ARCHE Зьмест № 4'05

1. Зьмест / Уводзіны
2. Уладзімер Мацкевіч, Андрэй Ягораў. Перамога над рэжымам або сьмерць нацыі: дылема будучых прэзыдэнцкіх выбараў
3. Уільям Пфаф. Што засталося ад Эўрапейскага Зьвязу?.
4. Віталь Сіліцкі. Недапісаная гісторыя, неканчатковы дыягназ.
5. Нерыюс Прэкявічус. Дыскурс прапаганды газэты «Советская Белоруссия».
6. Пётра Рудкоўскі. Сцэнары лукашэнкаўскай улады.
7. Андрэй Казакевіч. Суперновая сучаснасць: Рэклама сістэмы і канец гісторыі.
8. Даніла Жукоўскі. Пісьменнік і Пустэча.
9. Павал Абрамовіч. Быць жывым і бачыць сонца.
10. Аляксей Бацюкоў. А як вы ставіцеся да «крывавай Мэры»?
11. Тэадор Р. Уікс. Ідэнтычнасць у познеімперскай Расіі. Нацыя, культура, палітыка
12. Кімітака Мацузата. Рэжым Лукашэнкі як выспа папулізму ў акіяне кланавай палітыкі.
13. Дамінік Арэль. Парадоксы Памаранчавай рэвалюцыі.
14. Тымаці Гартан Эш, Тымаці Снайдэр. Памаранчавая рэвалюцыя.
15. Тымаці Гартан Эш. Эўропа ці Амэрыка? Польская дылема, брытанская дылема.
16. Алесь Пашкевіч, Андрэй Чарнякевіч. «Стары нямецкі агент» ці «Бацька радзіміцкага народу»?
17. Георгій Навіцыян. Перадумовы ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага ў святле ўзаемадзеяння Рыма і варвараў у I–VI стст.
18. Сяргей Балахонаў. Там нехта ёсьць, або Ростані постсавецкай беларускай літаратуры.
19. Адам Глобус. Мой бедны таварыш, мой Сыс і дні незалежнасці.
20. Аксана Бязлепкіна. Пентхаўз для Сыса.
21. Алесь Аркуш. Сысова сьвятасьць і паганства.

22. Самыя небясьпечныя ідэі сьвету
23. Пётар Сяўрук. Да «правадыроў» беларускага народу.
24. Аляксей Знаткевіч
25. Andruś Chrapavicki. Eŭropa.
26. Аляксандар Грыцанаў. Разброд і хістаньні афіцыйнай навукі.
27. Юры Ліхтаровіч. Росквіт і сьмерць польскага камунізму.

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 4 (38) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

4[image]-[image]**2005**

аналітыка • крытыка • палеміка • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

[image]

З ь м е с т

C o n t e n t s

АНАЛІТЫКА

УЛАДЗІМЕР МАЦКЕВІЧ, АНДРЭЙ ЯГОРАЎ Перамога над рэжымам або сьмерць нацыі: дылема будучых прэзыдэнцкіх выбараў
УІЛЬЯМ ПФАФ Што засталося ад Эўрапейскага Зьвязу?

КРЫТЫКА

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ Недапісаная гісторыя, неканчатковы дыягназ
НЭРЫЮС ПРЭКЯВІЧУС Дыскурс прапаганды газэты «Советская Белоруссия»
ПЁТРА РУДКОЎСКІ Сцэнары лукашэнкаўскай улады
АНДРЭЙ КАЗАКЕВІЧ Супэрновая сучаснасьць: Рэкляма сыстэмы і канец гісторыі
ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ Пісьменьнік і Пустэча
ПАВАЛ АБРАМОВІЧ Быць жывым і бачыць сонца
АЛЯКСЕЙ БАЦЮКОЎ А як вы ставіцеся да «крывавай Мэры»?
ТЭАДОР Р. УІКС Ідэнтычнасьць у позьнеімпэрскай Расіі. Нацыя, культура, палітыка

АНАЛІТЫКА

КІМІТАКА МАЦУЗАТА Рэжым Лукашэнкі як выспа папулізму ў акіяне кланавай палітыкі

ДАМІНІК АРЭЛЬ Парадоксы Памаранчавай рэвалюцыі
ТЫМАЦІ ГАРТАН ЭШ, ТЫМАЦІ СНАЙДЭР Памаранчавая рэвалюцыя
ТЫМАЦІ ГАРТАН ЭШ Эўропа ці Амэрыка?
АЛЕСЬ ПАШКЕВІЧ, АНДРЭЙ ЧАРНЯКЕВІЧ «Стары нямецкі агент» ці «Бацька радзіміцкага народу»?
ГЕОРГІ НАВІЦЫЯН Перадумовы ўтварэньня Вялікага Княства Літоўскага ў сьвятле ўзаемадзеяньня Рыму і барбараў у I–VI стст.
СЯРГЕЙ БАЛАХОНАЎ Там нехта ёсьць,або Ростані постсавецкай беларускай літаратуры

ЭСЭІСТЫКА

АДАМ ГЛЁБУС Мой бедны таварыш, мой Сыс і дні незалежнасьці
АКСАНА БЯЗЬЛЕПКІНА Пэнтхаўз для Сыса
АЛЕСЬ АРКУШ Сысова сьвятасьць і паганства
САМЫЯ НЕБЯСЬПЕЧНЫЯ ІДЭІ СЬВЕТУ
ПЁТАР СЯЎРУК Да «правадыроў» беларускага народу

ЛІТАРАТУРА

АЛЯКСЕЙ ЗНАТКЕВІЧ Лірыка
ANDRUŚ CHRAPAVICKI Eŭropa
ГАБРЫЭЛЬ ГАРСІЯ МАРКЕС Каханьне падчас халеры

РЭЦЭНЗІІ

АЛЯКСАНДАР ГРЫЦАНАЎ Разброд і хістаньні афіцыйнай навукі
ЮРЫ ЛІХТАРОВІЧ Росквіт і сьмерць польскага камунізму

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 4 (38) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/14
[image]

УЛАДЗІМЕР МАЦКЕВІЧ
палітоляг, аўтар кніг «Белорусская демократия: вопреки очевидности» (1996), «Вопиющее молчание» (2001). Уладальнік пэрсанальнай вэб-старонкі http://worvik.com. Яго апошняя публікацыя ў «ARCHE» «Чыя палітыка тапырыцца ў раёне Берасьця?» (5/2004).

АНДРЭЙ ЯГОРАЎ

Перамога над рэжымам або сьмерць нацыі: дылема будучых прэзыдэнцкіх выбараў

Гістарычна склалася так, што тэрыторыя Беларусі знаходзіцца ў памежнай сытуацыі: між «Усходам і Захадам» (І. Абдзіраловіч), «Поўднем і Поўначчу» (С. Санько). У палітычным кантэксьце гэтую сытуацыю можна зрэдукаваць да мадэлі двухбаковага ўплыву на Беларусь: з боку Расеі і з боку Эўропы (ці шырэй – Захаду). Гэтая думка ўжо стала настолькі звыклай і нават банальнай, што аналіз палітычнае сытуацыі часьцей за ўсё зводзіцца да простых антаганістычных схемаў супрацьстаяньня. Калі, напрыклад, мяркуецца, што Расея падтрымлівае палітычны рэжым у Беларусі (тут бяруцца адносіны са знакам «плюс»), то адпаведна міжнародная супольнасьць будзе разглядацца як праціўнік існага палітычнага рэжыму (бяруцца адносіны са знакам «мінус»), што далёка ня так проста і двухзначна.

Тут мы разгледзім сучасную палітычную сытуацыю ў Беларусі з пункту гледжаньня кіраваньня гэтай сытуацыяй. Адразу адзначым, что калі мы ўжываем тэрмін «кіраваньне», мы за ўсё маем на ўвазе нэгатыўны сэнс, што ўкладаецца ў гэты панятак. Размова ідзе не пра маніпуляваньне, закулісныя гульні, жыдамасонскія змовы і таму падобнае, а пра прыняцьцё рашэньняў, прызначэньне стратэгічных мэтаў, вызначэньне прыярытэтных задачаў і г. д. У гэтым сэнсе палітычная прастора (палітычная сытуацыя) у Беларусі кіруецца двума фокусаў альбо цэнтраў: афіцыйна-ўладнага, апазыцыйнага заходняга і расейскага.

Розныя кіроўныя цэнтры канкуруюць адзін з адным, бо імкнуцца да рэалізацыі ўласных мэтаў. Прычым кіраваньне з кожнага цэнтру ажыцьцяўляецца ня толькі непасрэдна, але і празь перахоп кіраваньня зь іншых цэнтраў. Калі адзін з цэнтраў пераймае кіраваньне, ён становіцца дамінуючым, і дзейнасьць усіх іншых робіцца несамакіраванай, падпарадкаванай волі праціўніка.

Зыходзячы з гэтых выкладак, разгледзім стратэгіі, што рэалізуюць розныя цэнтры адносна адзін аднаго і беларускай сытуацыі наагул.

Афіцыйна-ўладны цэнтар. Ён рэалізуе стратэгію, накіраваную супраць беларускай апазыцыі і яе дзейнасьці падчас галоўнай падзеі 2006 году – прэзыдэнцкіх выбараў[1]. Адна з галоўных задачаў гэтай стратэгіі – зрабіць некіраваным увесь дэмакратычны рух. У дадзеным кантэксьце карэктней было б казаць *несамакіраваным*, г. зн. фактычна апазыцыя не павінна сама кіраваць сабой. У гэтым сэнсе афіцыйная пазыцыя ўлады палягае на тым, што беларуская апазыцыя кіруецца з замежжа, у першую чаргу з Захаду. Тут гаворка ідзе пра рэфлексіўнае кіраваньне[2], а менавіта: беларуская апазыцыя кіруецца не сама сабой, але праціўнікам, тым, хто працуе супраць яе, альбо супраць каго яна выступае, г. зн. беларуская апазыцыя знаходзіцца ў сытуацыі вонкавага кіраваньня. Афіцыйная ўлада, рэжым кіруюць беларускай апазыцыяй празь як бы надбудову яшчэ аднаго контуру кіраваньня. Калі казаць іншымі словамі: рэжым кіруе кіраваньнем беларускай апазыцыі. Дзеля

вырашэньня гэтай задачы ўлада ўзводзіць спэцыяльныя бар'еры і перашкоды для магчымасьцяў самакіраваньня, кіруе вулічнай актыўнасьцю апазыцыі і г. д.

Заходні цэнтар. Лягічна меркаваць, што калі Захад выдзяляе значныя сродкі на трэці сэктар, разьвіцьцё грамадзянскай супольнасьці, то ў яго дзеяньнях павінна быць нейкая стратэгія пляны, стратэгічныя схемы. Але нават спэцыяльна арганізаваныя дасьледаваньні не дапамаглі выявіць такі тэкст і іншай асэнсаванай цэльнай стратэгіі. Можна казаць толькі, што заходні вэктар кіраваньня беларускай сытуацыяй – гэта чыстая ахлакратыя. г. зн. параўнальная беднасьць нацыянальнага фонду, здольныя зрабіць сутнасныя зьмены і прывесьці да сутнасных зрухаў. Практычна няма ніводнай краіны ў Эўропе, якая адчувала б сябе заможнай і не выдзяляла б сродкаў на падтрымку Беларусі. Кожная са шматлікіх замежных фундацыяў праводзіць уласную палітыку выдзяленьня сродкаў, ня бачыць сытуацыю ў краіне, что ўрэшце прыводзіць да фэўдальных хаатычных дзеяньняў і татальнай адсутнасьці ўзгодненага кіраваньня. Чаго нельга сказаць пра Расею.

Расейскі цэнтар. Асноўная мэта расейскага цэнтру – рэабілітавацца за паразу ўва Ўкраіне падчас памаранчавай рэвалюцыі. Уся расейская актыўнасьць накіраваная толькі на адно – не дапусьціць памаранчавай рэвалюцыі ці якой яшчэ каляровай рэвалюцыі ў Беларусі ў бліжэйшыя гады. Перш за ўсё – гэта выбары 2006 г. і тое, што адбудзецца пасьля іх. Пра нейкія рэвалюцыі ў Беларусі пасьля 2006 г. гаварыць бессэнсоўна, таму што ня можа быць ніякай зьмены рэжыму ў бліжэйшай будучыні, калі ён пераможа ў 2006 г. Гэта будзе абсалютная і канчатковая перамога на многія гады. Гэтая перамога рэжыму прывядзе да таго, што на гэтай тэрыторыі зьменіцца тытульная нацыя. Ёй будуць чырвона-зялёныя, а ня тыя беларусы, што сталі ўзьнікаць і асэнсоўваць сябе на хвалі Адраджэньня 1980-х гг. і якія да апошняга часу ў пэўнай ступені вызначалі стан рэчаў у беларускай палітычнай і культурнай прасторы. Любому незаангажаванаму аналітыку,

1. Гэтая стратэгія можа быць шырокі і нейкі час праіснуе, але ўжо дайна, чым тая, што вызначыў для сябе Ўрад. Ён вызначыў яго як працэс перадачы асновы для прыняцьця рашэньняў адным бокам канфлікту (альбо дыялегу) іншаму, што дазваляе кіраваць працэсам прыняцьця рашэньняў

2. Ўласна, дзеля кіраваньня Ў Лёгіцы

пры поглядзе на нашу сытуацыю павінна быць яснай, што ўлады/ зьмена рэжыму будзе зьвязаная з прэзыдэнцкімі выбарамі 2006 г., альбо яна не адбудзецца ўжо ніколі. Таму супадае расейскай стратэгіі і завязаная акурат на гэтым часе.

На сёньняшні дзень у Беларусі заўважная актыўнасьць як мінімум двух суб'ектаў, што працуюць у інтэлектуальнай, аналітычнай, праектнай плоскасьці над рэалізацыяй расейскай стратэгіі ў дачыненьні Беларусі і беларускай апазыцыі. Першы – гэта Фонд эфэктыўнай палітыкі і асабіста Глеб Паўлоўскі, які вымушаны рэабілітавацца за памылкі, якія былі зроблены ўва Ўкраіне, у прыватнасьці, «дзякуючы» і яго стратэгічным распрацоўкам. Другі суб'ект – Сяргей Караганаў, супрацоўніня ня так даўно створанай грамадзкай расейска-беларускай праваабарончай камісіі. Калі мы зьвернем увагу на пасады, якія займаў Караганаў у папярэднія гады, то відавочным робіцца ўся несур'ёзнасьць звароту апошняга да праваабарончай тэматыкі. Задача Караганава, якую ён вырашаў і раней і якую можна рэканструяваць і сёньня, палягае ў тым, каб узяць пад кантроль і ўсталяваць вонкавае кіраваньне празаходняй часткай грамадзянскай супольнасьці Беларусі. Выратаньне гэтай задачы падпарадкаваны праект абраньня адзінага кандыдата, які знаходзіцца пад кіраваньнем Караганава, яго аналітыкаў і праектантаў; праект, які ў значна больш грубай і камічнай форме паўтарае ўсе памылкі 2001 г. Сьвядома альбо не, трапляючы ў пастку Караганава, беларускія праваабаронцы, лідэры грамадзянскай супольнасьці і апазыцыі становяцца матэрыялам рэфлексіўнага кіраваньня з боку расейскіх стратэгаў[3].

Што да Паўлоўскага, то ягоныя намаганьні дзеля арганізацыі міжнароднага форуму «Эўропа: вынікі году пераменаў» з удзелам Аляксандра Вайтовіча, Уладзімера Коласа, Аляксандра Казуліна ды іншых маюць мэтай усталяваць кантроль над часткай апазыцыйных палітыкаў. Пошук паслухмяных і «памяркоўных» удзельнікаў будучых перамоваў з уладамі, гатовых здацца на ласку пераможцаў, як калісьці Шарэнкі зь Ціхінем зрабілі гэта пад ціскам Чарнамырдзіна, Строева і Селязьнёва, ужо пачаўся.

Лефевр В. А. Конфликтующие структуры. Издание второе, переработанное и дополненное. Москва: издво «Советское радио», 1973.

Міркуючы на словах пра ідэалы і прынцыпы, робіцца гэта, хутчэй, несьвядома. Парадуй. Але матэрыялы радыё «Свабода»: Кожны разумны чалавек у сучаснай цывілізацыі разумее, што стабільнасьць і добрыя адносіны паміж дзяржавамі

Апазыцыйны цэнтар. Беларуская апазыцыя дагэтуль не мае адзінай асэнсаванай стратэгіі дзеяньняў. Больш за тое, з яе боку існуе ўпартае нежаданьне браць удзел у стратэгічных мерапрыемствах, прысьвечаных яе распрацоўцы[4]. Такая натуральна, што ў барацьбе і са стратэгіяй рэжыму, і з расейскімі стратэгічнымі ініцыятывамі апазыцыя не мае шанцаў на выйгрыш, бо ў таго, у каго адсутнічае ўласная стратэгічная лінія, гэтая лінія будзе непазьбежна навязаная вонкавымі структурамі. Гэта робіць пытаньне выпрацоўкі і прасоўваньня адпаведнай стратэгіі пытаньнем нумар адзін на парадку дня дэмакратычнай супольнасьці[5].

Мяркуецца, што ў дэмакратыі, заснаванай на законнасьці і вяршэнстве права, апазыцыя можа ўплываць на ўладу толькі ў выніку выбараў. Але ў сучасных умовах цывілізацыя можа пасьпяхова разьвівацца. І ў Расеі дастаткова людзей, якія прымаюць гэтыя высновы, якія вынікаюць з разьвіцьця цывілізацыяў. Караганаў – разумны чалавек, ён зьяўляецца намесьнікам дырэктара Інстытуту Эўропы Расейскай Акадэміі навук. Як навуковец, ён разумее гэтыя ідэалы і

гэтыя ўмовы. Падабаецца гэта яму ці не – іншая справа. Зыходзячы з гэта ён і будуе сваю дзейнасьць. І вельмі важна, што гэтая дзейнасьць Караганава і Рады, у якую ўваходзяць і Памфілава, і Сванідзэ – людзі, якія хочуць бачыць Беларусь дэмакратычнай краінай.

[4] Выснова зроблена пад уплывам падрыхтоўкі Арганізацыйна-дзейнаснай гульні па распрацоўцы палітычнай стратэгіі для Беларусі, самой гульні, што адбылася ў

Кіеве ў сакавіку-красавіку 2005 г., і пасьлягульнёвых спробаў арганізацыі камунікацыі (круглага стала) зь лідэрамі апазыцыі.

[5] Параўн. наш варыянт такога дакумэнта.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 4 (38) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/07
[image]

УІЛЬЯМ ПФАФ
палітычны аглядальнік газэты «The International Herald Tribune». Аўтар кніг «Barbarian Sentiments: America in the New Century» (2000), «The Future of the United States As a Great Power» (1996), «The Wrath of Nations: Civilization and the Furies of Nationalism» (1993). Гэтае эсэ ўпершыню пабачыла

Уільям Пфаф Што засталося ад Эўрапейскага Зьвязу?

1

Адмоўныя вынікі французскага і нідэрляндзкага рэфэрэндумаў наконт ратыфікацыі дамовы аб эўрапейскай канстытуцыі выклікалі ў многіх эўрапейцаў занепакоенасьць лёсам самога эўрапейскага адзінства. Гэта назвалі найбольшым адкатам Эўропы назад за апошнія пяцьдзясят гадоў, паўстаньнем супраць эканамічнае рэформы, якое паставіла эўра пад пагрозу, «крэнам улева», адрачэньнем ад зацікаўленых у мадэрнізацыі Эўропы элітаў, пачаткам канца Эўрапейскага Зьвязу. «Мы, эўрапейскія лідэры, больш ня ў сілах зрабіць эўрапейцаў гордымі за саміх сябе», – заявіў Жан-Клёд Юнкер, прэм’ер-міністар Люксэмбургу, што старшынюе цяпер у Эўразьвязе.

Адмаўляць прасьцей за ўсё. Гэтая крыза была выкліканая пашырэньнем Эўразьвязу. Яе можна было спрагназаваць, і раней ці пазьней яна была непазьбежная. Французы і нідэрляндцы зрабілі Эўразьвязу паслугу, справакаваўшы яе цяпер. Эўропа дваццаці пяці (ня кажучы ўжо пра патэнцыйныя трыццаць пяць ці больш), завялікая, каб функцыянаваць гэтак сама, як функцыянавала Эўропа шасьці, дванаццаці і нават

пятнаццаці чальцоў. Яна ўяўляе сабой радыкальны разрыў з тым ЭЗ, які існаваў раней.

Канстытуцыйная дамова стала прадуктам шматмесячнага, добрасумленнага ўзгадненьня пазыцыяў нацыянальных дзяржаваў пад кіраўніцтвам Валеры Жыскар д'Эстэна, які і стварыў яе канчатковую вэрсію з такім сынтэзуючым акцэнтам, якому вучаць толькі ў Нацыянальнай школе ўрадаваньня (Ecole Nationale d'Administration). (Канстытуцыя «лёгка чытаецца», сказаў ён французам, «гэта вельмі зграбны» (*trus joli*) тэкст[1].) Апрача таго, што ў адзін 300-старонкавы дакумэнт былі зьведзены ўсе ранейшыя эўразьвязаўскія дамовы, канстытуцыя надала Зьвязу шэраг дадатковых паўнамоцтваў. Паводле яе, ствараецца пасада адзінага міністра замежных справаў ЭЗ і паўнапраўнага прэзыдэнта Эўрапейскай рады, што складаецца з кіраўнікоў дзяржаваў і ўрадаў. Скасоўваецца права вэта кожнае краіны на базавыя законапраекты (але не на сур'ёзныя рашэньні ў галіне вонкавай палітыкі), і павялічваюцца паўнамоцтвы Эўрапейскага парлямэнту. Дарма што Гішпанія ўхваліла ўсё гэта на рэфэрэндуме, які прайшоў трохі раней сёлета, Францыя і Нідэрлянды гнеўна адхілілі канстытуцыю, як толькі публіка змагла накінуцца на яе падчас рэфэрэндумаў[2].

Адхіленьне канстытуцыі, бясспрэчна, прадэманстравала адсутнасьць узаемаразуменьня паміж эўрапейскімі палітычнымі элітамі і эўрапейскімі грамадзтвамі, але перш за ўсё стала сьведчаньнем пастаянна недаацэньванай сілы нацыянальнай ідэнтычнасьці і амбітнасьці кожнай з дваццаці пяці краінаў. Французаў з энтузіязмам падтрымала іншая надзвычай нацыяналістычная і індывідуалістычная эўрапейская краіна – Нідэрлянды, якая таксама была адной зь дзяржаваў-заснавальніцаў Эўрапейскага Зьвязу.

* * *

Ня толькі французы і нідэрляндцы (і, відавочна, брытанцы, якія цяпер адклалі рэфэрэндум, на якім канстытуцыйную дамову чакаў бы гарантаваны правал) працівяцца канстытуцыі; дакладней, той форме эўрапейскай інтэграцыі і плянам далейшага пашырэньня ЭЗ, якія ўвасобіла канстытуцыя.

[1] Французскія газэты ў старонках «New York Review of Books» (выпуск за 14 ліпеня гэтага году).

Семдзесят пяць адсоткаў насельніцтва Швэцыі выступаюць за правядзеньне рэфэрэндуму (а не ратыфікацыю ў парламенце), і гэтыя адсоткі дазваляюць з пэўнасьцю прадказаць, што будзе галасаваньне. Чакаецца, што вынікам люксэмбурскага рэфэрэндуму, прызначанага на 10 ліпеня, можа стаць «супраць»*. Яшчэ да галасаваньняў у Францыі і Нідэрляндах апытаньні грамадзкае думкі ў Даніі дазвалялі прагназаваць, што большасьць галасоў у прызначаным на верасень рэфэрэндуме будуць пададзеныя «за», але прэм'ер-міністар, лібэрал Андэрс Фог Расмусэн ужо заявіў, што пакуль ён не атрымае гарантыяў, што пастаўлены на галасаваньне дагавор ня будзе ў далейшым перагледжвацца, праводзіць рэфэрэндум няма сэнсу.

Нямецкі Бундэстаг таксама ўжо ратыфікаваў канстытуцыю абсалютнай большасьцю галасоў, але і ў Нямеччыне назіраецца ўсё болей стрыманасьці наконт эўрапейскіх пэрспэктываў. Адзін публіцыст у «Die Zeit» напісаў нядаўна, што «сапраўдная прычына расстройства не ў канстытуцыі, а ў Эўропе: складваецца ўражаньне, што яна выйшла з-пад кантролю».

Нямецкі дэпутат ад хрысьціянска-дэмакратычнай партыі, былы чалец Камісіі, створанай для напісаньня канстытуцыі, нядаўна заявіў:

Да пачатку 1990-х гадоў мы меркавалі, што нямецкія і эўрапейскія інтарэсы сынанімічныя. Сёньня гэтае меркаваньне аспрэчваецца. Гэта пачалося з варожасьці да эўра, якая яшчэ не пераадоленая.

Калі гэты артыкул пісаўся, 16 чэрвеня на пасяджэнні Эўрапейскае рады прэзыдэнты і прэм'ер-міністры разглядалі свае далейшыя крокі, але паколькі шэраг урадаў цьвёрда адстойвае ідэю новых перамоваў па канстытуцыі альбо настойвае, што кожная краіна-чалец ЭЗ павінна мець магчымасьць прагаласаваць, здаецца відавочным, што канстытуцыі памёр, а разам зь ім і пашырэньне Эўразвязу межы цяперашніх дваццаці пяці чальцоў – плюс два, якім быў абяцаны прыем у ЭЗ (Баўгарыя і Румынія). Здаецца, што

Галасаваньне ў Францыі і Нідэрляндах

Заяўленыя намеры галасаваць супраць Канстытуцыйнага дагавору ў Францыі і Нідэрляндах, а таксама нізкія рэйтынгі прэзыдэнта Шырака і прэм'ер-міністра Балкенэндэ ў апошнія месяцы, верхнія радкі ў апытаньнях грамадзкае думкі ў Францыі і Нідэрляндах не пакідалі сумневаў, што Канстытуцыйны дагавор будзе адхілены. Урад разаслаў тэкст усім грамадзянам, упісаным у выбарчыя сьпісы. Пара тыя спрэчкі, што разьдзялялі сваякоў і клалі канец дружбе, ішлі з інтэнсіўнасьцю, нябачанай ад часоў, калі кааліцыя сацыялістаў і камуністаў нядаўна ўзначаліла ўрад Францыі ў 1981 годзе.

2 Наступныя дзевяць краінаў выступілі ратыфікаваць дамову ў

Турэччына, Аўстрыя, Ісландыя, Партугалія, Грэцыя, Вугоршчына, Латвія, Літва, Славаччына і Славенія.

Зноўна з эўразьвязайскай дамоўленасьцю працэс ратыфікацыі нельга бясконца зацягваць. Калі праз два гады чатыры пятыя дзяржаваў-чальцоў ЭЗ ратыфікуюць дамову, а астатнія сутыкнуцца з «складанасьцямі», справа будзе «перададзеная ў кампэтэнцыю» Эўрапейскай рады. Улічваючы дзьве ўжо атрыманыя на рэфэрэндумах важкія паразы, прыпыненьне падрыхтоўкі да брытанскага рэфэрэндуму і пэрспэктывы правалу на рэфэрэндумах у Люксэмбургу, Чэскай Рэспубліцы і нават Польшчы, трэба меркаваць, што Эўрапейскай радзе, відаць, не давядзецца праз два гады турбавацца наконт ратыфікацыі. У гэтым выпадку Эўразьвяз будзе і надалей кіравацца недапрацаваным Ніцкім пагадненьнем 2003 году, якое, бясспрэчна, давядзецца паправіць, каб прыбраць некаторыя найбольш непрымальныя яго палажэньні, у тым ліку наконт разьмеркаваньня галасоў у Эўрапейскай радзе, якое не здавальняла немцаў, але было выключна спрыяльным для Гішпаніі і Польшчы. Тады ўрады краінаў ЭЗ сутыкнуцца зь неабходнасьцю перагляду пэрспэктываў Эўропы.

* * *

Паразы на рэфэрэндумах і іх наступствы выявілі тую рэальнасьць, якой не магло ці не хацела прызнаць палітычнае кіраўніцтва Эўропы. Пашырэньне Эўразьвязу на краіны былога Варшаўскага пакту было ажыцьцёўлена як з маральных, так і з палітычных прычынаў, якія немагчыма было ігнараваць пасьля заканчэньня халоднае вайны. Але колькасныя зьмены могуць ператварацца ў якасныя перамены. Пашырэньне зьмяніла Эўразьвяз так, што гэта пачало замінаць самой інтэграцыі і ўзаемадзеяньню, якія былі часткай першапачатковае ідэі ЭЗ і ягонага ранейшага разьвіцьця.

Значная частка насельніцтва «старых» краінаў Зьвязу – у тым ліку Францыі, Нямеччыны і Нідэрляндаў – не задаволеная пашырэньнем да дваццаці пяці краінаў. Яны занепакоеныя допускам у ЭЗ Румыніі і Баўгарыі, ня кажучы ўжо пра засталыя былыя югаслаўскія рэспублікі Харватыю, Сэрбію, Чарнагорыю,

на тэрыторыі якіх усё яшчэ тлеюць ваенныя канфлікты, і (у любой яго магчымай форме) Косава, і вельмі сумняюцца наконт Украіны ды Грузіі.

Усе гэтыя краіны маюць традыцыі, культуры і гісторыі, якія больш ці менш далёкія ад спадчыны краінаў, што складаюць ядро Заходняе Эўропы, дзе і быў створаны ЭЗ. Існуе яшчэ большая зьнеахвочанасьць да пашырэньня ЭЗ на неэўрапейскія мусульманскія краіны ў Малой Азіі і паўднёвым Міжземнамор'і. Турэччыну, Марока, Ярданію, новы Ірак і, магчыма, Ізраіль часам разглядалі як лягічных чальцоў Зьвязу ў будучыні. Існаваў спадзеў, што іх далучэньне дазволіць зьмякчыць «сутыкненьне» ісламскай і заходняй цывілізацыяў.

На карысьць прыняцьця ўсіх гэтых краінаў прыводзіліся пераканаўчыя аргумэнты. Новае «ялцінскае» пагадненьне, якое б адрэзала Баўгарыю, Румынію, Украіну і Грузію ад Эўропы, цяпер немагчыма ўявіць. Ігнараваньне гэтых краінаў – шараханьне ад іх і іх далейшая ізаляцыя ад асноўных эўрапейскіх працэсаў – можа мець для іх сумныя і нават катастрафічныя наступствы. Прадуманы, адладжаны і добра фінансаваны мэханізм, які дагэтуль падштурхоўваў кандыдатаў на ўступленьне ў ЭЗ да рэфармаваньня іх палітычных інстытутаў і юрыдычных стандартаў, абароны правоў чалавека і разьвіцьця эканомікі, выявіў сваю цудадзейную сілу пры стабілізацыі і мадэрнізацыі такіх краінаў з бурлівай мінуўшчынай, як Гішпанія, Партугалія, Ірляндыя ды Грэцыя.

Цягам апошняга дзесяцігодзьдзя ЭЗ аказваў велізарны ўплыў на Турэччыну, бо турэцкія лідэры шмат зрабілі для таго, каб дабіцца далучэньня сваёй краіны да ЭЗ. Безумоўна, існуе неабходнасьць падтрымліваць палітычныя і сацыяльныя рэформы і ў іншых рэгіёнах мусульманскага сьвету, каб тым самым наладзіць канструктыўныя ўзаемін паміж ісламскім грамадзтвам і Эўропай, а таксама ўсім Захадам.

Але спробы дабіцца ўсяго гэтага, выконваючы абяцаньні наконт прыняцьця ў Эўразьвяз, пагражаюць цэласьці і выжываньню самога ЭЗ. Акурат такую думку выказалі французскія і нідэрляндзкія выбарцы. ЭЗ – гэта не агенцыя міжнароднай дапамогі або міжнароднага разьвіцьця, яго мэта не ў

рэфармаваньні чалавецтва ці прымірэньні цывілізацыяў (альбо падтрымцы замежнай палітыкі і глябальных плянаў Амэрыкі, хаця некаторыя амэрыканцы хацелі б, каб ён зрабіўся ёй).

Нідэрляндзкае і французскае галасаваньне адлюстроўвае тое інтуіцыйнае адчуваньне, што першы абавязак любое палітычнае супольнасьці, як нацыянальнае, так і шматнацыянальнае, тычыцца яе самой, яе ўласнай бясьпекі, цэласьці і пасьпяховага функцыянаваньня. Эўразьвяз павінен быць пасьпяховым утварэньнем, каб чыніць канструктыўны ўплыў на іншых, і з гэтага пункту гледжаньня ён, здаецца, апынуўся ў небясьпецы. Як прыклад посьпеху, ён можа «выпрамяньваць» свой уплыў на суседнія краіны пры дапамозе разнастайных формаў больш ці менш цеснай асацыяцыі, а не пры дапамозе прыняцьця ў свае шэрагі, якое падрывае яго цэласьць і дзеяздольнасьць.

Той-сёй бачыць у гэтым культурную ці рэлігійную дыскрымінацыю. Той-сёй бачыць у гэтым вяртаньне нацыяналізму, а агульнапрынятая паліткарэктнасьць пасьля Другой сусьветнай вайны атаясамляе нацыяналізм з фашызмам. Фашызм і нацызм былі нацыяналістычнымі гістарычнымі зьявамі, але нацыяналізм – гэта не фашызм ці нацызм. Ёсьць усе падставы лічыць цяпер ЗША самай нацыяналістычнай краінай на зямлі.

Нацыяналізм выражае вялікую патрэбу ў сьцьвярджэньні нацыянальнай ці калектыўнай ідэнтычнасьці як астоі індывідуальнай ідэнтычнасьці. Ён – адна з фундамэнтальных сілаў, якія дзейнічаюць у палітычных супольнасьцях, надаючы ім сэнс. Да таго ж ён – адна з магутных, калі не наймагутнейшая, сілаў у фізыцы міжнародных адносінаў. Ён нэўтралізуе кароткачасовыя адхіленьні альбо выбухі вар'яцтва. Хаця ён можа спалучацца з самым высакародным інтэрнацыяналізмам, і зламаць яго ня так проста; рэпрэсаваны нацыяналізм вяртаецца. З гэтых прычынаў з нацыяналізмам трэба ўмець правільна абыходзіцца, а ня ўпарта яму супраціўляцца.

Нацыяналізм – гэта сіла, якая пахіснула эўрапейскі праект, якая супраціўляецца далейшаму пашырэньню ЭЗ і далейшай

канцэнтрацыі выканаўчай улады. Канстытуцыя вымагала ахвяраваць большай часткай нацыянальнага сувэрэнітэту, чымся той, на якую згаджаліся французы, нідэрляндцы ды некаторыя іншыя эўрапейцы. Нідэрляндзкі плебісцыт стаў плебісцытам пра ідэнтычнасьць. «Мы хочам застацца нідэрляндцамі» быў адным зь лёзунгаў, выкарыстаных, каб мабілізаваць галасы супраць канстытуцыі. Існаваньне вялікага і неасымільванага імігранцкага насельніцтва было асабліва важным чыньнікам, што паўплываў на нідэрляндзкае «не».

2

Камэнтары, што прагучалі ў Эўропе, а таксама ў Злучаных Штатах і Вялікай Брытаніі і зьмяшалі ў адно ўнутраныя праблемы і палітычныя канфлікты Францыі і Нідэрляндаў з пытаньнямі пашырэньня Эўропы і канстытуцыйнае дамовы, яшчэ больш усё заблыталі. Францыя перажывае «крызіс рэжыму», спрычынены беспрацоўем на ўзроўні прыкладна дзесяці адсоткаў, беспасьпяховымі спробамі цяперашняга і ранейшых урадаў ажыцьцявіць эканамічныя і сацыяльныя рэформы, а таксама асабістым суперніцтвам палітыкаў за прэзыдэнцкую пасаду. Усё гэта вельмі цікава для французскае палітычнае клясы і французскага грамадзтва, а таксама для староньніх назіральнікаў, якія цікавяцца Францыяй, але гэта толькі ўнутраная французская праблема.

Тое самае датычыць Нідэрляндаў, дзе слабы кааліцыйны ўрад змагаецца з наступствамі крызісу старое палітычнае структуры нідэрляндзкага грамадзтва, які назіраецца ў апошнія гады і абумоўлены прычынамі, якія маюць слабое або ня маюць ніякага дачыненьня да ЭЗ. З пачатку мінулага стагодзьдзя палітычная стабільнасьць у Нідэрляндах грунтавалася на больш ці менш фармальным падзеле ўлады ды інстытуцыйнага ўплыву паміж пратэстанцкай і каталіцкай цэрквамі, а таксама іншымі асноўнымі грамадзкімі інстытутамі Нідэрляндаў.

Сёньня цэрквы ўжо ня маюць сілаў, каб несьці цяжар гэтага ўладкаваньня. У той самы час вялікая іміграцыя – перадусім з Турэччыны, Марока і былой нідэрляндзкай калёніі Сурынаму, а таксама іншых краінаў – зьмяніла вонкавы выгляд грамадзтва,

але імігрантаў так ніхто і не запрасіў асымілявацца ў сапраўды старое і ўнікальнае грамадзтва, якое ў пэўных адносінах можа быць вельмі неталерантным[3].

Тое, што нідэрляндзкі лад аджыў сваё, нідэрлянцы ўсведамілі пасьля забойстваў радыкальнага палітыка Піма Фартэйна ў 2002 годзе і Тэа ван Гога, стваральніка фільму, у якім адмоўна асьвятлялася абыходжаньне мусульманаў з жанчынамі. Гэтыя выпадкі былі вялікім узрушэньнем для традыцыйна стабільнага і лібэральнага грамадзтва, але зноў-такі ня мелі дачыненьня да ЭЗ.

І ў Нідэрляндах, і ў Францыі непрыняцьце эўраканстытуцыі інтэрпрэтавалі няправільна: сапраўдны эфэкт галасаваньня не адпавядае першапачаткова задуманаму. Шмат французаў галасавала супраць Жака Шырака і ягонага ўраду з-за яго нездольнасьці вырашыць праблему высокага беспрацоўя і нізкага эканамічнага росту; але толькі меншасьць тых, хто галасаваў у Францыі ці Нідэрляндах, лічылі, што яны галасуюць супраць эўрапейскага адзінства ў яго цяперашняй форме. Яны галасавалі супраць іншай Эўропы, той, якую мае стварыць канстытуцыя.

У Нідэрляндах людзі галасавалі ня толькі супраць наплыву імігрантаў, галасуючы, яны пратэставалі супраць стратаў, зазнаных у выніку афіцыйнай дэвальвацыі гульдэна падчас увядзеньня ў Нідэрляндах эўра. Яны абураліся абыякавасьцю чыноўнікаў ЭЗ і большых краінаў да нідэрляндзкіх прапановаў па канстытуцыі. Яны галасавалі за такую бясспрэчна пераканаўчую абстракцыю, як «застацца нідэрляндцамі». Ускосна яны галасавалі супраць прыняцьця Турэччыны і Ўкраіны ў ЭЗ і супраць таго, што першапачатковыя чальцы ЭЗ трацяць свой уплыў на карысьць новых чальцоў. Яны галасавалі супраць таго, каб Эўропа межавала з Расеяй, як гэта ёсьць цяпер, і з Іракам, як гэта будзе, калі прыняць Турэччыну. Але яны не адмаўляліся ад Эўразьвязу.

Французы галасавалі супраць абстракцыі пад назвай «лібэралізм», які ў Эўропе разумеюць як імкненьне глябалізаванага амэрыканскага рынкавага капіталізму разбурыць эўрапейскую мадэль сацыяльна арыентаванай

[3] Тая самая пасьля забойства Тэа ван Гога была адмоўна настроена. Гэтыя выпадкі былі вялікім узрушэньнем для традыцыйна стабільнага і лібэральнага грамадзтва, але зноў-такі ня мелі дачыненьня да ЭЗ.

з высакародных меркаваньняў ад імігрантаў не патрабавалі асыміляцыі або культурнай інтэграцыі, тым самым ажыцьцяўляючы іх ненаўмысную гетаізацыю. Найбольшыя групы імігрантаў у Нідэрляндах складаюць мараканцы, туркі, самалійцы – усе яны вызнаюць іслам – і насельнікі былой нідэрляндзкай калёніі

дзяржавы. Яны галасавалі супраць пагрозы польскіх сантэхнікаў, якія прагнуць адрамантаваць французскую каналізацыю за цану, якая б паставіла крыж на французскіх сантэхніках, што нібыта закладзена ў прапазыцыі бывшага эўрапейскага камісара ад Нідэрляндаў Фрытса Болкенштайна, які прапанаваў лібэралізаваць канкурэнцыю ў сфэры паслуг ва ўсім ЭЗ. (Расьсьледаваньні польскіх журналістаў пасьпяхова мала доказаў існаваньня сантэхнікаў, прагных выехаць у Францыю.) Яны таксама галасавалі супраць пагрозы, што канстытуцыя дазволіць НАТО кантраляваць эўрапейскую абарону.

Але апрача вялікіх эўрапейскіх пытаньняў, французы галасавалі таксама супраць стагнацыі і неэфэктыўнасьці французскае палітыкі. Жак Шырак распачаў сваю кар'еру ў якасьці кандыдата ў прэзыдэнты дваццаць дзевяць гадоў таму, спаборнічаючы з тагачасным прэзыдэнтам Валеры Жыскар д'Эстэнам, чалавекам, які распрацаваў эўрапейскую канстытуцыю. Жыскар упершыню стаў буйной палітычнай фігурай у тыя часы, калі прэзыдэнтам Францыі быў яшчэ Шарль дэ Голь. Французы хацелі б пераменаў. Яны хочуць, каб нехта вывеў іх з палітычнага тупіка, у якім адныя і тыя ж знаёмыя твары пераходзяць з пасады на пасаду. Нядаўна прэзыдэнт Шырак прызначыў прэм'ер-міністрам Дамініка дэ Вільпэна, прынамсі, параўнальна сьвежую фігуру ў французскай палітыцы, але, відаць, гэтага будзе недастаткова.

Сурынам, дзе нідэрландзкая мова выступае афіцыйнай мовай, а ува ўсім краіне пераважае мова сранан, што складаецца з крэолаў, індусаў, яванцаў, кітайцаў ды індзейцаў. Праблема, аднак, – альбо неасьміляцыі – тысяцца перадусім мусульманскіх супольнасьцяў. <

* * *

У Францыі палітычныя дэбаты адбываюцца ў самых вытанчаных формах, але гэта яшчэ не гарантуе наяўнасьці празрыстасьці палітычнай сыстэмы. Грамадзтва патрабуе рэформаў, а атрымаўшы іх, часьцяком выходзіць на вуліцы, каб заблякаваць іх рэалізацыю, як гэта нядаўна было з адукацыйнай рэформай. Французы сумнавядомыя сваім сварлівым норавам – які можна тлумачыць спадчынай рэвалюцыйнае традыцыі – які і зьяўляецца важным чыньнікам як пры патрабаваньні рэформаў, так і ў нежаданьні іх рэалізаваць.

У 1991 годзе французскае грамадзтва, падахвочанае прэзыдэнтам Францыа Мітэранам, ухваліла Маастрыхцкую дамову, што прапаноўвала захады для ўвядзеньня супольнай грашовай адзінкі. Параўнаньне вынікаў экзыт-полу, праведзенага ў Францыі падчас плебісцыту 29 траўня, з адпаведнымі лічбамі часоў рэфэрэндуму па Маастрыхцкай дамове, ня сьведчыць пра ўмацаваньне экстрэмісцкіх партыяў. Экзыт-пол таксама ня выявіў ніякіх новых клясавых, ідэалягічных альбо рэгіянальных падзелаў, а таксама падзелаў паміж горадам і вёскай або нават паміж працуючымі і беспрацоўнымі. Пэнсіянэры пераважна галасавалі «за» абодва разы, тое самае тычыцца асобаў з высокім узроўнем адукацыі і вышэйшай часткі сярэдняе клясы.

Вырашальнай стала вялікая зьмена ў галасаваньні прадстаўнікоў «прамежкавых» заняткаў і прафэсіяў, якія складаюць ніжэйшы слой сярэдняе клясы. Сюды, у прыватнасьці, уваходзяць школьныя настаўнікі, мэдсёстры і санітаркі, бухгальтары, загадчыкі аддзелаў у крамах, прадаўцы. За час паміж маастрыхцкім рэфэрэндумам і 2005 годам колькасьць галасоў «супраць» у гэтай групе выросла на 17 пунктаў і склала 53-адсоткавую большасьць.

У 1992 годзе гэтая група найбольш выйграла ад эпохі працьвітаньня – так званых трыццаці слаўных пасьляваенных гадоў Францыі. Яе прадстаўнікі зараблялі больш грошай, чым калі-кольвек раней, куплялі новыя дамы ў лепшых прадмесьцях і мелі вялікія спадзяваньні што да ўласнай будучыні і асабліва будучыні сваіх дзяцей. Цяпер гэты аптымізм зьнік, і людзі баяцца адкату назад. Іх пакупніцкая здольнасьць падае, яны баяцца за сваіх дзяцей. Яны больш працуюць (нягледзячы на трыццаціпяцігадзінны працоўны тыдзень), але здаюць свае пазыцыі. Перадусім зь іх складаюцца тыя людзі, на думку якіх «Францыя перажывае заняпад», і, мяркуючы па ўсім, начальства і прафсаюзы ігнаруюць іх становішча; яны нецікавыя прэсе, да іх з абыякавасьцю ставяцца кіроўныя эліты ў Парыжы і Брусэлі.

Несумненна, у паводзінах французскіх выбарцаў сёньня прысутнічае і выкліканы палітычнымі фрустрацыямі элемэнт нігілізму, але зноў-такі гэта мае слабае ці ня мае ніякага

дачыненьня да ЭЗ. Эканаміст і гісторык Нікаля Бавэрэз напісаў у «Le Monde» 4 чэрвеня сёлета, што канстытуцыйны рэфэрэндум проста выдаў «пасьведчаньне аб сьмерці» «галісцкай Францыі, разбэшчанай Франсуа Мітэранам і зруйнаванай Жакам Шыракам». Пераканаўчы прысуд.

* * *

Аднак выйсьце ёсьць. Швэцыі, Данііі некаторым іншым краінам накшталт Швайцарыі ўдаецца спалучаць высокія стандарты сваёй сацыяльнай палітыкі зь нізкім беспрацоўем. Шэраг рашэньняў французскіх праблемаў ужо знойдзены, напрыклад, неабходнасьць скасаваньня фіскальных і адміністрацыйных бар'ераў у звальненьні і прыёме на працу, а таксама ў стварэньні новых прадпрыемстваў. Але ў імя гэтага палітычныя лідэры павінны казаць выбарцам рэчы, якіх тыя ня хочуць чуць (як пачаў рабіць Герхард Шродэр у Нямеччыне).

Бавэрэз таксама закрануў праблему эўрапейскай «арганізаванай дэфляцыі, якая ператварыла «эўралэнд» у пустыню беспрацоўя і інавацыяў», выкліканую першапачатковай настойлівасьцю Нямеччыны, каб адзінай задачай Эўрапейскага цэнтральнага банку было прадухіленьне інфляцыі. Гэта аўтаматычна ліквідавала магчымасьць правядзеньня кейнсіянскай палітыкі (нават зьвязанага зь фінансавым дэфіцытам, перакручанага кейнсіянства адміністрацыі Буша, што забясьпечвае Амэрыцы Джорджа Буша і Алана Грынспэна рост і высокі ўзровень занятасьці, чаму многія моцна зайздросьцяць). Як нядаўна пісаў Робэрт Э. Левін, колішні намесьнік дырэктара бюджэтнага ўпраўленьня Кангрэсу ЗША: «Жорсткія манэтарныя і фіскальныя нормы, уведзеныя Маастрыхтам, вінаватыя ў эканамічных цяжкасьцях, прынамсі, ня менш, чым структурны склероз». Французскія выбарцы памятаюць, што пасьляваенны эканамічны рост у Францыі, ад пачатку 1950-х да нафтавага шоку пачатку 1970-х, адбываўся ўва ўмовах правядзеньня ўрадам пасьпяховай дырыжысцкай прамысловай палітыкі, пры якой дзяржава падтрымлівала і абараняла тыя галіны прамысловасьці, якія дэманстравалі моцны патэнцыял для росту. У тыя часы

манэтарызм быў толькі хмаркай на палітычным гарызонце, а ня бляклай артадоксіяй, як цяпер.

3

Эўрапейскі Зьвяз – гэта выдатнае дасягненьне. Заснавальнікі і першыя яго чальцы цягам пяцідзесяці гадоў намагаліся пераўладкаваць Эўропу; яны рабілі гэта з шчодрасьцю і гатовасьцю паступіцца сваім сувэрэнітэтам ды выдаткоўваць грошы адзін на аднаго, а таксама на тых чальцоў Зьвязу, што далучыліся пазьней. Яны імкнуліся стварыць і падтрымліваць мір у сьвеце, а таксама эканамічнае і сацыяльнае разьвіцьцё. ЭЗ ажыцьцявіў трансфармацыю некалі бедных краінаў Эўропы – Грэцыі, Ірляндыі, Гішпаніі ды Партугаліі – а цяпер ён паўтарае гэтыя высілкі, каб памагчы забагацець сваім новым чальцам у Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропе, краінах Балтыі і Міжземнамор'я. Гэта вялікі посьпех.

Адхіленьне канстытуцыі не зруйнуе існуючага Зьвязу. Важныя рэформы – накшталт увядзеньня пасады адзінага прэзыдэнта ды павелічэньня паўнамоцтваў у галіне дыпляматыі і абароны – можна выцягнуць з-пад аскепкаў канстытуцыі. Для краінаў ЭЗ цалкам магчыма працягваць супрацу ў зьлёгку мадыфікаванай вэрсіі цяперашняй структуры ЭЗ дваццаці пяці краінаў (ці дваццаці сямі).

Колішні французскі міністар замежных справаў Юбэр Вэдрын напісаў 9 чэрвеня гэтага году ў «Le Monde»:

Эўропа – гэта ня толькі палітычны, але і геаграфічны панятак. У яе павінны быць межы... Мы павінны вярнуцца да Эўропы вялікіх праектаў: інфраструктурных, адукацыйных, навуковых, прамысловых, сацыяльных, культурных, экалягічных, дыпляматычных. Праектаў, якія будуць мець дакладныя графікі выкананьня. Скарыстаўшыся зь іх, ніхто не паддасца спакусе прагаласаваць «супраць». Існуючыя дамовы дазваляюць нам гэта зрабіць. Дайце эўразоне правільную эканамічную палітыку. Выклік будучыні палягае ў тым, каб гарманізаваць эканамічны

рост, занятасьць і экалёгію. Дык давайце ж ажыцьцявім на эўрапейскім кантынэнце гэты сынтэз.

Што можна бязь цяжкасьці рэалізаваць, дык гэта палітычнае ўладкаваньне, пры якім існуюць некалькі розных узроўняў інтэграцыі, і краіны на ўласны выбар супрацоўнічаюць адна з адной, калі бачаць у тым сэнс. Часам гэта называюць дыскрымінацыяй, паніжэньнем статусу некаторых чальцоў, але гэтую выснову нельга рабіць аўтаматычна. Мабыць, такая Эўропа розных кампэтэнцыяў і амбіцыяў – адзінае практычнае выйсьце.

Напрыклад, эўрапейская манэтарная зона, у якой эўра зьяўляецца адзінай валютай, ахоплівае толькі дванаццаць з дваццаці пяці чальцоў ЭЗ. У Шэнгенскае пагадненьне, што ліквідавала бар'еры для іміграцыі і падарожжаў, уваходзяць толькі пятнаццаць краінаў ЭЗ, але да яго далучылася Нарвэгія, якая не ўваходзіць у ЭЗ, а цяпер яшчэ і Швайцарыя. Міратворчыя ініцыятывы ЭЗ былі ажыцьцёўленыя ў Македоніі, Босьніі, Косаве, Аўганістане і Конга.

У кожным разе, адрозьненьні паміж тымі, хто ўдзельнічае, і тымі, хто ня ўдзельнічае, маюць, хутчэй, прагматычны, а не антаганістычны характар. Эўрапейскай манэтарнай зоне, эўрапейскай арганізацыі бясьпекі і эўрапейскай дыпляматыі ўласьцівыя розныя мадэлі арганізацыі супрацы паміж чальцамі ЭЗ. Нэўтральныя дзяржавы, чальцы НАТО, што не ўваходзяць у ЭЗ, і чальцы ЭЗ, што не ўваходзяць у НАТО, бяруць на сябе розныя абавязаньні і па-рознаму ажыцьцяўляюць сумесную дзейнасьць.

Унутры існуючага ЭЗ пачала паўставаць група краінаў, якія ажыцьцяўляюць «паглыбленую каапэрацыю» ў сфэры абароны і вонкавай палітыкі, што стала вынікам ангельска-французкай ініцыятывы ў Сэн-Малё сьнежня 1998 году, якую цьвёрда падтрымалі Нямеччына і Бэльгія. ЭЗ ажыцьцяўляе падрыхтоўку корпусу міратворцаў колькасьцю 7500 чалавек і 60-тысячных сілаў хуткага рэагаваньня, у чым не бяруць удзелу нэўтральныя краіны ЭЗ, Аўстрыя і Ірляндыя. Намер палягае ў тым, каб дабіцца сур'ёзнага эўрапейскага палітычнага і вайсковага

ўплыву на міжнародныя справы, дамагчыся тае ролі, якую мелі ў мінулым большасьць чальцоў гэтай групы колішніх вялікіх дзяржаваў.

Такой Эўропы хоча Францыя. Гэты плян сутыкаецца з апазыцыяй і кпінамі ў Вашынгтоне і штаб-кватэры НАТО. Нікалас Бёрнз, памочнік дзяржсакратара ЗША і колішні пасол пры НАТО, падчас канфэрэнцыі НАТО ў Швэцыі 25 траўня сёлета наўпрост заявіў: «Будзем шчырымі. Шырокамаштабныя вайсковыя апэрацыі – гэта прэрагатыва НАТО» (ці дакладней, мяркуецца, што іх пад кіраўніцтвам ЗША будуць ажыцьцяўляць кааліцыі, складзеныя зь сяброў НАТО і іншых краінаў). ЭЗ, працягваў ён, праводзіць міратворчыя апэрацыі. «Інакш, – папярэдзіў ён, – будуць церці, і вы (маюцца на ўвазе эўрапейцы. – **У.П.**) радыя гэтаму ня будзеце».

Аднак абавязак ператварыць Эўропу ў дыпляматычную і стратэгічную сілу сусьветнага маштабу быў увасоблены ў канстытуцыі і, бясспрэчна, пражыве яе скон, бо ён таксама сьцьвярджае нацыянальную або супольнасную (communitarian) незалежнасьць і магутнасьць. Таму сумнеўна, што ад яго адмовяцца ў доўгатэрміновай пэрспэктыве.

Афіцыйная амэрыканская пазыцыя, паўтораная некалькі разоў падчас і пасьля французскага і нідэрляндзкага галасаваньняў, палягае ў тым, што Злучаныя Штаты хацелі б бачыць «моцную і задзіночаную Эўропу». Драматычныя вынікі французскага галасаваньня спачатку выклікалі радасьць у пэўных нэакансэрватыўных колах, але адміністрацыя Буша цяпер хоча добрых стасункаў нават з «старымі» эўрапейцамі і мае свае ўласныя прыярытэты для ЭЗ. Яна зьвяртаецца па эўрапейскую дапамогу ў Аўганістане і Іраку, у перамовах з Іранам, дабіваецца падтрымкі сваіх магчымых захадаў што да палестынскай дзяржавы.

Мэйнстрым амэрыканскага замежнапалітычнага істэблішмэнту даўно хоча цесных адносінаў паміж Эўразьвязам ды Вашынгтонам, і некаторыя амэрыканцы чакаюць, што ЭЗ урэшце стане палітычным спарынг-партнэрам НАТО ў трансатлянтычных дачыненьнях Амэрыкі. Гэта, рэч ясная, прадугледжвае амэрыканскае лідэрства і зьяўляецца часткай

шырэйшае канцэпцыі сусьветнага «дэмакратычнага» альянсу. Чаго Вашынгтон ня хоча, дык гэта Эўропы, якая імкнецца стаць процівагай магутнасьці ЗША альбо цэнтрам сілы ў шматпалярнай геапалітычнай структуры. Гэта можа стаць «дарогай да вайны», перасьцерагла некалі Кандаліза Райс.

Таму Вашынгтон вітае эўрапейскую крызу, якая часова аслабляе французскія пазыцыі ў Эўропе і ўмацоўвае Тоні Блэра, і не вітае Эўропы, закрытай для Турэччыны альбо новых чальцоў зь ліку постсавецкіх краінаў. Для адміністрацыі ЗША Эўропа з уласнымі палітычнымі і стратэгічнымі амбіцыямі непрымальная. Тым ня менш, відаць, акурат такой будзе Эўропа, што перажыве правальную авантуру з канстытуцыяй.

15 чэрвеня 2005 году

З амэрыканскай пераклаў Сяргей Богдан
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/07
[image]

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ
палітолаг, доктар PhD універсытэту Ратгерса (ЗША).

Віталь Сіліцкі Недапісаная гісторыя, неканчатковы дыягназ

Федута Александр. *Лукашенко. Политическая биография*. - Москва: Референдум, 2005.

З заўважнай перыядычнасцю пачалі з’яўляцца ў Беларусі палітычныя мемуары, якія сумяшчаюць пераасэнсаванне апошняга дзесяцігоддзя і спробу аўтара «выспаведацца на зададзеную тэму». Хтосьці робіць «працу над памылкамі», хтосьці спрабуе растлумачыць астатнім, якія яны ўсе дурні, іншыя проста імкнуцца, кажучы па-расейску, «излить душу». Аляксандр Лукашэнка так ці інакш робіцца героем любога апавядання ці аналізу пра сучасную Беларусь, нават калі гутарка не пра Лукашэнку. Аўтар рэцэнзіі неяк напісаў артыкул пра генерала Фралова. Дык пры падліку высветлілася, што прозвішча Фралоў у ім згадвалася 52 разы, а Лукашэнка – 30. Як з тым помнікам Пушкіну ў застойныя часы: білася-білася камісія, але не вырашыла, ці паставіць Аляксандра Сяргеевіча з «Малой зямлёй» у руках, ці Леаніда Ільіча з «Яўгенам Анегіным»... Пры любым стаўленні да аўтара і твору, кніга Аляксандра Фядуты «Лукашэнка: палітычная біяграфія» – гэта праца зусім іншага маштабу. І справа не толькі ў памеры, але і ў мэтах, якія ставіў перад сабой аўтар. Прэзентуючы нядаўна

Беларусь». У апошнім нумары «ARCHE» былі апублікаваныя яго два артыкулы – «Сьцеражыся народу» і «Страшная будучыня
прысьвечаная онлайн-канфэрэнцыя газэты «Вашынгтон Пост» «Фарпосты тыраніі:
ці сугероем

свой твор у Вільні, спадар Фядута заявіў, што Лукашэнка «гэта сімптом сур'ёзнай хваробы, і я спадзяюся, што мая кніга дапаможа нашаму народу яе вылечыць». Не ведаю, як народу: дзесяцітысячны наклад, як паказвае практыка, хутчэй за ўсё, будзе часткова сканфіскаваны, часткова разыдзецца па тых, хто Аляксандра Рыгоравіча і так не надта любіць, на электарат амаль нічога і не застаецца. У лепшым выпадку, такія творы спрыяюць выпрацоўцы імунітэту ад мінулага ў будучых пакаленняў. Хочацца спадзявацца, што ён выпрацуецца. А тое, што кніга дойдзе да чытача будучыні – я не сумняваюся.

Паколькі твор напісаны на мове міжнацыянальных зносінаў узору 1990–1995 гг., пераказваць яго няма сэнсу: лепш самому прачытаць. Таксама не буду раскладваць твор «па костачках» і палемізаваць са спадаром Фядутам па кожным пункце, дзе яго меркаванні ці інтэрпрэтацыі выклікаюць жаданне паспрачацца. Урэшце, гэта вядомая чытачу фігура, ягоныя погляды на беларускую палітыку, нацыянальныя і моўныя пытанні вядомыя. Як кажуць, Фядута ведае, што я магу яму сказаць, а я – што ён мне можа адказаць. Пра сваіх «суўдзельнікаў» неаўтарызаваны біёграф Лукашэнкі ведае больш, чым я, калі ніхто, як некалі, не пачне пагражаць біццём морды, значыць, напісана праўда. Замест гэтага, выкажу некалькі сваіх заўваг.

Кнігу Фядуты цяжка аднесці да пэўнага жанру. Гэта не паліталагічны аналіз: ва ўсякім выпадку, апавядання ў ім нашмат больш, чым аналізу. Некаторыя часткі, такія, як восем прыказанняў ад Лукашэнкі, выглядаюць, хутчэй, як агітка, нават калі з імі цалкам пагаджаешся. Гэта і не падручнік па найноўшай гісторыі Беларусі, хаця б таму, што кропку ў гэтай гісторыі ставіць, на жаль, яшчэ рана. Гэта толькі часткова, прыкладна на траціну, палітычны мемуар: большую частку гістарычнага адрэзку, які асвятляецца ў кнізе, спадар Фядута прабыў амаль такім жа назіральнікам, як і большасць чытачоў – у абсалютнай манархіі амаль усе роўныя. (Дарэчы, частка кнігі, якая асвятляе далукашэнкаўскі і ранні лукашэнкаўскі перыяд, мне падалася найбольш цікавай – у адрозненне ад амаль усёй іншай літаратуры, якая не ўтрымоўвае амаль нічога, пра што няможна было б за дзесяць гадоў прачытаць у перыядычным друку, там сапраўды ёсць шмат чаго цікавага. Мяне асабіста

ўразіла, як і, самае галоўнае, калі пачаў Аляксандр Рыгоравіч планаваць свой паход па прэзідэнцтва: як высвятляецца, яшчэ тады, калі яго зусім у праекце не было. Паспяховыя палітыкі, у адрозненне ад генералаў і нашых апазіцыянераў, заўжды рыхтуюцца да будучых, а не прамінулых баталій...) Гэта, нарэшце, нават і не зусім тое, што заяўлена ў назве – палітычная біяграфія самаго Лукашэнкі: гісторыя распарадзілася так, што размаўляць пра Лукашэнку і не размаўляць пра Беларусь, альбо наадварот, ужо амаль немагчыма: хіба што аб прагнозе надвор'я, дый тое самі ведаеце, хто ў нас дае дождж.

Кніга – гэта ў пэўнай ступені і палітычны аналіз, і асабістая споведзь, і падручнік па гісторыі, і біяграфія, і нават аўтабіяграфія. З пункту гледжання палітолага, варта адзначыць багаты матэрыял і рознабаковае адлюстраванне таго, што адбылося ў краіне за апошнія дзесяцігоддзі. Яны здольныя зрабіць твор абавязковым чытаннем для кожнага, хто цікавіцца Беларуссю і праблематыкай аўтарытарызму. І гэта пры тым, што аўтар абраў зусім не паліталагічны кампазіцыйны прыём: замест разваг, чаму гэта здарылася, ён проста паказвае, як гэта было, правакуючы чытача на ўласныя разважанні. На маю думку, нашмат больш паспяховы прыём, чым спробы сенсацыйнага выкрыцця рэжыму Лукашэнкі на аснове «смажаных» фактаў альбо яго прэзэнтацыі ў таблоідна-парнаграфічным стылі (я цалкам згодны, напрыклад, з думкай спадарыні Пяткевіч, колішняга прэсавага сакратара Лукашэнкі, што кніга «Нашэсце» – гэта палітычная парнаграфія: іншая справа, што існуе вядомая прыказка пра люстэрка і самі ведаеце, што). Афіцыёз ужо зміфалагізаваў найноўшую гісторыю не менш, чым Абэцэдарскі з Трашчанком – старажытнасць. Варта ўзгадаць хаця б серыял, які так і называўся – «Найноўшая гісторыя». Міф – канструкцыя трывалая, і лагічнымі аргументамі ці сцвярджэннямі, што «ўсё гэта не так», нават падмацаванымі тэчкамі Антончыка і Алкаева, яго перабіць немагчыма. Чалавеку гадамі можна распавядаць, што ў каўбасе дадаткі і нітраты, але пакуль яна прымальна каштуе і пакупнік не патруціцца ёй – ён і надалей яе будзе купляць і есці. Нават калі і патруціцца – пяройдзе на іншы гатунак. (Так і ў жыцці – ты ім пра Ганчара, «Таргэкспа» і

ЕГУ, яны табе – пра зарплату 200 долараў, пенсіі і стабільнасць.) Іншая справа – завесці на мясакамбінат і паказаць, як і з чаго гэта робіцца: вегетарыянства забяспечана. Дык вось, кніга Фядуты – гэта ў пэўным сэнсе альтэрнатыўная афіцыйнай «найноўшай гісторыі» экскурсія на мясакамбінат беларускай палітыкі, як «шуш-кебічаўскага», так і лукашэнкаўскага перыяду. Ванітаваць хочацца. Магчыма, і гэта самае важнае, праз некаторы час тыя самыя пачуцці твор выкліча, калі дойдзе і да новага пакалення беларусаў, якім ідэалагічная машына распавядзе і пра барацьбу з карупцыяй, і пра тое, як расейцаў на чамаданы садзілі, і пра многае іншае. З сённяшнімі тэхнічнымі і інфармацыйнымі магчымасцямі захаваць і данесці напісанае да чытача лягчэй, чым за савецкім часам. Вядома, не «Архіпелаг Гулаг» Салжаніцына, ад якога сканаў камуністычны рэжым, аднак усё роўна ўражвае.

Зазначым яшчэ адзін цікавы прыём: аўтар распавядае пра Лукашэнку і Беларусь не зусім сам, а з дапамогай сваіх шматлікіх суразмоўцаў, некаторыя з іх калісьці выказваліся аб Фядуту ненарматыўнай лексікай альбо пагражалі пэўнымі фізічнымі дзеяннямі несяброўскага характару. Такім чынам, гэта амаль што калектыўны твор, супольная рэфлексія, у якой аўтар часам – толькі keynote speaker і мадэратар. У чымсьці такі падыход лагічны: біяграфія Лукашэнкі вартая калектыўнай творчасці хаця б таму, што ён сам, з папраўкай на ўласныя таленты – гэта калектыўная творчасць беларусаў, простых і вядомых, «электарату» і «эліты»... Некаторыя з меркаванняў і каментароў, выказаныя суразмоўцамі, выглядаюць нашмат больш катэгарычнымі, чым аўтарскія – ці не падстрахоўка гэта ад магчымых непрыемнасцяў? Можа, і не. Урэшце, гісторыю рабіў не адзін Фядута. Дарэчы, уражвае шчырасць, з якой ён распавядае пра свае, скажам так, не вельмі ўзвышаныя матывы далучэння да каманды Лукашэнкі ў 1994 г. Каб і іншыя так – а то ад астатніх дагэтуль даводзіцца чуць, што ў беларускага лідэра быў «гістарычны шанец», які ён нібыта «змарнаваў». Якая была верагоднасць таго, што Лукашэнка захацеў бы скарыстацца гэтым шанцам?

Цяпер пра галоўнае. А галоўным у нас застаецца Лукашэнка, і спадар Фядута тлумачыць, чаму, хутчэй за ўсё, ён застанецца

надоўга. Фядута дае трапнае азначэнне базавага стану беларускай рэчаіснасці: беларускаму прэзідэнту ўдалося калі не спыніць, дык, прынамсі, замарудзіць бег часу. І тут асабліва не паспрачаешся. Фядута таксама абараняе сваю тэзу, якую ён выказаў насуперак яшчэ адной вядомай кніжцы пра Лукашэнку: гэта – зусім не «выпадковы прэзідэнт». Гісторыя жыцця Лукашэнкі – гэта сапраўды гісторыя нават не постсавецкай, а паваеннай Беларусі: з галечай і безбацькоўшчынай амаль цэлага пакалення, з індустрыялізацыяй, меліярацыяй і русіфікацыяй, што перарабіла цэлы народ на савецкі капыл, з калгасамі і таварыствамі ведаў, з Чарнобылем і перабудовай, з дэзарыентацыяй першых гадоў незалежнасці, з падазронасцю да ўсяго беларускага, з ціхай нянавісцю да начальства і патаемным жаданнем чаркі ды скваркі. Вядома, палітолагі могуць паспрачацца: адным народам узнікненне палітычнага рэжыму растлумачыць нельга. Аднак Фядута некалькімі штрыхамі прымушае задумацца, наколькі ўсё ж такі Лукашэнка сапраўды народны прэзідэнт. Адзін такі штрых – стыль ягоных публічных прамоваў: Лукашэнка «закідвае» ў аўдыторыю ідэю і сочыць за рэакцыяй. Калі рэакцыя станоўчая, ён яе раскручвае, як кажуць, на поўную катушку. Яшчэ адзін – перадвыбарчыя мітынгі 1994 г. Сотні людзей цягнуцца да свайго куміра, як калісьці цягнуліся да Чумака і Кашпіроўскага, бяруць аўтографы на стадоларавай банкноце ў паўжабрацкай тады Беларусі. Нарэшце, партрэт Лукашэнкі, які павесіла нейкая беларуская бабця побач з абразом пасля рэферэндуму 1996 году... Колькі б яго ні называлі цыганом ці расейскім шпіёнам, Лукашэнка – гэта костка ад косткі *гэтай* Беларусі. Ягонае адрозненне ад колішніх і цяперашніх апанентаў у тым, што Лукашэнка змог разгледзець і выкарыстаць тыя рысы і памкненні беларусаў, якія палітычныя і культурныя эліты звычайна мусяць згладжваць і кантраляваць. Тое, што іншымі вызначалася як дрэнна, Лукашэнка ўхваліў сваімі прамовамі і дзеяннямі (уявіце сабе, калі б бацькі ў дзяцінстве казалі вам, што грызці пазногці – гэта добра). Прыняўшы народ такім, якім ён ёсць, пазбавіўшы яго ад комплексаў, Лукашэнка выкарыстоўваў найбольш прымітыўныя, нават нізкія памкненні і рысы сваіх суродзічаў без аніякіх інтэлектуальных хістанняў і комплексаў. Колішнія паплечнікі разгледзелі толькі Лукашэнку, але не здолелі зразумець, што для іх нясе такі

прэзідэнт у такім народзе. Там, дзе Лукашэнка не быў падобны да народу, ён перарабляў яго. Няздольнасць шмат каго ў апазіцыйных і інтэлектуальных колах разгледзець, як кажа Фядута, «удручающую масштабность фигуры Лукашенко» можна аднесці на тое, што падаецца прымітывізмам яго асобы і метадаў кіравання краінай. Сапраўды, ва ўспрыманні шмат каго Лукашэнка так і застаўся дырэктарам саўгаса. Магчыма, гэта і правільная думка, ад якой, дарэчы, не адмовіцца і сам Лукашэнка (здаецца, калісьці ён сам сказаў, што краінай можна кіраваць, як вялікім калгасам, справакаваўшы дружнае «фэ» з боку беларускай «эліты»). Але ў гэтым прымітывізме і калгаснасці і ёсць сапраўдная сіла Лукашэнкі. Ёсць рэчы, якія для элітнага, проста выхаванага чалавека – маветон, іх рабіць няможна таму, бо няможна. Не для гэтага прэзідэнта! Для астатніх маветонам было ўжо тое, што дырэктар саўгаса папёрся ў прэзыдэнты. Маветонам была змена сімволікі, нацыяналізацыя банкаў, закрыццё газет... Шмат хто верыў у хуткае падзенне Лукашэнкі проста таму, што быў перакананы, што так кіраваць нельга, бо гэтак ніхто не кіруе. Аднак такіх комплексаў быў пазбаўлены не толькі герой біяграфіі, але і большасць тых, кім ён кіруе. Больш за тое, прымітыўная палітыка прымітывізавала і краіну, і грамадства, і цяпер Лукашэнка і той «клочок земли», якім ён кіруе, усё больш нагадваюць адзін аднаго.

Аднак, здаецца, акрамя апісання «гісторыі хваробы», кніга мае яшчэ адну мэту. У аўтара гэтых радкоў склалася ўражанне, што спадар Фядута мімаходзь, неяк спакваля, спрабуе хаця б часткова зняць адказнасць з сябе і цэлай генерацыі палітыкаў за суўдзел у стварэнні Лукашэнкі. Гісторыя 1991–1994 гг. апісана такім чынам, нібы будучы прэзідэнт Беларусі зрабіў амаль што ўсё сам. Нейкая істотная роля «каманды» прагледжваецца толькі ў вылучэнні Лукашэнкі на пасаду старшыні антыкарупцыйнай камісіі (лаўры адышлі Лябедзьку, які прапанаваў гэтую кандыдатуру Шушкевічу), у зніжэнні ўзроставага цэнзу для кандыдатаў на прэзідэнта да 35 гадоў (героі – Лябедзька і Ганчар), у зборы подпісаў (галоўныя лаўрэаты – Уладзімір і Ала Канаплёвы), ну і, магчыма, у кіраўніцтве кампаніяй (Леанід Сініцын). Астатнія, са спадаром Фядутам улучна, амаль што простыя фігуранты. Дарэчы, пры

канцы кнігі Фядута прыводзіць характэрны абмен думкамі са спадаром Сініцыным, былым кіраўніком прэзідэнцкай адміністрацыі, дзе той папракае аўтара за тое, што ў кнізе ён не адлюстраваў «ролю каманды» (амаль як Фадзееў, які мусіў на загад Сталіна перапісваць «Маладую гвардыю», каб адлюстраваць ролю партыі). Каманду Фядута адлюстраваў падрабязна, а вось ролю... нават калі яна была і большай, чым напісаў Фядута... У гэтай спрэчцы – адлюстраванне дробнага апартунізму і недальнабачнасці ўсіх лукашэнкаўскіх паплечнікаў – нават праз дзесяць гадоў. Сініцын так і не дацяміў, што Фядута забяспечвае і яму, і сабе дый іншым гістарычную індульгенцыю. Зазначу, што тэза аб тым, што Лукашэнка стварыў сам сябе, а не быў узведзены на трон апушчанымі ніжэй калена маладымі ваўкамі, Фядутам даказана пераканаўча. Аднак справа не ў гэтым – праяўленая спадаром Сініцыным пыха яшчэ мацней пацвярджае, што Лукашэнка – гэта зусім не выпадкова. І сапраўды, якая там роля каманды ў параўнанні з рукамі, якія цягнуліся да Лукашэнкі часам яго перадвыбарных мітынгаў і тым самым партрэтам у бабчыным пакоі...

Дыягназу беларускай хваробы Фядута так канчаткова і не сфармуляваў: здаецца, кожнаму чытачу належыць вызначыць яго для сябе самога. Хтосьці задасца пытаннем, «хто вінаваты», і ў залежнасці ад поглядаў, абвінаваціць ва ўсім наменклатуру, колішніх «маладых ваўкоў», БНФ, Шушкевіча, Кебіча, самога Фядуту, тых, хто ненавідзіць Фядуту, Расею, Захад, тых, хто ненавідзіць Расею альбо Захад і г. д. Хтосьці спытаецца, а што, нарэшце, рабіць. І тут Фядута маўчыць. Таксама, як і народ «безмолвствует». Пушкіназнаўца ўсё ж такі з Аляксандра Язэпавіча так і прэ. Апошнія радкі твору – апісанне сумнавядомай тэлевізійнай аб'явы пра рэферэндум мінулым годам. Зэяючы правадыр на вяршыні сваёй велічы ў экране на Кастрычніцкай плошчы, – і маўклівы, апушчаны натоўп. Амаль як у класіка – за маленькім выключэннем, якое зрабіў адзін крык «ганьба» на той плошчы ў той дзень. Такі вось папрок усім – тым, хто не выйшаў, не крыкнуў, не зганьбіў. Ад таго, хто сам не выходзіць, не ганьбіць і не крычыць. Ветэраны мітынгаў і пікетаў, жыхары хіміяў і старажылы Валадаркі і Акрэсціна могуць, вядома, выказаць спадару Фядуту ўсё, што

яны пра яго думаюць. Але, калі ласка, без мардабою. Усё ж такі напісаць неаўтарызаваную біяграфію Лукашэнкі сёння патрабуе не меншай мужнасці, чым выхад на плошчу.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 4 (38) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/07
[image]

НЕРЫЮС ПРЭКЯВІЧУС
палітолаг, супрацоўнік Стакгольмскага ўнівэрсытэту Sqdertqrn. Яго апошні аналіз у «ARCHE» называўся «Як Лукашэнка апраўдвае рэфэрэндум і свой рэжым» (5/2004).

Нерыюс Прэкявічус
Дыскурс прапаганды газэты «Советская Белоруссия»

Гэты артыкул прысьвечаны аналізу дзяржаўнай газэты «Советская Белоруссия», і ў ім разглядаецца яе зьмест і стыль. Ён пакліканы паказаць, як пры дапамозе моўных сродкаў у гэтым выданьні асьвятляюцца розныя палітычныя працэсы й характарызуецца палітыка беларускіх уладаў.

Я цьвёрда перакананы, што тэксты зазвычай гавораць самі за сябе, таму мае камэнтары прывязаныя да сьцьверджаньняў, якія можна знайсьці ў самой газэце. Каб ажыцьцявіць аналіз, я выбраў артыкулы, апублікаваныя прыблізна цягам аднаго месяца – з 20 траўня да 21 чэрвеня 2005 г. Да таго ж, я выбраў толькі тыя артыкулы, якія былі выстаўленыя ў рубрыцы «Палітыка» самой рэдакцыяй «Советской Белоруссии» (далей «СБ») у інтэрнэт-вэрсіі выданьня. Гэта дало мне 36 артыкулаў для аналізу. Той факт, што ня ўсім артыкулам была нададзена належная ўвага, тлумачыцца, хутчэй, рознай ступеньню іх інфармацыйнай насычанасьці ды каштоўнасьці, чым маімі асабістымі прыхільнасьцямі.

АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ

Напачатку будзе карысна даць агульнае ўяўленьне пра артыкулы. Дзеля гэтага я выкарыстоўваю пяць крытэраў: час, аўтар, матыў публікацыі артыкулу, геаграфічная прывязка і стыль матэрыялу. Гэтыя крытэры я патлумачу падчас іх далейшага разгляду. На падставе такой малой колькасьці матэрыялу немагчыма зрабіць далёкасяжных высноваў, таму мы зьвернем увагу нават на дробныя дэталі.

Калёнка з датамі публікацыяў паказвае, што такія артыкулы друкуюцца нерэгулярна: у некаторыя дні іх няма наагул (у нядзелі і панядзелкі, калі газэта не выходзіць, пара суботаў і чацьвяргоў). У іншыя ж дні іх колькасьць можа дасягаць чатырох штук за нумар. Таму, відавочна, артыкулы ёсьць рэакцыяй на бягучыя падзеі. Я пашкадаваў часу на аналіз пытаньня аўтарства артыкулаў. Калі дапусьціць, што яно сапраўднае, мы ўбачым, што ў «СБ» адзін асноўны міжнародны аглядальнік – Ігар Кольчанка, які напісаў 15 артыкулаў з 36. Ён спэцыялізуецца на эўразьвязаўскай ды іншай міжнароднай праблематыцы. (Гэткая спэцыялізацыя даволі адносная.) Таксама ў «СБ» працуюць яшчэ два сталыя аглядальнікі з падобнымі інтарэсамі – Павал Мацукевіч (чатыры артыкулы ў траўні) ды Ігар Славінскі (чатыры артыкулы ў чэрвені). Анатоль Нязванаў напісаў тры пазытыўныя артыкулы на важныя тэмы ўнутранай беларускай палітыкі (рэгістрацыя партыяў і чэкі). Дзьмітры Крат зрабіў тое самае ў двух артыкулах, абмяркоўваючы курсы абмену валютаў і робячы справаздачу пра візыт кітайскіх афіцыйных асобаў у Беларусь. Іншыя журналісты напісалі па адным артыкуле. У двух матэрыялах аўтарства не было пазначанае.

Выкарыстаны мною тэрмін «прычына публікацыі», а таксама яго вызначэньне выглядаюць, магчыма, у гэтым аглядзе малаўцямнымі. Асноўная ідэя палягае ў тым, што перадумовы напісаньня тэксту можна выявіць, дасьледуючы крыніцы, ужытыя ў тэксьце. У прааналізаваных артыкулах можна вызначыць тры асноўныя групы прычынаў публікацыяў: 1) падзеі; 2) публічныя заявы, перададзеныя інфармацыйнымі агенцыямі ці ўзятыя зь іншых крыніцаў; 3) простыя пазычаньні зь іншых пэрыядычных выданьняў. Даволі цяжка вызначыць

першакрыніцы кожнага артыкулу (дзеля гэтага спатрэбіліся б паасобныя дасьледзіны кожнага тэксту), аднак можна пабачыць, што 15 артыкулаў былі водгукамі на публікацыі ў іншых газэтах. Беручы пад увагу лібэральныя стандарты цытаваньня ў СМІ (асабліва ўва Ўсходняй Эўропе) і глыбей разглядаючы артыкулы, якія нібыта былі інсьпіраваныя пэўнымі падзеямі ці публічнымі заявамі, нават у іх можна выявіць значную колькасьць пазычаньняў зь іншых СМІ. Падсумоўваючы сказанае, трэба зазначыць, што журналісты «СБ» часта будуюць свае артыкулы на падставе зьвестак, узятых у сваіх калегаў. Гэта пацьвярджае адносна нізкі ўзровень кваліфікацыі аглядальнікаў – адзін журналіст ня можа мець глыбокіх ведаў пра такую вялікую колькасьць краінаў і валодаць такой вялікай колькасьцю замежных моваў. Дарма што я праверыў цытаты толькі ў некаторых артыкулах, агульная тэндэнцыя падаецца наступнай: заходняя прэса трапляе да чытачоў «СБ» праз расейскія крыніцы. Акрамя таго, журналісты вельмі рэдка карысталіся аналітычнымі матэрыяламі (мабыць, таксама з прычыны нізкага ўзроўню сваёй кваліфікацыі).

СТЫЛЬ І ЛЁГІКА

Стыль артыкулу – трохі складанейшы крытэр. Робячы гэты аналіз, я, у прыватнасьці, цікавіўся двума момантамі: эмацыйнай афарбоўкай артыкулаў і ступеньню вольнай інтэрпрэтацыі фактаў з боку аўтараў тэкстаў.

Прапаганда традыцыйна апэлюе да эмоцыяў чытача. Рацыянальныя аргумэнты прадугледжваюць і стымулююць незалежнасьць думкі, таму яны маюць малую вартасьць для агітатара. На жаль, аналізаваць эмацыйныя аспэкты даволі складана. Нягледзячы на частыя абвінавачаньні СМІ ў тым, што яны аддаюць перавагу асьвятленьню нэгатыўных зьяваў, эмацыйны тон артыкулу можна высьветліць, толькі ўзяўшы пад увагу яго зьмест. Яшчэ адну складанасьць стварае размаітасьць магчымых эмоцыяў, якія наўрад ці паддаюцца пэўнай клясыфікацыі.

З улікам гэтага я паспрабаваў-такі прааналізаваць адабраныя

артыкулы пад такім ракурсам. Пачатковы этап аналізу дазволіў вылучыць наступныя дамінантныя стылістычныя прыёмы: 1) нэгатыўныя ці «апакаліптычныя» прагнозы («…это имя в списке жертв не будет последним...»); 2) сарказм (*«…новая национальная забава киргизов: возьми «белый дом» силой…»*); 3) адмоўныя характарыстыкі (*«Разгул терроризма уравнял всех»*); 4) нэўтральна афарбаваныя сьцьверджаньні (*«…Президент заявил, что в России не должны приватизироваться леса…»*); 5) абарончыя аргумэнты (*«…они как свободно ездили друг к другу в гости, так и будут продолжать ездить…»*); 6) дадатныя характарыстыкі (*«…значительные перемены к лучшему для него особенно очевидны…»*); 7) пазытыўныя ці «ўтапічныя» прагнозы (*«…Беларусь получит доступ к передовым западным технологиям…»*).

У большасьці артыкулаў выкарыстоўваліся зьмяшаныя прыёмы, таму, каб атрымаць вынік, мне давялося крыху спрасьціць клясыфікацыю. Нэўтральныя выказваньні, якія складаюць аснову любога звычайнага тэксту, у артыкулах з «СБ» адыходзілі на другі плян пад уплывам іншых стылістычных прыёмаў. Мною былі выяўленыя толькі два артыкулы, якія можна аднесьці да эмацыйна нэўтральных рэпартажаў (прэсавая канфэрэнцыя Ўладзімера Пуціна і абмеркаваньне экалягічных праблемаў). Першы артыкул уяўляе зь сябе адмысловы выпадак ува ўсёй выбарцы – працытаваныя словы расейскага прэзыдэнта былі пададзеныя безь якіх-колечы камэнтароў (хоць тэкставы адбор меў месца). Другі артыкул падаў колькі ўзаемасупярэчлівых поглядаў. Шэсьць артыкулаў, прысьвечаных унутрыпалітычным пытаньням ці пытаньням беларуска-расейскай інтэграцыі, утрымлівалі пазытыўна афарбаваныя паведамленьні ці прагнозы. Васямнаццаць артыкулаў мелі нэгатыўную афарбоўку і, у асноўным, тычыліся падзеяў у ЭЗ і замежнай палітыкі ЗША. У дзевяцёх артыкулах, разам з адмоўна афарбаванымі паведамленьнямі ці нэгатыўнымі прагнозамі, быў выкарыстаны сарказм, у асноўным, у дачыненьні да краінаў СНД, у якіх нядаўна адбылася зьмена рэжыму. Абарончыя аргумэнты часта прысутнічалі падчас разгляду пытаньняў, датычных Беларусі, аднак выкарыстоўваліся ў спалучэньні зь іншымі тыпамі аргумэнтаў.

Другі зьвязаны са стылем аспэкт закранае найважнейшую праблему сродкаў масавай інфармацыі – журналісты часьцей навязваюць свой пункт гледжаньня (напрыклад, *«учитывая, как все начиналось, не мудрено»*) замест таго, каб паведамляць аўдыторыі ўсебаковую інфармацыю. У гэтым артыкуле я называю падобную пазыцыю «дыдактычнай». Вядома, нават калі журналіст карэктна асьвятляе факты, іх падбор можа быць тэндэнцыйны (як і ў бальшыні разгледжаных артыкулаў). Аднак дыдактычныя выказваньні на розныя тэмы часам даходзяць да абсурду.

У якасьці прыкладу разгледзім артыкул пра чалавека, які перадаў у «Вашынгтон Пост» сакрэтную інфармацыю падчас «Уотэргейцкага скандалу». Вось заява беларускага журналіста: *«что делают «глубокие глотки» (так, я думаю, отныне нарицательно будут называть сотрудников вездесущих американских спецслужб)…»*. На якой падставе аўтар вызначае будучае ўжываньне мэтафары «глыбокія глоткі»? Ці будзе яна выкарыстоўвацца ўва сусьветных СМІ, амэрыканскіх і беларускіх? Дакладна сказаць, што пэўная мэтафара будзе выкарыстоўвацца, могуць толькі тыя, хто зьбіраецца яе выкарыстоўваць. Яшчэ адно пытаньне: ці ўсюдыіснасьць амэрыканскіх спэцслужбаў – гэта характарыстыка, якую можна рэальна спраўдзіць, напрыклад, паказваючы, у які момант яны сталі ўсюдыісныя, ці гэта такая сабе этыкетка накшталт «Вялікая Кастрычніцкая»?

Можна сказаць, што гэта ўсяго толькі аўтарская думка, чаго ніхто і не хавае. На жаль, дыдактычныя цьверджаньні маюць схільнасьць намнажацца і ствараць у чытачоў агульную карціну сьвету. Больш за тое, яны падмяняюць рэальныя факты квазілягічнымі ланцужкамі. Вось, напрыклад: *«Кстати, то, что Джордж Буш затеял многочисленные и многоходовые перестройки спецслужб, вплоть до создания аналога НКВД СССР 30-х годов – министерства внутренней безопасности, наталкивает на мысль, что «глубокие глотки» могут появиться вскоре даже в спальнях рядовых американцев»*. Я ня бачу тут ніякай аргумэнтацыі. Гэта – усяго толькі ланцужок асацыяцыяў, у якім бракуе некаторых зьвёнаў: адміністрацыя Джорджа Буша стварыла Дэпартамэнт нацыянальнае бясьпекі з мэтай

паляпшэньня каардынацыі дзеяньняў спэцслужбаў – Дэпартамэнт нацыянальнае бясьпекі займаецца пытаньнямі ўнутранае бясьпекі – НКВД займаўся пытаньнямі ўнутранае бясьпекі – НКВД быў рэпрэсіўнай арганізацыяй, якая ўмешвалася ў асабістае жыцьцё людзей – Дэпартамэнт нацыянальнае бясьпекі таксама будзе ўмешвацца ў асабістае жыцьцё людзей.

У Дэпартамэнце нацыянальнае бясьпекі працуюць 180 000 чалавек. У сфэру яго кампэтэнцыі ўваходзіць ахова дзяржаўнай мяжы, іміграцыйныя праблемы, надзвычайныя сытуацыі (ці грамадзянская абарона), бясьпека палітычага кіраўніцтва краіны і абарона яе інфраструктуры, а таксама контравыведка. Апошняя задача ажыцьцяўляецца сумесна зь іншымі органамі (напрыклад, ФБР). Зважаючы на тое, што насельніцтва ЗША складае цяпер больш за 296 мільёнаў, на аднога супрацоўніка Аддзелу нацыянальнае бясьпекі прыпадае 1647 грамадзянаў ЗША. Перапіс насельніцтва 1937 г. у СССР (зьвесткі перапісу 1939 г. ненадзейныя) выявіў 162 мільёны жыхароў краіны. Калі абапірацца на гэтую прапорцыю, вынікае, што НКВД павінен быў налічваць 98 тысяч супрацоўнікаў. Але ў 1941 г. толькі памежнікаў у СССР было 168,2 тысячы! Зацікаўленыя могуць пераправерыць мае падлікі і для Беларусі: згодна зь імі, беларускі адпаведнік Дэпартамэнту нацыянальнае бясьпекі павінен налічваць каля 5940 супрацоўнікаў.

У аналізаванай выбарцы толькі 10 артыкулаў можна вызначыць як інфармацыйныя. У асноўным, гэта артыкулы, прысьвечаныя Беларусі. Рэшта ж адносіцца да дыдактычных. Гэта нядзіўна, паколькі «СБ» зьяўляецца дзяржаўнай газэтай. Нават калі б журналісты імкнуліся аб'ектыўна асьвятляць падзеі, газэта б ім гэтага не дазволіла. Намеры ўжываньня дыдактычнага стылю вар'іруюцца ад асьветніцкіх мэтаў да грубай прапаганды. Пакідаю чытачам «ARCHE» самім вызначыць, у якім пункце гэтае градацыі знаходзіцца «СБ».

СВАЕ І ЧУЖЫЯ

Яшчэ адно цікавае пытаньне: якім краінам прысьвечаны артыкулы? За прааналізаваны пэрыяд геаграфічны фокус «СБ»

быў вельмі звужаны. Усяго толькі адзін артыкул быў прысьвечаны глябальным пытаньням (праблема забруджваньня паветра) і тычыўся ратыфікацыі Беларусьсю Кіёцкага пратаколу. Чатыры артыкулы былі прысьвечаныя Іраку. У яшчэ двух артыкулах былі з энтузіязмам апісаныя беларуска-кітайскія стасункі. Большая частка артыкулаў (трынаццаць) тычылася палітыкі краінаў Эўразьвязу (асабліва падкрэсьліваліся ўнутраныя рознагалосьсі і прадракаўся яго распад). Дзесяць артыкулаў (у асноўным, крытычных) тычыліся ЗША. У адзінаццаці гаворка ішла пра краіны СНД[1]: пяць артыкулаў пра Грузію, чатыры – пра Ўкраіну, чатыры – пра Кіргізію, два – пра Ўзбэкістан (падзеі ўва ўсіх гэтых краінах разглядаліся ў адмоўным рэчышчы), тры – пра Расею (выключна пазытыўныя). Дарма што ў шмат якіх артыкулах узгадвалася Беларусь, толькі тры зь іх тычыліся выключна беларускіх праблемаў, а ў сямі беларускія падзеі былі асноўнай тэмай.

Мэта артыкулаў, скіраваных супраць Эўрапейскага Зьвязу, зьніжэньне прывабнасьці яго пашырэньня. У асноўным артыкулы тычацца эканамічных і палітычных праблемаў ЭЗ. З гэтай мэтай пэўную долю праніклівасьці знаходзяць нават у заявах нацыяналістаў-ксэнафобаў.

Я плохо отношусь к националисту Ле Пену, но он был чертовски убедителен (проницателен или наблюдателен), когда пугал апокалиптической фигурой «польского сантехника Петра», который должен согласно евроконституции отобрать у честных французов последний евро на утренний круассан.

Некаторыя артыкулы падкрэсьліваюць, што ў іншых краінаў амаль няма шанцаў далучыцца да Эўразьвязу ў бліжэйшай будучыні (*«Референдум – это, конечно, ответ очередным претендентам на членскую карточку, той же Турции или Украине»*). Таксама аўтары «СБ» заяўляюць, што новым чальцам ЭЗ ня варта чакаць вялікае колькасьці эканамічных пераваг. (*«Никто ни с кем делиться просто так не будет»*). Гэтым краінам навешваюцца разнастайныя ярлыкі – *«новобранцы», «бедные родственники», «орава», «младоевропейцы», «придирчивы и навязчивы», «откупорщики заокеанских бутылок», «наглые*

[1] Некаторыя з гэтых артыкулаў ня ўключаем у гэтую рубрыку, бо ў адным і тым жа артыкуле гаворка мацла ісьці пра ўзаемаадносіны адразу некалькіх краінаў або закраналася адразу некалькі пытаньняў.

выскочки» і да т. п. Правалы ў ратыфікацыі эўрапейскай канстытуцыі разглядаюцца як доказ адсутнасьці народнай падтрымкі эўрапейскіх урадаў (*«Тем более позы политиков не являются консолидированным мнением всего населения»*). Нарэшце, шмат у якіх артыкулах адлюстраваная думка пра тое, што ЭЗ павінен адцягнуць увагу ад Беларусі. Гэтае жаданьне, што тыпова для «СБ», выражаецца як ужо наяўны факт: «Пока единой внешней политики ЕС, по крайней мере настолько единой, насколько декларируется, нет. Это касается и позиции в отношении Беларуси».

Падобная пазыцыя выкарыстоўваецца і пры асьвятленьні пытаньняў датычна ЗША. Журналісты «СБ» выкарыстоўваюць вайну ў Іраку і любую іншую падзею, каб прадэманстраваць, што ў ЗША няма маральнага права крытыкаваць беларускія ўлады (*«…разоблачить «культ личности» главного апологета прав человека по всему миру…»*). Антыпатыя да ЗША ў беларускай дзяржаўнай газэце даходзіць да ўзроўню тэорыяў змовы: «Не то чтобы в этот момент случился некий значительный перелом во внешней политике США. Есть ощущение, что американцы действуют по давно задуманному плану, а атака на небоскребы лишь скорректировала их действия в сторону большей агрессивности». На самай справе, верагоднасьць войнаў у Аўганістане ды Іраку была вельмі нізкай да гэтых тэрактаў. Ізноў-такі, усе сродкі прыдатныя, каб давесьці сваю правату, нават справаздачы «Amnesty International».

Зь іншага боку, кантакты з Кітаем апісваюцца ў ружовых фарбах – *«…Китай был и остается важнейшим стратегическим партнером Беларуси; …Беларусь оказалась в числе немногих избранных…»*. Падобны энтузіязм даходзіць да крайнасьцяў – *«Беларусь – надежный партнер и союзник КНР»*. (Калі гэтыя краіны падпісалі дамову пра саюзныя адносіны?) Адно з магчымых тлумачэньняў – беларускія ўлады адчуваюць сябе ў міжнароднай ізаляцыі. Гучныя заявы і гучныя пратэсты часьцяком выдаюць слабое месца прамоўцы. Таму, калі журналіст заяўляе, што большасьць сусьветных дзяржаваў (*«абсолютное большинство держав, которые принято называть мировыми центрами силы»*) зьяўляюцца стратэгічнымі

партнэрамі Беларусі, чытачу варта быць уважлівым. Бо, як высьвятляецца, абсалютная большасьць сусьветных цэнтраў сілы – гэта Расея, Кітай ды Індыя[2]. Больш за тое, ЗША – адзіная звышдзяржава ў сьвеце[3] – падтрымлівае зь Беларусьсю адносіны, якія складана назваць нармальнымі, і *«эта обособленность… говорит об искусственности и исключительной односторонности американской позиции, формирование которой отнюдь не зависит от белорусской стороны»*. Адным росчыркам пяра ЗША ператвараюцца ў тупалобага ізгоя міжнароднай палітыкі, у той час як Беларусь выступае ў ролі *«…полноправного и авторитетного члена мирового сообщества, но и как надежного, последовательного партнера…»*. Падобнае прыняцьце жаданага за сапраўднае тлумачыць інтарэсы Беларусі ў адносінах з Кітаем.

ПРАПАГАНДА ПОСЬПЕХАЎ І ГАРМОНІІ

Як я ўжо адзначаў, беларускія падзеі падаюцца пераважнай пазытыўным сьвятле і збольшага дыдактычна. Здаецца, журналісты крытычна выказваюцца наконт пэўных журналіста, міжнародных падзеяў (што патэнцыйна можа сапсаваць адносіны Беларусі зь іншымі краінамі), у той час як у падзеі ім даводзіцца асьвятляць у строгай адпаведнасьці з указаньнямі кіраўніцтва краіны.

У двух артыкулах абмяркоўвалася новаўведзенае патрабаваньне да палітычных партыяў і няўрадавых арганізацыяў рэгістраваць юрыдычныя адрасы сваіх рэгіянальных філіяў у нежылым фондзе. Публікацыі не тлумачылі, чаму неабходныя гэтыя зьмены. Іх тэрміновы характар нівэлюецца абяцаньнем вызваліць ад гэтай працэдуры некаторыя арганізацыі (*«…которые задействованы в социальной, молодежной сфере, ветеранским организациям, объединениям инвалидов…»*). Падкрэсьліваецца, што гэта стала магчымым дзякуючы дальнабачнасьці прэзыдэнта (*«Но здесь последнее слово за Президентом»*). Іншымі словамі, юрыдычна гэтыя арганізацыі ня маюць такога права, але прэзыдэнт можа праявіць высакароднасьць. Да таго ж, юрыдычныя патрабаваньні ахутваюцца аўрай маралізатарства (*«И никакого избирательного подхода здесь никто не применял. Требование*

[2] Заходнія аналітыкі з аргумэнтацыяй Вялікабрытанія і Францыя зьяўляюцца вялікімі дзяржавамі, ня кажучы ўжо пра Нямеччыну, Японію ды Італію.

[3] Што ж адбываецца ў так званых «іншых»?

закона для всех едино»), а палітычныя партыі паказваюцца добраахвотнымі калябарантамі з рэжымам (*«Все они с пониманием подошли к этой проблеме»*). Увесь гэты малюнак выклікае пытаньне – дзеля чаго трэба было пісаць гэтыя два артыкулы, калі ўсё настолькі добра? Няма сумневу, новае заканадаўства ставіць у лепшае становішча тыя грамадзкія арганізацыі, якія маюць больш рэсурсаў (адным зь якіх зьяўляюцца сувязі з уладамі).

Артыкул пра чэкі «Маёмасьць» і «Жытло» напісаны ў падобным ключы – Савет міністраў і парлямэнт апісваюцца ў якасьці роўных партнэраў (*«…пытаются найти здесь компромиссное решение уже несколько лет…»*), якія абараняюць інтарэсы грамадзянаў (*«Отстаивая позицию своих избирателей, депутаты…»; «…не стоит упрекать Правительство в том, что оно, мол, не заботится…»*). Артыкул здаецца бессэнсоўным – навошта паведамляць пра тое, чаго няма – пакуль чытач ня дойдзе да апошняга абзацу: «некоторые владельцы чеков сознательно не вкладывают их в дело, ожидая получить за них компенсацию». Аказваецца, артыкул заклікае нарэшце ўкласьці гэтыя чэкі.

Артыкул, прысьвечаны эканамічным пытаньням, паведамляе пра падзеньне курсу эўра і даляра ЗША, тым самым выяўляючы сваю галоўную мэту – заклік захоўваць ашчаджэньні ў беларускіх рублях, які зноў-такі пададзены ў канцы артыкулу (*«Рубль ведет себя стабильно, и сбережения по-прежнему предпочтительнее и выгоднее хранить в белорусских дензнаках»*).

Калі зірнуць на афіцыйныя валютныя курсы за пэрыяд ад 20.06.2004 да 20.06.2005, можна заўважыць, што, нягледзячы на эканамічныя праблемы ЗША і ЭЗ, зьвязаныя з глябалізацыяй, ростам патрэбы ў нафце ў разьвіваных рынкавых эканоміках, ды іншыя праблемы (якія на руку Беларусі), валютны курс беларускага рубля зьнізіўся з 2589 да 2609 рублёў за 1 эўра, і падвысіўся з 2155 да 2149 рублёў за 1 даляр ЗША.

Зірнуўшы на доўгатэрміновыя тэндэнцыі, вымалюецца іншая карціна. На падставе дадзеных МВФ, можна разьлічыць, што ў

пэрыяд 1998–2004 гг. спажывецкія цэны ў Беларусі вырасьлі на 6737 адсоткаў. Для параўнаньня, сярэдні ўзровень інфляцыі ў іншых краінах СНД за 1998–2004 гг. склаў 281 адсотак. Дадзеныя пра валютныя курсы[4] наступныя: у пэрыяд 1998–2004 гг. беларускі рубель упаў з 30,74 да 2170 рублёў за 1 даляр ЗША. На аснове гэтых дадзеных можна зрабіць выснову, што валютны курс быў, па сутнасьці, прывязаны да ўзроўню інфляцыі (кошт даляра ЗША што да рубля падвысіўся на 6959 адсоткаў). Рэтраспэктыўная ацэнка валютнага курсу эўра (экю) больш складаная, але тэндэнцыі маюць быць тыя ж самыя.

Таму для тых беларусаў, хто робіць доўгатэрміновы выбар, у якой валюце захоўваць ашчаджэньні, рубель наўрад ці будзе такім бясьпечным, як рэклямуецца ў артыкуле. Для тых, хто зьбіраецца рабіць кароткатэрміновыя ашчаджэньні, беларускага рубля ў валюты – абмен грошай зьвязаны з камісійнымі зборамі і рызыкай хістаньня валютнага курсу.

[4] Бярэцца курс беларускага рубля ў 2000 г.

Нарэшце, друкуецца засяроджаны на беларускіх рэаліях артыкул пра перавагі ратыфікацыі Кіёцкага пратаколу, які можна ахарактарызаваць як спрэс антыэкалягічны. Экалягічныя пытаньні разглядаюцца толькі як частка палітыкі ці эканомікі. Журналіст цытуе сумнавядомыя словы радніка Ўладзімера Пуціна Андрэя Ілларыёнава пра Кіёцкі пратакол як *«экономический Освенцим»* і заяўляе: *«Дышать чистым воздухом хорошо, но еще лучше делать это на сытый желудок...»*. Складаецца ўражаньне, што супрацоўніцтва ў галіне аховы навакольнага асяродзьдзя не зьяўляецца сфэрай, у якой Беларусь хацела б атрымаць прызнаньне *«…полноправного и авторитетного члена мирового сообщества… надежного, последовательного партнера…»*. Удумлівы чытач можа заўважыць, калі гэта ўвогуле не агульная тэндэнцыя, што беларускія ўлады гатовыя супрацоўнічаць у любой галіне, дзе ад беларускага боку не патрабуецца аніякіх высілкаў.

АЧАРНЯЙ І ЎТОЙВАЙ

Крытыка нядаўніх палітычных зьменаў у краінах СНД мае найбольшы прапагандысцкі запал. Возьмем як прыклад

артыкул пра зьмены ва Ўкраіне пасьля памаранчавае рэвалюцыі, які, па ўсёй верагоднасьці, акажацца арыгінальным матэрыялам Джона Дызарда, надрукаваным 10 чэрвеня ў «The Financial Times». Больш-менш дакладны пераклад гэтага артыкулу на расейскую мову быў зьмешчаны парталам ИноСМИ.Ru 14 чэрвеня14. Паколькі «СБ» выкарыстоўвала апошнюю крыніцу, я буду цытаваць як ИноСМИ.Ru, так і «The Financial Times». Што характэрна, у беларускай вэрсіі бракуе двух важных сказаў:

Замест таго, каб дамагчыся фактычнай незалежнасьці Ўкраіны ад Расеі, улады, наадварот, дазволілі ёй застацца эканамічнай калёніяй.

і

Украіна імпартуе асноўную частку нафты з Расеі, што надае ўсходняму суседу гэткі ўзровень уплыву, пра які ўрадавыя ведамствы ЗША могуць толькі марыць.

Найбольшую частку выкінутага тэксту складае апісаньне запаволенага разьвіцьця нафтавае прамысловасьці ва Ўкраіне, што, магчыма, зьвязана з інтарэсамі вузкіх украінскіх бізнэс-колаў ды іх сувязямі з уладамі. Таму, на мой погляд, асноўная ідэя арыгінальнага артыкулу і яго расейскамоўнага пераказу была ў тым, што заходнія краіны чакалі ад новых украінскіх уладаў памяншэньня эканамічнай залежнасьці ад Расеі ды стварэньня належных умоваў для заходных інвэстыцыяў, але дзеля эгаізму ўкраінскага бізнэсу і ўладаў гэтага не адбываецца.

Эгаістычныя інтарэсы бізнэсу і ўладаў палягаюць, адпаведна, у наступным: «выгнаць усе заходнія кампаніі з краіны» і «прафінансаваць такі ўзровень пэнсіяў, які б забясьпечыў перамогу на наступных выбарах» («fund a vote-winning pension payment»)… ці… *«финансирование популистских пенсий»*. Гэтыя мэты, верагодна, большасьці чытачоў «СБ» не падаліся б ненатуральнымі, таму першую зь іх папросту выкінулі з тэксту,

а другую падалі ў расейскамоўнай вэрсіі ИноСМИ.Ru, у якой выкарыстоўваецца больш адмоўнае азначэньне – «папулісцкія» (хацелася б ведаць, як тады называць Лукашэнкавы абяцанкі падняць заробкі, стыпэндыі і пэнсіі…).

Якое ўражаньне ўзьнікае ў чытача пасьля азнаямленьня з «абрэзанай» вэрсіяй артыкулу ў «СБ»? Ва Ўкраіне ўсё дрэнна і робіцца яшчэ горш, бо новыя ўлады разьядае карупцыя. Вось найбольш уражвальнае тлумачэньне таго, чаму ва Ўкраіне няма парадку:

Такие кризисы разрешаются по мере поступления вполне благополучно и безболезненно при условии, что власть сплочена и каждый сверчок знает свой шесток.

АНТЫРЭВАЛЮЦЫЙНЫ ПАТАС
Напэўна, найбольш яскравым выпадкам перадузятасьці на старонках «СБ» зьяўляецца артыкул Аляксея Барташа, надрукаваны 1 чэрвеня. Фармальна ён абагульняе вынікі журналісцкага расьсьледаваньня Вэнсэна Жавэра, апублікаванага ў «Le Nouvel Observateur» 25 траўня. Расейскі пераклад гэтага матэрыялу зьявіўся на ИноСМИ.Ru 27 траўня15. Мае веды французкай мовы пакідаюць жадаць лепшага, таму я скарыстаюся з расейскамоўнага перакладу тэксту.

Артыкул у «СБ» прысьвечаны шматлікім тэмам, таму мае сэнс засяродзіцца на некалькіх характэрных прыкладах.

Прычына напісаньня артыкулу – страх, што палітычныя зьмены ва Ўкраіне і, да некаторай ступені, у Грузіі ды ў Кіргізіі паўплываюць на цяперашні беларускі рэжым, у іншым выпадку ўсе шалёныя нападкі і праклёны ў бок гэтых краінаў ня мелі б сэнсу. Мэта артыкулу – падкрэсьліць моц уладаў (*«В Минске дешевые трюки… не пройдут»*) і дыскрэдытаваць апазыцыю.

Аўтар матэрыялу малюе адзін з найбольш тэндэнцыйных партрэтаў інтэлігенцыі, якія толькі можна знайсьці ў

ідэалягічных пасквілях: «тяготеет к безопасным, но острым ощущениям», *«никчемный Алесь», «ругается потому интеллигент матом охотнее и звонче иного грузчика»*[5], *«прячет в воротник голову до ушей», «боящийся, как говорится, дверного скрипа», «завидев где-нибудь баррикаду… скоренько запрется в квартире», «мастера интриги и утонченного холуяжа», «крапивное семя».*

Аўтар выкарыстоўвае стары прапагандысцкі прыём,[5] Апошняе, прэзэнтуючы апанэнтаў улады як людзей, якія шчыра рэпрагодна, памыляюцца ў сваіх поглядах. Гэты прыём прадугледжвае, што ўсе іншадумцы – гэта альбо зламысьнікі, альбо тыя, хто шчыра памыляюцца, і адначасова выводзіць аўтара-прапагандыста за рамкі любой крытыкі. Іншымі словамі, замест таго, каб засумнявацца ва ўладзе пасьля таго, як паважаныя людзі сталі да яе ў апазыцыю, аўтар артыкулу заклікае чытача засумнявацца, перш за ўсё, у прыстойнасьці гэтых паважаных людзей.

Асабліва прамовістыя этнічныя стэрэатыпы: *«Разобрались по-восточному. Свистнули, гикнули, из дальних кишлаков прискакали родичи, набили сотню морд…»; «…одни тбилисцы кушали лобио и запивали «Кахетинским»…»; «знойная Кето»*. Былыя палітычныя лідэры «этычна» ахарактарызоўваюцца як «нувориши», «жирные коты», «тихий дедушка».

Зьмены ва Ўкраіне, Грузіі і ў Кыргызстане акрэсьліваюцца як па сутнасьці крымінальныя: *«борьба кланов», «мафиозные разборки», «передел собственности»*.

Паводле аўтара, за намаганьнямі зьмяніць уладу стаіць сквапнасьць і пачуцьцё помсты: *«…их восточный ветер выбросил в 1991 году из больших кабинетов, их отогнал доской от корыта Александр Григорьевич за разные некрасивые делишки»*[6]. Гэткім дзіўным чынам аглядальнік спрабуе адсячы ад апазыцыі антыкамуністычна настроеную частку беларускага насельніцтва[7]. Журналіст выкарыстоўвае цэлы арсэнал таўраў. Адначасова выкарыстоўваюцца асацыяцыі з царызмам і нацызмам (*«попу Гапону далеко до этого хитрого «технолога», его можно сравнивать разве что с теми, кто поджигал рейхстаг»*). Аўтар «СБ» паведамляе, што на трэнінгах, як

паводзіць сябе ў выпадку арышту, рыхтуюць бязьлітасных штурмавікоў (*«Именно так готовятся безжалостные и наверняка готовые на бесчинства штурмовики»*).

Цытуючы выказваньні Вэнсэна Жавэра пра будучыню ў палітычных зьменаў, аглядальнік «СБ» прапускае пачатковыя фразы (*«Сербский пример, скорее, обнадеживает»*) і ўстаўляе свае ўласныя інтэрпрэтацыі (*«Легко представить: дни Бастилии о либеральных ценностях, ночью – оргии. Облико морале Сексуальный опыт – в массы!»*). Некаторыя з гэтых інтэрпрэтацыяў папросту абсурдныя, напрыклад, што адхіленьне ад улады Ўладзімера Пуціна недзяржаўнымарганізацыям абяцаюць заплаціць мільёны (расейскіх рублёў? беларускіх рублёў? даляраў ЗША?).

Шматкроць сустракаюцца простыя пропускі словаў. Напрыклад, у сказе *«Успех основан, прежде всего, на демарше без насилия»* (правільны пераклад з французскай не *«на демарше без насилия»*, а на «на прынцыпах негвалтоўнасьці». – **Рэд.**) аўтар выкідвае два апошнія словы, што значна зьмяняе сэнс выказваньня.[8] Скажаюцца цэлыя фрагмэнты арыгінальнага тэксту. У ніжэй прыведзеным абзацы выкарыстаны наступныя ўмоўныя абазначэньні: прапушчаныя словы з расейскамоўнага перакладу на ИноСМИ.Ru, які добра адлюстроўвае арыгінал, пададзены тлустым шрыфтам, асабістая творчасьць беларускага журналіста вылучана падкрэсьленьнем, а рэшта словаў – простае пазычаньне аўтара «СБ» з парталу ИноСМИ.Ru.:

Первый **из них***: коммивояжеры демократии – являются ли они обыкновенными агентами Вашингтона, как то хотят представить* **в Кремле и в других местах? Ответ: нет,** *говорить начистоту – это правда!* **Это правда**, *они работают на американские (а иногда и европейские) организации скрывают этого.* **Правда также и то, что они раздел ценности дяди Сэма – демократия и доллар – и желают их прочно внедрить в бывшем СССР. Наконец**, *очевидно, что Белый Дом Джорджа Буша видит в них векторы своей «soft power», пешек в геостратегической шахматной партии, которую он разыгрывает с Россией* в регионе, *желая ослабить, а то и*

6 Зьвярніце ўвагу на ўжываньне артыкля «the» перад назвамі краінаў. Гэта правіла ангельскай мовы, якога ня ведае аўтар.

7 Трэба мець на ўвазе, што афіцыйнае стаўленьне прэзыдэнта да савецкага перавароту 1991 году.

8 Як можаш пераканацца, дадатнае.

развалить своего извечного геополитического соперника. Понимают это в Москве? Последние заявления В. В. Путина говорят – да, понимают… **Но ставят ли они интересы США выше интересов тех стран, в которых работают? Ничто не позволяет так говорить. И о какой Америке идет речь? Об Америке неоконсерваторов «Freedom House» или об Америке финансиста-гуманиста Джорджа Сороса, который тратит миллионы долларов на борьбу с Джорджем Бушем?**

Як можна заўважыць, сэнс арыгіналу цалкам перакручаны. Там, дзе Вэнсэн Жавэр выказвае няверу ў абвінавачваньні супраць кансультантаў палітычных кампаніяў, Аляксей Барташ «выпраўляе» сказ, каб зрабіць абвінавачваньні праўдападобнымі. Прапускаючы заўвагу пра агульныя каштоўнасьці, якія яны падзяляюць з урадам ЗША, аўтар «СБ» робіць з кансультантаў поўных эгаістаў. Урэшце, пропуск фразы пра адрозьненьне паміж фундацыямі ЗША звальвае іх усіх у адну вялікую, агідную і варожую кучу[9]. Вобраз ворага павялічваецца дзякуючы дададзенай фразе пра амэрыканскія «пляны» зруйнаваць Расею, якая прэзэнтуецца як больш-менш роўны партнэр у тэксьце арыгіналу.

Вось яшчэ адзін прыклад:

Но свергнуть хозяина Кремля – затея нелегкая. Кажется, что он держит твердой рукой свои спецслужбы **и большую часть армии**. *Он открыто поддержал* **кровавые репрессии** *действия Каримова в Узбекистане* **(см. ниже)** *и дал таким образом понять, что не испугается* стрелять по толпе, *если сочтет нужным дать погромщикам твердый отпор. Наконец российский Президент нашел два способа сорвать деятельность* **активистов** *«активистов». Он создал свою собственную молодежную организацию. Это копия движений «Отпор», «Кмара!» и других – то же двухсложное название «Наши», те же майки, те же улыбки. Но программа* – **националистическая**, *государственная, выступления жесткие. И это еще не все. ФСБ* суетится, шпионит, манипулирует, *хоть и с опозданием, взялось за работу: агенты внедряются во все группы протеста и создают другие, очевидно поддельные, чтобы спутать карты.*

[9] Дарэчы, французкі аўтар памылкова клясыфікуе «Freedom House» як нэакансэрватыўную арганізацыю. Вось некалькі з найбольш выбітных нэакансэрватыўных стратэгічных цэнтраў у ЗША:

Надо думать, что в Москве международным **демократическим** *«демократическим» агентам будет нелегко,* **старого медведя не научишь революции**. *Москва, когда припечет, слезам не верит…*

Большасьць ідэяў французскага аўтара перакручаныя да непазнавальнасьці: «крывавыя рэпрэсіі» пераўтвараюцца ў эўфэмічныя «дзеяньні», «стрэлы па натоўпе» – у «дань адлуп», «нацыяналістычная» – у «дзяржаўную», «мітусіцца, віжуе, маніпулюе» – у «бярэцца за працу», зялёны актывіст пераўтвараецца ў пагрозьлівага апанэнта.

Heritage Foundation», «Federalist Society», «American Enterprise Institute», «CATO Institute».

Падсумоўваючы, арыгінальны артыкул (ці, больш дакладна, яго расейскамоўны пераклад) быў парэзаны на часткі. Затым гэтыя кавалкі былі апрацаваныя і скарыстаныя для падтрымкі аргумэнтацыі «СБ». Апрача таго, што створаны опус вельмі нагадвае плягіят і кампрамэтуе французскага журналіста, які, відаць, нічога ня ведае пра «пераклад» ягонага твору ў Беларусі, ён зьяўляецца ўзорам найдзічэйшае прапаганды.

Пераклаў з ангельскай Андрусь Клікуноў

Дата	Аўтар	Прычына публікацыі	Геаграфічны фокус	Стыль
20.05	Павал Мацукевіч	публічная прамова кіраўніцтва ЗША	ЗША, Грузія	дыдактычна-саркастычны
20.05	Ігар Кольчанка	падзеі	ЗША, Ірак	дыдактычна-нэгатыўны
24.05	Ігар Кольчанка	падзеі, артыкулы ў нямецкай прэсе	Нямеччына	дыдактычна-нэгатыўны
24.05	(Ананім)	падзеі	Ірак	інфармацыйна-нэгатыўны
24.05	(Ананім)	артыкулы ў	Расея, былы	інфармацыйна-

		расейскай прэсе	СССР	нэўтральны
25.05	Ігар Кольчанка	падзеі	ЗША, Блізкі Ўсход	дыдактычна-нэгатыўны
25.05	Павал Мацукевіч	артыкулы ва ўкраінскай прэсе	Украіна	дыдактычна-нэгатыўны
26.05	Павал Мацукевіч	падзеі, артыкулы ў заходняй прэсе	ЭЗ	дыдактычна-саркастычны
27.05	Павал Мацукевіч	афіцыйныя заходнія справаздачы	ЗША	дыдактычна-нэгатыўны
31.05	Ігар Кольчанка	падзеі	ЭЗ (Францыя)	дыдактычна-нэгатыўны
31.05	Інэса Плескачэўская	падзеі	Беларусь-Кітай	інфармацыйна-пазытыўны
01.06	Ігар Кольчанка	падзеі, артыкулы ў заходняй прэсе	ЭЗ (Францыя)	дыдактычна-нэгатыўны
01.06	Аляксей Барташ	артыкулы ў заходняй прэсе	ЗША, ЭЗ, СНД	дыдактычна-саркастычны
02.06	Анатоль Нязванаў	публічныя заявы	Беларусь	інфармацыйна-пазытыўны
02.06	Віка Бялых	артыкулы ў заходняй прэсе	ЗША	дыдактычна-нэгатыўны
02.06	Ігар Кольчанка	падзеі	Кіргізія, Узбэкістан	дыдактычна-саркастычны
02.06	Ігар Кольчанка	падзеі, артыкулы ў заходняй прэсе	ЭЗ (Нідэрляндыі)	дыдактычна-саркастычны
07.06	Ігар Кольчанка	публічныя заявы	ЗША, Узбэкістан	дыдактычна-саркастычны
07.06	Ігар Кольчанка	публічныя заявы	ЭЗ (Вялікабрытанія),	дыдактычна-нэгатыўны

08.06	Ігар Славінскі	артыкулы ў заходняй прэсе	Швайцарыя ЗША	дыдактычна-нэгатыўны
08.06	Дзьмітры Крат	публічныя заявы, падзеі	Беларусь, ЭЗ, ЗША	інфармацыйна-пазытыўны
10.06	Ігар Славінскі	падзеі, заявы экспэртаў	Беларусь, сьвет	дыдактычна-нэўтральны
10.06	Ігар Кольчанка	падзеі, афіцыйныя прамовы	ЭЗ	дыдактычна-саркастычны
11.06	Анатоль Нязванаў	падзеі	Беларусь	інфармацыйна-пазытыўны
11.06	Аляксандар Фадзееў	публічныя заявы, артыкулы ў прэсе	Беларусь-Польшча, ЗША	дыдактычна-нэгатыўны
11.06	Анатоль Нязванаў	публічныя заявы	Беларусь	інфармацыйна-пазытыўны
11.06	Ігар Кольчанка	публічныя заявы, падзеі	Беларусь-Грузія	інфармацыйна-зьмяшаны
14.06	Дзьмітры Крат	публічныя заявы, падзеі	Беларусь-Кітай	дыдактычна-пазытыўны
14.06	Ігар Кольчанка	артыкулы ў заходняй прэсе, падзеі	ЭЗ	інфармацыйна-нэгатыўны
15.06	Ніна Раманава	артыкулы ў прэсе краін СНД, падзеі	ЭЗ	дыдактычна-нэгатыўны
17.06	Ігар Кольчанка	падзеі, артыкулы	ЭЗ	дыдактычна-нэгатыўны
17.06	(Джон Дызард)	артыкулы ў брытанскай прэсе	Украіна	інфармацыйна-нэгатыўны
17.06	Ігар Славінскі	публічныя заявы,	Кіргізія, Грузія	дыдактычна-саркастычны

		падзеі		
18.06	Ігар Славінскі	падзеі	Кіргізія	дыдактычна-саркастычны
18.06	Ігар Кольчанка	падзеі, афіцыйныя заявы	ЭЗ	дыдактычна-нэгатыўны
21.06	Ігар Кольчанка	падзеі, артыкулы ў заходняй прэсе	Ірак	дыдактычна-нэгатыўны

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 4 (38) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/07
[image]

Фільмы і рэпартажы, якія будуць абмяркоўвацца ў гэтым артыкуле:

1. *«Новейшая история»* (12 фільмаў). Аўтары: Юры Казіятка, Рыгор Кісель, Віктар Шавялевіч, Віктар Чамкоўскі, Аляксандар Рыдван // АНТ, этэр канец лістапада – пачатак сьнежня 2004 году.

2. *«Дорога в никуда»*. Аўтары: Рыгор Козыраў, Аляксандар Уюгін, Віктар Нікольскі, Уладзімер Жавараначк, Надзея Бывалая, Агафія Красачка, Сяргей Усатаў // БТ, этэр 13 траўня 2004 году.

3. *«Съезд интеллигенции»*. Рэпартаж Юр'я Пракопава // АНТ, этэр 8 красавіка 2004 году.

4. *«Конспирология»* (7 фільмаў). Аўтары: Юры Азаронак, Уладзіслаў Яровіч, Вадзім Гігантаў, Ніна Яроміна // БТ, этэр канец верасьня – пачатак кастрычніка 2004 году.

...а нават калі якую атруту

Апошняя публікацыя ў «ARCHE» – аглад «Стратэгіі барацьбы за рэальнасьць» (3/2005).

выпʼюць, не пашкодзіць ім.

Дабравесьце сьв. Марка 16:18

Палітычная прапаганда і тэндэнцыйнае асьвятленьне падзеяў у сродках масавай інфармацыі ня ёсьць адмысловасьцю аўтарытарных дзяржаваў. Мо гэта іронія лёсу, але мастацтва маніпуляваць грамадзкай думкай паўстала якраз у дэмакратычных Атэнах пару тысячагодзьдзяў таму, а культывавала гэтае мастацтва інтэлектуальная эліта атэнскага грамадзтва – сафісты («мудрагельцы»). Прапаганда зазвычай патрабуе пэўнага інтэлектуальнага патэнцыялу і арыгінальнасьці, здольнасьці ўмела «змайстраваць» пэўны зьмест, цікава яго аформіць і прыгожа падаць. Вось чаму прапаганда і дэмагогія маглі паўстаць толькі ў варунках палітычнай свабоды і талеранцыі; у аўтарытарнай Спарце, прыкладам, не было прапаганды, бо кожны знаў сваё месца, гаварыў, думаў і рабіў ня тое, што хоча, а «тое, што трэба».

Гэтая акалічнасьць надзвычай павучальная. Яна прымушае задумацца як над прыродаю дэмакратыі, так і над прыродаю прапаганды. Прапаганда – з аднаго боку – зьяўляецца неадʼемным складнікам дэмакратыі, свайго роду праявай «свабоды слова», «парэсіі», як казалі грэкі. Адначасна паўстае вялікая небясьпека, што «ўменьне чараваць словам» прывядзе да палітычнай тыраніі: дэмагог-чарадзей можа, дзякуючы свайму красамоўству, атрымаць ад плебсу легітымізацыю на задушэньне сваіх палітычных апанэнтаў і ў выніку зьнішчыць усякую свабоду. Нездарма вялікі змагар за дэмакратыю Лешак Калакоўскі кажа пра пагрозу «самаатручваньня адкрытага грамадзтва», а сам аўтар ідэі адкрытага грамадзтва, Карл Попэр, пад канец свайго жыцьця з уласьцівай яму экспрэсіяй выгукнуў: «Дык да дʼябла з такой дэмакратыяй!», хочучы такім чынам выразіць сурʼёзнасьць праблемы маніпуляцыі масавай сьвядомасьцю сродкамі масавай інфармацыі. Словы Яна Паўла II, неаднаразова паўтараныя: «дэмакратыя без каштоўнасьцяў ператвараецца ў яўны або замаскаваны таталітарызм» – у гэтым кантэксьце надзвычай трапныя.

Нашым заданьнем будзе прасачыць падобны працэс у Беларусі.

Гэта дазволіць яшчэ раз пераканацца, што прычынай таталітарызму ёсьць ня столькі подласьць уладу трымаючых (хоць, вядома ж, не бяз гэтага), колькі маральная атрафія грамадзтва. І дадаць варта, што маральны раскол праходзіць на самым фундамэнтальным узроўні, якім ёсьць павага да жыцьця і годнасьці іншага чалавека. Нашым *locus explorationis* («месца дасьледаваньня») будзе беларускае тэлебачаньне, а канкрэтна – некаторыя прапагандысцкія фільмы і рэпартажы. Калі на гэтым этапе ня можам дзейсна запыніць «самаатручваньне» беларускага грамадзтва, то можам, прынамсі, пабраць пробы гэтай атруты, узяць пад мікраскоп, прааналізаваць ейныя складнікі і спрагназаваць, якія магчымыя наступствы могуць быць ад той ці іншай дозы. Мэтафара «атруты», праўда, ня цалкам адэкватна характарызуе ўсе прапагандысцкія праекты беларускага тэлебачаньня. У некаторых выпадках апраўданы больш «лагодныя» мэтафары, скажам, «масаж», «снатворны наркотык» або «опіюм». А часам патрэбны будуць і больш «моцныя» мэтафары, напрыклад, «палітычны сатанізм»...

БАЛЬ ФАЛЬШЫВЫХ БАГОЎ

Ня верце ўсякаму духу,
але дасьледуйце іх, ці ад Бога яны.

Першае пасланьне сьв. Яна Багаслова 4:1

Беларускі рэжым, нягледзячы на выразную ізаляцынісцкую ўстаноўку, зацікаўлены ў тым, каб, прынамсі, ствараць бачнасьць адкрытасьці і славутай «гатоўнасьці да супрацоўніцтва». Адначасна ж зь недраў рэжыму раз-пораз вылазяць лютыя ворагі якога-кольвечы дыялёгу, зацікаўленыя ў тым, каб прасоўваць маніхейскі сьветавобраз, у якім няма аніякіх злучальных пунктаў паміж Каралеўствам Дабра і Ісьціны (=лукашэнкаўская ўлада) і Каралеўствам Зла і Цемры (=Захад, Амэрыка ды «мясцовыя агенты ўплыву»).

Гэты прымітыўны сьветападзел нагадвае мэнтальнасьць сэктанцкіх рухаў у Расеі пэрыяду «смуты» і «расколу» (які

пачаўся ад часоў рэформы Нікана ў другой пал. XVII ст.), рухаў, надта разрозьненых і шматлікіх, але якія мелі адну *idee fixe*: змагацца з усім тым, што
вонкавае = нерасейскае = неправаслаўнае = ад Антыхрыста. Характэрнай рысай гэтых сэктаў было саманазываньне наймем «истинное православие», але пад маскай такога «праваслаўя» хаваўся чыста паганскі зьмест: культ племяннога адзінства. Хрысьціянскі ўнівэрсалізм і вера ў еднасьць чалавечага роду, якая цягам часу станецца галоўным матывам для праваслаўных мысьляроў такога фармату, як Салаўёў ці Бярдзяеў, быў для гэтых сэктанцкіх рухаў ворагам нумар адзін.

ПРАФАНАЦЫЯ ПРАВАСЛАЎЯ

Гэтая сэктанцкая, псэўдаправаслаўная ідэалёгія і пакладзена ў аснову такіх фільмаў, як «Конспирология» і «Дорога в никуда». Такога тыпу фільмы могуць быць добрай пажывай для мясцовых экстрэмісцкіх рухаў, хоць яны маюць, як паказваюць сацыялягічныя дасьледаваньні, маргінальны характар. Тым ня менш, варта спыніцца на «інтрызе» гэтых фільмаў, бо, як хтосьці добра прыкмеціў, яны «б'юць па мазгах» і здольны прадукаваць новых фанатыкаў і экстрэмістаў.

«Дорога в никуда» і «Конспирология» пачынаюцца вельмі падобна: першы ад рэлігійна-патрыятычнай рэфлексіі: «Гасподзь даў нам цудоўную зямлю...», а другі ад прыгожай праваслаўнай малітоўнае песьні, у якой маецца духоўны заклік: «Время Бога молить», а таксама матыў пакаяньня і навяртаньня: «Чтоб грехи отпустил». Візуальны фон у абодвух выпадках цудоўна канкрэтызуе зьмест рэфлексіі і песьні: здымкі беларускай зямлі, храмы, праваслаўныя абразы выклікаюць духоўнае ўзрушэньне і ўводзяць у настрой малітвы і сузіраньня. І хацелася б у гэты момант усклікнуць гэтак, як усклікнуў сьв. Пётар на гары Табор: «Госпадзе, добра нам тут быць!»...

Хацелася б, але неўзабаве стракаеш такі паток бруду, хлусьні і нянавісьці, што можна адно толькі ўсьлед за сьв. Паўлам паўтарыць: «Сатана явіцца ў выглядзе Анёла Сьвятла». Пад

канец фільмаў становіцца ясна, што рэлігійна-малітоўныя матывы зьяўляюцца ўсяго толькі прыёмам, каб увесьці ў зман, каб пад шырмай абароны духоўных каштоўнасьцяў іньектаваць у душу гледачоў вялікую дозу агрэсіі і нянавісьці. З багаслоўскага гледзішча гэта цяжкі грэх супраць другога Божага прыказаньня (эксплюатацыя рэлігійных пачуцьцяў), але аўтараў фільмаў духоўна-багаслоўскія аргумэнты наўрад ці хвалююць. Іх хвалюе толькі адна рэч: бездакорная вернасьць Племянному Адзінству. Праваслаўе для іх – гэта адно толькі зручны інструмэнт навязваньня паганскай, антыхрысьціянскай у сваёй сутнасьці мэнтальнасьці.

ТЭАЛЁГІЯ І ДЭМАНАЛЁГІЯ. РЭСТЫТУЦЫЯ СТАЛІНІЗМУ

Возьмем тое-сёе з «Дороги в никуда». Палітычная нарацыя тут пачынаецца ад словаў: «...але гэту зямлю [г. зн. тую, якую даў нам Гасподзь] сплюгавілі разбуральнікі Савецкага Саюзу, падпісаўшы ўпотайку ноччу дакумэнт...» Дык вось пра які патрыятызм ідзецца гаворка, вось як трэба разумець сказаныя на самым пачатку словы «Гасподзь даў нам цудоўную зямлю»! «Зямля» – гэта не Беларусь, а Савецкі Саюз, а «гасподзь» тут напэўна ня мае нічога супольнага з Богам, у якога вераць хрысьціяне, габрэі ды мусульмане. Няўжо гэта Бог мог нам «даць» Савецкі Саюз, галоўным лёзунгам якога і было змаганьне з Богам і перасьлед Ягоных вернікаў? «Бог ёсьць любоў» – чытаем у Яна Багаслова, а фундамэнтам Савецкага Саюзу была якраз нянавісьць і гвалт; кожны сапраўдны грамадзянін СССР меў абавязак ненавідзець клясавага ворага і імкнуцца зьнішчыць яго.

Дык хто зьяўляецца госпадам для Козырава, Уюгіна, Нікольскага і іншых творцаў «Дороги в никуда»? Ленін ці Сталін? Розьніца тут нясутнасная.

Ясна, што д'ябал заўжды перашкаджае ў зьдзяйсьненьні ратавальнага пляну, таму варта пазнаць яго гіпастазы: Амэрыка, Захад і «пятая калёна, якая складаецца з правых

радыкалаў, трацкістаў і дамаслых лібэралаў» (вельмі цікава, які сэнс для аўтараў мае акрэсьленьне «дамаслыя»: няўжо аўтары намякаюць, што лепей, калі лібэралы будуць «за мяжой выслыя»? Але ж для іх ня тое, што быць выслым за мяжой, а нават сымпатызаваць замежжу ёсьць сьмяротным грэхам. І як тут быць, невядома). Вось яны, «дзеці хлусьні».

Далей у фільме гаворка ідзе пра «даляравую падмогу» і пра тое, што «гэта не дапамагло бяздарнай беларускай апазыцыі». Наконт таго, што апазыцыя «бяздарная», хай будзе дазволена засумнявацца: ці ж не яна разваліла магутны Савецкі Саюз, царства шчасьця і дабрабыту? Каб такое ўчыніць, усё ж такі патрэбен нейкі дар! З далярамі таксама справа не такая простая: былы шэф тэлебачаньня Ягор Рыбакоў прызнаваўся, што прэзыдэнт Лукашэнка даваў яму іх тысячамі без усях папераў для заахвочваньня лепшых супрацоўнікаў. Крытэр «апазыцыйнасьці» тут яўна не пасуе.

Але для аўтараў фільму такога тыпу нюансы ня маюць значэньня. Аповед пра «бяздарную, хцівую і нячыстаплотную апазыцыю» суправаджаецца вельмі сугестыўнымі вобразамі, якія на працягу ўсяго фільму ўтвараюць цыклічны рытм: 1) фрагмэнт з жыцьця апазыцыянэраў, паказаных дзякуючы адпаведнаму мантажу ў этычна і эстэтычна адпіхваючых сытуацыях; 2) урыўкі з камэдыяў або зь фільмаў пра вайну, каб атаясаміць апазыцыянэраў з камэдыйнымі пэрсанажамі або з фашыстамі; 3) «сусьвет кантрасту» – упарадкаваны і зладжаны сьвет, стваральнікам якога зьяўляецца беларускі прэзыдэнт.

Эфэкт прадажнасьці апазыцыі яшчэ больш узмацняецца шляхам рэгулярнага паказваньня станка, які друкуе даляравыя купюры; даляры – гэта, па сутнасьці, асноўны інтэрпрэтант дзейнасьці апазыцыі. Але апроч іх ёсьць яшчэ другі важны інтэрпрэтант: «Падрыхтоўка фашыстоўскіх дывэрсантаў і апазыцыянэраў 2003 году разьліву практычна не зьмянілася» – гаворыць з сугестыўнай, добра выпрацаванай мадуляцыяй голасу наратар з-за кадру. Хуткае і частае чаргаваньне вобразу фашыстаў і вобразу беларусаў зь бел-чырвона-белымі сьцягамі разьлічана на замбаваньне гледача, замацаваньне ў падсьвядомасьці ўстойлівай асацыяцыі (альбо нават тоеснасьці): бел-чырвона-

белае = фашыстоўскае. Наагул, фільм зроблены зь неблагім веданьнем псыхалёгіі пэрцэпцыі.

Буржуй-дармаед, здрайца-фашыст і блазан-камэдыянт – вось кім зьяўляецца любы апазыцыянэр, кім-кольвечы ён бы ні быў: праваслаўны ці каталік, правы ці левы, беларуска- ці расейскамоўны. Адразу прыгадваецца ленінскі шэдэўр пад назовам «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм», у якім вызваліцель пралетарыяту вельмі ясна прадставіў кірунак мысьленьня: ёсьць толькі дзьве магчымыя ідэалёгіі: матэрыялізм і ідэалізм. Калі хто не стаіць на пазыцыі матэрыялізму, той – ідэаліст, а раз ідэаліст, значыць буржуй, а раз буржуй, то клерыкал, а раз клерыкал, значыць, ён зьняволены папоўскімі забабонамі і ўсякім цемрашальствам, вораг прагрэсу і сацыялізму. Аўтары «Дороги в никуда» дакладна капіююць гэтае мысьленьне, мабыць, не ўсьведамляючы, што такім чынам явяцца ў культурным сьвеце як інтэлектуальныя прымітывы, зьняволеныя бальшавіцкім чорна-белым сьветаўспрыманьнем.

ПСЫХААНАЛІТЫЧНАЯ ГІПОТЭЗА

Згодна з Карлам Юнгам, радыкальнае супрацьпастаўленьне на «сваіх» са знакам плюс і «чужых» са знакам мінус па сутнасьці заўсёды трэба разглядаць як небясьпечны сындром, які завецца псыхічнай праекцыяй. Ахвярай гэтага сындрому становяцца людзі, пазбаўленыя аўтакрытыцызму, хоць часам з пэўным інтэлектуальным патэнцыялам. Усякія заганныя бакі ўласнай асабовасьці яны «сьпіхваюць» (выцясьняюць) у несьвядомае. Працэс выцясьненьня і псыхічная праекцыя могуць мець таксама калектыўны характар, калі пэўная група «адбельвае» саму сябе, а «чорныя» аспэкты, уласьцівыя ёй самой, перакідвае на ўсіх «іншых».

Маніякальнасьць і навязьлівасьць, зь якімі аўтары «Дороги в никуда» і «Конспирологии» даказваюць прадажную-фашыстоўскую-камічную сутнасьць апазыцыі, не пакідае

сумневу, што маем справу са згаданай праекцыяй. Непрывабныя, выпіхнутыя ў несьвядомае рысы, уласьцівыя дадзенай групе, праектуюцца на апазыцыю (якая натуральным чынам гуляе ролю архетыповага «іншага»).

Таму цалкам слушна было б паставіць пытаньне пра ролю даляраў у жыцьці той групы, якую прадстаўляюць аўтары фільму. Шчыра кажучы, ня надта хочацца калупацца ў фінансавых справах і выяўляць тыя ці іншыя грашовыя сэнсацыі. Абмяжуюся толькі да цытаты выказваньня аднаго з псыхіятраў: «Калі хтосьці мае грошы і траціць іх, ніякай праблемы няма. Але калі хтосьці няспынна думае пра грошы і паўсюдна, у любой справе і любым здарэньні бачыць грошы, то гэта ўжо сьведчыць пра псыхічнае адхіленьне». Так яно і ёсьць: «даляравая жарсьць» вельмі моцна даймае аўтараў згаданых фільмаў. Паўсюль і заўсёды ў дзеяньнях праціўніка ім бачацца грашовыя купюры. «Для нячыстага ўсё навокал – нячыстае», – казаў сьв. Аўгустын.

ДВА «ФАШЫЗМЫ»: БЕЛ-ЧЫРВОНА-БЕЛЫ І ЧЫРВОНА-ЗЯЛЁНЫ. ЯКІ ЛЕПШЫ?

Больш важнай, чымся даляры, справай ёсьць значэньне фашызму. Як вядома, «тыповы апазыцынэр» у афіцыйнай прапагандзе – гэта нашчадак фашыстаў пад бел-чырвона-белым сьцягам, новае ўцелаўленьне калябарантаў 1941–1944 гг.

Тое, што тут таксама маем справу з псыхічнай праекцыяй, няма сумневу. Для аднаго вядомага дзяржаўнага дзеяча «палітыка Гітлера 1930-х гг. ёсьць тым, што сёньня патрэбна для Беларусі». Падчас памятнай «ідэалягічнай» прамовы ў сакавіку 2003 г. прэзыдэнт Лукашэнка ж цалкам станоўча згадваў Садама Хусэйна, аднаго з найбольш жорсткіх і крывавых азіяцкіх сатрапаў. Асабліва даспадобы прэзыдэнту была гатоўнасьць ірацкага народу змагацца за «свайго Садама», абараніць яго перад «амэрыканскімі агрэсарамі». З кантэксту гаворанага было ясна, што ідэалягічная апрацоўка беларускага

грамадзтва ставіць перад сабой менавіта такую мэту: ператварэньне беларусаў у абсалютна паслухмяных рабоў абсалютнага валадара.

Нельга забываць, што паміж нацызмам і савецкім камунізмам няма сутнаснай розьніцы, як даказаў у тэорыі і практыцы Аляксандар Дугін, стварыўшы ў Расеі ідэалёгію і партыю пад шыльдай «нацыянал-бальшавізму», якая пасьпяхова сынтэзавала фашызм і камунізм. Такім чынам, усіх, хто ваяваў на баку Сталіна, таксама можна было б назваць «калябарантамі», якія змагаліся супраць уласнага народу, паколькі на руках маскоўскага сатрапа была кроў дзясяткаў тысячаў беларусаў, прычым найлепшых. Толькі праблема ў тым, што ані гітлераўскія, ані сталінскія калябаранты ня мелі тады магчымасьці змагацца за сваю краіну, за Беларусь. У гэтым трагізм і адных, і другіх, адсюль і адны, і другія заслугоўваюць індульгенцыі (вядома, тыя, хто не заплямiў сябе крывёй).

Як бы там ні было, ані адраджэнцы пачатку XX ст., ані адраджэнцы пачатку 1990-х не атаясамляліся з ідэалёгіяй фашызму. Калі параўноўваць «насычанасьць фашызмам» двух сьцягоў – нацыянальнага бел-чырвона-белага і савецкага чырвона-зялёнага, то трэба гэтак сьцьвердзіць: сваяцтва бел-чырвона-белага сьцягу з фашызмам мае *акцыдэнтальны* характар, у той час як сваяцтва чырвона-зялёнага з фашызмам – *субстанцыянальны* характар. Саюз беларускіх адраджэнцаў з фашызмам меў усяго толькі сытуацыйны, выпадковы, вымушаны рэаліямі характар, быў праявай безвыходнага становішча, быцьця «паміж молатам і кавадлам». Ужо з даўніх часоў вядомы этычны прынцып: каб ацаніць дзеяньне як злое, трэба паказаць, што яно было ўчынена *сьведама* і *добраахвотна*. Калі для беларускіх адраджэнцаў ваеннай пары альтэрнатывай была барацьба за маскоўскага сатрапа, то пра добраахвотнасьць гітлераўскіх калябарантаў ня можа быць гаворкі.

Але нават калі і прымем, што бел-чырвона-белы сьцяг быў запэцканы фашызмам, то кроў тысячаў нявінных беларусаў, якія памерлі за гэты сьцяг у выніку сталінскіх рэпрэсіяў перад і

пасьля вайны, змыла нават па некалькі разоў гэтыя плямы. Ён застаецца адзіным сьцягам, які можа аб'яднаць усе грамадзкія, культурныя і палітычныя сілы Беларусі (і дэ-факта яднае). Ён ня ёсьць выключна сымбалем нацыяналістаў, як гэта апантана навязваюць афіцыйныя прапагандысты, пад ім ахвотна выступаюць і лібэралы, і сацыял-дэмакраты, якія як могуць адгароджваюцца ад нацыяналізму.

А вось што тычыцца камуна-фашыстаў, то ясна, што яны ня могуць выступіць пад гэтым сьцягам. Ён у іх выклікае зразумелыя фобіі, бо, па-першае, ставіць пад сумнеў догму аб страчаным раі, якім быў Савецкі Саюз, па-другое, разбурае прымітыўную чорна-белую аксіялёгію, а што горш, па-трэцяе, сымбалізуе канец панаваньня фальшывых багоў: Маркса, Леніна, Сталіна. Расставаньне зь любай рэлігіяй ніколі не было лёгкім. Таму няма нічога дзіўнага, што ў змаганьні з нацыянальнымі сымбалямі столькі рэлігійнай рыторыкі.

«НОВЕЙШАЯ ИСТОРИЯ» = ГІСТОРЫЯ ЗБАЎЛЕНЬНЯ

Nihil novi sub sole (Нічога новага пад сонцам).

Эклезіяст

Калі фільмы кшталту «Конспирология» і «Дорога в никуда» зьяўляюцца прадуктам ваяўнічага лукашызму, то «Новейшая история» явіцца як памяркоўная ягоная вэрсія. Тое, што дазваляе ўспрымаць гэту сэрыю фільмаў як больш-менш цывілізаваны прадукт, гэта прысутнасьць аналітыкаў кшталту Дракахруста, Заікі ці Падгола, а нават нейкая бачнасьць плюралізму. Тым ня менш, як тыя, так і гэтыя фільмы трэба разглядаць як праяву *рэлігійнага сьветаўспрыманьня*, своеасаблівую «гісторыю збаўленьня» з тымі самымі догмамі, тымі самымі багамі і тымі самымі дэманамі.

ПРА ГРЭХ ПЕРШАРОДНЫ, АНАРХІЮ І СТАБІЛІЗАЦЫЮ

Інтэрпрэтацыя памятных віскулёўскіх падзеяў у афіцыйнай прапагандзе добра вядомая. Тыя, хто падпісалі акт аб дэмантажы СССР і ўтварэньні СНД, называюцца «дзяржаўнымі злачынцамі» і «тайнымі агентамі» (пашкадавалі б хоць заслужанага дзеяча беларуска-расейскай інтэграцыі, Барыса Ельцына). У чым трагедыя, у чым злачынства? «Мы атрымалі па-барбарску разбураную краіну» – лямантуе колішні дэпутат Генадзь Казлоў, не патлумачыўшы, у чым заключаецца гэтае «барбарства». Не іначай, для спадара Казлова працэс стварэньня Савецкага Саюзу шляхам крывавага гвалту і хранічнага тэрору быў цалкам цывілізаваны, а вось «разбурэньне» гэтага монстра шляхам перамоваў і супольнага прыняцьця пагадненьня было прыкладам «барбарства». Цікавая крытэрыялёгія. Дзеля справядлівасьці зацеміць трэба, што роля Ельцына, Краўчука і Шушкевіча была не такой ужо і вялікай: падпісаньне віскулёўскага пагадненьня было адно толькі афармленьнем фактычнага стану. Савецкі Саюз развальваўся і гніў у выніку ўнутраных супярэчнасьцяў. СССР напрыканцы 1980-х нічым не адрозьніваўся ад маўзалееўскай мумііі свайго заснавальніка, а роля ЦК КПСС зводзілася толькі да прыманьня рытуальных захадаў для яе бальзамаваньня. І ад калі гэта канстатацыя «пацыент памёр» стала барбарствам і дзяржаўным злачынствам?

Але рацыянальныя аргумэнты тут ні пры чым. Для фанатычных русафілаў-беларусафобаў, спавядальнікаў марксісцка-ленінскай веры гэта была сапраўды трагедыя, і трэба да іх паставіцца з пэўным спачуваньнем. Канец Савецкага Саюзу – гэта свайго роду «сьмерць бога». Гома саветыкус усьвядоміў сваё *vacuum existentiale*, адхлань уласнага быцьця і спалохаўся: як далей жыць, калі няма духоўна-маральнага хрыбта? Хто вінаваты?

Цікава, што ворагі ёсьць ня толькі звонку, яны таксама – хочацца сказаць – унутры нас. Менавіта гэта сугеруе выказваньне таго ж самага Казлова: «...але ў канчатковым пляне мы ўсе – усе да аднаго – удзельнічалі ў гэтым працэсе».

Гэты «акт скрухі» выглядае як акт ачышчэньня: прызнайма, што і мы самі ўчынілі гэты першародны грэх.

У той час, як Казлоў гатоў з жалем у сэрцы прызнаць, што «ўсе да аднаго прымалі ўдзел у гэтым працэсе», былы першы сакратар ЦК КПБ Анатоль Малафееў лічыць, што ён бы змог прадухіліць гэту трагедыю (то бок, ён ня ўдзельнічаў у гэтым грахоўным працэсе). Яго выказваньне дастаткова калярытнае, каб зацытаваць у арыгінале:

Если б я был там, (…) я мог разговаривать с первыми лицами вот так, как с вами теперь, и ещё более конкретно, потому что я их десятилетия знал, сказал бы: што вы, хлопцы, думаеце – так бы на беларускую мову перавёў бы іх. Ну куда вы, как гаварыцца, нягоднае дзела вы зацеялі.

Што ж, невядома, ці ад такіх словаў Савецкі Саюз акрыяў бы, ці яшчэ больш заваліўся. Як бы там ні было, ён разваліўся, дамовы падпісаны былі, і трэба неяк жыць. А жыццё пасьля «трагедыі» прадстаўлена ў фільме пры дапамозе сэрыі сугестыўных вобразаў: анархія, натоўпы мітынгоўцаў, купоны, бойкая кабета, якая публічна наракае на малую зарплату, кавалі, якія даводзяць, што ім бялок патрэбен, а купіць няма за што, прыватызацыя, карупцыя – паўсюль шалее нейкая неапанаваная стыхія. Пад гэтыя вобразы падкладзена лёгкая, амаль камэдыйная музыка, а ў цэлым ад усяго паўстае ўражаньне, што пэрыяд 1991–1994 гг. – гэта суцэльная камэдыя, пад якой хаваецца Бяда і Трагедыя. Досыць дзейсны маніпуляцыйны сродак.

Так, у сацыяльна-эканамічным пляне пэрыяд «бескаралеўя» быў цяжкім пэрыядам. Толькі ці не партыйная намэнклятура, родам з Савецкага Саюзу, несла адказнасьць за тармажэньне рэформаў і хаос у працэсе прыватызацыі? Добрым камэнтаром зьяўляецца выказваньне эканаміста Леаніда Заікі, што пасьля распаду СССР улада ў Беларусі апынулася ў руках «няздольнай намэнклятуры» ды «недасьведчаных дэмакратаў». Дадаць тут трэба толькі тое, што калі дэмакраты выказвалі такое-сякое імкненьне да набыцьця досьведу, намэнклятура ўзяла курс на

папулізм – выбітны сродак на ўтойваньне ўласнага дылетанцтва. Найбольш здольны сярод папулістаў-дэмагогаў меў рэальныя шанцы перамагчы.

Прафэсар Пётар Капітула, выступаючы ў фільме, прыкмеціў, што «калі маем працяглы эканамічны і палітычны крызіс, то першаю справай мусіць быць стабілізацыя». Гэта так, толькі стабілізацыя бывае рознай: можна стабілізоўваць экамноміку цераз дэталёва распрацаваныя рэформы, а можна стабілізаваць празь «дзяржымордзтва». Няцяжка здагадацца, які варыянт стабілізацыі быў абраны пасьля ліпеня 1994-га.

«НЕВЯДОМАЕ РАНЕЙ СЛОВА: КАРУПЦЫЯ»

Перад тым, як надышоў гэты сьветлы дзень – 10 ліпеня 1994 г., была антыкарупцыйная эпапэя, насычаная падзеямі і эмоцыямі.

Я вам як прафэсіянал гавару, – запэўнівае Міхаіл Сазонаў наконт антыкарупцыйных прамоваў Лукашэнкі, – *кожны прыведзены факт быў абсалютна праўдзівы, гэта быў менавіта факт.*

Ну, калі гэта слова прафэсіянала, то спрачацца няёмка. Толькі зацеміць трэба, што такое нагрувашчаньне прыслоўяў і прыметнікаў вакол слова «факт» – ня дужа прафэсійны прыём. Міжволі ўзьнікае падозра, што нешта ня так з гэтым фактам. У выказваньні зашмат экспрэсантаў, каб успрымаць яго як апісальна-справаздачнае.

Пасьля выказваньня «прафэсіянала» на пару сэкундаў зьяўляецца фрагмэнт прамовы тагачаснага дэпутата ВС 12 скліканьня Аляксандра Лукашэнкі. На добра вядомай гаворцы будучы прэзыдэнт грымеў:

Вы говорите, Станислау Станиславович, что не надо искать

виновных. Надо, Станислау Станиславович, надо. (...) Каждый за своё должен ответить.

Асабліва экспрэсіўным атрымалася слова «ка-а-аждый», што надало выказваньню адносна ве-е-ельмі важных справаў ве-е-ельмі камічнае адценьне.

Антыкарупцыйная кампанія маладога дэпутата натрапіла на розныя перашкоды з боку ўладу трымаючых. З аднаго боку, спэцслужбы перашкаджалі, а з другога боку, нейкія няўдзячнікі выдумалі, каб прынізіць ролю антыкарупцыйнае камісіі, што Шушкевіч быў быццам бы скінуты толькі за «скрынку цьвікоў». Дзьмітры Булахаў сфармуляваў тут такі сэнсацыйны тэзіс, што нават сама прапанова Шушкевіча паставіць на чале антыкарупцыйнай камісіі А. Лукашэнку была элемэнтам антылукашэнкаўскай задумы! Даўпраўды, «кансьпіралёгія» высокага палёту.

Іншым крокам ворагаў было ініцыяваньне дыскусіяў вакол узроставага цэнзу. «Ад самага пачатку было зразумела, хто будзе прэзыдэнтам, – кажа Булахаў, – яшчэ выбары не былі расьпісаны, а ўжо было зразумела». Раз так, раз усім было зразумела, то ўсе дружна пачалі змагацца за тое, каб падняць узроставы цэнз.

Яны разумелі, – кажа зноў той жа Булахаў, – *што калі апусьцяць узроставы цэнз да 35, прэзыдэнтам становіцца Лукашэнка. Але мы аказаліся хітрэйшыя... не, мы не хітрэйшыя, мы папросту былі разумнейшыя за іх. Мы таксама гулялі на гэтых супярэчнасьцях. Яны пагадзіліся на 35-гадовы цэнз, недаацэньваючы кандыдата.*

І хай хто разумны расшыфруе: калі «яны разумелі», што прэзыдэнтам стане Лукашэнка ў выпадку абніжэньня цэнзу, значыць, даацэньвалі яго. Але – аказваецца – апусьцілі цэнз, «недаацэньваючы» яго. Значыць, водле Булахава, яны даацэньвалі і адначасова недаацэньвалі, разумелі і адначасова не разумелі. Відаць, што некаторым «закон ня пісаны», у тым

ліку і закон лёгікі. І як тут ня ўспомніць адну з расейскіх сэктаў, чальцы якой выконвалі рэгулярна рытуальны танец, асновай якога было рытмічнае і хуткае паўтараньне словаў «так-не-так-не-так-не», якое суправаджалася кружэньнем вакол сябе на правай назе. Гэты рытуал «так-не» служыў самаўвядзеньню ў стан трансу і эўфарыі. Спадар Булахаў, можа, і ня ставіць мэты ўвесьці сябе самога ў такі транс, але, напэўна, тактыка «так-не», ужытая ў гэтых фільмах, спрыяе гіпнатызацыі гледачоў.

ПРА «ВЫДЗЯЛЕНЬНІ НА ФІЛЯЗАФІЧНА-ДЭМАГАГІЧНЫМ ФОНЕ»

...Пачалася перадвыбарная кампанія. Розныя былі кандыдаты і розныя іх лёзунгі. Пазьняк, напрыклад, казаў: «Для мяне асноўным крытэрам зьяўляецца праўда. Я прынцыпова не займаюся папулізмам». Дубко пастуляваў, каб «словы і справы не разыходзіліся», Новікаў жадаў, каб «кожны рабіў сваю справу». Але

...на філязафічна-дэмагагічным фоне выдзяляліся лёзунгі яшчэ аднаго кандыдата: «Я чалавек здаровага сэнсу. І ў палітыцы, і ў эканоміцы рабіць трэба ад вытворчасьці, ад людзей, тады прыйдзем да якіхсьці мадэляў. Толькі здаровы сэнс,

– гэтак прамаўляў кандыдат, наконт якога «загадзя было зразумела».

«Здаровы сэнс» адыграў сваю ролю. Для Станіслава Багданкевіча здаровы сэнс выявіўся ў такім разумаваньні: «Ясна было, што Кебіч ня будзе праводзіць рэформаў. Былі нейкія надзеі на Лукашэнку». «Ён здолеў патрапіць у балявыя кропкі беларускага народу», – прыкмячае Юры Дракахруст і згадвае пра аднаго з дыпляматаў, які «сеў на хвост» камандзе Лукашэнкі, паглядзеў, як яго ўспрымаюць людзі і адбіў тэлеграму ў сваю краіну: «Прэзыдэнтам будзе Лукашэнка».

«Але прадстаўляць справу, быццам усё гэта бралася з памылак іншых кандыдатаў, значыла б занадта спрашчаць справу. Ён быў запатрабаваны часам», – кажа дыктар з-за кадру. «Ён стаў прэзыдэнтам задоўга да свайго абраньня, – запэўнівае, крыху перафразуючы раней ужо сказанае, Булахаў. – Героі не зьяўляюцца зьніадкуль».

У фільме можна было пабачыць, у чым палягаў гэты гераізм і як завязвалася тая патаемная еднасьць паміж народам і Лукашэнкам. Вось малады кандыдат прыбывае ў свой радзімы Шклоў. Невялічкі натоўп сабраўся на яго прывітаньне. Лукашэнка набліжаецца. «Умніца наша, умніца», – чуваць поўныя ўзрушэньня словы пажылой кабеты. Іншая жанчына пачынае чамусьці плакаць, Лукашэнка яе супакойвае; хтосьці задае пытаньне, якія будуць яго першыя крокі, адказ гучыць такі: «А я ўжо сказаў, спачатку з жулікамі будзем разьбірацца, а потым з усімі астатнімі», – у адказ чуюцца адабральныя вохканьні і аплядысмэнты. Вось яна, таямніца еднасьці паміж народам і ягоным абраньнікам: не стваральная ідэя, не жаданьне будаваць, аб'ядноўваць, адраджаць краіну, а прымітыўная жарсьць «разьбірацца», шукаць ворагаў надоўга і накрэпка аб'яднала народ і прэзыдэнта.

Нягледзячы на «волю вышыняў» і бясспрэчны посьпех «на нізінах», нямала прыйшлося і намучыцца, каб здабыць прэзыдэнцкую пасаду. Вось бачым, як Лукашэнка выкрывае блізу мільёна фальшывых бюлетэняў, надрукаваных у МУС. «Каманда Кебіча задзейнічала адміністрацыйны рэсурс напоўніцу», – чуем ад камэнтатараў. Карэспандэнт дзяржрадыё ў 1994-м Уладзімер Кудрынцаў згадвае пра асобаў «з высокіх міліцэйскіх чыноў», якія перашкаджалі Аляксандру Рыгоравічу дайсьці да ўласнага кабінэту. Жанчына расказвае пра затрыманьне кабет, якія зьбіралі подпісы за Лукашэнку, «а адна зь іх мела дома пяцёх дзяцей». Наяўнасьць мноства перашкодаў з боку людзей Кебіча пацьвярджае і Ўладзімер Падгол, які ў тыя часы быў у камандзе Пазьняка: «Лукашэнка стаў прэзыдэнтам ужо ў першым туры. Я некалькі месяцаў разьбіраўся і высьветліў, што кебічаўцы папросту зладзілі другі тур».

І ў гэты момант варта пільна прыслухацца да словаў зычлівага Міхаіла Сазонава, які, мабыць, сам таго ня хочучы, прагаварыўся наконт таго, у чым палягае палітычная этыка дзеючага прэзыдэнта:

Я вось памятаю Чачэрскі раён (Гомельская вобласьць). Старшынём выканкаму быў Зарэцкі – такі гаспадарнік строгі, дык ён, відаць, ужыў там адміністрацыйны рэсурс зь яўным перагібам, ну і там Кебіч выйграў. Але ён застаўся, я памятаю... Лукашэнка вось выдатна ведаў... (тут невялічкая паўза) – ну я тут з гумарам гавару, вы разумееце - вось гэта сапраўдны гаспадар раёну! Не было падзелу на «свае», «не свае», за Кебіча ці не.

Сказанае «з гумарам» мае дужа сур'ёзны зьмест. Ну, вядома ж, нашто пазбаўляцца такіх прафэсійных фальсыфікатараў. Такія цяпер у цане.

АКЦЫЯ – РЭАКЦЫЯ. ПЕРАМОГА РЭАКЦЫІ

Фільмы па «Новейшей истории» пераважна не даюць магчымасьці захаваць нейкую дыстанцыю ці самастойна ацаніць падзеі. Любое здарэньне, любы «факт» пададзены са знакам плюс або мінус. Глядач ня мае права думаць. Яго абавязак – прымаць усё як канчатковую ісьціну.

Але ёсьць у гэтых фільмах пара месцаў, якія, здавалася б, даюць нейкі «глыток паветра». Такім месцам ёсьць, між іншым, пачатак трэцяга фільму, калі дыктар з-за кадру абвяшчае, што гаворка будзе весьціся пра «першыя крокі прэзыдэнта, пра першыя посьпехі і памылкі». Пахвальна, што аўтары адважыліся ўвесьці катэгорыю «памылкі прэзыдэнта».

Толькі праблема ў тым, што ані ў трэцім, ані ў наступных фільмах нават намёку няма на якуюсь пагрэшнасьць прэзыдэнта. Былі, праўда, згадкі пра загалоўкі газэтаў у соты

дзень прэзыдэнцтва: «Хаджэньне прэзыдэнта Аляксандра Лукашэнкі за тры гары, або небясспрэчныя, але шчырыя думкі аб першых 100 днях прэзыдэнта Беларусі» («Советская Белоруссия»). «100 дзён прэзыдэнцтва: цэны ўздымаліся, «зайчык» падаў, міністры гублялі партфэлі, але народ надзеі не губляў» («Рэспубліка»), але яны тут жа былі «нэўтралізаваны» адпаведным камэнтаром.

Крытычныя загалоўкі перадавалі атмасфэру крытычнае эпохі, – кажа дыктар з-за кадру. – *Што можна было зрабіць за 100 дзён?*

Адказ на гэтае, здавалася б, рытарычнае пытаньне, дае Сяргей Лінг:

Мы займаліся тушэньнем пажару, які загарэўся ў вялікім доме. (...) Тут ня лёзунгі патрэбны, а трэ' было ісьці па ваду і заліваць... Так, мы папросту выконвалі ролю пажарнікаў.

Наконт таго, што менавіта «вогнетушэньне» адбывалася і трывае ўсьцяж, няма сумневу. Душэньне ўсякай праявы свабоднае думкі, заліваньне прапагандысцкай вадой творчых ініцыятываў, барацьба з культурай і нацыянальнымі сымбалямі – вось яно, існае «вогнетушэньне».

Вельмі характэрным ёсьць выказваньне Паўла Шыпука, старшыні Гомельскага аблвыканкаму, які наракае, што «весьці работу пад крытычным позіркам, прымаць рашэньні гаспадарчага пляну было надзвычай складана». Не прывучаная да крытычных позіркаў посткамуністычная намэнклятура аж да сёньня страшэнна баіцца дэмакратыі і «тушыць» яе заядла і апантана.

Інтрыга «Новейшей истории» ня дужа арыгінальная. «Міна запаволенага дзеяньня», «падвойныя стандарты», шлях прэзыдэнта «скрозь церні» – усё гэта элемэнты той самай «кансьпіралёгіі». Інтрыга арганізавана вакол вядомых матываў: акцыя (злых дэманаў) – рэакцыя (асьвечанага манарха), акцыя – рэакцыя, акцыя – рэакцыя. Лёзунгам стваральнікаў фільму

можа быць: «Хай жыве рэакцыя!»

СТЭРЫЛІЗАЦЫЯ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ

Барацьба з інтэлігенцыяй – гэта для лукашэнкаўскіх прапагандыстаў не праблема. На прыкладзе рэпартажу Юр'я Пракопава з 8 красавіка 2004 году прыгледзьмася некаторым прыёмам, стасаваным у барацьбе з інтэлігенцыяй.

Вось малады рэпартэр, стоячы на фоне Палацу мастацтва, жартоўным тонам даносіць, што зьезд беларускай інтэлігенцыі пачаўся ад... бойкі паміж Станіславам Шушкевічам і Алесем Белым. Ізноў маем камэдыю, а вось мараль гэтай камэдыі: палітыкі-аднадзёнкі спрабуюць выкарыстаць інтэлігенцыю ў сваіх карысьлівых інтарэсах. «Ничегонеделание, оно же борьба за демократию» – гэта зьмест жыцьця і дзейнасьці дэмакратычнай інтэлігенцыі.

«У людзей проста няма адказнасьці», – сыгналізуе Таісія Бондар. «Пазьняка... надта ж яго занесла ўправа», – кажа дэкан філфаку Гомельскага дзяржунівэрсытэту Аляксей Лаўшук. (Немавед чаму рэпартаж пра канкрэтны зьезд пераключыўся на абстрактныя пытаньні з галіны палітычнай філязофіі.) Потым зьяўляецца заклапочаны заклік Віктара Праўдзіна: «Дайце чалавеку быць сабой!» У чым тут заключаецца «быцьцё сабой», якое дачыненьне меў да гэтага зьезду Пазьняк, пра якую адказнасьць гаворыць спадарыня Бондар – не зусім ясна. Нейкую ўсё ж яснасьць, можа, удасца здабыць, калі зынтэрпрэтуем сказанае – як таго і патрабуюць прынцыпы гермэнэўтыкі – у шырэйшым кантэксьце, у кантэксьце таго крэда, якое і аб'ядноўвае спавядальнікаў савецкай веры. Калі так, то пад словам «адказнасьць» трэба разумець «ляяльнасьць», Пазьняк тут зьявіўся папросту як сымбаль усіх неляяльных у стасунку да савецкае веры, а «быць сабой» – гэта застацца гома саветыкусам. Вось такая, браце, кансьпіралёгія – хочацца словамі дыктара фільму «Конспирология» зацеміць.

Гэтую інтэрпрэтацыю, здаецца, пацьвярджаюць словы Віктара Кірыенкі: «Калі ты нармальны чалавек, нармальна мысьліш...

дык рэалізуй сябе ў навуцы, навошта на барыкады?» Так, навукоўцу і творцы сапраўды намнога лепш і ўтульней на сваёй працы, але – выкарыстоўваючы словы самога прэзыдэнта – «время нелёгкое». Калі зачыняюцца такія навучальныя ўстановы, як Беларускі гуманітарны ліцэй або Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт, няспынна аказваецца ціск на Нацыянальную Акадэмію навук ці перасьледуецца грамадска-культурная арганізацыя, як Саюз палякаў Беларусі, то як тут не пайсьці «на барыкады»? Да таго ж афіцыйныя, г. зн. «нармальна мысьлячыя» воі таксама нярэдка зьяўляюцца на культурных і палітычных барыкадах, прадукуючы адыёзныя творы тыпу «Конспирология» ці «Дорога в никуда». І, мабыць, не за бясплатна...

На нейкі момант спадар Пракопаў ператвараецца ў разважлівага аналітычнага філязофа і кажа: «Арганізуецца зьезд «дэмакратычнай» інтэлігенцыі, а ці бывае інтэлігенцыя «недэмакратычная» – такога пытаньня яны ня ставяць». Ах, спадару Пракопаў, бывае, яшчэ як бывае. Рэкамэндаваць бы вам, скажам, тэкст Мікалая Бярдзяева пад назовам «Філязофская ісьціна і інтэлігенцкая праўда», альбо хаця б тэкст з савецкага часопісу «Вопросы философии» часоў перабудовы пад назовам «Анатомия репрессивного сознания». І тады выявіцца, што недэмакратычная інтэлігенцыя – гэта ўстойлівы і амаль паўсюдны фэномэн. У Беларусі гэтай недэмакратычнай інтэлігенцыі ня так ужо, можа, і шмат, але затое кожны экзэмпляр такога інтэлігента асабліва цэніцца рэжымам.

Падзел на «дэмакратычную» і «недэмакратычную» інтэлігенцыю цалкам апраўданы і зразумелы, а вось які сэнс мае падзел на «сапраўдную» і «несапраўдную» інтэлігенцыю, які прасоўваецца ў рэпартажы, і сапраўды няясна.

Сапраўдныя інтэлігенты – каторыя працуюць на карысьць народу. А калі людзі робяць нешта адваротнае... я хачу задаць пытаньне, кім яны ўвогуле ўпаўнаважаныя? Я нават абурана выкарыстаньнем імі самога слова «інтэлігенцыя», – скардзіцца спадарыня Бондар.

Бярдзяеў у згадваным тэксьце «Філязофская ісьціна і інтэлігенцкая праўда» вельмі шырока аналізуе ролю катэгорыі «на карысьць народу» ў сьвядомасьці крытыкаванай ім інтэлігенцыі. І паказвае, што народніцтва ніяк не гарантуе «сапраўднасьці», а хутчэй, наадварот, вядзе да інструмэнталізацыі «ісьціны».

Але можна крыху зьмякчыць выснову Бярдзяева і пагадзіцца, што «праца на карысьць народу» – сапраўды важны паказьнік «інтэлігентнасьці». Але тады мусім запытацца ў Таісы Бондар, *хто вызначае* крытэр карыснасьці: улада ці сумленьне творцы? Што рабіць, калі я, напрыклад, *у сумленьні* сваім пераканаы, што культурнае адраджэньне *больш карыснае* для народу, чымся савецкая опцыя, навязаная ўладай? Але наўрад ці Бондар або Пракопава хвалюе праблема сумленьня.

Здавён было так, што «мысьляр і пясьняр» выконвалі *прарочую* функцыю ў сваім грамадзтве. Нярэдка «мысьляр і пясьняр» мусілі сустрэцца з варожасьцю з боку суграмадзянаў і перасьледам з боку ўладу трымаючых. Сакрат, Ісая, Ерамія, Ян Хрысьціцель, Саванарола – гэта сапраўдныя «героі духу», якія засталіся вернымі свайму сумленьню да канца.

Заўсёды былі таксама прарокі-падлізы, творцы-канфармісты, няздольныя ўзьняць голас у абарону вышэйшых каштоўнасьцяў, калі трэба было нешта сказаць насуперак меркаваньню бальшыні альбо волі валадара. Такія вельмі хутка сыходзяць на сьметнік гісторыі.

Інтэнцыя афіцыйнае прапаганды – стэрылізаваць інтэлігенцыю.

* * *

«Нянавісьць», «Дзеці хлусьні», «Дорога в никуда»... Афіцыйная прапаганда вельмі насычана разбуральнай, ненавісьніцкай фразэалёгіяй. Прапаганда, як той тэрмінатар, не спыняецца ні перад чым: ці то будуць нешчасьлівыя жонкі зьніклых

палітыкаў, ці звычайныя «штатныя» апазыцыянэры – усіх трэба аплёўваць, растаптаць, зьнішчыць, калі яны хоць у нечым пагражаюць Племянному Адзінству. Гэтыя прапагандысты ня бачаць, аднак, таго, што нянавісьць, хлусьня і нігілізм іх саміх пажырае. І раней ці пазьней ім прыйдзецца паўтарыць словы Іосіфа Сталіна: «Прапашчы я чалавек...»

Кракаў, чэрвень 2005 г.

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/07
[image]

АНДРЭЙ КАЗАКЕВІЧ
палітоляг, галоўны рэдактар часопісу «Палітычная сфера». Апошнія публікацыі – аналізы «Шумэр: кансэрватыўная мадэль сацыяльных зьменаў» і «Дэканцэптуалізацыя крэольства» (Палітычная сфера. 2005. № 4).

Андрэй Казакевіч
Суперновая сучаснасць: Рэклама сістэмы і канец гісторыі

Фільм, які абмяркоўваецца ў гэтым артыкуле:

«Новейшая история» (12 серый). Аўтары: Юры Казіятка, Рыгор Кісель, Віктар Шавялевіч, Віктар Чамкоўскі, Аляксандр Рыдван // АНТ, эфір канец лістапада – пачатак снежня 2004 г.

Але чаму пры тлумачэнні пэўнае гістарычнае эпохі мы пытаемся пра карціну свету? Ці кожная эпоха гісторыі мае сваю карціну свету, пры тым, каб сама кожны раз была заклапочана пабудоваю сваёй уласнай карціны свету?

М. Хайдэгер

Выказванне М. Хайдэгера, вынесенае ў якасці эпіграфа, цікавіць нас не параўнаннем еўрапейскай мадэрнасці з сярэднявеччам і антычнасцю, а ў значна больш вузкім сэнсе. Цягам практычна

ўсіх 1990-х палітычная прастора мысліла катэгорыямі праекта нацыянальнага «адраджэння», дэмакратычнай «вестэрнізацыі», савецкай/славянскай «рэстаўрацыі». Але сёння палітычнае змаганне ідзе не паміж праектамі, а паміж карцінамі свету. Значна больш важна не паказаць, «якім можа быць свет» і як трэба пераўладкаваць грамадства, а даць назву існым рэчам і з'явам. Як ужо адзначалася некаторымі аўтарамі, на практыцы выяўляецца, што спрэчкі пра *планы, змены і рэформы* не такія важныя, як пытанне пра тое, ці называць Беларусь «апошняй дыктатураю ў Еўропе» або «дынамічнай, нармальнай і сучаснай краінай». Барацьба ідзе паміж светлым, дынамічным і прагрэсіўным вобразам краіны (мова ўлады) і рознымі альтэрнатывамі, якія ўказваюць на «ненармальнасць» існуючага дзяржаўнага ладу.

Сімволіка праектнасці, такая ўжывальная ў 1990-х, практычна страціла сваю палітычную значнасць і рэпрэзентацыю на візуальным узроўні. Улада заклікала галасаваць «За Беларусь» (вельмі канкрэтную і наяўную), а адным з галоўных сімвалаў яе кампаніі становяцца контуры Беларусі ў шкляным шары, якія варта захоўваць. «Пяць крокаў да лепшага жыцця» апазіцыі таксама былі не праектам, але вобразам магчымай *іншай* Беларусі.

Увага да карціны свету ёсць, напэўна, агульнай прыкметай стабілізаванае свядомасці, якая ўжо некалькі гадоў назад прыйшла на месца «крызіснай», заснаванай на праектах.

Серыял з 12 фільмаў «Найноўшая гісторыя» («Новейшая история»), выраблены Агульнанацыянальным тэлебачаннем (АНТ), ёсць адной са спробаў прэзентаваць карціну палітычнага ландшафту і генеалогіі Беларусі з 1990 г. З'яўленне такога прадукту ёсць праявай агульнага імкнення да самаапісання дзяржаўнай «сістэмы» Беларусі і канструявання ўласнай (уладнай) генеалогіі. Яшчэ ў 2001–2002 гг. гэтае імкненне не было заўважна, усё абмяжоўвалася стандартнай прапагандай ды маргінальнымі інтэлектуальнымі канструкцыямі[1], але цяпер назіраецца перавытворчасць (выкліканая практычна неабмежаванай дзяржзамовай) розных канцэптуалізацыяў «беларускай мадэлі», версіяў беларускай генеалогіі ды

сімволікі «незалежнае ды суверэннае краіны» (па-за межамі мовы нацыянальнага «адраджэння», натуральна).

З улікам перавытворчасці мы маем вельмі розныя і якасна[1] зместам культурныя і ідэалагічныя прадукты, і тут «Найноўшая гісторыя» займае сваю нішу. У гэтым артыкуле мы прааналізаваць прэзентаваны ў ім новабеларускі праект ідэалагічнага дызайну. Гэта тым больш цікава, што дзякуючы сумневу, прайшоў доўгі шлях узгадненняў, цэнзуры і, тым не менш, шмат у чым прэзентуе іншы стыль і большасць прадуктаў беларускіх тэлевізійных каналаў.

Для апісання «Найноўшай гісторыі» трэба высветліць жанр і палітычны кантэкст. Серыял выклікаў чаканую негатыўную рэакцыю ў «крытычных» і «апазіцыйных» колах і авацыі ў «афіцыйных». Але гэтая рэакцыя палітычна матываваная і прадказальная, закладзеная ў сам прадукт, які не хавае таго, што ствараецца з пэўных палітычных пазіцыяў. І крытыкуецца звычайна менавіта гэтая пазіцыя, а не ён сам.

Жанр фільма відавочны – гэта апісанне (самаапісанне) уладнай «элітай» сваёй ролі і месца ў гісторыі апошніх 15 гадоў, «аналітычная кадыфікацыя вядомых міфаў, ідэалагем і сімвалічных вобразаў беларускай сістэмы». Апісанне, зробленае з пэўных (прычым цалкам відавочных) палітычных пазіцый і для пэўных палітычных патрэб[2]. Трэба адзначыць, што як прадукт свайго жанру фільм дастаткова паспяховы і нават «збалансаваны». Гэта значыць, што крытыка яго за недакументальны характар не мае пад сабою ніякіх падстаў, як і нараканне на неадпаведнасць *праўдзе*. Гэта менавіта выкладанне ўласнай версіі праўды, якая *павінна* стаць праўдай «нацыі» праз аналітычную стылістыку і выкладанне ўласнай візіі як «відавочнасці, падмацаванай здаровым сэнсам». У гэтым палітычная мэта серыяла, прычына фінансавання зусім не таннага праекта.

Калі аналізаваць агульны «ідэалагічны» фон стужкі, то ён толькі ў параўнанні з тупаватымі прапагандысцкімі кшталту «Канспіралогіі», але і сучаснымі расійскімі «дакументальнымі» фільмамі на ОРТ ці НТВ у стылі небудзь Мамантава яна выглядае дастаткова «нейтральнай»,

[1] Каштаўнасці, якія

[2] Цяжка

Найноўшай гісторыі

прапануе

дадаткова

Беларусі

2001–2002

гадоў.

Прынамсі, у большасці выпадкаў пазбягаюцца відавочнае паталогіі і непатрэбныя хвалебныя ацэнкі – у такую прапаганду ўжо цалкам могуць паверыць і тыя, хто са скепсісам ставіцца да успрымае навіны БТ.

Трэба адзначыць, што толькі частка серыяў ёсць выкладаннем уласна гісторыі – прыблізна, адна шостая. Потым ідуць, хутчэй, «аналітычныя» і, магчыма, зацягнутыя серыі пра адносіны Беларусі з Захадам і Расіяй (у якіх выкладаецца мала інфармацыі і якія шчыльна спалучаюцца з пустымі прапагандысцкімі сюжэтамі). Паступова ўзрастае колькасць палітычнай рэкламы, і апошнія дзве серыі выкананы цалкам у рэкламным стылі, дзе ад найноўшай гісторыі застаюцца толькі два элементы-сімвалы, да якіх робяцца ўстойлівыя адсылкі: крызіс і хаос пачатку 1990-х – стабілізацыя і парадак, якія прыносіць «разбудова выканаўчай вертыкалі» пасля прэзідэнцкіх выбараў 1995–1996 гг. Дарэчы, стыль стужак менавіта рэкламна-глянцавы («паказваць найлепшае, не казаць пра дрэннае»), а не звычайны прапагандысцкі, што можна лічыць крокам наперад у тэхналогіі афіцыёзу. У той жа час аўтары некалькі разоў губляюць пачуццё меры. Элітныя дамы, асабнякі і вялікія пакоі (як дасягненне беларускай «сістэмы») – гэта занадта крута. Па логіцы тут павінны прысутнічаць невялікія, але чыстыя і дабротныя кватэры з новаю мэбляй, каб не раздражняць людзей. Але глянцавы стыль накладвае свае адбіткі.

Як ужо было пазначана вышэй, «Найноўшая гісторыя» – фільм з прэтэнзіяй на адносную збалансаванасць, рафінаванасць ацэнак, цэнтральную візію, са значным ухілам да рэспектабельнасці і бляску, тэхналагічнасці і вялікага бюджэту. Серыял (асабліва пачатак) сапраўды мае карысны матэрыял па палітычнай гісторыі Беларусі. Ён, аднак, не раскрывае цэласнай карціны і сканцэнтраваны на акрэсленні генеалогіі палітычнай «сістэмы», зыходзячы з пастаўленых палітычных задач, але гэта не зніжае ягонай цікавасці.

Яшчэ большую цікавасць выклікае тое, што серыял стаў не аповедам палітычнай біяграфіі А. Лукашэнкі, але гісторыі і эвалюцыі ўсёй «сістэмы». Прынамсі, галоўныя ролі тут

чаканне
прапагандысцкага
эфекту для
патрэбаў
легітымацыі
і тыкненне
да
самаапісання. <

адыгрываюць не «прэзідэнт», які фігуруе практычна выключна як сімвалічны і арганізацыйны цэнтр, і не дзікаватыя «аналітыкі» (як у «аналітычных праграмах»), а бюракраты, сучасныя і былыя палітыкі, даследчыкі і іншыя досыць разнастайныя персанажы. Прысутнічае толькі самы мінімум маразматыкаў, якія «лаюць бэнээфаўцаў». Удзельнічае нават пэўная колькасць апазіцыйных палітыкаў і аналітыкаў, каб казаць пра пэўны ўзровень рэпрэзентатыўнасці (натуральна, што маніпуляцый з вобразамі і словамі тут досыць). Гэта фільм з пазіцыі і вачыма, умоўна кажучы, «*новай эліты*» – розных людзей, у якіх дзякуючы гэтай уладзе ўсё атрымалася. І рэкламуецца тут пераважна не прэзідэнт, як звычайна, а сістэма ўлады, спецыфічная палітычная і сацыяльная «мадэль», якая прэзентуецца як каштоўнасць, аснова дабрабыту і стабільнасці. З гэтага пункту гледжання паказальна функцыянаванне займенніка «мы» ў фразах розных персанажаў. «Мы адступілі ад абавязкаў дзеля міру і спакою», – кажа Уладзімір Канаплёў пры апісанні падзеяў 1996-га. Не проста «прэзідэнт», а «мы». Сяргей Лінг ужывае фразу кшталту «моладзь, якая прывяла яго (Лукашэнку) да ўлады», – не народ, сам прэзідэнт, але нейкія людзі, якіх Уладзімір Канаплёў называе «мы». Дзмітры Булахаў таксама часта кажа «мы зрабілі», «мы вырашылі» тады, калі звычайна кажуць «зрабіў прэзідэнт»[3].

Часам «Найноўшая гісторыя» прэзентуе адносна вольныя, улікам нарматыўных рамак палітычнай рэкламы, інтэрпрэтацыі. Напрыклад, аб’яўляецца і нават падкрэсліваецца, што Лукашэнка прыйшоў да ўлады без каманды, і яго перамога была інтэграцыяй у існуючую, але з новым сімвалічным капіталам. Калі літаральна ў некаторыя выказванні персанажаў, то Лукашэнку можна ўвогуле разглядаць як «праект», створаны напярэдадні выбараў.

Міхаіл Сазонаў з добрай усмешкай расказвае пра тое, як нейкі старшыня райвыканкаму («настоящий хозяин района») выкарыстоўваў адміністрацыйны рэсурс і здолеў забяспечыць перамогу ў раёне В. Кебіча. Лукашэнка пасля перамогі адпомсціў яму, і той яшчэ доўга працаваў на сваёй пасадзе; гэта пра пытанне законнасці, барацьбы з карупцыяй і

[3] Гэта, з напэўна, першы прыклад, у якім сістэму, а ўзгадваецца выкарыстанне палітычных тэхналогій для перамогі на выбарах

злоўжываннем. Некалькі разоў адзначаецца як натуральная і нармальная з’ява выкарыстанне адміністрацыйнага рэсурсу ўладнымі групамі ў палітычнай барацьбе 1995–1996 гг. Фігуруе нават меркаванне, што рэферэндум – «упрощенное обращение к людям» і што канстытуцыю ў 1996 г. ніхто, натуральна, не чытаў – усе проста галасавалі за прэзідэнта. Жарэс Альфераў выказвае сваю нязгоду з метадамі, якімі прэзідэнт рэарганізуе Акадэмію навук, потым, праўда, адразу пачынае адзначаць яго «агульную пазітыўную ролю», а Іван Антановіч прызнае памылкі ўлады падчас канфлікту ў Драздах (натуральна, вінаваты найперш Шушкевіч, але і самі зрабілі «не тое, што трэба»). Гэты шэраг можна дапоўніць словамі Мясніковіча пра «імперскія замашкі» расійцаў, пра якія «не пішуць у газетах». На гэтым дэманстрацыя «нейтральнасці» і крытычнасці сканчаецца.

Найноўшая гісторыя Беларусі складаецца з некалькіх этапаў-сімвалаў, кожны з якіх мае сваю сэнсавую нагрузку. Развал Саюза, крызіс-хаос першай паловы 1990-х, аднаўленне парадку ў 1994–1996 гг., дынамічнае і аптымістычнае развіццё пасля (фактычна з рэферэндуму 1996 г.). Сімволіка і героіка гэтых перыядаў часта дублюецца ў розных прадуктах афіцыйнай ідэалогіі і паступова кадыфікуецца ў пэўную генеалагічную цэласнасць.

Пачатак 1990-х. Крызіс і развал пачатку 1990-х выконвае функцыю універсальнай сметніцы, у якую можна скінуць усё негатыўнае, дэпрэсіўнае, паталагічнае, здрадніцкае і агіднае. Пасля гэтай эпохі любая іншая падаецца «нармальнай». Эпоха, якую ў фільме раз нават назвалі «крытычнай», калі дазвалялася крытычна ставіцца да ўлады. Часткова сімвалічны вобраз пачатку 1990-х ужо разладзіўся, але «Найноўшая гісторыя» прадстаўляе значна больш дэталізаваны і эмацыйны матэрыял.

Стабілізацыя. Сімволіка «стабілізацыі» звязана з цяжкім, але рашучым і няўхільным утаймаваннем палітычнага і эканамічнага хаосу – тушэннем пажару. Але гэтае ўтаймаванне мае свае выгадныя «кансерватыўныя» ўласцівасці, якія выразна адрознівалі Беларусь ад іншых краін, чый досвед, на думку аўтараў, быў разбуральным. Прэзідэнт імкнецца захаваць

пераймальнасць, прадказальнасць і дэманструе здольнасць ісці на кампрамісы, што не зусім праўда.

Сутнасць разважлівай і памяркоўнай стабілізацыі адлюстроўваецца ў фразах каментатара кшталту «сінтэз старых і маладых кіраўнікоў», «паспяховы баланс ва ўрадзе». Як вынік адсутнасці ўласнага кадравага патэнцыялу, новая ўлада здзяйсняе інтэграцыю з «адыходзячай генерацыяй». Нікому не помсціла[4].

Паміж дзвюма згубнымі крайнасцямі – талоны, карткі і «шокавая тэрапія» – абіраецца *трэці шлях* (гэта важны элемент сімволікі), які дазваляе паспяхова пераадолець крызіс, паступовыя, асцярожныя (гэтае слова ўжываецца асабліва часта), сацыяльна арыентаваныя захады, заснаваныя на «здаровым сэнсе»[5] і досведзе, а не на замежных тэарэтычных схемах і «ўказках чужых стратэгаў». Асноўная апора робіцца на ўласныя сілы. Ну і, натуральна, галоўным для «памяркоўнай і асцярожнай» палітыкі аказваецца «клопат пра людзей», выкананне перадвыбарных абяцанняў[6] – «знакаміты ўказ прэзідэнта *цэны назад*». Новая ўлада «ратуе краіну ад краху» праз увядзенне на прадпрыемствах прамога прэзідэнцкага кіравання, звальненне арганізатараў страйкаў 1994–1995 гг. і забарону на скарачэнне працоўных месцаў і павышэнне коштаў на камунальныя паслугі. Яна зусім не супраць рэформаў, не выступае за паступовасць, не супраць новых тэндэнцый, не прапануе асцярожны падыход. Асаблівай заслугай лічыцца ўвядзенне нацыянальнай валюты (з нейкіх прычын сам факт узгадваецца ў серыяле шмат разоў) як важнага атрыбута дзяржаўнасці.

Улада таксама не прымае «праграмы прыватызацыі, падрыхтаванай М. Чыгіром», што дазволіла захаваць дзяржаўную ўласнасць і кантроль над эканомікай. Роля прэм'ер-міністра М. Чыгіра (1994–1996) і старшыні Нацбанка С. Багданкевіча (1991–1995), як, дарэчы, і В. Кебіча, ухіляецца, ацэньваецца негатыўна, дарма што неаднаразова сцвярджаецца, што асноўная праца па эканамічнай «стабілізацыі» была праведзена менавіта ў гэты час. Трэба думаць, насуперак дзейнасці гэтых асоб.

[4] З пункту гледжання аналогія з «ўсё добра, што добра заканчваецца» (у кадры момант падпісання). Пачынаецца нейкая

Палітычная «стабілізацыя». Фармаванне сучаснага нацыянальнага рэжыму (паводле версіі фільма, «нармалізацыя» ды «стабілізацыя») праяўляюцца ў двух ключавых момантах: стварэнні «прэзідэнцкай вертыкалі» (што лічыцца вялікім дасягненнем) і рэферэндумах 1995–1996 гг. Гэта суправаджаецца збольшага слушнай крытыкай неэфектыўнасці працы органаў кіравання ў пачатку 1990-х.

Умацаванне ўлады – гэта выбар паміж тым, «ці быць адзінай краінай або нацыяй, падзеленай палітычнымі рознагалоссямі». Са стварэннем «вертыкалі» краіна робіцца кіраванай. Выхад газеты з «белымі плямамі» – гэта, натуральна, нармальная сусветная практыка пры пераходзе да дэмакратыі. Рэферэндум 1995 г. быў «захадам па аслабленні нацыяналістычных палітыкаў» і «важным ідэалагічным дзеяннем». Хоць увогуле крытыцы «нацыяналістаў» адводзіцца нечакана мала месца. Нацыянальныя сімвалы (бел-чырвона-белы сцяг і герб «Пагоня») «ненармальныя», акрамя традыцыйнага абвінавачання ў «калабарацыянізме» адзначаецца «пасяднасць у адмежаванні ад савецкае спадчыны», а новыя сімвалы названы «найбольш прымальнымі для насельніцтва і мэтазгоднымі з гістарычнага (!) пункту гледжання». «Аслабленне нацыяналістаў» ішло зусім не талерантнымі метадамі, далёкімі ад дэкларованага «пошуку згоды». У фільме прысутнічаюць кадры, дзе, у тэрміналогіі серыяла, «група энтузіястаў» здымае і рве дзяржаўны сцяг, чым не толькі парушае закон, але і абражае значную частку беларускага грамадства, якая з гэтага часу робіцца рэпрэсаванай, «апазіцыйнай» і негатыўнай ва ўсіх іншых значэннях. Агульнанацыянальнага «сінтэзу» ні на ўзроўні сімволікі, ні на ўзроўні грамадства не адбылося.

Дарэчы, фільм цалкам прапускае падзеі вясны 1996 г. (і вулічнага супрацьстаяння ўвогуле), масавыя акцыі пратэсту і сутыкненні ў Менску. Гэта вялікі дакументальны недахоп «гісторыі», тым больш, калі гэта зроблена наўмысна (для актуалізацыі вобразу «адноснага спакою»).

Падзеі рэферэндуму 1996 г. асветлены з відавочным імкненнем «карэктнага» іх прачытання, нават з пэўнай кропляй

нацыянальнага дынаміка (мітынгі, якія завяршаюцца жарсцівам і бойкамі з міліцыяй, пікеты пенсіянераў з надпісам «карупцыя»), якая ўвогуле ахоплівае ўсе сферы жыцця (у кадры трапляюць і навальна ўхваленыя засмучаны пенсіянер). І рантам зноў дынаміка (выява брашуры «Заканадаўчыя акты «Аб выбарах прэзідэнта»): Лукашэнка прымае прысягу. Цікава, што на Законе змешчаны сучасны герб (а не «Пагоня»), а Лукашэнка прымае прысягу на фоне

«прымірэння», і падаюцца як самы «складаны і драматычны эпізод найноўшай гісторыі Беларусі». Перад пачаткам галасавання пра рэферэндум пускаецца блок пра «прагрэс у эканоміцы», «пачатак росту» і г. д.

Міна пад канстытуцыйны лад была закладзеная самой сістэмай (не толькі створанай у 1994 г., але і камуністычнай), якая правакавала пастаянныя канфлікты паміж выканаўчай і заканадаўчай уладай (старая эліта не хацела здаваць свае паўнамоцтвы), што «неабходна было» стабілізаваць. Ініцыятыўмі былі не людзі і не кіраўнікі парламента, але «сістэма»[7], таму яе змена была неабходная, больш за тое (гэта асабліва падкрэсліваецца): непазбежная. «У Беларусі, прынамсі, гэта абышлося без стрэлаў і чалавечых ахвяр», – сцвярджаецца на фоне кадраў расстрэлу Белага дома ў Маскве 1993 г. Гэта суправаджаецца маналогам Рыгора Васілевіча пра тое, наколькі ў Беларусі добрая канстытуцыя, збалансаваная і дэмакратычная, і Дзмітрыя Булахава, які кажа пра яе як пра «очень мощный инструмент»[8]. Рэальнае кіпенне палітычных падзей і канфлікты («на грані вайны») народ выражае мірам, дзякуючы прэзідэнту, які абвяшчае рэферэндум дзеля міру і спакою. У гэты час Вольга Абрамава спакойным голасам класіфікуе акругі ў г. Менску на «цэнтрысцка-дэмакратычныя», якія, натуральна, за прэзідэнта, і «радыкальна-дэмакратычныя», якія, адпаведна, супраць і якіх «было няшмат».

чырвона-зялёным

Музыка дае пачуццё павольнасці і ўзнёсласці, якая пераходзіць у трыумф. Візуальны рад дэманструе новыя дасягненні, росквіт і стабільнасць, вайсковую моц, павагу да гісторыі і ўласнай «гераічнай» вайны, клопат пра культуру. У кадры з’яўляюцца заснежаныя горныя вяршыні («зияющие высоты», дасягнутыя Беларуссю), на якіх чалавек махае

сцягам. Усё канчаецца панарамаю Беларусі.

[5] Па версіі фільма – асноўны пастулат кампаніі А. Лукашэнкі ў 1994 годзе.

[6] Нават сцвярджаецца, што ўмовы МВФ абавязкова б прынялі, каб не гэтая акалічнасць.

Сучаснасць. На гэтым уласна гісторыя як паслядоўная з'яўляецца палітычна значных падзей заканчваецца, і пачынаецца квітнеючая («хоць пакуль і існуюць пэўныя праблемы»), дынамічная, аптымістычная і прагрэсіўная сучаснасць. Сучаснасць, створаная і легітымізаваная *народам* і прэзідэнтам. Адзінае, што дапаўняе і трошкі дэстабілізуе аформленую і самадастатковую сучаснасць, гэта знешнепалітычны кантэкст (гэта застаецца «жыццём барацьбе» і захаванне «шматвектарнасці»), які ўжо не істотны[9]. Як і належыць, *сучаснасць* насычана не толькі «стабільнасцю» і «ўпэўненасцю», але і тэхнічнай дынамікай, эканамічным ростам, ростам якасці, дабрабытам, нарэшце. расказе пра сельскую гаспадару кажуць не пра калгасы, а пра заводы і фермераў. Прагрэс ва ўсіх кірунках. *Экспарт, жыццё і харчаванне. Сучасная палітыка* сябе цалкам апраўдала, пра што кажа Уладзімір Навіцкі, паралельна даказваючы (тым, хто не ведае), што ў нас ніжэйшыя цэны, чым на Захадзе. Адным словам, у нас нармальная краіна, і надалей усё будзе нармальна, бязладдзе належыць *гісторыі*, стабільнасць належыць сучаснасці.

[7] Ні ЗША, ні Расіяй

[8] У сваю чаргу, прафэсар анэзіцыі Васілевіч, *каханку з пазіцыі права»*, называе непрымальным.

Такім чынам, мы маем якасны ідэалагічны прадукт (крытыка адначасова ўтрымлівае пэўную колькасць цікавай інфармацыі), але з пэўным ссунутым цэнтрам цяжару. Гэта рэкламны ролік з выкладаннем яе генеалогіі (менавіта рэклама, а не прапаганда, як большасць прадуктаў такога кшталту). Калі стылістыка звычайных палітычных праграм асацыюецца з цынічнымі дзікаватым і закамплексаваным аналітыкам (часта нават з паталогіі), то вобраз «Найноўшае гісторыі» іншы. Яна расказваецца ад імя пакуль невыразна акрэсленай *«новай эліты»*, усіх тых хлопчыкаў, старых і новых бюракратаў, палітыкаў, якія шмат атрымалі пры гэтай сістэме і ўлюбёна ў

[9] Крытыка афіцыйнай сістэмы з пункту гледжання, як ні дзіўна, атрыманая. Акрамя таго, гэта не першы выпадак, калі ідэалогія ўлады ў

парадку». І таму гэта, перш за ўсё, *іх* «гісторыя». Гэта іх «найноўшая гісторыя», якая скончылася недзе ў 1996–1997 гг., саступіўшы месца аптымістычнай *сучаснасці*.

Ад гэтага часу гісторыя тычыцца толькі *несучасных* (тых, хто выпаў ці супраціўляецца *сучаснасці* з пазіцыі ўладнага дыскурсу), несістэмных і маргінальных рухаў і арганізацый.

мой ён ідэалагічным стандартам: саюз з ей – выключна эканамічная мэта паводле ўзору ЕС, а не СССР. Нават узгадваецца пра «раскол грамадства» ў пытанні інтэграцыі – Пазняк мітынгуе, камуністы (Калякін) выступаюць за поўнае ўз'яднанне, а галоўнай пазіцыяй Лукашэнкі на перамовах называецца «суверэнітэт перш да ўсё».

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 4 (38) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.

Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/07
[image]

Мінулы (1'2000)

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 4 (38) - 2005**
[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]
[image] [image]2005
Ці Зміст
Ці Змест
Ці Змест
Ці Змест

рэцэнзію на шматстаронкавы том «Шчасця...» гэтак:

Ці ведае шаноўны чытач, як упрыгожваюць іншы раз кнігу тэксты, што дзеля аўтарскае волі засталіся па-за яе межамі? Адсутнасць карацелек і зацемак кшталту вядомых «Піліпікаў» – намер патрабавальнага аўтара выявіцца ў жанрах традыцыйнае аповесці, эсэ ці апавядання, выключэнне «Мрояў» – спроба крытычнага падсумавання ўласнага творчага даробку, адрынутыя «Фрэскі»... На жаль, усе гэтыя тэксты, а таксама шэраг іншых, у разгляданым выданні прысутнічаюць.

Гэта было б эмацыйна, але недарэчна: падбухторванне да перачытвання супярэчыць уражанням.

Можна, зайшоўшы з іншага боку, распачаць пошукі, каму рэкамендаваць кнігу. Але тыя, хто цікавіцца беларускаю літаратураю, хутчэй за ўсё, ужо вызначыліся, пачаткоўцам жа лепш пачынаць з іншых аўтараў. Лепш ужо адкінуць спробы выглядаць першаадкрывальнікам і звярнуцца да тых, хто прачытаў: «А ці заўважылі вы?..»

1

Эстэтычныя пазіцыі аўтара – кідкая, нават найвыразнейшая рыса прадстаўленых тэкстаў. «Шчасце быць...» чытаецца як маніфест уплывовае літаратурнае «партыі», мэта выдання – не толькі пазнаёміць чытача з творамі, а сцвердзіць слушную з гледзішча аўтара пазіцыю. Перад намі ўказальнік: «Гэткай дарогаю рушце, таварышы!» Трапна ўгледзеў А. Івашчанка. На ўказальніку лагічна шукаць пазначэнне кірунку, і рэцэнзент чытае герогліф Б. Пятровіча як «дзверы». Мне падаецца дакладнейшым *Сюды!* – бо спалучае агітацыйны пафас з недакладнасцю.

Б. Пятровіч па-маякоўску заўзята агітуе за пэўны кшталт літаратуры. Нішто акрамя агітацыйнага імпэту не можа апраўдаць змяшчэнне ў кнізе тэкстаў, відавочна не абцяжараных якім-небудзь іншым зместавым ладункам. У

«Фрэсках», «Мроях», нават у «Трызненнях» не знойдзеш запамінальных гістарычных рэаліяў, свежых сюжэтаў, адметных характараў, цікавых партрэтаў. Нават арыгінальнага погляду на жыццё там не знойдзеш. Затое цяжка не заўважыць пераканання аўтара пра першарухавік літаратуры – непазбыўнае імкненне *выказацца* (або мякчэй – абавязак рэалізаваць свае творчыя памкненні).

Заканамерным вынікам абранае пазіцыі – жорстка абсечаная фізіка існавання герояў і персанажаў. Для персанажаў са старонак «Шчасця быць...» некалькі небагатых на падзеі абзацаў – знакамітае імгненне між мінулым і будучым, усё іхняе быццё. Вобразы існуюць выключна каб праілюстраваць, агучыць канкрэтную думку аўтара. Перагарні, чытач, балонку і забудзься на іхнія адметнасці, бо гэта не людзі, а фантомы, форма мыслення і спосаб выказвання, цені тэзісаў і мэтафары абстракцыяў.

Чалавечыя постаці ў «Шчасці быць...» (выключэннем ёсць хіба героі «ўстаўной навелы» пра Сёмку-Геца) у большасці невыразныя, ролі персанажаў занадта службовыя, каб ацэньваць іх як асобы: няма клёку, каб пратрываць па-за межамі адведзенай старонкі, сфакусаваць на сабе чытацкія пачуцці – абыякава, захапленне ці агіду. Пра герояў Б. Пятровіча не скажаш, што яны, быццам конан-дойлеўскі Шэрлак Холмс, выйшлі з-пад кантролю стваральніка і жывуць уласным жыццём. Не жылі, не жывуць і жыць не будуць. Яны ў лепшым выпадку партрэты («Вера», «Віна») або плакаты, а ў большасці – чалавекападобныя інтэлектуальныя канструкцыі, і ў гэтым сэнсе нашмат бліжэйшыя да Жабы з каляіны, Лісы ці Вароны. Але ў адрозненне ад персанажаў баек героі Б. Пятровіча не ілюструюць нейкі тэзіс, а вымаўляюць яго. Іхняя роля, сэнс існавання ў тэксце – надаць аўтарскаму выказванню фармальна дакладную літаратурную форму.

Шмат якія творы ў «Шчасці быць...» напісаныя, як падаецца, перш за ўсё, з-за цёплых пачуццяў да канкрэтнае літаратурнае «штучкі». Аўтар зачараваны разнастайнасцю і прыхаванаю моццу майстэрства/мастацтва пісання, дасканаласцю, прыгажосцю, магчымасцямі «маўлення на паперы». Ён з

асалодаю выпрабоўвае здабыткі стагоддзяў пісьмовай культуры ў мастацкім афармленні свайго маналогу. «Пуціна» або «Мроі» паўсталі ці не выключна дзеля жадання надаць яшчэ адну слоўную абалонку спрытным літаратурным вынаходкам, «Чаканне або зацемкі 1995-га года» можна інтэрпрэтаваць як імкненне ўвесці ў свой рэпертуар сюжэтную схему з добрай радаслоўнай.

Да аднаго з найстаражытнейшых літаратурных інструментаў пісьменнік мае асаблівую любасць. Размовы з містычнымі істотамі дзеля сваёй іманентнай несапраўднасці ёсць цудоўнай нагодаю выказвацца – з захаваннем вытанчанай формы. У выніку, сустрэчаў з прывідамі і дыялогаў з духамі ў кнізе шмат. Можа нават зашмат. Але яны дадаюць прыемнай разнастайнасці да грубасткіх нутраных маналогаў адцягнена-філасофскага зместу, якія аўтар ужывае там, дзе вырашыў абмежавацца матэрыяльным.

2

Час, нарэшце, звярнуць увагу на тое, што, уласна кажучы, Б. Пятровіч гаворыць. Хай сабе гэта не галоўнае для аўтара, і ў жыццёвай філасофіі «Шчасця быць...» няма тае непахіснае вызначанасці, якой характарызуецца эстэтычная пазіцыя, але, тым не менш, пэўны лад светабачання выяўлены з дастатковай падрабязнасцю, глыбінёй і паслядоўнасцю.

Звяртае на сябе ўвагу постаць апавядальніка: сваім нібыта адстаронена-расчараваным поглядам на з'явы жыцця яна прыводзіць на думку вобраз мужчыны сярэдняга веку, які шчэ не пазбавіўся жадання ўзяць ад жыцця найлепшае, але ўжо зразумеў моц абмежаванняў на гэтым шляху і незваротна зняверыўся ў моцы ўласных пачуццяў. Са старонак «Шчасця быць...» да нас не звернецца ані малады летуценнік, ані рамантык-ідэаліст, ані прагматычны цынік.

«Wiek męski wie klęski», пісаў паэта. З гэтага гледзішча лірычны герой, якому наканавана «шчасце быць» – стоадсоткавы macho. Ён выразна адчуў, што чара мае дно, не настолькі эмацыйны і

непасрэдны, каб адрэагаваць на што-кольвек бурай пачуццяў, але і няздольны цалкам узняцца па-над адвечнай несправядлівасцю жыцця. Твор за творам разгортваецца перад чытачом панарама жыццёвай Паразы. Гэта не параза дзеянняў, а прэвентыўная, свядомая адмова ад змагання надта прадбачлівага розуму, які загадзя адмаўляецца ад высільвання, бо разлічыў, што шанцаў на перамогу няма.

Захоўваючы, аднак, уласцівае ўсім людзям імкненне да шчасця, чалавек вынаходзіць шчасце, якое нельга страціць. Калі распадуцца ўсе ілюзіі і памруць усе ідэалы, ляснуць усе задумы, спрахнуць апошнія праекты і не застанецца анічога, дзеля чаго варта адарвацца ад сузірання ўласнага пупка, калі ўсе сацыяльныя ролі будуць выпрабаваныя з аднолькава правальным вынікам, захоўваецца адна роля: быць. І шчасце годна граць гэтую ролю – ШЧАСЦЕ БЫЦЬ. На шматлікіх старонках разгортваецца абгрунтаванне паўнавартасці гэткага шчасця, а «Піліпікі» выглядаюць нават спробаю надаць светапогляду статус нацыянальнага характару, парадкуючы сітуацыі, калі герой выяўляе сваё «шчасцебыццё» на падабенства каталога.

Дзеля мэтаў абагульнення да нацыянальных ці агульначалавечых маштабаў Б. Пятровіч смела ўжывае сумнавядомы камбітлушч беларускай літаратурнай кухні – неразбаўлены лірызм. Рэчаіснасць інтэнсіўна «набывае адзнакі чароўнасці», замілаванне тоўстым слоем пакрывае сцэну і дэкарацыі, дзейсна спрычыняючыся да таго, што элементы твора губляюць выразнасць і непаўторнасць кшталтаў. Замест летапісу душы ці аналізу псіхічных станаў з грудзей апавядальніка раз за разам вырываецца замілаваны ўздых, які мае слабую повязь з канкрэтыкай сітуацыі. Тэкст змястоўнасцю пачынае нагадваць дыялог Хлестакова з Пушкіным.

Наймацнейшыя прыклады лірычнае хваробы знаходзім у «Фрэсках-2», дзе саладжавыя ўздыхі сплятаюцца ў дасканалай гармоніі з шаблоннай павярхоўнасцю побытавых замалёвак. Але нават там, дзе Б. Пятровіч дэманструе здольнасць да тонкіх псіхалагічных назіранняў і дакладнага фармулявання думак, д’ябал пераканаўчасці і дэман займальнасці хаваецца ў

дэталях.

Калі чытач «сам» вызваляе сітуацыю з жыццёвых падрабязнасцяў, ён верыць у прыдатнасць і каштоўнасць абагульнення, нават калі логіка асэнсавання накінутая аўтарам і чытачу чужая: крыжаванка цікавая, пакуль ніхто яе не разгадаў, і мала хто крыўдуе, калі складальнік пакідае дасціпныя падказкі для лянівых і нецярплівых. Калі ж *усе* словы ўпісаныя ў клеткі, верагоднасць, што плён пісьменніцкае працы падасца сухой сумнеўнай схемай, імкліва набліжаецца да максімуму. Замест таго, каб стварыць адпаведную нагоду для чытацкіх глуздоў, сп. Пятровіч раз-пораз абірае кароткі пераказ падзеі з шырокімі каментарамі ад уласнай асобы ці праз нутраны маналог героя. Замест таго, каб даць чытачу агледзецца і вызначыцца «самому», ён агрэсіўна прапануе свае эмоцыі, густа здобрыўшы лірызмам у спадзяванні выклікаць пачуццё свойскае цеплыні і агульнага досведу.

Не, сапраўды няварта чакаць прапаноў выходзіць праз вокны. Але цалкам натуральна было б сустрэць у «Шчасці быць...» даследаванне, асэнсаванне, духоўнае ды інтэлектуальнае пераадоленне тае рэчаіснасці, якой лёс прызначыў быць сведкам. Але калі ў колішнім «ЛіМе» Б. Пятровіч бліскуча рэалізоўваў гэтую канцэпцыю ў знакамітых каментарах да падзеяў тыдня, у мастацкай плашчыні гэткая задача ім або не ставілася, або не рэалізавалася. Вастрыё ўвагі і аналітычныя здольнасці пісьменніка сканцэнтраваліся на несацыяльным вымярэнні.

Свядома адрынуўшы шматлікія магчымасці, якія прапануе вывучэнне дачыненняў з навакольлем, самавыяўленне чалавека ў кантэксце канкрэтнай гістарычнай сітуацыі пісьменнік не асягнуў псіхічных глыбіняў, якія апраўдвалі б гэткую адмову. Калі ж ён праяўляе цікавасць да жыццёвай канкрэтыкі («Вера») і гістарычнай эмпірыкі («Віна», апавяданні пра журналіста Максіма), выяўляецца адсутнасць звычкі сумяшчаць уласныя задумы са «знешнім» кантэкстам. І тым не менш менавіта гэтыя тэксты запамінаюцца. Бо ёсць за што зачапіцца думцы.

Але нельга лічыць Б. Пятровіча, намесніка старшыні СБП, стваральніка незалежнага літаратурнага часопіса «Дзеяслоў» *і прочая і прочая* прыкладам, аматарам ці заўзятарам спосабу існавання, дзе адзінаю ўцехаю было б «шчасце быць». Падаецца, стан прымірэння з жыццёвай паразай трапіў у фокус ягонай прозы ў пэўным сэнсе выпадкова. Бясконца мілы яму працэс выказвання запатрабаваў фармулявання тэзісаў, у прынцыпе, неабавязковых па змесце, але неабходных дзеля рэалізацыі формы: вынік пераканання, быццам жаданне выказацца дастаткова для стварэння вартаснага тэксту.

Прыгожа сказаць можна, маючы нешта на ўвазе. Байкападобныя канструкты персанажаў уцелясняюць шляхетныя спосабы выказвання, але змест іхніх маналогаў і дыялогаў цікавіць аўтара значна менш, чым дасканаласць структуры. Другарадная роля абумоўлівае выбар па прынцыпе найменшага высільвання, і апалогія малога высільвання робіцца стрыжнявою, а сітуацыя элегічнага прымірэння з перашкодай – галоўным аб'ектам апісання. Але няварта пераймацца! Для аўтара галоўнае не *пра што*, а *як* прыгожа, дасканала, разнастайна і стылёва ажыццяўляецца выказванне.

Робіцца зразумелай дзіўнаватая заўвага А. Івашчанкі наконт абстракцыяў нацыянальнай ідэі (з тэкстаў выразна відаць, што нацыянальныя каштоўнасці аўтару зусім не чужыя). Больш: непатрэбнай абстракцыяй выглядае якое заўгодна аб'яднанне людзей. Узнесенае ў вышыні творчае *Я* апынаецца па-над нявартымі яго акалічнасцямі ў пустаце і самоце. Бо абсалютызуецца выказванне, абсалютызуецца і той, хто выказваецца. Вакол распасціраецца незаселеная платонаўская Пустэча – геніяў мала, а прастора – бясконцая.

Аўтар выказаўся, напісаўшы больш за паўтысячы старонак. Але што ён перадаў чытачу? Цьмянае пачуццё пагарды да рэчаіснасці? Эгацэнтрызм эстэта? Снабізм гуманітарыя? Пачуццё адсутнасці цвёрдай апоры, уласцівае творцу, які піша на мове з незайздросным лёсам? Адчуванне нутранай самадастатковасці працы са словам? Нават бліскучая форма не перавесіць слабасці матэрыялу і амаль эгаістычнай

абмежаванасці задумы. Вынік назіранняў пісьменніка за жыццём прэзентуецца, мякка кажучы, сціпла. Самы заўзяты апалагет, пазнаёміўшыся са «Шчасцем быць...» не навесіць сп. Пятровічу біркі летапісца эпохі: ён выглядае нашмат больш пераканаўча як прыхільнік пэўнай літаратурнай традыцыі, чымся як носьбіт цікавага жыццёвага досведу. Ён валодае словам і піша тое, што хоча напісаць. Але подых Пустэчы адчуваецца ў фінале ці не кожнага тэксту са «Шчасця быць...».

Якія ж дзверы прапанаваў Б. Пятровіч, і ў якія вокны спрабавалі выйсці іншыя? Калі лічыць савецкі літаратурны працэс у Беларусі хатаю, шмат хто падчас і пасля крушэння СССР шукаў з яе выйсця. Барыс Пятровіч сапраўды паказаў дзверы: традыцыі асобных плыняў заходняга прыгожага пісьменства. Працягваючы метафару, разумнейшымі выглядаюць дзівакі, якія, згодна з візіяй А. Івашчанкі, адраджаюць «абстрактныя ідэалы» нацыянальнае ідэі і не спяшаюцца выходзіць у дзверы еўрапеізацыі. Выйсці ў прапанаваным кірунку яны могуць, але рызыкуюць застацца сам-насам з Пустэчаю. Народу (а гэта ўсё ж і крыніца творчасці, і легітымацыя існавання і, што б хто ні казаў, аўдыторыя) да прапанаваных каштоўнасцяў трэ' ісці нейкім іншым шляхам, і гэты кірунак не згадваецца ў «Шчасці быць...».
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 4 (38) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/07
[image]

ПАВАЛ АБРАМОВІЧ
крытык. Выкладае на журфаку БДУ. Яго апошняя публікацыя ў «ARCHE» называлася «Антычны дзёньнік» (3/2005).

Павал Абрамовіч
Быць жывым і бачыць сонца

Андранікава Г. *Гук сонечнага гадзінніка* / Пер. з чэшск. В. Бяльковіч; Прадм. с. Сматрычэнкі. – Менск: выдавец І. Логвінаў, 2005. – 300 с. – (Чэшская калекцыя).

Чэская літаратура, клясычная і сучасная, вызначаецца жыцьцёвасьцю, энэргіч- насьцю, вялікім інтэлектуальным досьведам. Іншыя літаратуры, у першую чаргу, славянскія, здавён пільна прыглядаліся да імпульсіўнага літаратурнага жыцьця Чэхіі, і пэўная доля зайздрасьці была ў тым позірку. Аналягічная сытуацыя захавалася і да сёньняшніх дзён, аб чым сьведчыць, напрыклад, спэцыяльны нумар расейскай «Иностранной литературы» (2005, № 3), прысьвечаны творчасьці Шкворацкага, Шабаха, Сайфэрта і іншых слынных чэскіх мастакоў слова.

Патэнцыял мастацкай літаратуры Чэхіі невычарпальны, а новыя імёны зьяўляюцца ў ёй гэтак жа рэгулярна, як сонца на небе. Так, некалькі гадоў таму пабачыў сьвет дэбютны раман Ганы Андранікавай «Гук сонечнага гадзіньніка» (2001), за які тады 34-гадовая пісьменьніца атрымала прэстыжныя літаратурныя прэміі Кніжнага клюбу (найлепшая кніга году) і

«Magnesia Litera» (адкрыцьцё году). Беларускі пераклад гэтай кнігі пабачыў сьвет сёлета – ім быў распачаты новы выдавецкі праект «Чэская калекцыя», творчы калектыў якога вырашыў ісьці ў авангардзе сучаснай перакладной прозы і, па словах куратара сэрыі, перакладчыка Сяргея Сматрычэнкі, «сэрвіраваць беларускаму чытачу самыя смачныя літаратурныя дэлікатэсы Чэхіі».

ВАЙНА

«Раман – гэта дзяржава, вялікая альбо маленькая. (…) У раману свае берагі, свае межы, свая вайна, свой мір і свой час…» – піша ў кнізе «Раман як дзяржава» сэрбскі пісьменьнік Міларад Павіч.

Раман Андранікавай мае ўласныя берагі – гэта Канада, Чэхія, Індыя, краіны, у якіх разгортваюцца асноўныя падзеі кнігі (на геаграфічнай мапе раману пазначаныя гарады Дэнвэр, Прага, Зьлін, Бамбэй, Калькута і іншыя); мае сваю вайну – Другую сусьветную, якая адняла ў галоўных герояў найдаражэйшае – родных; свой час, дакладней, кропку адліку ў часе – Каляды 1989 г., калі ў Каларада Даніэль Кеплер выпадкова сустракаецца са сваёй зямлячкай Эн Ванье (у дзявоцтве – Анна Вайнштайн), што разам з Рахель, ягонай матуляю, трапіла ў канцлягер. Даніэль і Эн пачынаюць узводзіць масткі памяці, масткі, якія вядуць у мінулае, і што можа быць цяжэйшым за гэтую працу?..

«Мірная» тэрыторыя раману, на якой жонка, сыны і ўнук Даніэля весела бавяць час у пансіёне сярод засьнежаных горных вышыняў, мяжуе ў кнізе Андранікавай зь мёртвай прасторай, дзе зямля счарнела ад пажараў і людзкой нянавісьці, дзе блукаюць прывіды і ў неба над крэматорыямі падымаецца густы дым. Героям «Гуку сонечнага гадзіньніка» – сем'ям Кеплераў і Вайнштайн, у жылах якіх цячэ чэская, габрэйская і нямецкая кроў, – наканавана апынуцца ў пекле. Вайна ёсьць адной з галоўных нэрваў раману, і гэта дазваляе параўнаць яго зь іншымі раманамі-«дзяржавамі», у якіх ёсьць «свая вайна», напрыклад, з «Чытаньнем у цемры» ірляндца

Шэймаса Дына ці «Алоўкам цесьляра» гішпанца Мануэля Рываса. Як здолела жанчына-прадпрымальніца, якая нарадзілася ў 1967 г., так праўдападобна, фактаграфічна і ў той жа час па-мастацку пераканаўча, са сваёй інтанацыяй увасобіць у літаратурных формах жахлівасьць вайны, пазьбегнуўшы штампаў, банальнасьцяў і мэлядраматызму? Чаму гэтую кнігу сапраўды цікава і *неабходна* чытаць у краіне, якая носіць у сабе вірус героя-пераможцы, захлынулася ў эўфарыі ад сьвяткаваньня 60-годзьдзя Перамогі?

Чытаючы раман, кожны па-свойму будзе адказваць на гэтыя пытаньні, але відавочна адно: Гана Адранікава мае пісьменьніцкі талент і сваю цікавую гісторыю, якую чытач абавязкова даслухае да канца. (Да ліку найлепшых сцэнаў раману, у якой цалкам непрадказальна для чытача сыходзяцца дзьве трагічныя сюжэтныя лініі, можна аднесьці наступную: у нямецкай аўчарцы, якую трымае ля чорнага скуранога бота лягерны вартаўнік, Рахель пазнае Бэні – сабаку свайго сына. Даніэль гадаваў і трэніраваў яе, але потым мусіў аддаць на адмысловы, агульны для ўсіх загад немцаў – ужо пасьля таго, як тыя забралі ягоную маці. І вось – неспадзяваная сустрэча, якая назаўсёды засталася ў памяці Эн Ванье:

Яна шаптала, хвалі ціхага голасу прымусілі яго навастрыць вушы і вабілі яго бліжэй. (...)

– Ты крышачку да некага падобны, ведаеш? Ты нагадваеш мне Бэні, – казала яна яму. Ён падпоўз яшчэ бліжэй. Дазволіў сябе пагладзіць. Уніформы з цыгарэтамі ў зубах нечакана павярнуліся.)

Выкарыстоўваючы тэрміналёгію такіх літаратурных крытыкаў, як Алесь Адамовіч, хочацца назваць гэты твор «шчырым дакумэнтам часу». Утрымаюся, памятаючы, што сама аўтарка папярэджвае: «гэты раман – фікцыя». Паспрабаваць у рэчышчы традыцыяў савецкай крытыкі адшукаць у «Гуку сонечнага гадзіньніка» ідэйнасьць і гераізм галоўных пэрсанажаў таксама не атрымліваецца.

Рахель спачатку спрабавала шукаць адказы.

– Бо прасцей стрэліць зь літасьці ў некага, хто ўжо не выглядае як чалавек, чым забіць самавітую чалавечую істоту, якая ведае сабе кошт. Яны

[нацысты. – **П. А.**] *ствараюць сабе алібі. Алібі свайму сумленьню.*

Зь цягам часу яна зразумела, што адказы нічога не вырашаюць. Быць інтэлігентам у Асьвенціме – забойчая камбінацыя. Яна шукала спосаб вызваліцца [вылучана мною. – **П. А.**].

Эвалюцыя поглядаў Рахель на сваё знаходжаньне ў Асьвенціме – ад пасіўнага сузіраньня да дзеяньня дзеля самазахаваньня – адлюстроўвае эвалюцыю поглядаў на *гераічнае*, якая ў той ці іншай магчымай у літаратурах славянскага сьвету пасьля літаратуры, ператварыліся ў пыл Бэрлінскі мур, Варшаўскі пакт і іншыя трэба камуністычныя артэфакты, пайшла з авансцэны стараба намэнклятура, зьніклі тагачасныя палітычныя і сацыяльныя практыкі[1]. Бо ў полі зроку камуністычнага мастацтва быў не чалавек, але народ, а каштоўнасьць асобы актуалізуецца толькі тады, калі яна зьдзяйсьняла подзьвіг, ахвяравала сабой, сваім жыцьцём ізноў жа ў імя народу – ці то ў ваенны, ці ў мірны час. І толькі *вызваліўшыся* з гэтага палону, чэшская, польская, сэрбская і іншыя літаратуры пачынаюць гэтак-сяк пераасэнсоўваць прыроду гераічнага і адначасова – паволі – вучыцца разумець і паважаць кожнае жыцьцё, індывідуальны досьвед асобы, больш ужо не патрабуючы ад яе пакутніцкай ахвяраў[2]. Да гэтага заўсёды клікалі айчыннае пісьменства Кузьма Чорны і Васіль Быкаў[3], але сэрвільная беларуская літаратура, якая выразна заявіла пра сябе пасьля страты незалежнасьці 2002 г. рэдакцыйна-выдавецкай установы «Літаратура і мастацтва», адчула смак самацэнзуры і творыць па-ранейшаму ідэалізуючы вобраз народу, пераможцы, заўсёды гатовага да (сама)забойства дзеля ўва ўсім сьвеце[4]. А ў гэты час, у іншым вымярэньні, у бясконцых перазовах у Асьвенціме, Рахель Кеплер, мілітарысцкай выкарыстоўваючы досьвед індыйскіх ёгаў, зь якімі яны пазнаёмілася ў час, калі яе муж будаваў у Індыі абутковага

[1] Ніцшэ – ад пасіўнага сузіраньня да дзеяньня дзеля самазахаваньня – адлюстроўвае эвалюцыю поглядаў на *гераічнае*, якая ў той ці іншай магчымай у літаратурах славянскага сьвету пасьля літаратуры, ператварыліся ў пыл Бэрлінскі мур, Варшаўскі пакт і іншыя трэба камуністычныя артэфакты, пайшла з авансцэны стараба намэнклятура, зьніклі тагачасныя палітычныя і сацыяльныя практыкі[1]. Бо ў полі зроку камуністычнага мастацтва быў не чалавек, але народ, а каштоўнасьць асобы актуалізуецца толькі тады, калі яна зьдзяйсьняла подзьвіг, ахвяравала сабой, сваім жыцьцём ізноў жа ў імя народу – ці то ў ваенны, ці ў мірны час. І толькі *вызваліўшыся* з гэтага палону, чэшская, польская, сэрбская і іншыя літаратуры пачынаюць гэтак-сяк пераасэнсоўваць прыроду гераічнага і адначасова – паволі – вучыцца разумець і паважаць кожнае жыцьцё, індывідуальны досьвед асобы, больш ужо не патрабуючы ад яе пакутніцкай ахвяраў[2]. Да гэтага заўсёды клікалі айчыннае пісьменства Кузьма Чорны і Васіль Быкаў[3], але сэрвільная беларуская літаратура, якая выразна заявіла пра сябе пасьля страты незалежнасьці 2002 г. рэдакцыйна-выдавецкай установы «Літаратура і мастацтва», адчула смак самацэнзуры і творыць па-ранейшаму ідэалізуючы вобраз народу, пераможцы, заўсёды гатовага да (сама)забойства дзеля ўва ўсім сьвеце[4]. А ў гэты час, у іншым вымярэньні, у бясконцых перазовах у Асьвенціме, Рахель Кеплер, мілітарысцкай выкарыстоўваючы досьвед індыйскіх ёгаў, зь якімі яны пазнаёмілася ў час, калі яе муж будаваў у Індыі абутковага

фабрыкі, робіць дыхальную гімнастыку. *«Пасьля гадзіны стаяньня на марозе ў яе былі цёплыя рукі»*. Рахель хоча жыць. Яна жадае захаваць найвялікшы скарб, дараваны ўласнае жыццё. І гэта тады, калі ўвесь сьвет абрынуўся ў бездань, калі поруч кожны дзень хтосьці канчае жыцьцё самагубствам, лёгка кранаючы пальцамі электрычныя агаломшаныя габрэйскія гандляры і краўцы, музыкі і літаратары пакорліва ўваходзяць у расчыненыя брамы крэматорыяў! Рахель – герой, які спрабуе ацалець. У гэтым заключаецца сутнасьць эўрапейскага погляду на гераізм. Пройдуць гады, і Даніэль Кеплер, апавядаючы ўнукам цэнтральнаамэрыканскіх індзейцаў пра кратка, які хацеў выратаваў сонца ад палону, але страціў зрок, адзначыць сябе:

Нік быў задаволены, краток нарэшце перамог. Ягоную душу не кранаў факт, што краток асьлеп. Захапляла яго краткова адвага і вытрымка, альтруістычны гераізм.

Беларуская «ваенная» літаратура адважна, гераічна, самазакахана бараніла сваю Перамогу і ўласныя эстэтычныя набыткі ад рэальных і ўяўных ворагаў і ў выніку страціла зрок. І ў гэтай цемры яна засталася на самоце – удалечыні ад свайго чытача і іншых літаратураў. Але самаізаляцыя і страта чытача, які ня можа больш мірыцца з глянцавасьцю вайны ў гэтых кнігах, зь іх няшчырасьцю, нецікавасьцю, мастацкай кволасьцю, – яшчэ палова бяды. Другая бачыцца ў тым, што ў многім дзякуючы высілкам ангажаванай «ваеннай» літаратуры 1950-х гг. і да сёньняшніх дзён застаецца ў Беларусі лякаматывам літаратурнага працэсу, *мадэрнізаваць гераічнае ў нацыянальным мастацтве пачатку XXI ст. сталася немагчымым*. І нават Быкаў пры канцы жыцьця не зьмяніў свайго стаўленьня да гераічнага: «аўганец» спачатку выказвае волю да подзьвігу і жаданьне ахвяраваць сабою дзеля сьвятой справы («Трэба яго стрэльнуць. А там будзь, што будзе»), але потым *абіраe жыцьцё*, вырашае пачакаць з геройскім учынкам – і ўмомант робіцца здраднікам. Больш за тое, у аповесьці «Аўганец» Быкаў фактычна адмовіў беларусам у подзьвігу – «Новая культура, адмовіўшыся ад Адзінай Ісьціны, калі хочаце – страціўшы волю да яе пошуку, стварыла тым самым заруку выжыванньня. Чаму, напрыклад, не бывае войнаў паміж дэмакратычнымі краінамі?» – пытаецца Варыс Парамонаў, амэрыканскі літаратуразнаўца, публіцыст і журналіст. І сам

дзіцяці-
нерыць.
заўтрашнім
дзень
інструкцыяй
цудоўцыйнага
надзеяцца
і
подзьвіг», а
другое,
Ці
ўсё-такі
хаваць
чалавека
жыццём
дзеля
абароны
краіны і
высокіх
ідэалаў,
быць
паслухмянай
марыянэткай
у руках
палітыкаў і
генэралаў,
хоць
вонкава
дэманструе
ляяльнасьць
і
гатоунасьць
да
гераічнага
самаахвяраваньня.

Нашы шляхі з эўрапейскім мастацтвам ізноў разышліся. І таму

– Калі ты ўбачыш сонейка, адчуеш промні на твары, то будзеш ведаць, што гэта мае рукі, якія цябе гладзяць, што я побач. Месяц будзе расказваць табе перад сном казкі. (…) Памятай, што нікога з тых, каго сапраўды любіш, ты ніколі ня можаш страціць.

Стаўшы дарослым, Даніэль будзе апавядаць міты ўнуку, быццам перадаючы маленькаму Ніку найвялікшую каштоўнасьць сям'і Кеплераў, духоўны тастамэнт ягонай бабулі.

Выратоўваюць міты і саму Рахель. Дачцэ габрэя, прафэсара гісторыі, у Асьвенціме давядзецца працаваць выхавацелькай у так званых дзявочых дамох. У часе працы і адпачынку яна апавядае сяброўкам міты (кожны дзень новыя, створаныя рознымі народамі), чытае сапраўдныя лекцыі, і міты, разам з асабістымі ўспамінамі і музыкай, не дапамагаюць забыцца, а саграваюць іхныя сэрцы і душы як цяпло вогнішча, вакол якога згушчаецца беспрасьветная цемра, пераконваюць у магчымасьці перамогі, неабходнасьці *заставацца чалавекам, памятаць, верыць, кахаць, жыць*. Жыць – гэта і значыць быць героем у Асьвенціме, недарма Рахель кажа Аньне Вайнштайн, што, паводле перакананьня індуістаў, скончыўшы жыцьцё самагубствам, чалавек не «аплачвае» кармічны рахунак.

Прастора *сноў* «Гуку сонечнага гадзіньніка» – паэтычна-праронкая, насычаная падзеямі, як у Міларада Павіча, а тэрыторыя *ўспамінаў* гэтага раману багатая гукамі, пахамі, фарбамі, галасамі, супастаўляльная зь «Іншымі берагамі» Ўладзімера Набокава. (Рэканструкцыя дзяцінства і юнацтва кожнага зь сям'і Кеплераў і Вайнштайнаў уражвае сваёй дэталёвай прапрацоўкай і мастацкай дасканаласьцю.) Дэталь – гэта бог, сказаў Вальтэр. Калі гэта так, то ў кнізе Ганы Андранікавай бог жыве на кожнай старонцы:

Заам Сінгх прынёс у наш дом яшчэ часьціну індыйскага духу і мноства п'янлівых пахаў. Каляндра, імбярац, кардамон, куркума і чылі. Ён увесь час усьміхаўся і ўвадначас напяваў. Гэта гучала, як кантрабас. Турбан на галаве і вусы, дагледжаная барада, заплеценая ў коскі, якія на скронях зьнікалі ў валасах, як дзьве зьмейкі. (…) *Заам лётаў па кухні, як белы кажан. Ягонае каралеўства было абсталяванае неабходным інструмэнтам, уключна з жорнамі, якія пераходзяць з пакаленьня ў пакаленьне. Sil nora. Я з маленства захапляўся гэтай штукай. Заамава рука сьціскае гладкі авальны камень і езьдзіць зь ім сюды-туды па пляскатым камені пяцікутнай формы, на якім ляжыць сачыўка ці што іншае.*

Дарэчы, Індыя, у якой Кеплеры пражылі свае найлепшыя гады, намалявана ў рамане «Гук сонечнага гадзіньніка» зь вялікай

ласкаю, і частка трапяткога пачуцьця Андранікавай да гэтай краіны, культуры, цывілізацыі міжвольна перадасца чытачам. Канечне, першапачаткова камусьці можа не спадабацца як быццам бы празьмерная ўвага аўтаркі ў пачатку раману да пахавальных рытуалаў індусаў (у прыватнасьці, спаленьне нябожчыкаў на берагох Гангу, якога ня могуць ня бачыць Кеплеры), аднак пазьней, калі паміж усходнім абрадам і спальваньнем габрэяў нацыстамі працягнуцца сотні нябачных нітак, да нас прыйдзе ўсьведамленьне таго, што ў сапраўдным мастацкім творы няма нічога лішняга.

Але я б не хацеў, каб склалася ўражаньне, што раман Андранікавай – празьмерна сур'ёзная, суворая кніга, поўная антываеннага патасу. «Гук сонечнага гадзіньніка» – гэта найперш шчырае прызнаньне ў любові да радзімы, Прагі і Зьліну, гэта пяшчотная кніга пра радасьць дзяцінства і веліч каханьня.

Калісьці такі раман зьявіцца і ў нас.

Я знайду цябе. У махагонавым змроку ў глыбінях скальных храмаў, на фрэсках, калісьці гарачых ад дотыкаў чалавечых целаў. Нас аддзяляюць тысячы гадоў. Мы ўвойдзем у іх з багацьцем уражаньняў і згадак пра людзей, якія паглынулі нас, як вада ў моры, пра месцы, якія адкрылі нам таямніцы далёкіх часоў, пра кароткія імгненьні, калі мы набліжаліся да багоў. Наша адзіная маёмасьць – гэта вера ў людзей, якіх мы любілі. Сьвятло тваіх вачэй праходзіць скрозь цемру і прыносіць сьвітаньне. Нарэшце днее.

Я знайду цябе ў сонцы зьніклага сьвету, каб ты голымі рукамі аднёс мой попел рацэ.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2006/01/07
[image]

АЛЯКСЕЙ БАЦЮКОЎ
Аляксей Бацюкоў журналіст, філёзаф. Жыве і працуе ў Магілёве.

А як вы ставіцеся да «крывавай Мэры»?

Климов А., Огурцов Е. *Прогулки с вампиром: Диалоги.* – Санкт-Петербург: Невский Простор, 2004. – 660 с.

Галоўны недахоп кнігі дыялёгаў – нястача шасьці старонак. Іх 660, а магло б быць і 666. У выніку быў недарэчна згублены апакаліптычны сымбалізм і атрымаліся бессэнсоўнымі кроплі крыві зь літараў назову на вокладцы.

– Скажыце мне, Андрэй, хто зацікавіцца 660-старонкавым эсэ пра тое, як вы бачыце сусьвет?

– Гэта абраза?

– Гэта вымушанае працьверажэньне аўтара, што знаходзіцца ў рэвалюцыйнай эўфарыі.

– А як жа мае прыхільнікі?

– Тыя дзьве тысячы замест паўмільёна?

– Але ж будуць іншыя.

– І замест кожнага забітага ўстане пяць?

– Мы з вамі па розныя бакі барыкадаў?

– Мы з вамі жывём у розных Беларусях.

– Гэта добра, што ў кожнага з нас розная Беларусь.

– Але ці добра, што ў тэарэтыка рэвалюцыі Беларусь адрозьніваецца ад Беларусі шараговага грамадзяніна ці нават ад Беларусі выканаўцы рэвалюцыйных праектаў?

– Гэтую кнігу я пісаў дзеля вас.

Гэта не дыялёг з кнігі, гэта мой уяўны дыялёг з аўтарам. Непахісны ў сваёй веры ў сябе, аўтар дыялёгаў сягае далёка за межы, самадазволеныя сучаснымі беларускімі апазыцыянэрамі. Андрэй Клімаў выпускае здаравенную задуменную кнігу 50-тысячным накладам, адкрыта прызнаецца, што бачыць сябе прэзыдэнтам, і ў той жа час не-не дый жыгане ўласны народ сатырай:

«– Справа нават не ў табе.

– А ў кім?

– У нашым народзе.

– Чым жа табе народ насаліў?

– А ён ужо без дыктатараў ня можа абысьціся» (з дыялёгу «Павал Уладзімераў»)[1].

«– Калі б яны [людзі] маглі сябе рэалізаваць у звычайным жыцьці, навошта ім трэба было б захапляцца перад звышнатуральнымі магчымасьцямі ўлады й грошай?

– Аднак хіба можна бяз гэтага ўсяго абысьціся?

– А хіба не?

– Вось чаму беларусы дэградуюць і цалуюць зад дыктатару» (з

[1] Тут і далей пераклад з расейскай мой. – **А. Б.**

дыялёгу «Павал Данэйка»).

«– Выходзіць, беларусы толькі тым і занятыя, што дзень пры дні, гадзіна за гадзінай забіваюць свой інтэлект?» (з дыялёгу «Васіль Старавойтаў»).

Кніга, прэзэнтаваная як палітычны маніфэст, па сутнасьці працягвае даўнюю філязофскую традыцыю выкладаць палемічныя тэмы й палітычныя канцэпцыі ў форме размовы. Прыклады – дыялёгі Плятона, канфуцыянскі «Лунь Юй», творы П'ера Абэляра. У нашым выпадку чытач ад самага пачатку паглыбляецца ў хаатычную мяшанку фразаў, пазбаўленых выразнага кантэксту і, наагул, гледзячы па ўсім, разьлічаную на спрацоўваньне ў чытача эфэкту дадумваньня. Вельмі зручная форма палітычнага маніфэсту, дарэчы. Уплеценыя ў жывую размову, лёзунгі ажываюць, і ў той жа час няма патрэбы іх абгрунтоўваць і тлумачыць.

Надзвычай элегантна эфэкт дадумваньня спрацоўвае ў дыялёгу «Кама сутра». Ужо толькі прачытаўшы назву гэтага дыялёгу, я прыкладна ўявіў сабе, што зьбіраецца рабіць з электаратам А. Клімаў. Апісваючы стратэгію й тактыку паводзінаў узорнай каханкі, што імкнецца заваяваць прыхільнасьць мужчыны, аўтар кароткімі фразамі ілюструе ўсю гаму сваіх верагодных адносінаў зь беларускім народам.

«– [Яна, каханка] будзе хаваць свой гнеў.

– [Ён, народ] ня будзе на мне спаганяць зло, назьбіранае за часы кіраваньня Лукашэнкі?

– Ніколі ня будзе пагарджаць ім у ложку, калі ён паварочвае да яе свой твар.

– Заўсёды з гатоўнасьцю пойдуць на размову са мной?

– Будзе лашчыць любую частку цела, якую ён пажадае.

– Прымуць, што маім саюзьнікам на выбарах будзе Пуцін?

– Будзе цалаваць і абдымаць яго, пакуль ён сьпіць.

– Пачнуць прапагандаваць маю кандыдатуру сярод родных, сяброў і знаёмых?»

Ці то задуменнасьць і разважлівасьць, ці то флегматычнасьць аўтара, ці то наўпрост паважлівы ўлік уяўнай і татальнай разважлівасьці, чытай – флегматычнасьці беларускага чытача, але думку аўтара ў кнізе нельга назваць імклівай. Яна нетаропка перапаўзае з дыялёгу ў дыялёг, пакідаючы адну-дзьве ясныя фразы на пару старонак. Абвяшчэньне рамантычных памкненьняў аўтара («– Выходзіць, ты адзін бярэсься біцца з Лукашэнкам? – Так»[2]), ягоных індывідуальных амбіцыяў («Значыць, табе ўсё ж такі спатрэбіцца падтрымка прадпрымальнікаў. – Ня зараз. – Калі? – Калі ўлада ўжо будзе ў маіх руках»[3]), характарыстыка прыкладных умоваў для перамогі («Ад Лукашэнкі можна пазбавіцца, толькі вярнуўшы да ўлады Вярхоўны Савет 13-га скліканьня?»[4]), некаторыя рысы магчымай рэвалюцыі («– Возьмуць уладу на месцах яшчэ да завяршэньня падліку галасоў?»[5]), сымболіка стратэгіі палітычнай барацьбы («У краіне, дзе заасфальтаваныя ўсе палі чалавечых эмоцыяў, прабівацца да сумленьня людзей можна толькі адбойным малатком»[6]), а таксама філязофскія развагі («– Ты ўсё ж скачаш з аднаго трамваю. – Але трапляю ў іншы? – Затое ў цябе ўжо няма страху перад скачком»[7]) – зярняты, рассыпаныя па полі. І па гэтым полі млява крочыць Андрэй Клімаў, поўны надзеяў, што хоць зернейкі засохлыя былі, усё ж такі жыцьцёвая іх сіла – і гэтак далей паводле тэксту.

Найлепшы паводле сюжэту й пабудовы дыялёг, як і трэба было чакаць – «Аляксандар Лукашэнка». У інтэрпрэтацыі Андрэя Клімава размова аўтара з «Сашам» – сустрэча пэрсанажаў міфічных дабра і зла адпаведна («Ён стаіўся. Выклік кінуты. Але ж дзе адбудзецца паядынак? Тут, на Зямлі, мы аднолькава бясьсільныя»). Звыклае да элегантных перамог, зло прапанавала аўтару напрысутнічаць пры тайнай размове ўсіх лідэраў апазыцыі. Размова адбывалася ў авальным кабінэце на Карла Маркса, 38. («Ты вырашыў зрабіць мне выпрабаваньне ў маім будучым кабінэце?» – вырвалася ў аўтара.) Удар, падрыхтаваны «Сашам», быў магутны. Вячорка, Садоўскі, Саньнікаў, Фралоў, Лябедзька, Скрабец, Манаеў, Карбалевіч, Халіп, Дабравольскі, Гразнова, Лявонаў, Чыгір, Багданкевіч,

2 Дыялёг «Аляксандар Лукашэнка».
3 Тамсама.
4 Дыялёг «Сунь Цзы».
5 Дыялёг «Кама-сутра».
6 Дыялёг «Юры Хадыка».
7 Дыялёг «Іван Бабіч, Ганна Бабіч».

Статкевіч, Красоўская, Ганчар, Палевікова, Оргіш, Калякін, Ганчарык, Казлоўскі, Гілевіч, Раманчук, Нісьцюк і Пашкевіч, нягледзячы на статус скансалідаваных сілаў сьвятла, упалі духам ад безвыніковасьці ўласнай палітычнай барацьбы, прыйшлі да высновы, што з гэтым народам што ні рабі, ён і не паварушыцца (Чыгір: «…часам мне здаецца, што з глузду зьехала ўся краіна. – Ну, скажам, я яшчэ ў сваім розуме, – адказаў Багданкевіч. – Праўда, ад гэтага я ня стаў адчуваць сябе больш камфортна»), і ўрэшце вуснамі Пашкевіча падвялі рысу, што дапамагчы дэмакратычнай апазыцыі зможа хіба толькі Бог.

Удар у адказ дабро, увасобленае ў А. Клімаву, нанесла бязьлітасны: «Мы паедзем у саўгас «Гарадзец» – і гэтыя словы гучаць для Сашы як прысуд». Тут засядалі якраз цёмныя сілы, хцівыя і беспрынцыповыя вышэйшыя чыноўнікі дзяржавы[8] плюс Абрамава, Навасяд, Марыніч (во табе на), Янкоўскі. Баючыся і свайго гаспадара, і апазыцыі, нарада падыходзіць да канцэптуальнага рашэньня: «Дэбіл не дэбіл, а дзесяць гадоў нас усіх у страху пратрымаў, – уставіў Лявонаў[9]. – Пара з гэтым канчаць». Вынік размовы сілаў зла быў падведзены Жураўковай: «Атрута, удаўка, куля ці абмяжуемся вар'ятняй?» Пабачыўшы, які канец рыхтуе яму бліжэйшае акружэньне, маральна зломлены Саша згаджаецца з аўтарам (аўтар пачынае й выйграе: «Ты абкружыў сябе прайдохамі. – Сам бачу. – А ў выніку ты за ўсіх адкажаш. – Так і будзе»), але здацца паабяцаў толькі «ня ў гэтай кнізе».

Палітык Андрэй Клімаў назаўсёды застанецца ў гісторыі Беларусі як дэпутат, які выступіў у 1996 г. у парлямэнце прапановай імпічмэнту прэзыдэнта. Гэта самы значны ўчынак ягонай палітычнай кар'еры. Пасьля доўгага перапынку актыўнай публічнай дзейнасьці, Андрэй Клімаў цяпер чалавекам, які цьвёрда вызначыўся са сваімі мэтамі ў кнізе «Прагулкі з вампірам» ён заяўляе пра намер прэзыдэнтам, дык у рэальным жыцьці ён працуе на свайго намеру. Выступ 25 Сакавіка, харызматычнае ў цэнтры падзеяў і, немалаважная рыса, зьбіраньне вузялкоў для зьняволеных удзельнікаў «рэвалюцыі – няйначай граматны і пазытыўны (для пэўных колаў)

[8] Адзначэньне, што ў чыноўніка ягонай палітычнай кар'еры. Пасьля доўгага перапынку актыўнай публічнай дзейнасьці, Андрэй Клімаў цяпер чалавекам, які цьвёрда вызначыўся са сваімі мэтамі ў кнізе «Прагулкі з вампірам» ён заяўляе пра намер прэзыдэнтам, дык у рэальным жыцьці ён працуе на свайго намеру. Выступ 25 Сакавіка, харызматычнае ў цэнтры падзеяў і, немалаважная рыса, зьбіраньне вузялкоў для зьняволеных удзельнікаў «рэвалюцыі – няйначай граматны і пазытыўны (для пэўных колаў)

[9] Удар

Пасьля тых вулічных падзеяў і пасьля выхаду гэтай кнігі ўзьнікае заканамернае пытаньне: як жа дагэтуль пажыў Клімаў, аналітыка абыходзілася без Андрэя Клімава? Кім ён разглядаўся і ў якой ролі? Хто гэтая асоба – чорцік з табакеркі, казырны туз у рукаве, штосьці трэцяе?

Разгадка ў кнізе

Гэтая кніга нейкі момант падаецца сублімацыяй мрояў аўтара пра прэзыдэнцтва. Надта шмат тут адпаведных грувасткіх намёкаў, часам Клімаў выглядае ня столькі тэарэтыкам, колькі фантазэрам. Пасьля Ўкраіны ды Кыргызстану людныя й пратэстныя вуліцы апанавалі сны не аднаго беларускага палітыка. Але. Эўфарыя ад дэмакратычных рэвалюцыяў залагодзіла душы беларускіх апазыцыянэраў толькі-толькі пад канец мінулага году. Кніжка ж была напісаная не пазьней за лета 2004-га (здадзеная ў друк – 30.07.2004). Грузінскі прыклад быў тады яшчэ адзінкавым і яўна ня мог раскрыць цэлую тэндэнцыю дэмакратычных рэвалюцыяў. А гэта, у сваю, чаргу паказвае на пэўную самастойнасьць у мысьленьні Клімава – ня так хваля захапіла яго, як ён чакаў хвалі і цяпер імкнецца на яе сесьці і накіраваць яе рух.

Магчыма, калі б аўтар пісаў гэтую кнігу ўсё ж пасьля падзеяў ва Ўкраіне ды Кіргізіі, не было б і тых усплёскаў самакрытыкі і ўпадніцтва, накшталт: «Вы ўсе – бяздарныя гульцы адной каманды. Пакуль вы тут высьвятляеце, хто з вас лепшы, іншыя забіваюць вам гол. З гэтым вы нічога зрабіць ня можаце. (…) Так жа не бывае, каб мільёны адначасова зьехалі з глузду. (…) Вы – мёртванароджанае дзіця» (з падразьдзелу «Іосіф Бродзкі». Тут у фінале размовы Бродзкі крытыкуе Клімава, які прасіў у паэта падтрымкі ў разгар ваеннага процістаяньня на вуліцах Менску).

Акрамя таго, цікава было б ведаць, ці выкрэсьліваў Клімаў нейкія фразы ці падразьдзелы з сваёй кнігі пасьля рэфэрэндуму?

Частка «Плошча Незалежнасьці» пачынаецца трагічна й гераічна. Дзяржаўны пераварот у Менску, паўстанцамі захоплены Дом ураду. Не хапае боепрыпасаў, з дахаў суседніх

дамоў страляюць снайпэры, будынак ачэплены войскамі, а праз пэўны час у неба падымаюцца падуладныя А. Р. бамбавікі. Лідэр паўстанцаў А. Клімаў прапаноўвае ўсім, хто хоча, пакінуць Дом ураду, але ахвотных няма.

Іншы варыянт разьвязкі прапанаваны далей, у главе «Нобэль». Тут А. Клімаў з поясам шагіда прабіраецца ў той самы будынак Адміністрацыі прэзыдэнта на Карла Маркса, 38. Выбух спыняе сам вынаходнік дынаміту, Альфрэд Нобэль, бескампрамісна заяўляючы Клімаву, што ён для падобнага ўчынку заслабы. «Дзеля таго, каб помсьціць, як мінімум трэба быць моцным або небеларусам». Гэтая разьвязка спробы рашыць праблему адным выбухам паказвае, што аўтар кнігі далёкі ад думкі, нібыта віна за сучасны стан палітычнага жыцьця ў Беларусі ляжыць на адным чалавеку. Сваю частку віны ён пакідае кожнаму, і сабе ў тым ліку. Віна галоўнага нэгатыўнага пэрсанажа тут ня ў тым, што ён нешта зьмяніў у мэнталітэце масаў, а ў тым, што, на думку Клімава, ён адпавядае гэтаму мэнталітэту.

У наступнай, трэцяй частцы кнігі, якая называецца «Менск-2016», Андрэй Клімаў ня Віктар Юшчанка, ня бог і нават не марскі цар. У першым падразьдзеле ён вязень, у другім – кандыдат у прэзыдэнты ў дзень галасаваньня. У гэтай апошняй якасьці ён выступае пад лёзунгам «Галасуй за Кліма, а то Лука вернецца» і не саромеецца ў сродках, падкупаючы і прыпалохваючы чыноўнікаў, падтасоўваючы вынікі галасаваньня. Матывацыя нячэснасьці ў барацьбе адна – а вы ўспомніце, як *той* з намі абыходзіўся. Перамога кандыдату Клімаву даецца дзякуючы дамове з д'яблам. У трэцім падразьдзеле прэзыдэнт Клімаў адмаўляецца мяняць сыстэму дзяржаўнага кіраваньня (бо былая, «часоў А. Р.», працавала зусім няблага) і склад новага ўраду. Д'ябал радасна паціраe рукі. Гэткае публічнае прызнаньне наяўнасьці маленькага «лукашэнкі» ў сабе павінна, відаць, пераканаць чытача ў тым, што гэты самы маленькі «лукашэнка» знаходзіцца пад поўным кантролем.

Для тых самых чытачоў, каму асобы Клімава ў кніжцы Клімава дагэтуль падалося недастаткова, аўтар (цяпер гэта Яўген

Агурцоў) прадугледзеў частку № 4, «Той самы Клімаў». Прычыну падобнага ўчынку ён растлумачыў даволі завуалявана. Назва «Той самы Клімаў», паводле Я. Агурцова, узнікла таму, што імя Клімава перасьледавала абываталя шчэ з 1992 г. Была і газэта Андрэя Клімава, і банк таго ж імя, і малое прадпрыемства, і акцыянэрнае таварыства. Абываталь мусіў бачыць дэпутацтва А. Клімава ў Вярхоўным Савеце 13-га скліканьня працягам прамоўшэну аднаго толькі імя, тады як насамрэч гэта было сьведчаньнем «нараджэньня палітыка новай хвалі»[10]. Кніга, успрынятая чытачом спачатку як прамоўшэн усё таго ж імя, павінна, па задумцы аўтара/аўтараў, відаць, стаць, у першую чаргу, сьведчаньнем рэінкарнацыі палітыка новай хвалі. Тым больш што Клімаву цяпер ужо ёсьць трыццаць пяць, і канстытуцыйнае права балятавацца ў прэзыдэнты ён мае. Крымінальная судзімасьць, праўда, згадваецца, аднак калі быць пасьлядоўным праціўнікам лукашэнкаўскіх палітычных новаўтварэньняў, то судзімасьць не павінна замінаць.

І, шчыра кажучы, калі ў дадзенай кнізе зьмяшчаюцца хаця б на палову ўласныя думкі, перажываньні, страхі, надзеі А. Клімава, то на тле масавага вобразу непісьменнага і некультурнага, часам беспрынцыповага сучаснага палітыка А. Клімаў выглядае чаканай фігурай для вузкага кола інтэлігентаў. Для больш шырокіх колаў гэты чалавек мог бы заявіць сябе ўжо ня толькі эпатажным палітыкам-рамантыкам, але і палітыкам-інтэлектуалам з стратэгічным мысьленьнем, зь вялікім капіталам пасьпяховага прадпрымальніка, з арэолам пакутніка, нарэшце. «Прагулкі з вампірам» сьведчаць кожным радком – ён сапраўды такі, ён сапраўды прэтэндуе, падыходзіць і гэтак далей.

Напісаная густоўна, хоць часам і нуднавата, кніга ўспрымаецца як тэкст шчыры й амбіцыйны. Як зьява шчырая, яна часам выклікае натуральны недавер у паўнаце сваёй шчырасьці. А як любая амбіцыйная заява, для таго, каб выклікаць да сябе давер чытача, яна павінна была б падмацоўвацца нейкім сапраўды значным палітычным учынкам. Але і гэты ўчынак (той самы, 25 Сакавіка) успрымаецца, хутчэй, як працяг усё той жа амбіцыйнасьці аўтара.

Літаратурны тэкст – як раскіданая па старонках палітычная фантазія, палітычная практыка, як літаратурны твор з фантастычным адценьнем. Менавіта так, магчыма, будуць успрымаць маладога Клімава пазьней. *Калі* ён зьменіцца. Калі ён *зьменіцца*.

[image]

[image]

№ 4 (38) - 2005

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.

Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2006/01/07

[image]

ТЭАДОР Р. УІКС

Тэадор Р. Уікс
Ідэнтычнасць у познеімперскай Расіі
Нацыя, культура, палітыка

ад’юнкт-прафэсар гісторыі ўва ўнівэрсытэце Паўднёвага Ілінойсу ў Карбандэйле. Сёлета мае выйсьці ягоная кніга «His From Assimilation to Antisemitism: The «Jewish Question» and Polish Society, 1850-1914». Цяпер жыве ў Вільні і працуе над кнігай пра мультыэтнічнай гісторыі Вільні ад 1795 да 2000 г.

Ely Christopher. *This Meager Mature: Landscape and National Identity in Imperial Russia*. – DeKalb, Illinois: Northern Illinois University Press, 2002. – 278 p.

Schrader Abby M. *Languages of the Lash: Corporal Punishment and Identity in Imperial Russia.* – DeKalb, Illinois: Northern Illinois University Press, 2002. – 258 p.

Wolff David. *To the Harbin Station: The Liberal Alternative in Russian Manchuria, 1898–1914*. – Stanford: Stanford University Press, 1999. – 255 p.

Малинова О. Ю. *Либеральный национализм (середина XIX – начальнем начало XX века)*. – Москва: РИК Русанова, 2000. – 254 с.

Вісарыён Бялінскі неяк зазначыў: «Нацыянальнасць – гэта не даматканая світка, лапці, сівуха ці кіслая капуста». У чым жа тады сутнасць «расійскасці»? Насамрэч, ці існуе расійская

ідэнтычнасць наогул? Кнігі, якія тут разглядаюцца, уяўляюць сабой спробу ў розныя спосабы даць адказ на гэтыя пытанні, як беручы за аснову ранейшую гістарыяграфію, так і ідучы новымі шляхамі. Падчас «доўгай халоднай вайны», што працягвалася і ў 1980-х, Расію часцяком трактавалі як своеасаблівы свет і асобна як нацыю, у пэўным сэнсе пагаджаючыся з Канстанцінам Аксакавым («Расійскі народ – гэта не народ, гэта людзі»)* і Фёдарам Цютчавым («Расіі розумам не ўцяміць»). На шчасце ці на гора, крушэнне СССР – з ціхім скавытаннем, а не з гучным выбухам – паклала канец тым часам, будзем спадзявацца, назаўсёды. Расія больш не з'яўляецца адной з вялікіх дзяржаў свету; гэта, хутчэй, дзяржава, якая мае вялікае значэнне, аднак бадай што не кіроўную ролю, з вялізным патэнцыялам, аднак з не менш страхатлівымі эканамічнымі, сацыяльнымі ды палітычнымі праблемамі. Адна з такіх праблем мае на ўвазе спробы разабрацца, што азначала і што азначае быць расійцам.

«Ідэнтычнасць» – паняцце, сумнавядомае сваёй няпэўнасцю, і некаторыя навукоўцы хацелі б наогул адмовіцца ад яго ўжывання. Аднак урэшце гісторыкі вымушаны мець справу з цьмянымі катэгорыямі і эмацыянальнымі прыхільнасцямі; зрэшты, хто-хто, а чалавечыя істоты якраз такія – цьмяныя і эмацыянальныя[1]. У апошнія гадоў дзесяць быў апублікаваны шэраг розных манаграфій, прысвечаных аспектам расійскай ідэнтычнасці (у прыватнасці, нацыянальнай), як бліскучых, так і пасрэдных[2]. Мы, безумоўна, сталі больш ведаць аб нацыянальнай палітыцы, аб супраціўленні нерасійцаў русіфікацыі (якім бы чынам яе ні акрэслівалі) і аб гісторыях этнічных групаў у межах Расіі[3]. У той самы час, заблытаны вузел культуры, рэлігіі, настрояў, класаў і палітыкі, які складае «расійскую ідэнтычнасць» (або «ідэнтычнасці»), шмат у чым застаецца па-ранейшаму terra incognita.

Гэтыя чатыры выданні ў разнастайныя спосабы асвятляюць розныя куточкі славутай «расійскай душы» праз прызму краявідавых выяваў, тэорыю і практыку цялеснага канцэпцыі ліберальнага нацыяналізму і пабудову «ліберальнай альтэрнатывы» па-за межамі самой Расіі.

* Пераклад: Народ не имеет

Dadzenaya kniga ўyaўlyae sabo gistoryu Harbina ў pershyya pyatnaccaць gadoў yago isnavannya, adnak u yoy yosc taksama nechta bolshae. Harbin byў zasnavany yak chygunachny vuzel Kitajska-Usxodnyaj chygunki (KUCh, yakaya zlychala Transsibirskuyu chygunachnuyu magistral z Uladzivastokam praz kitajskuyu Manchzhuryu) i chygunachnaj linii, shto ishla na poўdzen da Port-Artura. Takim chynam, ad samaga pachatku gorad byў tvoram rasijskaga ўrada i staўsya padstavaj dlya spraechak, napryklad, pamizh Ministerstvam finansaў, Ministerstvam abarony i MZS. Drugi razdzel knigi amal calkam prysvechany getaj baracbe. Volf nyastomna padkrэslivae «madэrnasc» getaga horada, shto byў spraektavany i pabudavany hutka, horada bez gistoryi, mocnych elit abo pracyaglych tradycyj. Shmat u chym Harbin bolsh nagadvaў amerykanski «gorad buму», gorad, shto paўstaў u vyniku ekanamichnaga pad'ёmu, chym rasijski gorad; i navednikaў urazhvali yagony ambitny sucasny vygliad i atmasfera. Adnoj z

9. Frank Steffen Grand Cultural Conflict, and Russia, 1856–1914 Berkeley: University of California Press, 1999.

прыкметных праяваў гэтай сучаснай «нерасійскай» атмасферы быў росквіт габрэйскай супольнасці. Усяго праз дзесяць гадоў пасля заснавання Харбіна габрэі ўжо складалі больш за 19 % «расійскага» (г. зн. няўсходнеазіяцкага) насельніцтва, мелі як «нацыянальныя», так і рэлігійныя арганізацыі, і паспелі збудаваць як унушальнага выгляду сінагогу, так і габрэйскую школу. Хаця на габрэяў у Харбіне не распаўсюджваліся абмежаванні, якія накладаліся на габрэяў, што жылі ў іншых расійскіх гарадах (за рысай аселасці), аднак і тут таксама расійскае чыноўніцтва ставілася да іх з недаверам. Харбін усё ж такі прайшоў праз антыгабрэйскую агітацыю, звычайную для ўсёй Расіі ў 1905 г. і пазней, хаця пагромаў тут не адбывалася.

Як і варта было спадзявацца, перыяд расійска-японскай вайны і наступнай за ёй рэвалюцыі апісаны даволі падрабязна. У гэтым выпадку падзеі ў Харбіне таксама адлюстроўвалі агульнарасійскія тэндэнцыі, аднак мелі і своеасаблівыя ўласныя рысы. Як і іншыя індустрыяльныя гарады, Харбін перажыў стачкі і грамадзянскія хваляванні ў 1905 г., аднак паслярэвалюцыйная «чыстка» ўладаў была нашмат мякчэйшай, чым у іншых месцах. Волф апісвае пацешны эпізод, калі лідэры страйку былі дапытаныя закрытым вайсковым трыбуналам, прызнаныя вінаватымі ў распаўсюдзе рэвалюцыйнай прапаганды і асуджаныя на турэмнае зняволенне – аднак акурат высветлілася, што турмы для іх няма, таму вязняў давялося размясціць у даволі шыкоўным гатэлі. Волф таксама адзначае, што шмат якія з завадатараў належалі да сярэдняга класа, былі адукаванымі прафесіяналамі – інжынерамі, адвакатамі і да т. п. – і часта палякамі. Бунтаўнікоў такога кшталту ў самой Расіі амаль з пэўнасцю чакала значна больш жорсткае пакаранне.

У апошнім раздзеле кнігі аўтар адыходзіць ад тэмы Харбіна, каб распавесці блізкую і ў гэткай самай ступені цікавую гісторыю пачаткаў «расійскай арыенталогіі». Усходні інстытут быў заснаваны ва Уладзівастоку праз год пасля заснавання Харбіна і ў пэўным сэнсе развіваўся разам з гэтым горадам. Хаця інстытут быў размешчаны не ў Харбіне, у ягонай праграме знайшла адлюстраванне «ўсходняя місія» Расіі, і шмат хто з ягоных выпускнікоў выправіўся працаваць у Манчжурыю. Са

зразумелых прычын, вывучэнне азіяцкіх моваў і культуры праводзілася таксама і ў самім Харбіне. «Таварыства расійскіх усходазнаўцаў» спрыяла вывучэнню і пашырэнню інфармацыі аб культуры Азіі, у прыватнасці, кітайскай і мангольскай. З 1909 па 1925 гг. таварыства выдавала «Вестник Азии». Выглядае, аднак, на тое, што да 1914 г. і пазней большасць расійцаў у Харбіне, не кажучы ўжо пра Маскву ці Санкт-Пецярбург, заставаліся ў ізаляцыі і ў няведанні адносна сваіх кітайскіх, карэйскіх ды манчжурскіх суседзяў.

Дэвід Волф як ніхто іншы надаецца на ролю аўтара гэтай кнігі, для напісання якой ён карыстаўся архівамі не толькі Расіі і Кітаю, аднак таксама Японіі, Ізраілю, Заходняй Еўропы і Інстытута Гувера. Кніжка чытаецца, хутчэй, як прыгодніцкі раман, чым як навуковая манаграфія, асабліва калі Волф апісвае асоб, якія засноўвалі і стваралі горад. Яна ўтрымлівае набор цудоўных дабраякасных ілюстрацый і сучасных картаў. Вядома, нават найлепшая кніга не можа быць дасканалай ва ўсіх адносінах. Асабліва прыкра, што аповед у ёй сканчваецца (у асноўным) на 1914 г. Да таго ж, аўтар мог бы прысвяціць больш часу таму, каб змясціць сваю працу ў кантэкст найноўшай гістарыяграфіі гарадской гісторыі, што магло б падмацаваць (ці наадварот) ягоныя сцвярджэнні пра унікальнасць Харбіна. Шмат у чым больш падрабязна можна было б паказаць і штодзённае жыццё, і гендэрную сітуацыю, хаця магчыма, аб'ём выдання зрабіў гэта немажлівым. З больш сур'ёзнай крытыкай варта звярнуцца да падзагалоўка кнігі: «Ліберальная альтэрнатыва ў расійскай Манчжурыі». Ці гэта была рэальная альтэрнатыва? І наколькі «ліберальнай» яна была ў доўгатэрміновай перспектыве? Праблема расійскай ідэнтычнасці тут закранаецца, хутчэй, мімаходзь, хаця яна магла б стаць прадметам больш глыбокага даследавання. Без сумневу, харбінцы вызначалі сябе як расійцаў новага перадавога кшталту. Тым не менш, цікава было б прасачыць глыбей праблему ідэнтычнасці ў асяроддзі харбінцаў-габрэяў, у прыватнасці, што датычыць стаўлення да інтэграцыі ў большую нацыянальную супольнасць. Аднак наўрад ці было б справядліва папракаць аўтара за ненапісаныя раздзелы, і кніга «Да станцыі Харбін» застаецца ў вышэйшай ступені добра падрыхтаванай і дакументальна абгрунтаванай працай, якая

заслугоўвае ўвагі шырокага кола чытачоў.

Апошняя кніга, што разглядаецца намі, «Ліберальны нацыяналізм» Вольгі Малінавай, даволі моцна адрозніваецца ад трох папярэдніх, і не толькі таму, што напісаная па-расійску. Гэта кніга трывала ўкаранёная ў традыцыі «гісторыі ідэй»; канцэпцыі і палітычна-філасофскія творы займаюць у ёй цэнтральнае месца. Гэта таксама кніга, што, відавочна, пісалася з думкай пра цяперашнюю палітычную сітуацыю ў Расіі, хаця аўтара нельга абвінаваціць у празмерным адхіленні ў бок «прэзентызму». Яе асноўнае пытанне простае: што ўяўляў з сябе ліберальны нацыяналізм, як ён развіваўся ў XIX–XX стст. і (гэта маецца на ўвазе, аднак абмяркоўваецца адкрыта толькі на апошніх старонках кнігі) ці магчымы ліберальны нацыяналізм у сённяшняй Расіі? Аўтар кнігі ідзе даволі знаёмым (прынамсі, тым, хто вывучаў нацыяналізм) шляхам, аднак робіць і некалькі цікавых новых крокаў у іншым кірунку. Асноўныя дзеючыя асобы – Джон Сцюарт Міль, Лорд Актан, Джузепе Мадзіні, Уладзімір Салаўёў, Пётр Струвэ, Павел Мілюкоў, Томаш Масарык і нарэшце апошні і, магчыма, найменш значны з іх усіх, Вудра Уілсан. Аповед Малінавай пра пералічаных тут заходніх дзеячаў (да якіх я далучаю і Масарыка), хутчэй за ўсё, не ўтрымлівае нічога новага для ўсіх нашых чытачоў. Трэба сказаць, тым не менш, што Вудра Уілсан у нечым выпадае з гэтага шэрагу, і не толькі праз ягоныя палітычныя няўдачы. Ці шмат хто з нас чытаў нейкія працы Уілсана, акрамя, магчыма, ягоных «Чатырнаццаці пунктаў»? Ва ўсякім выпадку, для мяне павучальна было прачытаць пра навуковую працу 28-га прэзідэнта Амерыкі, дзе, прынамсі, часткова разглядалася роля, якую адыгрывае нацыя ў сучаснай палітычнай адзінцы.

Аднак для большасці чытачоў найболей адкрыццяў утрымлівае той раздзел працы Малінавай, што прысвечаны Салаўёву, Барысу Чычэрыну, Пятру Струвэ і Паўлу Мілюкову. Вядома, што ўсе гэтыя людзі пісалі пра праблемы нацыянальнасці, аднак іх думкі заслугоўваюць глыбейшага абмеркавання, асабліва калі прыняць да ўвагі іх надзённасць для сённяшняй Расіі. Шэсцьдзесят з лішнім старонак Малінава прысвячае гэтым асобам як «ліберальным нацыяналістам», пераважна

аналізуючы іх працы на тэму нацыянальнасці і, у прыватнасці, вечных польскага, габрэйскага і (асабліва для Струвэ і Мілюкова) украінскага пытанняў. У гэтым месцы Малінавай перашкаджае як занадта малы аб'ём кнігі, так і яе жаданне падагнаць гэтыя даволі непадобныя ідэалогіі пад шырэйшую канцэпцыю «ліберальнага нацыяналізму». Нацыяналізм Струвэ можна было б лічыць ліберальным, скажам, у кантэксце Злучаных Штатаў, аднак для большасці палякаў, украінцаў і нават габрэяў ягоныя працы, напісаныя пасля 1905 г., выглядаюць, хутчэй, на падсалоджаны варыянт старога добрага расійскага імперыялізму. Мілюкоў, без сумневу, быў сапраўдным расійскім лібералам, аднак разам з тым ён лічыў адной з найпершых каштоўнасцяў захаванне імперыі з мінімальнымі тэрытарыяльнымі зменамі. У нейкім сэнсе Мілюкоў мог быць вельмі ліберальным адносна габрэйскага пытання, бо меркаваў, што габрэі асімілююцца і стануць сапраўднымі расійскімі лібераламі, што шмат якія з іх на той момант ужо зрабілі. Малінава называе ў кнізе мілюкоўскую канцэпцыю нацыянальнай палітыкі «ліберальна-імперыялістычнай», праводзячы (у зносцы) адкрытае параўнанне з творамі Джона Сцюарта Міля аб часах брытанскага панавання ў Ірландыі ды Індыі. Усё гэта вельмі цікава, аднак заслугоўвае глыбейшага і больш дэталёвага падыходу. Аўтар разглядае працы гэтых людзей, аднак не адважваецца закранаць глыбейшыя гістарычныя пытанні: напрыклад, ці мог расійскі ліберальны нацыяналізм у любым сваім выглядзе дасягнуць поспеху да пачатку XX ст.; ці быў лібералізм проста тупіком для Расіі, нават без Першай сусветнай вайны? Да якой ступені катэгорыі «нацыяналістычнага» і «ліберальнага» маглі суіснаваць у расійскай ідэнтычнасці – рэч, што была цалкам магчымай, прынамсі, пэўны час, у Нямеччыне або Францыі? Відавочна, гэта грунтоўныя пытанні, на якія нельга адказаць з пэўнасцю, аднак разгляд грунтоўных пытанняў, на якія немагчыма адказаць, можа спрычыніцца да з'яўлення цікавых і павучальных прац па гісторыі.

Што ж тады мы можам сказаць пра расійскую нацыянальную ідэнтычнасць у XIX ст. (да 1914 г.), прачытаўшы гэтую кнігу? Першая наша рэакцыя – збянтэжанае маўчанне. Быў

расійцы. Чамусьці яны лічылі сябе адрознымі ад татараў, нарадзіць
габрэяў і палякаў. Расійскія чыноўнікі спрабавалі кадыфікаваць
і забяспечыць дзеянне элементаў гэтай ідэнтычнасці, аднак
(закадаванай у рамках пэўнага сацыяльнага ладу) прыхільнасць
дапамозе цялесных пакаранняў. Пісьменнікі і мастакі XIX ст. таксальныя
стварылі і перадалі нашчадкам вобразы «расійскасці», якія ў нічым
не адметным расійскім краявідзе. Адзін з варыянтаў такой
ідэнтычнасці, больш сучасны, дзёрзкі і ліберальны, ствараецца
версія з Варонежа ды Пермі, адлюстраваўся ў новым фармаце
Харбін. Некаторыя расійскія мысляры на пераломе стагоддзя
рознымі вынікамі спрабавалі сплавіць ліберальныя ідэалы
глыбокім расійскім патрыятызмам. Усё гэта заслугоўвае ўвагі;
шмат ёсць свежага і наватарскага. Чаго ж не стае? Цалкам
няма сумневу, аднак у першую чаргу аднаго ключавога
фактару, які з'яўляецца кожны раз, калі расійцы XIX ст. пачынаюць
пра сябе саміх, супрацьпастаўляючы сябе нерасійцам:
праваслаўя. Быць расійцам, не вызнаючы адначасова «праўдзівай
веры», было нялёгка, як часта дазнавалі на сабе расійскія
габрэі (заўважце: [ні ў якім выпадку] не «габрэйскія хрысціяне»).
Праваслаўе азначала шмат рэчаў, у тым ліку шмат негатыўнае,
прымалася дзейнай царквой[10]. Аднак, безумоўна, праваслаўе
нагэтулькі ж цесна пераплецена з «расійскасцю», як каталіцызм
з польскасцю, і патрабуе ўважлівага, новага, крытычнага
разгляду энергічным маладым гісторыкам. А мы тым часам
можам падзякаваць разгледжаным тут аўтарам за іх
натхняльны ўнёсак у наша разуменне гэтага прыкрага і вечнага
пытання «Што ёсць расіец?» (*Что такое русский человек?*).

Пераклала з амерыканскай Мілана Міхалевіч паводле:
Kritika: Explorations in Russian and Eurasian History. Vol. 5. No. 4. Fall 2004. P. 735–747.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 4 (38) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [mk]. Абнаўленьне [czyk].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/07

[image]

КІМІТАКА МАЦУЗАТА нар. у 1960 г.) – палітоляг, выкладае расейскую і ўкраінскую палітыку і гісторыю ў Хакайдзкім універсытэце. З 1991-га супрацоўнічае з створаным пры гэтым універсытэце Цэнтрам славістыкі. У 2003 г. у гадавіку «Jahrbücher für Geschichte Osteuropas» быў апублікаваны яго аналіз «Russian Anti-

Кімітака Мацузата
Рэжым Лукашэнкі як выспа папулізму ў акіяне кланавай палітыкі[1]

УВОДЗІНЫ: ЛУКАШЭНКАЎ ПАПУЛІЗМ У ПОСТКАМУНІСТЫЧНЫМ КАНТЭКСЦЕ

Крах сацыялістычных рэжымаў ва Усходняй Еўропе і Еўразіі прывёў да паляры-зацыі палітычных сістэм. У краінах Цэнтральнай Еўропы і Балтыі (далей мы будзем называць іх заходнімі посткамуністычнымі краінамі[2]) палітычныя партыі пачалі адыгрываць значную ролю ўжо на раннім этапе трансфармацыі. У гэтых краінах дамінуюць унітарныя палітычныя рэжымы і свабодныя рынкавыя эканомікі. У адрозненне ад іх, у палітычных сістэмах краін СНД пераважаюць нефармальныя кланавыя адносіны. Вядома, нават у СНД пачынаючы з канца 1990-х гг. існуе некалькі прыкладаў паспяховай разбудовы партый. Тым не менш, гэткія паспяховыя партыі, як «Адзіная Расія» і Сацыял-дэмакратычная партыя (аб’яднаная) ва Украіне, былі і застаюцца адно фасадам, за якім крыюцца ўсё тыя ж узаемадачыненні розных кланаў. Калі ў заходніх посткамуністычных краінах будуюцца унітарныя дзяржавы, то ў краінах СНД палітычныя адносіны паміж

цэнтрам і перыферыяй выяўляюцца скрайне дэканцэнтраванымі, хаця канстытуцыі большасці краін, за выключэннем Расіі, абвяшчаюць, што ў іх таксама будуецца унітарная дзяржава. У гэтых краінах аформіўся патрыманіяльны капіталізм, выгадны не толькі мясцоваму бізнесу, але і насельніцтву ўвогуле.

Мэта дадзенага артыкула – раскрыць папулісцкі характар палітычнага рэжыму Аляксандра Лукашэнкі, нехарактэрнага ў прынцыпе, для краін СНД. Каб вытлумачыць гэтую адметнасць, недастаткова проста параўнаць беларускую палітыку з палітыкай іншых постсавецкіх краін. Яе можна зразумець толькі ў кантэксце палярызацыі посткамуністычных палітычных і эканамічных рэжымаў. У табліцы, змешчанай ніжэй, пералічваюцца 9 крытэраў адрозненняў паміж дзвюма тыпамі посткамуністычных рэжымаў.

ДВА ТЫПЫ ПОСТКАМУНІСТЫЧНЫХ ПАЛІТЫЧНЫХ РЭЖЫМАЎ

	Краіны Цэнтральна-Усходняй Еўропы і Балтыі	**Краіны СНД**
1. Канстытуцыйнае ўладкаванне	Парламенцкая або слабая прэзідэнцкая сістэма	Моцная прэзідэнцкая сістэма
2. Змена ўраду	Чаргаванні кааліцыйных урадаў	Вечнае кіраванне адной партыі, якая абсарбуе ўсе рухі левага кшталту
3. Арганізацыйная інфраструктура палітыкі	Афіцыйна замацаваная роля партый	Кліентэлісцкія адносіны
4. Выбары	Залежныя ад хістанняў грамадскай думкі	Падпарадкаваныя палітычнай інжынерыі
5. Прасторавыя характарыстыкі партыйнай сістэмы	Цэнтралізаваная партыйная сістэма спалучаная з прапарцыйнай	Пераважна падкантрольная выбарчая сістэма; фрагментаваная

Polonism Under the Challenges of Modernization», цэнтру «Генерал-губернаторства в Российской империи: от этнического к пространственному подходу» (зборнік «Новая имперская история постсоветского пространства», выдадзены казанскім часопісам «Ab imperio»).

1 Артыкул выкананы ў рамках праектаў «Мікрадаследаванні эканамічных, сацыяльных і палітычных структур Беларусі і Украіны ў пераходны перыяд» (2001–2004

	выбарчай сістэмай на нацыянальным і мясцовым узроўнях	партыйная сістэма	«Утварэнне новых дзяржаў і ўзнаўленне незалежнасці ў Еўразіі» (2003–2008 гг.)
6. Адносіны паміж цэнтрам і перыферыяй	Унітарнае ўладкаванне	Дэканцэнтраваныя ўлады, вялікі ўплыў рэгіянальных эліт	«Узнаўленне і пераасэнсаванне ўлады ў постсавецкіх рэгіёнах (Meso-areas) і глабалізацыя» (2003–2008 гг.)
7. Стаўленне да патрабаванняў ЕС	Шчырае (няма безумоўнай падтрымкі; выказваюцца заўвагі)	«Згадванне ідэі разумення» ці выключна дзеянні самалегітымацыі	«Стаўленне да пашырэння ЕС» (2002–2005 гг.)
8. Эканамічны рэжым	Чыстая неакансерватыўная рынкавая эканоміка; адкрытасць да замежнага капіталу	Патрымка капіталізму, падтрымка нацыянальнага капіталу	«Стаўленне славянска-еўразійскіх краін як аб'ектаў дысцыпліны: праблемы і перспектывы» (2003–2008 гг.)
9. Жыццёвы ўзровень грамадзянаў	Неспадзявана нізкі	Неспадзявана нізкі	«Трансфармацыя рэгіёны (Meso-areas) і глабалізацыя» (2003–2008 гг.)

Крытэр 1: канстытуцыйнае ўладкаванне. Калі заходнія посткамуністычныя краіны прынялі або парламенцкую, або, у скрайнім выпадку, слабую прэзідэнцкую сістэму, то краіны СНД нормай стала суперпрэзідэнцкая рэспубліка (выключэннем складае Малдова). Месца сакратароў ЦК занялі прэзідэнты, іхнія рэжымы функцыянуюць як гарантыя персаналізаванага размеркавання рэсурсаў і даходаў. Праўда, у большасці краін СНД у канстытуцыях прапісана не чыста прэзідэнцкая, а паўпрэзідэнцкая сістэма, калі прэзідэнт прызначае прэм'ер-міністра са згоды парламента. Аднак удзел апошняга ў прызначэнні кіраўніка ўрада сам па сабе не сведчыць аб моцы ці слабасці прэзідэнта; у катэгорыю «паўпрэзідэнцкіх» трапляюць самыя розныя палітычныя рэжымы, ад суперпрэзідэнцкіх рэспублік (Беларусь, краіны Цэнтральнай Азіі) да рэжымаў, дзе рэальная ўлада прэзідэнта сімвалічная (Фінляндыя).

Крытэры 2, 3, 4, 5, мабыць, маюць вырашальнае значэнне. Яны дазваляюць аднесці лукашэнкаўскі рэжым да «тыпу СНД», аднак у той жа час паказваюць, што ён істотна адхіляецца ад

такога чыстага тыпу. Малая імавернасць зменаў урада, недаразвітасць афіцыйных партый пры дамінаванні груповак, выбарчыя кампаніі, дзе на першы план выходзіць асабісты патранаж над электаратам, а не партыйныя і ініцыятывы, выкарыстанне пераважна мажарытарнай выбарчай сістэмы адрозніваюць палітычныя рэжымы краін СНД (уключаючы беларускі) ад тых, што склаліся ў цэнтральна-постсавецкіх краінах.

Палітычныя рэжымы ў краінах СНД паўсталі ў выніку прыстасавання палітыкі былых камуністычных босаў (кланаў) да эпохі канкурэнтных выбараў. У гэтым сэнсе палітычныя рэжымы краін СНД больш традыцыйныя, чым у заходніх постсавецкіх краінах, у якіх, як ужо адзначалася, у 1989–1990 гг. значная частка былых лідэраў была адхілена ад улады і пазней згуртавалася ў прарынкавых апазіцыйных сацыял-дэмакратычных кааліцыях. У выніку, на левым фланзе апынулася даволі многа дасведчаных палітыкаў, што палягчала перыядычную змену ўрадаў. Наадварот, у краінах СНД камуністычныя партыі засталіся адно пратэставымі палітычнымі сіламі. Падабаецца камусьці гэта ці не, але адсутнасць стратэгічных разыходжанняў паміж левымі і правымі ў заходніх посткамуністычных краінах (што паказала аднадушная падтрымка імі пашырэння ЕС і НАТО) стварыла ўмовы для чаргавання палітыкаў ля стырна ўлады. Як толькі гэтыя краіны пачалі інтэгравацца ў Еўрапейскі Саюз, яго кіраўніцтва, у сваю чаргу, зрабіла захады, каб прадухіліць развіццё іх палітычных і эканамічных рэжымаў паводле мадэлі СНД[3].

Згодна з *крытэрамі 2, 3, 4, 5* рэжым Лукашэнкі, без сумневу, належыць да тыпу «ўсходніх постсавецкіх». Аднак, калі расійскі, украінскі і нават цэнтральнаазіяцкія рэжымы дэманструюць пэўны ўзровень плюралістычнай канкурэнтнасці паміж кланамі, беларускую кланавую палітыку можна назваць манапалісцкай. У Расіі, Украіне, Казахстане ўласныя прэзідэнцкія кланы былі адносна малыя. Ельцын, Кучма і Назарбаеў даваралі ці працягваюць даваць разнастайным кланам, падштурхоўваючы іх да змагання міжсобку-

Хаця дзяржаўнага ўкідзіцца ў праграмы найбольш фармацыйна-выбарчых дзеяннях недзяржаўных арганізацый на чале з Уладзімірам Рэўдам.

[2] Маштабныя змены ў палітычным ландшафце Украіны адбыліся толькі ў 2004 г. Эпідэмія «каляровых рэвалюцый» ахапіла Кыргызстан у 2005 г.

[3] Шлях, які выбралі Арменія, Грузія, Малдова, Украіна, Латвія, Літва, Эстонія, Славенія, Славакія, Балгарыя, Румынія, Харватыя, Албанія і Македонія, у 1990-я гг. значна адрозніваўся ад шляху, выбранага краінамі СНД.

ўскладаючы на іх адказнасць за правалы ў палітыцы. Гэтая практыка пасуе да паўпрэзідэнцкай сістэмы, якая забяспечвае ўкраінскаму прэм'ер-міністру пэўную незалежнасць дзеянняў прэм'ер-міністра. Лукашэнка ж спрыяе развіццю толькі ўласнага клана і ўласнай вертыкалі машыны, не дазваляючы ў гэтым плане ніякай канкурэнцыі з боку фракцый эліты. Лукашэнка дабіўся поспеху ў дэструкцыі любога заўважнага развіцця элітных кланаў – парламенцкіх, бюракратычных, фінансава-алігархічных, прамысловых, рэгіянальных. З гэтай мэтай Лукашэнка заўсёды апеляваў да масаў, спрабуючы выклікаць у іх антыэлітныя пачуцці і атакаваць эліты і зверху, і знізу. Лукашэнкава манадэлісцкая кланавая палітыка знайшла сваё апраўданне ў папулісцкім вобразе палітыкі, у якой бяруць чынны ўдзел толькі дзве дзеючыя асобы: «лідэр» і «народ».

Безумоўна, кіраўнікі іншых краін СНД таксама ўжывалі папулісцкую тактыку і яўна антыэлітныя захады. Напрыклад, палітыка цэнтралізацыі прэзідэнта Пуціна прынесла яму поспех толькі тады, калі ён прышчапіў масам негатыўны вобраз «мясцовых князькоў». Працэс супраць Хадаркоўскага прадэманстраваў, што незалежных бізнесоўцаў не чакае лёгкае жыццё ў капіталістычнай Расіі – прэзідэнт можа пакараць любога, каго западозрыць у «нячэснасці». Прэзідэнты цэнтральнаазіяцкіх краін часта абвінавачваюць найвышэйшых чыноўнікаў у карумпаванасці і некампетэнтнасці – гэта робіцца па тэлебачанні напярэдадні выбараў і рэферэндумаў. Тым не менш, папулізм і антыэлітызм Лукашэнкі маюць больш сістэмны і інстытуцыяналізаваны характар, што і будзе паказана ў маім артыкуле.

Крытэр 6: рэгіянальная палітыка. Адносіны паміж цэнтрам і перыферыяй у Беларусі не толькі дэ-юрэ, але і дэ-факта унітарныя. Краінам СНД гэта не ўласціва. Калі ўкраінскі прэзідэнт Кучма і татарстанскі Шайміеў прызначалі губернатараў і кіраўнікоў мясцовага ўзроўню з ліку рэгіянальных/мясцовых «босаў» пад шырмай цэнтралізаванай сістэмы прэфектаў, то Лукашэнка ж фактычна тасуе мясцовых кіраўнікоў паміж рознымі рэгіёнамі, не чакаючы, пакуль яны ўтвораць уласныя «зоны ўплыву».

Гэта блакуе ўкараненне ў грамадстве ўкраінскай урбанізацыі і ўкараненне ў дзяржаўнай службовых, інжынерных і фінансавых кадраў, а таксама спрыяе ўзмацненню дзяржаўных рэсурсаў. У гэтым выпадку, нават прыхільнікі палітыкі не маюць доступу да дзяржаўных рэсурсаў для партыйнага будаўніцтва, і таму не маюць іншай альтэрнатывы, як будаваць партыі, прыцягваючы калектыўныя і мэтавыя

унескі. Гл.: Shelter Martin. Political Parties and

Крытэр 7: стаўленне да нормаў, прынятых у ЕС. Што тычыцца стаўленні адрознівае заходнія постсавецкія краіны ад краін СНД. Гэта не азначае, што палітыкі з Цэнтральнай Еўропы заўжды трымаліся нормаў ЕС. Напрыклад, Вацлаў Клаўс адкрыта крытыкаваў ідэю «Еўропы рэгіёнаў», аддаючы перавагу пабудове унітарнай дзяржавы. У сярэдзіне 1990-х расійскі, украінскі і кіргізскі рэжымы ажыццяўлялі рэформу мясцовае улады, якая супярэчыла асноўным прынцыпам Еўрапейскай хартыі мясцовага самакіравання, але ніколі не крытыкавалі яе і заўсёды станоўча яе «ўзгадвалі». У гэтым плане Беларусь вылучаецца сярод краін СНД. У адрозненне ад Кучмы і Лукашэнка не лічыць неабходным паляпшаць свой імідж у Захадзе і нават на словах не прымае такіх еўрапейскіх каштоўнасцяў, як мясцовае самакіраванне і адмова ад смяротнага пакарання.

Крытэры 8 і 9: патрыманіяльны капіталізм і жыццёвыя стандарты. Іронія посткамуністычнай трансфармацыі заключаецца ў тым, што павольнае прыняцце заходнімі посткамуністычнымі краінамі сусветных стандартаў неабавязкова прыводзіла да адчувальнага ўздыму жыццёвага ўзроўню насельніцтва. Нават калі расійцы і беларусы зарабляюць у эквіваленце па 120 амерыканскіх долараў штомесяц, а жыхары балтыйскіх краін – 250, нельга катэгарычна сцвярджаць, што апошнія жывуць лепш за першых, беручы пад увагу цэны на тавары і паслугі[4]. Больш за тое, грамадзяне краін СНД дэ-факта карыстаюцца пэўнымі прывілеямі і дзяржаўнай «дабрачыннасцю». Напрыклад, нават калі яны не заплацяць за электраэнергію, газ і ацяпленне, яны не адчуюць ніякіх нязручнасцяў (што цяжка ўявіць у заходніх постсавецкіх краінах). Мне здаецца, што нізкі ўзровень жыцця ў Літве дае Лукашэнку козыры для вядзення антызаходняй палітыкі.

---

the State in European Historical Perspective, Princeton University Press, 1994. Pp. 5–6, 14–15. Важна адзначыць, што ў заходніх посткамуністычных краінах і кансерватыўныя, і левыя партыі ўтвараліся падобным чынам, што знаходзіліся ў апазіцыі. У краінах СНД уладныя кланы перажылі палітычныя забурэнні 1989–1991 гг., не страціўшы ўлады, і стваралі партыі ды блокі (такія, як «Наш дом Расія», «Адзінства»,

«Народна-дэмакратычная партыя» і «За адзіную Украіну») «знутры» сістэмы, з дапамогай традыцыйных патрон-кліенцкіх сувязяў і адміністрацыйных рэсурсаў. Як адзначае Шэфтэр, гэтая пачатковая розніца можа мець доўгатэрміновыя наступствы і вызначаць палітычнае жыццё ў названых краінах нават пасля зменаў «сацыялагічных умоваў».[4]

Чаму рэжым Лукашэнкі адхіліўся ад кланавага тыпу, дамінуючага ў краінах СНД, на карысць папулізму? Зрабіць тут артыкуле я паспрабую даць адказ на гэтае пытанне, прааналізаваўшы істотныя аспекты папулізму Лукашэнкі і зварот да спецыфічнай беларускай ментальнасці, рэтраспектыўную працэсы станаўлення яго рэжыму, паказальныя працэсы над прадстаўнікамі дзяржаўнай эліты, рэгіянальную палітыку, скіраваную на абмежаванне мясцовых кланаў, кантраляваную эканоміку і недарэчныя дзеянні апазіцыі, якія ствараюць ёй

Памеры

Уласцівасці

прыбліз

ня

ю

ю

ю

вобраз ворага.

ПАРАЎНАННЕ З ЛАЦІНААМЕРЫКАНСКІМ ПАПУЛІЗМАМ

Разглядаючы працэсы адыходу ад традыцыйнага «алігархічнага парламентарызму» ў Лацінскай Амерыцы, на Паўночных Балканах і ў Грэцыі ў другой палове XIX і першых дзесяцігоддзяў XX ст., Нікас Музеліс вылучае дзве схемы: папулізм (у Лацінскай Амерыцы і на Балканах) і трансфармацыю ўжо існых кліентэлісцкіх сетак (у Грэцыі)[5]. Музеліс тлумачыць гэтую розніцу сацыяльнымі ўмовамі палітычнай мадэрнізацыі гэтых краёў. Напрыклад, для грэцкага сярэдняга класу ў папулісцкім метадзе палітычнай барацьбы «не было неабходнасці (шанцаў на алігархічную рэстаўрацыю паводле аргентынскай мадэлі, бадай, не было); адначасова ён быў цяжкаўжывальны (скрайне маргіналізаванае гарадское насельніцтва амаль адсутнічала)». Аднак структурна-сацыяльны падыход Музеліса наўрад ці пасуе да тлумачэння падобных разыходжанняў паміж папулізмам у Беларусі і кланавай палітыкай у іншых краінах СНД – сацыяльная структура ва ўсіх краінах СНД была падобнай і захоўвае шмат падабенстваў. Да кастрычніка 1993 г. Ельцын, напрыклад, таксама часта дэманстраваў папулізм.

У літаратуры аб лацінаамерыканскай палітыцы назіваюць больш некалькі праяў папулізму. 1. Папулізм быў рэакцыяй на хуткую, рэвалюцыю, адбытую ў метраполіі. Ён змагаўся супраць традыцыйных алігархічных аграрных эліт, быў адказам на ўзрослыя запыты гарадскіх масаў, што чакалі падвышэння стандартаў жыцця, адукацыі, сацыяльнага забеспячэння. 2. Ён меў антыэлітысцкае паходжанне і быў шматкласавым рухам. Папулісты (адмаўлялі сацыяльную рэвалюцыю і спрабавалі ператварыць рабочых у слаі грамадства ў «бяскласавы электарат». 3. Папулізм меў выбарчы і часта плебісцытарны характар. 4. Папулісцкія рухі кіраваліся харызматычнымі лідэрамі, якія захопліваюць прастору, якую традыцыйна займаюць кліентэлісцкія пасярэднікі. Апошнія часта пераквалiфікоўваліся ў спічрайтэраў ці прэс-сакратароў лідэра або ў функцыянераў

[5] Kaliba A. Mouzelis Nicos Politics in the Semi-Periphery: Early and Late Populism. Basingstoke: Palgrave Macmillan, 2008. 224 p.

партыі, створанай пад лідэра. Нават калі яны выжывалі ў пасярэднікаў, то страчвалі аўтаномію, якой карысталіся ў сістэме кліентэлісцкага тыпу. 5. Папулізм быў экспансіўны яго прадстаўнікі абяцалі масам пастаянны поспех і ўздым. Гэтыя дасягненні былі неабходныя для пацвярджэння даверу папулістам ад электарату і ўмацавання харызмы лідэра. «Стабільнасць» нярэдка выклікала крызіс папулісцкіх рухаў – з гэтай прычыны іх заўжды складана было інстытуцыяналізаваць. 6. Хаця экспансіўная эканамічная палітыка часта вяла да інфляцыі і запазычанасці, увогуле яна спрыяла павелічэнню ВУП. 7. Папулісты не былі ні тэарэтыкамі, ні дактрынёрамі, а выкарыстоўвалі ідэалогіі інструментальна, і гэта адрознівала папулізм ад іншых левых рухаў. 8. Прагрэс такіх сродкаў масавай камунікацыі, як радыё і тэлебачанне, паспрыяў папулізму, магчыма, больш, чым іншым сацыяльным рухам. 9. Эра папулізму завяршылася ў пачатку 1960-х гг., калі кубінская рэвалюцыя ўскладніла ўжыванне папулісцкага «шматкласавага» падыходу, а распаўсюджванне ўсеагульнага галасавання і інкарпарацыя новага электарату дасягнула максімуму.

Нягледзячы на вялізныя гістарычныя адрозненні, функцыянальныя характарыстыкі лацінаамерыканскага папулізму ў вялікай ступені ўласцівы лукашэнкаўскаму папулізму. Тым не менш, апошні валодае істотнымі адметнасцямі. Па-першае, у постсавецкіх варунках наўрад ці выпадае ўжываць паняцце «рэвалюцыі ўзрослых спадзяванняў», што пасуе да Лацінскай Амерыкі. Лукашэнкаўскі папулізм у існасці сваёй абарончы; патрэбны лідэру дынамізм Лукашэнка атрымлівае, раздзьмуваючы змаганне з ворагамі. Па-другое, лукашэнкаўскі папулізм у большай ступені антыэлітны, чым лацінаамерыканскі. Па-трэцяе, калі лацінаамерыканскі папулізм панаваў на кантыненце цягам жыцця некалькіх пакаленняў, папулізм Лукашэнкі развіваецца ў вельмі неспрыяльным асяроддзі: міжнародная супольнасць разглядае яго як прыкрае адхіленне ад нармальнай посткамуністычнай трансфармацыі. Таму Лукашэнка мае патрэбу ў дэманстраванні «поспеху і росту» не толькі ў дыяхронным, але і ў сінхронным плане, г. зн. у параўнанні з балючай еўрапеізацыяй Літвы і «драпежным капіталізмам» Расіі і Украіны. Рэпрэсіі, скіраваныя

Populism
and Latin
American
Populism
in
Comparative
Perspective
1986. P. xvi,
passim.
Paliўnkacaў
i Lyte
Industrialisation
ў dzie.
Balkanand
Latin
Houndmills
and London:
Macmillan

супраць беларускай топ-эліты, павінны кантраставаць з вакханаліяй «обнаглевшей» наменклатуры ў Расіі і ва Украіне. У той жа час, Лукашэнка вымушаны пастаянна бараніцца ад крытыкі з боку міжнародных арганізацый (або часцяком выкарыстоўваць яе на сваю карысць). Напрыклад, адсутнасць запазычанасці Беларусі перад МВФ рэкламуецца як адказная пазіцыя ўладаў што да будучых пакаленняў, а да сітуацыі Украіны ў гэтай сферы не без долі ісціны ўжываецца метафара «пасля нас хоць патоп!».

БЛАГІ ПРЭЗІДЭНТ У ДОБРАЙ КРАІНЕ? БЕЛАРУСКАЯ МЕНТАЛЬНАСЦЬ І АДНАЎЛЕННЕ «СПРАВЯДЛІВАСЦІ»

Згодна з індэксам чалавечага развіцця ААН (2000 г.), Беларусь займала 56-е месца сярод 173 краін, у той час як Расія і Украіна, адпаведна, 60-е і 80-е месцы. Прынамсі да нядаўняга часу грамадская думка ў Беларусі характарызавалася вышэйшым узроўнем задаволенасці сітуацыяй у краіне, чым грамадская думка ў іншых постсавецкіх краінах. Паводле даследавання, праведзенага ў 1999 г. Міжнародным фондам выбарчых сістэм (МФВС; было апытана 1012 чалавек), 5 % рэспандэнтаў былі «вельмі задаволены» сітуацыяй у Беларусі, 21 % – «задаволены», 40 % – «незадаволены» і толькі 27 % «вельмі незадаволены». У аналагічным даследаванні, праведзеным ва Украіне (апытана 1200 чалавек), вынікі складалі, адпаведна, 0 %, 2 %, 29 % і 65 %[6].

З пункту гледжання такіх заходніх каштоўнасцяў, як выканальнасць, ветлівасць, акуратнасць і імкненне да тэхналагічнага развіцця, Беларусь выглядае нават лепш краіны Балтыі. Калі Менск і не самае прыгожае места Еўропы (гістарычныя помнікі архітэктуры былі разбураны ў часы Другой сусветнай вайны), то, прынамсі, адзін з самых чыстых еўрапейскіх гарадоў. Беларускія таксісты звяртаюцца да кліентаў з прафесійнай ветлівасцю – не так фамільярна, як амерыканскія ці расійскія калегі. Беларускія правадыры не крычаць на пасажыраў. Замежнікам спадабаецца таксама, што менчукі не лаюць адзін аднаго ў грамадскім транспарце. Усе гэтыя перавагі ацэніць той, хто наведваў Расію і Украіну.

[6] Larissa G. Titarenko et al. The Health of Russia's Young Adults: Behavioral Risks and Contexts // Studies in Family Planning. 1997. Vol. 28. No. 4. P. 304–312; Timothy Haney. Belarus as a Model for CIS Transition // Demokratizatsiya: The Journal of Post-Soviet Democratization. 2000. Vol. 8. No. 3. P. 353–362.

Замежных навукоўцаў уразіць добра кампутарызаваная Нацыянальная бібліятэка Беларусі, дзе літаратуру можна замаўляць праз электронны каталог і сканаваць яе без абмежавання аб'ёму. Такі сервіс цяжка ўявіць себе нават у балтыйскіх краінах, не кажучы пра Расію і Украіну. Беларускія ўрадоўцы, хаця гэта і крыху дзіўна гучыць, хваляцца фактам, што «80 % хакераў, якія атакуюць Захад з прасторы, жывуць у Беларусі»[7].

Паводле маіх назіранняў, замежнікаў у Беларусі прасцей прад'явіць пашпарт значна радзей, чым у Расіі ці ва Украіне. З прычыны таго, што Лукашэнка абыякавы да сацыяльных і гуманітарных навук як да сродкаў легітымацыі яго кіравання, беларускія навукоўцы маюць большую свабоду выказвання і публікацый, чым іх украінскія калегі, якія, напрыклад, маюць тлумачыць студэнтам, што «Кіеўская Русь» была часткай ўкраінскай дзяржавай*. Добра вядома, што беларускія электронныя СМІ манапалізаваны прэзідэнтам, але ж тое самае адбылося і ва Украіне. У цэлым, звычайныя грамадзяне і замежнікі ў Беларусі не адчуваюць, што знаходзяцца ў паліцэйскай дзяржаве. Амаль траціна рэспандэнтаў у вышэйзгаданым апытанні МФВС адказала, што «Беларусь ёсць дэмакратыяй».

Назваўшы станоўчыя рысы Беларусі і беларусаў, магу толькі дадаць, што яны маюць і адваротны бок. Акурат гэтыя рысы сталі бар'ерам на шляху паспяховай посткамуністычнай трансфармацыі краіны. Многія назіральнікі тлумачаць трываласць савецкай спадчыны ў Беларусі слабасцю беларускай нацыянальна-дэмакратычнай ідэалогіі[8], лічачы, што беларусы былі найбольш саветызаванай нацыяй у Савецкім Саюзе, нават больш саветызаванай, чым расійцы. Іншае «антрапалагічнае» тлумачэнне ўзнікнення і трываласці лукашэнкаўскага рэжыму базуецца на знакамітай «цярплівасці» беларусаў[9]. На мой погляд, аднак, гэтаую «цярплівасць» нельга ўразумець асобна ад таго факту, што тэрыторыі сучаснай Беларусі ўваходзілі ў Польшчу аж да канца XVIII ст. Больш за тое, польскія землеўладальнікі панавалі над беларускім сялянствам да 1917 г. ва Усходняй Беларусі і аж да 1944 г. у Заходняй. Вось чаму камуністычная ўлада ў паваенны

2(8). P. 236. Гл. таксама: Ioffe G., Kaplan D., Lewis C., Nikiforov A., Rontoyanni C., Tsybarskaya T. Belarus: Between Russia and the European Union // Eurasian Geography and Economics. 2004. Vol. 45. No. 3. P. 182–202.

7 Данілаў Д. Беларускія хакеры // Беларускі час. 2000. 2–8 лістап. С. 2.

28 Лысюк Анатолий. Региональная государственная власть как субъект политической жизни Беларуси // Аналитический бюллетень белорусских фабрик мысли. 2001. № 1 (12). с. 28.

выпадку, трэба спрабаваць аналізаваць палітычны працэс у гэтых краінах як адно цэлае і параўнаць іх, не падзяляючы паводле прыналежнасці да СНД ці ЕС.

Пераклаў з англійскай з ведама аўтара і са скарачэннямі Вольф Рубінчык паводле: Europe-Asia Studies. Vol. 56. No. 2. March 2004.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 4 (38) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/07
[image]

[image] [image] [image]

ДАМІНІК АРЭЛЬ (Dominique Arel) – палітоляг, прафэсар Атаўскага ўніверсытэту, спэцыяліст з праблем цэнтральнаўсходне палітыкі. Сурэдактар (разам з Дэівідам Кетцэрам) калектыўнай манаграфіі «Census and Identity: The Politics of Race, Ethnicity and Language in National Censuses» (Cambridge, UK, 2002), рэдактар акадэмічнага

Дамінік Арэль Парадоксы Памаранчавай рэвалюцыі

Памаранчавая рэвалюцыя, найважнейшая палітычная падзея ўва Ўсходняй Эўропе пасьля падзеньня Бэрлінскага муру, заснаваная на парадоксах. Гэтая рэвалюцыя мела на мэце стварыць палітычную нацыю, зьмяніць прыроду палітычнага рэжыму ва Ўкраіне дый накіраваць палітычнае разьвіцьцё у бок «адкрытага грамадзтва», якое цяпер ёсьць сынонімам слова Эўропа. Разам з тым, сваім існаваньнем Памаранчавая рэвалюцыя абавязаная магутнаму нацыянальнаму руху ува Ўкраіне. Нацыянальнаму акурат у сэнсе нацыяналізму.

Нацыянальная вера ператварылася, хай сабе і нечаканым чынам, у выбарчую большасьць, а яе посьпехі ў вырашэньні найцяжэйшай задачы – арганізаванага дый працяглага грамадзкага дзеяньня – пусьцілі скразную расколіну у старым рэжыме. Мы ўжо далёка адышлі ад часоў Ганса Кона, які бачыў у нацыяналізьме на Ўсходзе адныя толькі эмоцыі, ірацыяналізм і пагрозу адкрытаму грамадзтву. Край, дзе разгарнулася падзеі Памаранчавай рэвалюцыі, быў для Кона глыбокім Усходам, бо, вядома ж, ягоны Ўсход пачынаўся на француска-нямецкай мяжы. Аднак, калі Ўкраіна цяпер накіроўваецца да адкрытага грамадзтва, дык гэта адбываецца ў значнай меры акурат дзякуючы сіле ейнага нацыяналізму.

Справу ўскладняе і глыбокая крыза легітымнасьці, якую сёньня пераживае ўкраінскае грамадзтва. Непамаранчавая частка электарату, што ў трэцім туры выбараў 26 сьнежня склала каля 44 %, не прызнае народнага паўстаньня на Майдане лістапада. Памаранчавы электарат з сваёй невялічкай перавагай у 52 % прызнае, што непамаранчавым была нанесеная абражаючая можна было б не зважаць, як на нармальную дынаміку выбараў зь пераможцам і пераможаным, калі б палярызацыя памаранчавага і непамаранчавага электаратаў не набыла такіх надзвычайных геаграфічных прыкметаў. Украіна ў цэлым ужо была геаграфічна палярызаваная, калі на выбарах 1994 году ўладу здабыў Леанід Кучма, але сёньня гэтая палярызаваная значна больш. Адначасова, як пабачым ніжэй, гэтым няма супярэчнасьці: высокі ўзровень непрымання Віктара Юшчанкі ўва ўсходняй Украіне цалкам супастаўны з узроўнем непрыманьня Леаніда Краўчука ў 1994 годзе, а таксама да Памаранчавай рэвалюцыі. Наважуся дапусьціць, што ідзецца пра нешта больш істотнае: пра страх адасабленьня. У зьвязку з гэтым адметна, што ўпершыню пасьля паўстаньня Савецкае Ўкраіны ўва ўрадзе амаль адсутнічае ўсходняя Ўкраіна.

* * *

Памаранчавая рэвалюцыя распачалася 22 лістапада 2004 году, калі стала зразумела, што стары рэжым скраў выбары. Фальшаваньне вынікаў галасаваньня падчас барацьбы вымагае пэўнага мастацтва, аднак у фальшаваньні ў Данбасе, сілавой базе тагачаснага прэм'ер-міністра Януковіча, не было нічога мастацкага. Данецк афіцыйна абвесьціў пра ашаламляльную перамогу Януковіча (97 %), зрэшты, не зусім неверагодную, бо на Галіччыне мы сутыкаемся з амаль такой жа аднадушнай падтрымкай Юшчанкі. Але Данецк аж занадта «загнуў», дакладваючы пра пагалоўную яўку выбарцаў, бо тыя ж 97 % на 10 % перавышаюць яўку ў любой вобласьці па-за Данбасам, на 16 % – сярэднюю яўку ўва Ўкраіне ды на 19 % – у самой Данецкай вобласьці ўсяго тры тыдні перад тым. Тое, што абачлівы статыстык прызнаў бы малаймаверным, Майдан (а за ім і ўрады Захаду) назваў немажлівым. Ішлося пра тое, што ў

Бюлетэні ЦВК.

«The Ukraine 44 Lists (UKL).

Аўтар 52 % ня ведаў гэта

Ukrainian Election Code

Analysis and Implications of the 2004 Presidential Election in Ukraine

The 3rd Annual Stasiuk-Canadian Lecture on Contemporary Ukraine).

Данбасе было сфабрыкавана прынамсі тры чвэрткі мільёна галасоў, і ўжо толькі гэта ставіла пад сумнеў маленькую (2,9 %) афіцыйную перавагу Януковіча ў агульнанацыянальным выніку. Вядома, не бракавала і сведчаньняў пра тысячы парушэньняў у мясцовых акругах усёй усходняй ды паўднёвай Украіны, уплыў якіх на агульнанацыянальны вынік ацаніць складана. Неўзабаве ўсплылі доказы таго, што адміністрацыя прэзыдэнта перахоплівала і зьмяняла дадзеныя, якія высылаліся ў ЦВК тэрытарыяльнымі выбарчымі камісіямі. Пра гэта сьведчылі запісаныя тэлефонныя размовы, хаця высьвятленьне іх аўтэнтычнасьці зазвычай вымагае часу. Акурат шок, спрычынены перадусім відавочнымі і грубымі парушэньнямі ў Данецку, змусіў АБСЭ ды заходнія ўрады адмовіцца прызнаць вынікі другога туру, і акурат гэта, відаць, вывела людзей на Майдан. Як апавядаў адзін расеец-наглядальнік ад эўрапейскай арганізацыі, на радзіме Януковіча яго ўразілі ня так самі парушэньні, як адкрытасьць і бессаромнасьць, зь якімі іх зьдзяйсьнялі. Гэтае нахабства – назавем яго пыхай некампэтэнтнасьці – зрэшты, і вынесла рэжыму прысуд, але для яго скіданьня патрэбны быў працяглы грамадзкі ціск. І акурат у гэты момант усе, пачынаючы зь Юшчанкі, блукалі ў поцемках. Таму хаця ў размовах пра тое, што Памаранчавая рэвалюцыя, маўляў, была наступствам заходняга ўмяшаньня, ёсьць нейкае зярнё праўды, аднак у сутнасьці яны глыбока памылковыя. Студэнцкі рух «Пора», на якім трымаліся памаранчавыя, быў сапраўды вельмі добра арганізаваны і, бясспрэчна, абавязаны сваім вышкалам як сэрбскім і грузінскім калегам, гэтак і амэрыканскім фундацыям. Каб утрымліваць пасярод Кіева намётавае мястэчка, былі патрэбныя сродкі, прычым немалыя, але гэтыя рэсурсы сыходзілі хутчэй ад кола заможных хаўрусьнікаў Юшчанкі (якія, дарэчы, зь цягам часу склалі ядро кабінэту Цімашэнкі), чым ад усюдыіснага дзядзькі Сэма. Ува Ўкраіне абарочваліся значныя грашовыя сумы, і ня ўсе яны належалі прыхільным да Януковіча алігархам.

Ад самага пачатку памаранчавых падзеяў адбыўся масавы выхад людзей на вуліцы, і тых, хто выходзіў, усё большала, а ня меншала. Можна спрачацца наконт колькасьці народу на вуліцах, але аднаго позірку на Майдан хапала, каб у галаву

прыходзілі Бэрлін, Прага ці Бухарэст 1989 году. Або Бялград 2000-га ці Тбілісі 2003-га. З пункту гледжаньня тэорыі рацыянальнага выбару, была дасягнутая «крытычная кропка», калі перавагі ўдзелу ў калектыўных дзеяньнях пераважылі меркаваную цану за гэта. Гэтага ніхто ня мог спрагназаваць. Гэтага не магло адбыцца ўва Ўкраіне. На ўсіх сэмінарах па ўкраіністыцы, якія я наведваў цягам апошніх гадоў, у прыватнасьці і на тым, які я зладзіў за месяц да другога туру, усе аднадушна згаджаліся: грамадзянская супольнасьць ува Ўкраіне заслабая, каб зрынуць постсавецкі аўтарытарны рэжым. Прага-1989 у Кіеве? Ня варта нават і марыць. Але акурат гэта і адбылося. Рэвалюцыя была перадусім адкрыцьцём таго, што ўкраінскае грамадзтва карэнна зьмянілася за гады незалежнасьці.

У выніку масавага, але мірнага паўстаньня ў цэнтры Кіева пад ціск патрапілі хутчэй старыя эліты рэжыму, а не заходнія ўрады. Захаду было значна прасьцей не прызнаць вынікаў выбараў, зважаючы на такую колькасьць людзей на вуліцах і відавочныя фальшаваньні ў Данецку, нават дарма што Францыя ды Нямеччына, якія заўжды пільнуюць свае нафтавыя інтарэсы ў заклапочанай памаранчавым рухам Расеі, зусім ня мелі патрэбы ў гэтым. Ад таго часу, калі ў тэрмінах вулічных дэманстрацыяў была пераадоленая крытычная кропка і Захад пачаў трымацца ў баку ад Украіны, лёс Памаранчавай рэвалюцыі залежаў ад згуртаванасьці элітаў старога рэжыму. Як піша ельскі палітоляг Кіт Дардэн у кніжцы «Шантажысцкая дзяржава», стары рэжым (насамрэч адмысловае і ня надта даўняе ўтварэньне пэўнага постсавецкага асяродзьдзя) мусіў падарваць уладу дзяржаўных установаў (бясьпеку, фіскальную сыстэму, рэгіёны, асьвету) на карысьць аднаго з кандыдатаў і ягоных прыхільнікаў.

У пэўным сэнсе гісторыя паўстаньня «Нашае Ўкраіны», Юшчанкавай палітычнай машыны, ёсьць гісторыяй асобных чыноўнікаў, якія працавалі на Кучмаў рэжым, але зь цягам часу праз прымус альбо расчараваньне адышлі і пасьля аб'ядналіся, каб кінуць выклік гэтаму рэжыму. З другога боку, Памаранчавая рэвалюцыя ёсьць гісторыяй магутных элітаў, якія парвалі з Кучмавым рэжымам, захаваўшы кантроль над сваімі

інстытуцыямі. Перад першым турам толькі Ўладзімер Літвін, колішні кіраўнік Кучмавай адміністрацыі, які як старшыня парлямэнту меў бы стаць Кучмавым паплечнікам, быў на мяжы адступніцтва; пасьля 27 лістапада, калі Вярхоўная Рада не прызнала вынікаў другога туру, да гэткага выбару пачалі схіляцца і іншыя асобы.

Пад ціскам вуліцы адступніцтва прыняло характар лавіны. Рэктары ўнівэрсытэтаў дазволілі студэнтам браць удзел у дэманстрацыях. Абласныя рады абвесьцілі, што не прызнаюць вынікаў выбараў. Дыпляматы за мяжой асудзілі фальсыфікацыі. Мэдыйныя магнаты аслабілі адміністрацыйны кантроль над праграмамі навінаў. І найважнейшае: сілы бясьпекі адмовіліся ўжываць сілу. Апошняй кропляй стала пастанова Вярхоўнага Суду, якой быў скасаваны другі тур і прызначаны трэці, насуперак выказанай Кучмам волі.

Да рэвалюцыі тыя, хто сачылі за падзеямі ўва Ўкраіне, ведалі, што пералом будзе залежаць ад таго, ці адступіць крытычная маса эліты ад старога рэжыму. Немагчыма было прадбачыць, што запусьціць гэтую сьпіраль рэнэгацтва. Інакш кажучы, немагчыма было прадбачыць памаранчавы рух. Але чым ён быў? Бо тут жа ідзецца не пра пытаньні палітыкі, якія звычайна займаюць галоўнае месца ў выбарчых баталіях, а пра пэўны працэс. Ідзецца не пра радасную гатовасьць пераняць нэалібэральную мадэль эканомікі і не пра геастратэгічныя інтарэсы Амэрыкі, а пра сыстэматычныя злоўжываньні выканаўчай улады ўва Ўкраіне ды няшчырасьць абвяшчэньня стратэгічнага курсу на Эўропу на фоне рэгрэсу ўва ўсіх палітычных, эканамічных і праўных паказьніках эўрапейскасьці. Памаранчавая рэвалюцыя – гэта твор грамадзянскае супольнасьці ў рэальным часе, на нашых вачах: упершыню ўва ўкраінскай гісторыі арганізаванае грамадзтва дало рады выступіць супраць улады. Адкуль жа ўзялася гэтая грамадзянская супольнасьць? Мне падаецца, што крытычную ролю адыгралі два чыньнікі: генэрацыйны і нацыянальны. Памаранчавы рух пачаўся з «Поры» – групы студэнтаў, якія на час абвяшчэньня незалежнасьці былі дзецьмі альбо падлеткамі, і закончыўся ці не наймаладзейшым урадам з часоў бальшавіцкай рэвалюцыі (сярэдні век міністраў – 44 гады).

Бясспрэчна, на Майдане былі прысутныя прадстаўнікі ўсіх узроставых групаў, і больш сталых людзей там таксама не бракавала. Аднак здаецца справядлівым сьцьвярджэньне, што рухавіком як «у нізох», так і ў цэнтральным кіраўніцтве было пакаленьне, якое ня мела ўплыву ў савецкі пэрыяд. Лягічна дапускаць, што сваімі поглядамі на дзяржаву яно можа быць чым заўгодна, але ня Homo sovieticus-ам. Акурат гэта найбольш непакоіць суседзяў-аўтакратаў на чале з Расеяй, калі яны ацэньваюць экспартны патэнцыял Памаранчавай рэвалюцыі. Вядома, з чаго б гэта маладое постсавецкае пакаленьне ў Расеі павінна павесьці сябе інакш пры такой самай нагодзе?

Што да нацыяналізму – дык шмат для каго гэта непрыстойны тэрмін, якім імкнуцца празьмерна часта не карыстацца. Нягледзячы на гэта, ён важны як панятак параўнальнага палітычнага аналізу. Тут я хачу як мага выразьней патлумачыць, што маю на ўвазе. Нацыяналізм – гэта заява на палітычны сувэрэнітэт, што грунтуецца на сьцьвярджэньні культурнай адрознасьці. Зазвычай уважаюць, што французская мадэль нацыі супярэчыць гэтаму сьцьвярджэньню, але ўрэшце французы вызначылі французаў як тых, хто гаворыць па-французку, дый годзе. Яны былі і застаюцца вельмі неталерантнымі да моўнае разнастайнасьці. Ува Ўкраіне нацыяналізм можна ўважаць адным з чыньнікаў рэвалюцыі, бо адна частка электарату значна больш згуртаваная ў разуменьні прыроды культурнай адрознасьці Ўкраіны. Гэты электарат найбольш шчыльны ў заходняй Украіне, на абшарах, што аж да Другой сусьветнай вайны (за адным напаўвыняткам) не належалі да расейскай дзяржавы – ні імпэрскай, ні савецкай. Заходнія ўкраінцы не запоўнілі Майдану толькі сабой, але, амаль няма сумневу, што іх, асабліва галічанаў, было на Майдане найбольш. Выдаліўшы іх з раўненьня, мы атрымаем сур'ёзную арганізацыйную праблему.

Але калі мы пакінем іх на Майдане ў самоце, дык атрымаем яшчэ большую праблему. Памаранчавая рэвалюцыя не была галіцкім бунтам. Мы хутчэй сьведкі таго, як украінцы заходняй і цэнтральнай Украіны ўпершыню сыходзяцца рэальна, а не сымбалічна, як у 1919 годзе. З пункту гледжаньня выбарчай арытмэтыкі, прарыў Юшчанкі, несумненна, адбыўся акурат у

цэнтральнай Украіне. Хаця мы яшчэ ня маем доступу да сыстэмных дадзеных, але трэба меркаваць, што большасьць дэманстрантаў, якія не паходзяць з заходняй Украіны, паходзяць з цэнтру. На ўзроўні элітаў адметны таксама склад новага Кабінэту міністраў. З дваццаці трох міністраў толькі чатыры паходзяць з усходу, але і ўсяго чатыры – з захаду. Амаль дзьве траціны – з цэнтральнай Украіны. Данбаскія СМІ часьцяком стваралі прывід Галіччыны, якая захапіла Ўкраіну, але насамрэч з Галіччыны паходзіць толькі адзін міністар. Дзяржаўную палітыку сёньня вызначае цэнтральная Ўкраіна.

Чаму гэта важна? Грамадзянская супольнасьць, якую адкрыла Памаранчавая рэвалюцыя, пусьціла сваё карэньне акурат там, дзе ўкраінская нацыянальная сьвядомасьць мае больш пасьлядоўны характар. Гістарычна нацыяналізм, вядома, можа прышчапіцца да любой ідэалёгіі. У міжваеннай заходняй Украіне ўкраінскі нацыяналізм арыентаваўся на аўтарытарную мадэль грамадзтва, вельмі пашыраную ў тагачаснай Цэнтральнай Эўропе. На пачатку незалежнасьці нацыяналістычны мэйнстрым, здавалася, больш апекаваўся мундурам дзяржаўнасьці, чымся зьмястоўнымі рэформамі. Але Кучмагейт давёў, што адзінай групай, здатнай чыніць арганізаваны – хай нават пакуль што беспасьпяховы – супраціў зьнішчэньню дэмакратыі, зьяўляюцца нацыяналісты. Калі не зважаць на радыкалаў, дык нацыяналісты ў гэты вырашальны момант паказалі сябе дэмакратамі, больш за тое – адзінымі дэмакратамі. Пытаньне, якое мы мусім сабе паставіць, гучыць так: чаму тады і цяпер людзі мабілізаваліся ў адных рэгіёнах (захад і цэнтар), але не мабілізаваліся ў іншых (усход і поўдзень)? Мой адказ тычыцца таго, як людзі ставяцца да нацыянальнай ідэнтычнасьці. Украінцы цэнтру ды захаду маюць больш выразнае бачаньне сваёй ідэнтычнасьці, а глыбейшае пачуцьцё салідарнасьці ўмацоўвае іх здольнасьць да калектыўных дзеяньняў. Акурат такі нацыяналізм і спрычыніўся да Памаранчавай рэвалюцыі, якая набыла форму народнага паўстаньня за адкрытае грамадзтва, арыентаванае на Эўропу. А досьведу нацыяналізму «інтэгральнага» даўно ўжо месца на звалцы гісторыі.

Але памаранчавы рух заваяваў толькі палову краіны, і яна

геаграфічна вельмі канцэнтраваная. Што мы з пэўнасьцю ведаем пра гэтую палярызацыю? У трэцім туры выбараў Януковіч перамог у дзесяці абласьцях, сабраўшы галасы трохі менш чым паловы (48 %) усяго электарату. Юшчанка перамог у сямнаццаці абласьцях, набраўшы трохі больш за палову (52 %) усіх галасоў. Перамагаючы, Януковіч набіраў у сярэднім 75 % галасоў. Перамогу Юшчанкі вызначалі 80 %. Толькі ў адной вобласьці разрыў быў параўнальна невялікім – на Херсоншчыне, дзе Януковіч перамог Юшчанку зь лікам 51 % супраць 43 %. У астатніх тэрыторыях розьніца паміж кандыдатамі была велічэзнай. Найменшы пасьля Херсону разрыў бачым на Кіраваградчыне, якая якраз і злучае цэнтар з поўднем. Тут Юшчанка перамог Януковіча з розьніцай у 31 адсотак (63 % супраць 32 %), якая ў любым іншым месцы лічылася б разгромнай.

Можна паглядзець на ўсё гэта інакш, калі падзяліць Украіну на рэгіёны. У прафэсійных дасьледаваньнях ідзе цікавая дыскусія наконт таго, як найлепей іх вылучаць, але дазволю сабе зьвярнуцца да прынцыпаў, якімі карыстаюся ўжо цягам дзесяці гадоў, вызначаючы пяць рэгіёнаў і беручы Кіеў у дужкі. Паводле гэтага падзелу, да Януковічавай зоны належаць прамысловы ўсход і напаўпрамысловы-напаўсельскагаспадарчы поўдзень, тады як пераважна сельскагаспадарчая Юшчанкава зона дзеліцца на тры рэгіёны, адпаведна часу іх падпаданьня пад уладу Масквы: Левабярэжжа (з 1640-х гадоў), Правабярэжжа (з 1790-х) і Захад (з 1940-х). Сталіца Кіеў як прамысловы магніт ёсьць велізарным выняткам з гэтага сельскагаспадарчага краявіду. 26 сьнежня Януковіч набраў 79 % на ўсходзе ды 70 % на поўдні, а Юшчанка – 72 % на Левабярэжжы, 78 % у Кіеве, 78 % на Правабярэжжы ды 89 % на Захадзе.

Геаграфічная палярызацыя больш яркая і адчувальная, чым дзесяць гадоў таму, калі на выбарах 1994 году колішні прэм'ер-міністар Кучма нечакана абышоў тагачаснага прэзыдэнта Краўчука на 6 %, здабыўшы 51 % супраць 45 %. На тых выбарах не ішлося пра дэмакратыю, бо галасаваньне адбылося параўнальна празрыста й свабодна, і ніхто не аспрэчваў легітымнасьці Кучмавай перамогі. Павучальным ёсьць

параўнаньне рэгіянальнага падзелу галасоў з выбарамі 2004-га году. Калі супастаўляць іх зь Януковічам і Юшчанкам, дык падтрымка Кучмы і Краўчука паміж 1994 і 2004 гадамі практычна не зьмянілася на ўсходзе, поўдні і захадзе: пераможца здабыў 75 адсоткаў на ўсходзе і поўдні, і 90 % – на захадзе. Амаль усе зьмены адбыліся ў цэнтры: на Лева- ды Правабярэжжы, а таксама ў сталіцы. Левы бераг падтрымаў Кучму ў адносінах два да аднаго (66 да 31 адсотка), і тады гэты было найвялікшай загадкай. Цяпер Левы бераг тры да аднаго прагаласаваў за Юшчанку (72 да 24 адсоткаў). Правабярэжжа прайшло шлях ад параўнальна блізкага выніку (54 да 42 адсоткаў за Краўчука) да татальнай падтрымкі Юшчанкі чатыры да аднаго (78 да 19 адсоткаў). У 1994-м годзе крытыкі тэорыі палярызацыі сьцьвярджалі, што Правабярэжжа выконвала ролю буфэра паміж палярызаванымі ўсходам і захадам. Але цяпер, за выняткам маленькага Херсону, такога буфэру больш няма. Паміж 1994 і 2004 гадамі электаральную арыентацыю істотна зьмяніла адна праслойка грамадзтва – сяляне. Да нядаўняга часу толькі на захадзе, то бок там, дзе не было досьведу сацыяльных катаклізмаў калектывізацыі і голаду трыццатых гадоў, сялянства было нацыянальна арыентаваным. У сельскагаспадарчым сэрцы цэнтральнай Украіны сяляне пераважна галасавалі за сацыялістаў ці камуністаў.

Паўтараліся 1917–1918 гады, хаця і зь іншых прычынаў: нацыянальны рух апанаваў захад, сталіцу і некаторыя ўрбанізаваныя раёны цэнтру, але ня даў рады прарвацца ў вёску. Найвялікшым Юшчанкавым дасягненьнем стала ягоная здольнасьць сабраць пад сваім штандарам вясковую Ўкраіну. Гэта пачалося падчас парлямэнцкіх выбараў 2002 году і набыло гегеманічны характар у апошнім туры прэзыдэнцкае сагі 2004 году.

Мы яшчэ ня ведаем, як само сялянства стала памаранчавым. Зноў жа, патрэбныя сур'ёзныя палявыя дасьледаваньні. Ёсьць два магчымыя сцэнары. Першы – актывацыя грамадзкае клясы, якую фактычна зламалі ў трыццатыя гады. За апошняе дзесяцігодзьдзе сялянства магло разьвіць палітычную сьвядомасьць, якая настроіла яго крытычна да ўлады і спачувальна да памаранчавых ідэяў. Сялянства, можа, і не

стаяла на Майдане ў лістападзе–сьнежні, але акурат яго ўстаноўка галасаваць за зьмены абумовіла долю старога рэжыму. Магчыма, упершыню за ўкраінскую гісторыю сялянства стала палітычна актыўным складнікам маладой палітычнай нацыі.

Другая магчымасьць вытлумачэньня засяроджаная на элітах. Верагодна, што сяляне (ці з-за эканамічнай залежнасьці, ці з-за спадчыны 1930-х гадоў) і надалей збольшага слухаюцца мясцовай улады, але за апошняе дзесяцігодзьдзе лад яе паводзінаў зьмяніўся. Пры ўсіх размовах пра тое, як «адмінрэсурс», то бок злоўжываньне мясцовымі адміністрацыйнымі пасадамі, перакруціў вынікі першага туру выбараў у кастрычніку 2004 году, ніхто ня здолеў мне ўцямна растлумачыць, чаму адмінрэсурсы павінны былі спрацаваць ува ўсходняй і паўднёвай Украіне, але ня ў іншых месцах. Зьвярніце ўвагу на тое, што гэта адбывалася ўва ўмовах, калі ўлада чыніла ціск на ўсе мясцовыя адміністрацыі, каб тыя падтасавалі вынікі за Януковіча, і калі Юшчанку выключылі зь перадачаў асноўных тэлеканалаў, якія трансьлююцца ўва ўсіх рэгіёнах. Чаму шантажысцкая дзяржава не змагла шантажаваць усіх, асабліва ў аддаленых вясковых мясцовасьцях?

Амэрыканскі палітоляг Люкан Вэй зазначыў, што праект аўтакратычнай рэстаўрацыі, здавалася б, пасьпяховы ў Расеі, ува Ўкраіне спатыкнуўся аб структурную праблему, якая палягае ў падзеле ўкраінскіх элітаў па нацыянальным пытаньні. Нягледзячы на шантажысцкую дзяржаву, да рэвалюцыі парлямэнт ува Ўкраіне быў больш незалежным, чым у Расеі, а выбарчы працэс – значна больш канкурэнтным. Паводле Вэя, ува Ўкраіне разьвіўся выпадак «дэфолтнай дэмакратыі», правілы якой у любы момант парушаліся выканаўчай уладай, аднак гэтая дэмакратыя была дастаткова моцнай, каб не дазволіць рэжыму забясьпечыць патрэбныя яму вынікі выбараў. Яшчэ ў кастрычніку 2004-го ніхто ня мог прадбачыць Памаранчавай рэвалюцыі, але й ніхто ня мог з пэўнасьцю сказаць, чым скончацца выбары. (Пэсымісты з украінскай інтэлігенцыі прадракалі змрочны апакаліпсыс і страшэнна памыліліся.) Насамрэч перад рэвалюцыяй справа выглядала так: незважаючы на геркулесавыя намаганьні

рэжыму Кучмы сарваць выбары, яму не ўдалося перашкодзіць дэмакратычнаму прэтэндэнту зрабіць пераканаўчы крок да перамогі. Такі ўзровень плюралізму ў сыстэме, цалкам зьнішчаны ў Беларусі, моцна аслаблены ў Расеі, але інтрыгоўна магутны ў Малдове ды ўва Ўкраіне, Вэй тлумачыць існаваньнем структурнага падзелу ў элітах у стаўленьні да нацыяналізму. Нэасавецкая дзяржава не змагла цалкам перацэнтралізавацца, усталяваць нанова тое, што расейцы і ўкраінцы называюць «вэртыкальлю» дзяржаўнай улады, бо эліты маюць стымул аб'ядноўвацца вакол двух полюсаў, і гэты стымул «аўтаматычна» прышчапляе пэўны ўзровень плюралізму ў сыстэме. Чаму элітам у вясковых раёнах цэнтральнай Украіны ўдалося выстаяць перад ціскам сумнавядомага адмінрэсурсу з цэнтру? Бо яны адчулі глыбінную зьмену ляяльнасьці сярод выбарцаў? Ці, можа, тут дзейнічае нешта яшчэ, што зрабіла іх успрымальнымі да памаранчавага дыскурсу?

Гэтта я хацеў бы ўвесьці моўную пераменную. Украіна – дзьвюхмоўная краіна, – не па дзяржаўнай палітыцы, а з пункту гледжаньня сацыялягічных дасьледаваньняў, – і ейнаму насельніцтву ўласьцівае няпростае стаўленьне да мовы. Украінцы бачаць розьніцу паміж мовай, зь якой яны сябе атаясамліваюць; мовай, якой яны аддаюць перавагу ў камунікацыі, калі маюць выбар, і мовай, на якой бы яны хацелі, каб іх дзеці навучаліся ў школе. Мова выбару ды падтрымка Януковіча ці Юшчанкі ў рэгіёнах, як высьветлілася, выдатна карэлююць паміж сабой. У цэнтральнай і заходняй Украіне частка насельніцтва, што хоча карыстацца ўкраінскай мовай, складае прыблізна 75–80 %, і падтрымка Юшчанкі тут практычна такая самая. Ува ўсходняй і паўднёвай Украіне ад 75 да 80 адсоткаў насельніцтва аддаюць перавагу расейскай мове, і падобную ж падтрымку аказваюць Януковічу. Памаранчавая рэвалюцыя занялася на ўкраінскамоўных абшарах, дзе «ўкраінскамоўны» азначае практычныя паводзіны, а не сымбалічную адданасьць. Паводле практычных крытэраў сялянства цэнтральнай Украіны, то бок група, што прывяла Юшчанку да перамогі, на 99 % украінскамоўная. Гэта зноў вяртае нас да нашага пытаньня. Што падштурхоўвае сялянства і/або вясковыя эліты ўспрымаць памаранчавыя ідэі? Ці можа

гэта мець нейкае дачыненьне да таго, што яны жывуць у пераважна ўкраінскамоўным сьвеце?

Паміж другім і трэцім турамі выбараў агульнанацыянальныя СМІ адкрыліся, а назіральнікі заўважылі, што асьвятленьне абедзьвюх кампаніяў збалянсавалася і Януковіч, які раптоўна падаўся ў адпачынак, страціў падтрымку адмінрэсурсаў. Досыць дзіўна, што тры тыдні памаранчавай ліхаманкі не зрабілі адчувальнага ўплыву на ўсходнюю ды паўднёвую Ўкраіну. Падтрымка Януковіча на гэтай пераважна ўрбанізаванай тэрыторыі засталася нязьменнай, і калі нейкія нязначныя зьмены і адбыліся, дык зноў жа ў сельскай мясцовасьці. Аднак у цэнтральнай Украіне і без таго даволі нізкі адсотак за Януковіча абваліўся. З улікам фальсыфікацыі яўкі выбарцаў у Данецку, галоўным адрозьненьнем паміж другім і трэцім турам было тое, што памаранчавая зона стала яшчэ больш памаранчавай, паглыбіўшы палярызацыю.

Як нам трактаваць гэты стан? Адзін падыход прапануе адкінуць палярызацыю як неправамерную, г.зн., з аднаго боку, лічыць, што адсотак, які Юшчанка здабыў у трэцім туры, адлюстроўвае сапраўдныя жаданьні ягоных выбарцаў, а з іншага – адначасова не згаджацца з тым, што ў Януковічавым выпадку адбылося тое самае. Іншымі словамі, адсотак за Юшчанку сапраўдны, а адсотак за Януковіча сумнеўны.

Адна з варыяцыяў гэтага аргумэнту, якая, здаецца, натхняе Цімашэнку і Юшчанку, такая: хаця падлік галасоў у трэцім туры быў легітымным, аднак умовы, што змусілі людзей галасаваць так, як яны прагаласавалі, легітымнымі не былі. Грамадзянская супольнасьць не прышчапілася ўва ўсходняй і паўднёвай Украіне, і людзі тут значна больш уразьлівыя да маніпуляцыяў сваіх элітаў. Адсотак, набраны Януковічам, ня быў легітымным, бо быў прадуктам закрытага грамадзтва. Паколькі кампанія за адкрытае грамадзтва бярэ пачаткі ў заходняй і цэнтральнай Украіне, дык і сыстэматычныя рэформы давядзецца навязваць з-за межаў усходняй Украіны. У выніку гэтае высновы фармуецца такі Кабінэт Міністраў, у якім мізэр украінцаў з усходу.

Складваецца ўражаньне, нібыта Ўкраіну насяляюць два сьветы,

адзін зь якіх намагаецца разьвітацца з савецкай грамадзкай мадэльлю, а другі дагэтуль ня мае ніякай ініцыятывы ў процівагу дзяржаве, нягледзячы на глыбінныя эканамічныя зьмены. Чаму гэтае насельніцтва супраціўляецца зьменам?

Я раіў бы пайсьці далей за дапушчэньне, што людзі яшчэ не ўсьведамляюць сваіх інтарэсаў, і зьвярнуць увагу таксама на нацыянальнае пытаньне. Геаграфічная палярызацыя ўва Ўкраіне ня ёсьць этнічнай. Большасьць насельніцтва ўсходу і поўдня Ўкраіны ўспрыняла ўкраінскую ідэнтычнасьць у тым варыянце, у якім яе пашырала савецкая нацыянальная палітыка. Акурат таму страх сэпаратызму беспадстаўны, бо цяжка сабе ўявіць, з чаго б гэта людзі, якія атаясамліваюць сябе з украінцамі, хацелі б адасобіцца ад тэрыторыі, што называецца Ўкраіна, якой яны да таго ж практычна кіравалі цягам васьмідзесяці гадоў. Адзіным выняткам тут ёсьць Крым, дзе этнічныя расейцы дагэтуль складаюць большасьць і дзе сэцэсійны рух у дзевяностых гадох меў сапраўдны патэнцыял. Аднак цягам усёй Памаранчавай рэвалюцыі Крым заставаўся пасіўным, і яўка выбарцаў у гэтым рэгіёне, у адрозьненьне ад Данбасу, была ніжэйшай за сярэдні паказьнік ува Ўкраіне.

Усходнія ўкраінцы называюць сябе ўкраінцамі, але ня так, як заходнія. (Тут, спрошчана, «усходнія» павінна азначаць усходніх і паўднёвых, «заходнія» – цэнтральных і заходніх украінцаў.) Усходнія ўкраінцы, у адрозьненьне ад заходніх, не ўспрымаюць ідэнтычнасьці як нечага выняткового. У савецкі пэрыяд яны адчувалі сябе адначасова ўкраінцамі і савецкімі грамадзянамі. Зь зьнікненьнем савецкай ідэнтычнасьці яны адчуваюць сябе кінутымі на волю лёсу, яны няпэўныя, да чаго ім прымацаваць сваю ўкраінскую ідэнтычнасьць. А за апошняе дзесяцігодзьдзе ў цэнтральнай Украіне цалкам магла выкрышталізавацца ўкраінская ідэнтычнасьць. Я намагаюся тут падкрэсьліць сувязь нацыянальнай ідэнтычнасьці, г.зн. таго, як людзі пазыцыянуюць сваю ідэнтычнасьць, з большым цэлым. Сувязь дае ўпэўненасьць у сабе. А ўпэўненасьць выклікае зусім іншае стаўленьне да Расеі, што насьцярожвае расейскі ўрад і расейцаў наагул.

Усходнія ўкраінцы – не расейцы, аднак яны адчуваюць сябе

вельмі блізкімі да Расеі ў тым, як інтэрпрэтуюць сваю мінуўшчыну і будучыню. Заходнія ўкраінцы не адчуваюць гэтай сувязі, а калі і адчуваюць, дык у значна меншай меры. Рэч у тым, што заходнія ўкраінцы схіляюцца да думкі, што гэтае двухслойнае разуменьне ідэнтычнасьці на ўсходзе можна перабудаваць. Гэта можна назваць «нацыятварэньнем» у этнічным сэнсе; мовай нацыянальных актывістаў гэта называецца зрабіць з усходніх украінцаў «сапраўдных» украінцаў. Але цалкам магчыма, што ў рэгіянальным досьведзе ўсходняй Украіны ёсьць штосьці пругкае, што ператварае гэты праект у ілюзію. Справа ня ў мове як такой, але ў мове, што існуе ў пэўным гістарычным рэгіёне. Усходнія ўкраінцы глядзяць на Памаранчавую рэвалюцыю праз прызму свайго рэгіянальнага досьведу, і расейская – мова, на якой яны гавораць, робіцца сымбалем гэтага самабачаньня. Яны адкідаюць памаранчавасьць не таму, што прыроджана не ўспрымаюць праекту адкрытага грамадзтва, а таму, што адчуваюць сваю адасобленасьць ад яго.

У Памаранчавай рэвалюцыі ішлося пра нараджэньне ўкраінскай палітычнай нацыі, то бок пра ўзьнікненьне ў насельніцтва здольнасьці арганізоўвацца незалежна ад дзяржавы ды не паддавацца дзяржаве ў часы крызы. Аднак гэтую палітычную нацыю пакуль абмяжоўваюць выразныя гістарычныя рэгіёны: цэнтар і захад. Найбліжэйшым выклікам для Ўкраіны ў наступныя гады стане праблема, як пашырыць гэтую палітычную нацыю на ўсход і поўдзень, даць іх насельніцтву зразумець, што яно *актыўна* належыць да Ўкраіны, напоўніць зьместам яго грамадзянства (ці грамадзянскую ідэнтычнасьць). Але далучэньне да палітычнай нацыі наўрад ці зьдзейсьніцца ад аднабаковага бачаньня таго, як трэба канструяваць нацыянальную ідэнтычнасьць. Калі расейцы ў Расеі мусяць зразумець, што яны ня могуць аднабакова навязваць украінцам сваё бачаньне ўкраінскасьці, дык і заходнія ўкраінцы ня могуць накідаць свайго разуменьня ўкраінцам усходу. Ідзецца пра стварэньне магчымасьцяў для існаваньня розьніцы, якая грунтуецца на ідэнтычнасьці. Можа, час расшыфруе ўсе гэтыя заклікі да «фэдэралізму» на ўсходзе як кодавае слова, што азначае дапасаваньне. Мы мусім памятаць, што ўсходнія ўкраінцы могуць успрыняць першыя

сыгналы постпамаранчавасьці як самазьдзяйсьняльнае прароцтва: Юшчанка забараняе нават слова «фэдэралізм», а ў Кабінэце Цімашэнкі няма нікога, хто прадстаўляе ўсход у вачах усходу, вось і выходзіць, што героі Памаранчавай рэвалюцыі імкнуцца іх ігнараваць.

Пераклаў з украінскай Сяргей Богдан паводле: Критика 4/2005
з ласкавай згоды гэтага выданьня
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 4 (38) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/07
[image]

[image] [image] [image]

ТЫМАЦІ ГАРТАН ЭШ

Тымаці Гартан Эш, буйны брытанскі інтэлектуал, вялікі знаўца Ўсходняй Эўропы.

Тымаці Снайдэр

Памаранчавая рэвалюцыя

Леташняй восенню Украіна ўпершыню за сваю гісторыю зрабіла глыбокае ўражанне на палітычную свядомасць людзей усяго свету. Падчас таго, што ахрысцілі «памаранчавай рэвалюцыяй», велізарныя натоўпы людзей з аранжавымі шалікамі збіраліся на кіеўскай Плошчы Незалежнасці і патрабавалі сумленных прэзідэнцкіх выбараў, не сыходзячы нават пры мінусавой тэмпературы. Яны перамаглі. З новым прэзідэнтам, Віктарам Юшчанкам, як спадзяецца ён сам і яго паплечнікі, Украіна зможа прыйсці да эфектыўнай дэмакратыі, рынкавай эканомікі, вяршэнства права, а таксама дабіцца членства ў Еўрапейскім Саюзе.

Назіральнікі паставілі памаранчавую рэвалюцыю ў адзін шэраг з мірнымі дэмакратычнымі рэвалюцыямі – ад «аксамітных рэвалюцый» 1989 г. у Цэнтральнай Еўропе і да грузінскай «рэвалюцыі ружаў» 2003 г. і ліванскай, якую ўжо празвалі «кедравай». Многія украінцы, зразумела, пешацца з гэтага прывабнага іміджу, гэтак адрозная ад таго негатыўнага ці «нікага», які іх краіна мела раней. Трэба зрабіць невялічкі экскурс у гісторыю, каб убачыць, як і чаму адбыліся змены і якімі могуць быць іхнія наступствы.

ТЫМАЦІ СНАЙДЭР амэрыканскі гісторык, аўтар нашумелай кнігі «The Reconstruction of Nations: Poland, Ukraine, Lithuania, Belarus, 1569–1999» (Yale University Press, 2003), фрагмэнты зь якой былі апублікаваныя ў перакладзе на беларускую мову ў часопісе «Дзеяслоў». Цяпер выдавецтва Yale University Press рыхтуе да друку яго новую кнігу «Sketches from a Secret War: A

разгледжаная у мінулым нумары «ARCHE»

Polish Artist’s Mission to Liberate Soviet Ukraine».
1 Гэтае эсэ ўпершыню пабачыла сьвет сёлета 28 красавіка ў «New York Review of Books». Друкуецца ў скарачэньні.

Украіне не ўдалося набыць незалежнасці ў 1918 г. Спробы ўкраінцаў заснаваць дзяржаву былі спынены бальшавіцкімі і польскімі сіламі. Вудра Уілсан не лічыў Украіну нацыяй, а заходнія дзяржавы ўступілі ўкраінскія землі расійскай Белай арміі, спадзеючыся, што тая пераможа бальшавізм. У 1941 г. сталінскі рэжым змяніўся нацысцкім. Сотні тысяч жаўнераў-украінцаў памерлі з голаду ў нямецкіх лагерах. Бацька Віктара Юшчанкі, які перажыў Асвенцім, быў адным з рэдкіх шчасліўцаў.

Савецкая ўлада аслабіла або знішчыла ўва Украіне тыя элементы грамадзянскай супольнасці – прыватныя гаспадаркі, цэрквы, інтэлігенцыю – якія дапамаглі падрыхтоўцы аксамітных рэвалюцый у вальнейшых суседніх краінах, напрыклад, у Польшчы і Чэхаславакіі. І ўсё ж, калі ў 1991 г. знік СССР, ува Украіны было імя, сталіца, месца на карце. Аднак дзяржаўная незалежнасць прыйшла без выразнага народнага руху ў яе падтрымку («Рух», які прэтэндаваў на гэтую ролю ў 1991 г., не здолеў выйграць выбараў). Падмурак незалежнасці быў хісткі. Многія ў Расіі адмаўляліся прызнаць яе рэальнасць.

2

Цягам 1990-х гг. Украіна была электаральнай дэмакратыяй, якая паволі пераходзіла да постсавецкай версіі капіталізму. Паміж 1994 і 2004 гг. рэжым Леаніда Кучмы, пры якім прэзідэнт сам прызначаў усіх больш-менш значных функцыянераў, станавіўся ўсё больш карумпаваным, а яго метады кіравання – усё больш грубымі і недэмакратычнымі. Кучму належыць аўтарства таго, што паслей празвалі «шантажысцкай дзяржавай». Дарма што адміністрацыя Кучмы сама насаджала карупцыю, яна шантажавала чыноўнікаў і прыватных асоб, пагражаючы абнародаваць сабраныя спецслужбамі звесткі аб іхніх праступках – так званы

«кампрамат». Кучма таксама падтрымліваў блізкія адносіны з шэрагам новых прамысловых баронаў Украіны, дазваляючы ім прыбіраць да сваіх рук дзяржаўныя актывы (вугаль, сталь, прыродны газ) ды даючы ім іншыя прэферэнцыі ў абмен на палітычную падтрымку. Здавалася, сістэма працуе.

Пасля Першай сусветнай вайны ўкраінскі кансерватар Вячаслаў Ліпінскі выказаў аптымістычную думку: нават карумпаваная ўкраінская дзяржава, калі толькі яна будзе існаваць, здолее стварыць украінскую нацыю. Багатыры прыстасуюцца да законаў і будуць шукаць сувязяў з дзяржаўным апаратам. Тыя, хто не меў культурнай лучнасці з Украінай, стануць грамадзянамі ўкраінскай дзяржавы, калі зробяць стаўку на яе інстытуты. 1990-я сталіся часам выпрабавання гэтых ідэй. Спрытныя бізнесоўцы прысабечылі былыя дзяржаўныя актывы, стварылі і пачалі нажывацца на манаполіях, зрабілі высокадаходныя інвестыцыі. На крайнім усходзе Украіны сын шахцёра Рынат Ахметаў з'яўляецца ўладальнікам капіталу, які ацэньваецца больш як на 3 мільярды долараў. Ён пачынаў якраз з вугалю і сталі. Гэтыя пераважна расійскамоўныя алігархі з усходу дзякуючы фінансаванню палітычных партый увайшлі ў парламент. Многія з іх пераехалі ў Кіеў і зблізіліся з прэзідэнтам Кучмам. Адзін з іх, Віктар Пінчук, ажаніўся з яго дачкой. Гэтыя алігархі былі, зразумела, па-шкурніцку зацікаўлены ў выжыванні самастойнай Украіны. У расшыранай Расіі або адноўленым Савецкім Саюзе яны ператварыліся б у пешкі на вялікай дошцы, а іх сувязі адразу страцілі б каштоўнасць.

Украіна за Кучмам развівала інстытуты і сімвалы незалежнай дзяржаўнасці, мела пасольствы, армію, міліцыю. Нацыянальны гімн часоў Украінскай народнай рэспублікі быў адноўлены ў 1992 г. і дапоўнены ў 2003 г. Штовечар па тэлебачанні народ бачыў геаграфічныя абрысы сваёй краіны на мапе надвор'я. Украінская мова захавала статус дзяржаўнай. Замежных журналістаў прасілі карыстацца словам «Kyiv», а не «Kiev». Настаўнікі ў элітных школах выкладалі па-ўкраінску, на ўкраінскай вялося справаводства, прымаліся экзамены ва ўніверсітэтах. Хаця многія з палітыкаў працягвалі ў прыватных размовах ужываць расійскую мову, публічнае ўжыванне імі

ўкраінскай стала знакам таго, што дзяржава адбылася. Сам Кучма выпусціў кнігу пад назвай «Украіна – не Расія».

У 2004 г. сістэма Кучмы пераўзышла сябе. Віктар Пінчук і Рынат Ахметаў набылі Крыварожскі металургічны камбінат за цану, якая была на 800 мільёнаў долараў ніжэйшай, чым прапанаваная кансорцыюмам пад кіраўніцтвам «US Steel». Як кажуць, паслуга – за паслугу: Ахметаў фінансаваў прэзідэнцкую кампанію прэм'ер-міністра Віктара Януковіча, выбранага Кучмам пераемнікам. Калі б Януковіч стаў прэзідэнтам, Украіна засталася б незалежнай, але яе рэсурсы перайшлі б пад яшчэ больш цесны кантроль купкі алігархаў. Аднак Кучмава сістэма мела два істотныя недахопы. Па-першае, украінцы мелі права галасаваць на выбарах. І рэжым Кучмы, і яго кандыдат, у найвышэйшай ступені нехарызматычная асоба з дзвюма судзімасцямі, не карысталіся папулярнасцю. Па-другое, не ўсе людзі, якія валодалі грашыма і палітычнымі рэсурсамі, былі ім задаволеныя.

Напрыклад, пакрыўджанай алігархесай была Юлія Цімашэнка. Эканамістка з Днепрапятроўску, яна зарабіла грошы на спекуляцыях прыродным газам, карыстаючыся пралазамі, што дазвалялі дзяржаўным прадпрыемствам расплачвацца за энергію не грашыма, а таварамі, якія можна было перапрадаць. Гэткім шляхам пасярэднікі (і пасярэдніцы) зараблялі ўласныя капіталы. Цімашэнку празвалі «газавай прынцэсай». Пазней, быўшы ў 1999–2001 гг. міністаркай, яна закрыла гэныя пралазы, прымусіўшы энергетычны сектар адмовіцца ад бартэру. Разам з былым кіраўніком Цэнтрабанка Віктарам Юшчанкам, які потым стаў прэм'ер-міністрам, яна працавала ў імя рэфармавання ўкраінскай эканомікі. Кучма абаіх адправіў у адстаўку, а Цімашэнку пасадзіў у турму. Яе смеласць і няўрымслівасць ператварылі яе ледзь не ў народную гераіню. Неўзабаве яе вызвалілі. Аднак найбольш папулярным палітыкам ва Украіне стаў усё-такі Юшчанка. Ён здолеў прывабіць тых прадпрымальнікаў, якія хацелі зарабляць грошы ў такой эканоміцы, дзе вяршэнства права важыць больш, чым сувязі з рэжымам.

3

У лістападзе 2000 г. у лесе пад Кіевам быў знойдзены абезгалоўлены труп Георгія Гангадзэ, журналіста, вядомага ягонай крытыкай Кучмы. На аўдыёстужках, запісаных адным з ахоўнікаў Кучмы, голасам, падобным да голасу прэзідэнта, было загадана пакончыць з Гангадзэ. Некалькі месяцаў украінцы выходзілі на вуліцы, патрабуючы «Украіны без Кучмы». Студэнты-пратэстоўцы пабудавалі тады ў Кіеве палатачны гарадок і, хаця іх ініцыятывы не далі вынікаў, народная мабілізацыя сталася новым досведам для тысяч украінцаў.

Праз тры гады Віктар Юшчанка ўзначаліў працэсію з запаленымі свечкамі ў памяць аб мільёнах ахвяр галадамору 1932–1933 гг. Прэзідэнцкая кампанія была ўжо ў разгары, і многім украінцам спадабалася, як Юшчанка спакойна папрасіў людзей помніць пра нацыянальную мінуўшчыну. Яго асноўны супернік, прэм'ер-міністр Віктар Януковіч, забяспечыў сабе падтрымку Кучмы, фінансавыя рэсурсы алігархаў, неабмежаваны час на тэлебачанні. Маючы мала магчымасцяў выступаць па тэлебачанні, падчас кампаніі Юшчанка мусіў паўсюль выступаць асабіста. Тэлевізійным атакам ён процістаўіў асабістыя наведванні вёсак, паціскканні рук, дэманстрацыю свайго твару.

У верасні 2004 г., за некалькі тыдняў да выбараў, ён быў атручаны дыяксінам. Першыя сімптомы з'явіліся пасля таго, як ён паабедаў з кіраўнікамі спецслужбаў, хаця сувязь паміж абедам і атручваннем дагэтуль канчаткова не ўстаноўлена. Ён вярнуўся ў перадвыбарную кампанію з тварам, усыпаным жахлівымі пухірамі і шнарамі. Пра свой выгляд Юшчанка казаў так: «Гэта твар сённяшняй Украіны». Адміністрацыя Кучмы таемна намаўляла тэлевізійныя каналы называць сцвярджэнні аб наўмысным атручванні «бессаромнай хлуснёй» і перадвыбарным трукам. Тэлеканал, які належаў Віктару Медзведчуку, алігарху, блізкаму да Кучмы, намякаў, што хвароба Юшчанкі была выклікана яго сумнеўнымі асабістымі сувязямі.

Нягледзячы на ўсе перашкоды, у першым туры прэзідэнцкіх

выбараў 31 кастрычніка сярод мноства кандыдатаў Юшчанка заняў першае месца. У нядзелю 21 лістапада, калі праходзіў другі тур, рэжым Кучмы наладзіў кампанію фальсіфікацыі вынікаў выбараў. У той вечар была абвешчана перамога Януковіча з адрывам 3 працэнты галасоў. Прэзідэнт Уладзімір Пуцін паспяшаўся павіншаваць Януковіча. Тым не менш, незалежныя, а таксама прафінансаваныя Захадам экзіт-полы засведчылі, што Юшчанка атрымаў пераканаўчую перамогу.

Памаранчавая рэвалюцыя паўстала з пратэстаў супраць «Пора» – скрадзеных выбараў. Паколькі рэжым Кучмы жорстка кантраляваў тэлебачанне, студэнцкі рух «Пора»[1] скарыстоўваў Інтэрнет, шырока распаўсюджваючы інфармацыю аб падзеях, якія былі арганізаваны іншыя пратэстныя рухі – ад Славакіі да Грузіі. Выкарыстанне сеціва стала новай старонкай у гісторыі ўсходнееўрапейскіх аксамітных рэвалюцый. «Я не дарма Інтэрнету, – гаварыў адзін са студэнтаў-дэманстрантаў Пятра Бялградзе 1997 г., – але я хацеў бы ім быць». Калі ўкраінскія студэнты ў першыя гадзіны панядзелка пачалі ставіць палаткі на галоўнай вуліцы сталіцы, іх вебсайт адразу ж паведаміў пра гэты факт свету на англійскай мове – у 2 гадзіны 33 хвіліны 11 секундаў. Пазней яны патлумачылі, што чакалі ад рэжыму фальсіфікацый вынікаў другога тура і таму падрыхтавалі ўжо крокі ў адказ задоўга да падзей. У той жа панядзелак амаль ўкраінскія дыпламаты, як у Кіеве, так і за мяжой, абвясцілі аб сваёй «поўнай і безагаворачнай падтрымцы» Юшчанкі, і заява была разаслана электроннай поштай па ўсім свеце.

[1] «Пора» – каюзія на кантраляваў скарыстоўваў Інтэрнет, шырока распаўсюджваючы інфармацыю аб падзеях, якія былі арганізаваны іншыя пратэстныя рухі – ад Славакіі да Грузіі. Выкарыстанне сеціва стала новай старонкай у гісторыі ўсходнееўрапейскіх аксамітных рэвалюцый. «Я не дарма Інтэрнету, – гаварыў адзін са студэнтаў-дэманстрантаў Пятра Бялградзе 1997 г., – але я хацеў бы ім быць». Калі ўкраінскія студэнты ў першыя гадзіны панядзелка пачалі ставіць палаткі на галоўнай вуліцы сталіцы, іх вебсайт адразу ж паведаміў пра гэты факт свету на англійскай мове – у 2 гадзіны 33 хвіліны 11 секундаў. Пазней яны патлумачылі, што чакалі ад рэжыму фальсіфікацый вынікаў другога тура і таму падрыхтавалі ўжо крокі ў адказ задоўга да падзей. У той жа панядзелак амаль ўкраінскія дыпламаты, як у Кіеве, так і за мяжой, абвясцілі аб сваёй «поўнай і безагаворачнай падтрымцы» Юшчанкі, і заява была разаслана электроннай поштай па ўсім свеце.

Аднак сітуацыю цалкам пераламіла рэакцыя звычайных людзей. Спачатку ў Кіеве дэманстравалі тысячы грамадзянаў, потым сотні тысяч: неўзабаве людзі з іншых частак Украіны адгукнуліся на заклік прыехаць у Кіеў. Грэючыся ля вогнішча ў адну з маразяных зімовых начэй, Станіслаў Смолін, дзябёлы мужчына з блядым тварам, патлумачыў аднаму з аўтараў гэтага артыкула, як ён дайшоў да жыцця ў імправізаваным «палатачным горадзе», пакінуўшы сваю звычайную працу (вымярэнне ўзроўню радыяцыі ў чарнобыльскай зоне). У той панядзелак, увечары, з перадачы адзінага апазіцыйнага тэлеканала ён даведаўся, што тысячы людзей збіраюцца ў сталіцы, каб апратэставаць «скрадзеныя» вынікі другога тура

прэзідэнцкіх выбараў. Ён сказаў жонцы: «Мне таксама трэба туды». Васіль Кархуда з прыкарпацкай вёскі (там ён кіруе невялікім турагенцтвам) прыняў гэткае самае спантаннае рашэнне. Падобным чынам дзейнічала і Алена Маярчук, прывабная маладая жанчына ў футры і абавязковым на той момант аранжавым шаліку, уласніца салона прыгажосці ў заходнеўкраінскім мястэчку.

Звычайныя людзі рабілі незвычайныя рэчы. Назіральнікам не маглі не прыйсці да галавы аналогіі з Прагай 1989 г. ці Польшчай 1980–1981 гг., часоў узнікнення «Салідарнасці». Але ў Польшчы чвэрць стагоддзя таму ў авангардзе руху ішлі рабочыя ды сяляне, а ўва Украіне на пярэдні план выступіў кагадзе народжаны сярэдні клас: студэнты, турагенты, уладальніца салону прыгажосці.

Цягам рэвалюцыйных дзён позняй восенню 2004 г., Юшчанка і Цімашэнка звычайна разам з'яўляліся на сцэне Майдану Незалежнасці: высокая, салідная, унушальная постаць палітыка з усыпаным воспінамі тварам, што сталі стыгматамі нацыянальнага героя, і маленькая, эмацыйная жанчына, часта апранутая ў нацыянальную сукенку, з афарбаванымі ў радыкальны белы колер валасамі, заплеценымі ў псеўдасялянскім стылі. «Газавая прынцэса» стала «багіняй рэвалюцыі», хаця ўвесь час выглядала, бадай, як Марыя-Антуанета.

Першым запаветам «памаранчавых рэвалюцыянераў» было «ніколі не ўжываць гвалту». Гэта як нішто іншае адрознівае аксамітныя рэвалюцыі ад якабінскай і бальшавіцкай 1789 і 1917 гг. Як і ў некаторых іншых выпадках, пачынаючы з 1989 г. (і ў пазнейшы перыяд), супрацоўнікі сілаў бяспекі спыніліся за крок ад ужывання сілы супраць пратэстоўцаў. Юшчанка, Цімашэнка і іх паплечнікі трымалі поўны Майдан Незалежнасці людзей, праводзілі мірную блакаду ўрадавых будынкаў і чакалі магчымасцяў для перамоў.

Вярхоўны суд забараніў цэнтральнай выбарчай камісіі абвяшчаць аб чыёй-небудзь перамозе да разгляду справы аб выбарчых фальсіфікацыях. 3 снежня Вярхоўны суд выявіў, што фальсіфікацыі сапраўды мелі месца, і пастанавіў, што другі тур

выбараў будзе паўторна праведзены 26 снежня. Пакуль справа разглядалася, Юшчанка, якому дапамагалі міжнародныя пасярэднікі, у выніку шэрагу круглых сталоў дабіўся здзелкі з сыходзячым у адстаўку прэзідэнтам Леанідам Кучмам. Апошні пагадзіўся адысці ўбок і перастаць падтрымліваць Януковіча. У сваю чаргу, Юшчанка пагадзіўся на абмежаванне прэзідэнцкай улады. Парламент прыняў адпаведныя папраўкі да Канстытуцыі 8 снежня. Такім чынам, нават калі ўжо ішла рэвалюцыя, намеціліся абрысы здаровага падзелу ўладаў: судовая ўлада выканала кантрольную функцыю, выканаўчая была абмежавана, а заканадаўчая павялічыла вагу.

Юшчанка выйграў паўторнае галасаванне 26 снежня і ў студзені заступіў на пасаду прэзідэнта. 4 лютага Цімашэнка была зацверджана прэм'ер-міністрам. Іх новы ўрад спрабуе наблізіць Украіну да заходнееўрапейскіх эканамічных і палітычных стандартаў. Вярнуўшы некаторыя незаконна прыватызаваныя кампаніі пад дзяржаўны кантроль і наноў выставіўшы іх на продаж, новы ўрад стараецца лепш забяспечыць права на ўласнасць. Юшчанка прапанаваў амністыю людзям, якія набылі капіталы сумнеўным чынам, спадзеючыся, што пасля яе яны будуць лепш плаціць падаткі. У еўрапейскай эканоміцы з найбольшымі тэмпамі росту (прырост ВУП на 9,6 % у 2003 г. і, мяркуецца, на 12 % у 2004 г.) дабра хопіць усім.

Алігархі, якія спярша процістаялі новаабраным лідэрам, здаецца, пачынаюць, хай сабе і неахвотна, прымаць новы парадак. Размаўляючы з адным з аўтараў на Сусветным эканамічным форуме ў Давосе ў студзені 2005 г., Пінчук сказаў, што падтрымае новае кіраўніцтва, калі яно не будзе парушаць права. Ён меркаваў, што Рынат Ахметаў, найбагацейшы алігарх усходняй Украіны, зробіць тое самае. Усё, чаго яны просяць, паўтарыў Пінчук, гэта павагі да закона. Для тых, хто ведае іх працоўную біяграфію, такая заява можа падацца прытворствам, але гэта карыснае прытворства.

Многа словаў было сказана пра нібыта рэзкі рэлігійны, гістарычны і моўны падзел паміж «украінскай», заходняй часткай краіны, і «расійскай», усходняй. Рэальнасць значна больш складаная. Украіна – краіна некалькіх рэлігій, улучна са значнай колькасцю грэка-католікаў. Аднак праваслаўныя складаюць пераважную большасць, і іх галасы размеркаваліся паміж абодвума кандыдатамі. Культура і гісторыя ўплываюць на сучасныя палітычныя працэсы, аднак не абумоўліваюць іх зусім – насуперак довадам Сэмюэля Гантынгтана, прыведзеным у «Сутыкненні цывілізацый». Адзін украінскі гісторык заўважыў, што пасля распаду Савецкага Саюза назіралася такая тэндэнцыя: чым даўжэй частка Украіны калісьці належала Польшчы, тым больш выбарцаў з гэтага рэгіёну галасавала за кандыдата, які ішоў пад лозунгамі ўкраінскага патрыятызму. На першых прэзідэнцкіх выбарах у 1991 г. кандыдат ад «Руху» выйграў у рэгіёнах, што ўваходзілі ў Польшчу на працягу пяці соцень гадоў. У 2004 г. Юшчанка «далучыў» да іх тыя вобласці, што былі пад Польшчай усяго сотню гадоў[2]. Межы заходняй Украіны адсоўваюцца ўсё далей на ўсход.

«Уся краіна гаворыць па-расійску!» – выгукнуў раздражнёны прэзідэнт Пуцін у часе памаранчавай рэвалюцыі. Насамрэч краіна гаворыць на дзвюх мовах. Савецкая палітыка [illegible] сярод адукаваных украінцаў расійскую мову. Сённяшняе пакаленне ў Украіне ёсць моладзь, якая не ўмее гаварыць па-расійску, і ёсць жыхары поўдня і ўсходу краіны, якія ніколі не гаворацца ўкраінску. Але большасць украінцаў гавораць на абедзвюх мовах, прычым многія з іх пераходзяць з адной мовы на другую ў залежнасці ад настрою ці абставінаў – часта нават спыняючыся на паўслове. Вынік украінскіх выбараў абумовілі палітычныя погляды, а не моўны фактар. Юшчанка здабыў пераканаўчую перавагу ў рэгіёнах, дзе расійская з'яўляецца галоўным сродкам камунікацыі: у Чарнігаве ён заваяваў 71 % галасоў, у Палтаве – 66 %, у Сумах – 79 %, у Кіеве – 78 %.

Кіеў – расійскамоўны горад, дзе людзі ўмеюць, калі трэба, гаварыць па-ўкраінску. Кіяўляне заўсёды называюць галоўную плошчу «Майданам Незалежнасці», нават калі гутарка ідзе на расійскай мове. У часе кампаніі Юшчанка і Цімашэнка на публіцы карысталіся ўкраінскай мовай. Абвяшчаючы перамогу

[2] Тут і [illegible] [illegible] [illegible]

рэвалюцыі 8 снежня, Юшчанка вёў рэй, спяваючы нацыянальны гімн з рукой, пакладзенай на сэрца – нядаўна засвоены жэст, верагодна, падгледжаны ў амерыканскіх прэзідэнтаў. На ўсёй плошчы расійскамоўныя кіяўляне паклалі рукі на сэрца і таксама спявалі па-ўкраінску – ці, прынамсі, спрабавалі спяваць: «Ще не вмерла України і слава, і воля, / Ще нам, браття молодії, усміхнеться доля. / Згинуть наші воріженьки, як роса на сонці. / Запануєм і ми, браття, у своїй сторонці…»

Юшчанка і Цімашэнка лепш валодаюць украінскай мовай, чым Кучма і Януковіч. Да таго ж, яны лепш валодаюць і расійскай. Абое яны родам з усходу Украіны, што даказвае: украінская ідэнтычнасць не абмяжоўваецца «захадам». Новыя лідэры ведаюць, што павінны патлумачыць свае мэты і задачы шахцёрам і металургам з усходніх абласцёў. Адразу пасля рэвалюцыі і Юшчанка, і Цімашэнка наведалі Данецк, усходні бастыён Ахметава, каб сустрэцца з прыхільнікамі Януковіча. «Багіня рэвалюцыі» выступіла на тэлеканале, што належыць Ахметаву. Яна годна адказала на каверзныя пытанні на расійскай мове. «Уся краіна гаворыць па-расійску!» – гэтыя словы могуць быць зусім не такімі зручнымі для прэзідэнта Пуціна, як яму здавалася.

5

Урад Пуціна выступіў з рэзкімі абвінавачваннямі на адрас Злучаных Штатаў і Еўрапейскага Саюза ў навязванні «памаранчавай рэвалюцыі» з-за мяжы. Амаль штодня нідэрландскі міністр замежных спраў – Нідэрланды ў той перыяд згодна з прынцыпам ратацыі старшынявалі ў Еўрапейскім Саюзе – атрымліваў сярдзітыя тэлефонныя званкі ад свайго расійскага калегі.

Няма ніякіх сумневаў, што Юшчанка хоча, каб яго краіна была часткай Еўропы. На Майдане Незалежнасці ён сказаў: «Свет убачыў, што Украіну ўжо можна назваць еўрапейскай дзяржавай». А ў Давосе патлумачыў: «Мы мяркуем падаць заяўку на членства ў ЕС у бліжэйшай будучыні». ЕС спрыяў рэвалюцыі проста сваёй прывабнасцю, будучы клубам, у які

многія хацелі б уступіць. Для пасляваеннай еўрапейскай сітуацыі гэта характэрная рыса: яшчэ ў 1950-я гг. Конрад Адэнаўэр, айцец-заснавальнік Федэратыўнай Рэспублікі Германіі, разважаў аб «магнетычным прыцягненні Еўропы».

Украінскія актывісты адзначылі некаторых членаў ЕС – Вялікабрытанію і Нідэрланды – за значную і простую падтрымку назіранню за выбарамі, а таксама ўкраінскім студэнтам, навукоўцам і іншым прадстаўнікам грамадзянскай супольнасці. У маі 2004 г. у ЕС увайшлі восем цэнтральна- і ўсходнееўрапейскіх краін, уключна з Польшчай і краінамі Балтыі, якія разам з Украінай да 1991 г. былі савецкімі рэспублікамі. Такім чынам, магніт наблізіўся да ўкраінскай мяжы. У часе старшынства Нідэрландаў ЕС з беспрэцэдэнтнай жорсткасцю асудзіў лістападаўскія выбарчыя махінацыі. Хаўер Салана, Вярхоўны прадстаўнік ЕС па замежнай палітыцы (пасада, ад якой застаўся толькі крок да еўрапейскага міністра замежных справаў) адыграў тады вядучую ролю ў перамовах з украінскімі лідэрамі за круглым сталом у Кіеве. За тым сталом сядзеў і літоўскі прэзідэнт. І ўсё ж нефармальным кіраўніком перамоўнага працэсу быў Аляксандр Квасьнеўскі, прэзідэнт Польшчы, краіны, у якой у 1989 г. перамовы за круглым сталом былі апрабаваныя ў якасці метаду змены рэжыму.

Палякі рана далучыліся да рэвалюцыі. Вялікая польская дэлегацыя прыбыла на Майдан Незалежнасці ў першы тыдзень падзей і гучна вітала ўдзельнікаў, разгарнуўшы як чырвона-белы польскі сцяг, так і – што важна – сцяг Еўрапейскага Саюза з жоўтымі зоркамі на сінім фоне. Польская прысутнасць у Кіеве засведчыла, між іншага, што ў гэтай краіны была паслядоўная стратэгія ўзаемаадносін з суседзямі. У 1970-я гг., калі Польшча яшчэ была савецкім сатэлітам, уплывовы эмігранцкі месячнік «Kultura» (Парыж) прапанаваў новую палітыку для Польшчы пасля заканчэння эры камунізму. Палякі мусілі пагадзіцца на пасляваенныя ўсходнія межы, нават не зважаючы на тое, што Сталін захапіў палову іх краіны. Калі б палякі прынялілі гэтыя межы загадзя, не патрабуючы вяртання сваіх былых земляў, ім удалося б, паводле «Kultury», наладзіць паспяховае супрацоўніцтва з дэмакратычнымі апазіцыйнымі рухамі ў Літоўскай, Беларускай і Украінскай ССР і ўстанавіць з

суседнімі краінамі прыязныя адносіны пасля распаду Савецкага Саюза.

У 1980-я гг. гэтыя падыходы прыняла антыкамуністычная польская апазіцыя, а пасля 1989 г. яны сталі падставай замежнай палітыкі ўрадаў «Салідарнасці». Варшава трактавала Украіну як незалежную дзяржаву нават да распаду Савецкага Саюза ў 1991 г. Пасля Польшча хуценька падпісала з незалежнай Украінай дагавор аб прызнанні сучасных межаў і абароне нацыянальных меншасцяў у абедзвюх краінах.

Пасля 1995 г. прэзідэнт Польшчы, экс-камуніст Аляксандр Квасьнеўскі, пераняў стратэгію, ініцыяваную антыкамуністычным эмігранцкім часопісам і ажыццёўленую «Салідарнасцю». Разам з прэзідэнтам Кучмам Квасьнеўскі браў удзел у сумесным адзначэнні ўгодак нацыянальных трагедый палякаў і ўкраінцаў. Тое, што ён устанавіў цесныя кантакты з Кучмам, было адной з прычын, з якой якраз Квасьнеўскі стаў пасярэднікам паміж двума бакамі ў найбольш крытычныя моманты рэвалюцыі. Польшча пастаянна лабіравала адмысловы падыход ЕС да Украіны. Але апрача нежадання некаторых старэйшых членаў ЕС прымаць у саюз адносна бедныя ўсходнееўрапейскія краіны, галоўнай праблемай заставаўся рэжым Кучмы. Пасля рэвалюцыі Квасьнеўскі загаварыў аб Украіне з большым імпэтам. Будучы разам з Юшчанкам на Давоскім форуме, ён натхнёна заклікаў прыняць «гэтую цудоўную краіну… велічную нацыю з вялікімі лідэрамі» ў члены ЕС.

Што можна сказаць аб амерыканскім уплыве на выбары? Урад Злучаных Штатаў – і прыватныя амерыканскія донары – зрабілі для падтрымкі ўкраінскіх дэмакратаў больш, чым Заходняя Еўропа. Дзярждэпартамент ЗША заявіў, што за апошнія два гады выдаткаваў на Украіну 65 мільёнаў долараў. Фонд Сораса ва Украіне – Міжнародны фонд «Відродження» – 20 кастрычніка 2004 г. абвясціў, што выдзеліў 1 201 904 долары для няўрадавых аб'яднанняў на «праекты, звязаныя з выбарамі». Большасць гэтых амерыканскіх долараў (як і заходне- і цэнтральнаеўрапейскіх грошай) пайшлі на развіццё НДА, уключна з навучаннем студэнцкіх актывістаў,

падтрымкай незалежнай прэсы ды тэлебачання, арганізацыяй назірання за выбарамі, двума незалежнымі экзіт-поламі. Як мы адзначылі вышэй, гэтыя экзіт-полы адыгралі важную ролю ў пачатку рэвалюцыі.

Ці была ўся гэтая дзейнасць «умяшаннем ва ўнутраныя справы», як сказалі б у Савецкім Саюзе? Безумоўна, была. Гэтаксама як выдзяленне велізарных сумаў на кампанію Януковіча расійскімі спонсарамі – у расійскай прэсе яны ацэньваюцца ў 300 мільёнаў долараў. Гэтаксама як паслугі расійскіх паліттэхнолагаў, якія развязалі брудную кампанію супраць Юшчанкі. Як выпісаная расійскімі ўладамі позва Юліі Цімашэнцы ў суд, якую вінавацілі ў крымінальных злачынствах (яна адказала: «Калі ласка, не замінайце вызваленчай барацьбе ўкраінскай нацыі»). Як і два з'яўленні Пуціна ва Украіне ў часе выбарчай кампаніі: ён прыязджаў, каб падтрымаць Януковіча. Расследаванне справы аб атручанні Юшчанкі працягваецца, і ёсць падазрэнні, што атрута была дастаўлена з Расіі.

Некаторыя замежныя «ўмяшанні» трэба лічыць апраўданымі, некаторыя – відавочна, не. Патрэбна адкрытая дыскусія аб базавых правілах вонкавага, галоўным чынам фінансавага ўмяшання ў імя падтрымкі дэмакратыі – аналагічная ўжо распачатай няпростай дыскусіі аб крытэрах ваеннай інтэрвенцыі з гуманітарных або іншых меркаванняў. Аднак умяшанне амерыканцаў і еўрапейцаў ва ўкраінскія справы нават не наблізілася да межаў, за якімі пачынаецца маральнае асуджэнне. Памаранчавая рэвалюцыя не была зроблена ў Вашынгтоне ці навязана Бруселем. Захад дапамог грамадзянам Украіны здзейсніць тое, што яны хацелі здзейсніць самі.

6

Пасля свайго абрання Віктар Юшчанка з Міхаілам Саакашвілі, які ў студзені 2004 г. стаў прэзідэнтам Грузіі ў выніку «ружовай рэвалюцыі», на выходныя выправіўся ў Карпаты. Абодва падпісалі Карпацкую дэкларацыю, з энтузіязмам трактуючы змены ў сваіх краінах як пачатак «новай хвалі вызвалення Еўропы, якая прывядзе да канчатковай перамогі свабоды і

дэмакратыі на еўрапейскім кантыненце». У артыкуле, апублікаваным у «Financial Times», прэзідэнт Саакашвілі патлумачыў, што гэтая «трэцяя і апошняя хваля еўрапейскага вызвалення» павінна ахапіць «увесь постсавецкі рэгіён».

Ці выдаваў ён жаданае за сапраўднае? Магчыма. Аднак нават некаторыя кансерватары ў Маскве, здаецца, пагаджаюцца з канцэпцыяй «трэцяй хвалі». У часе ўкраінскіх падзей блізкая да Крамля «Российская газета» пісала:

Нельга дапусціць паразы Расіі ў бітве за Украіну. Гэтая параза, апрача ўсяго іншага, будзе азначаць, што ў бліжэйшыя два гады аксамітныя рэвалюцыі (цяпер ужо паводле ўкраінскага сцэнару) адбудуцца ў Беларусі, Малдове, Казахстане, Кіргізіі і, магчыма, Арменіі.

У часе напісання артыкула ў Кіргізіі пасля сфальшаваных парламенцкіх выбараў адбываліся хваляванні. Адзін малады кіргіз сказаў у інтэрв'ю Бі-Бі-Сі: «Мы хочам быць больш падобнымі да Еўропы». 25 сакавіка беларускія студэнты выйшлі на вуліцы пад сцягамі ЕС, кінуўшы выклік свайму дыктатару.

Украінская «памаранчавая рэвалюцыя» будзе таксама аказваць непасрэднае ўздзеянне на пуцінскі рэжым, які становіцца ўсё менш дэмакратычным. Нават само па сабе існаванне свабоднай прэсы і тэлебачання ў вялізнай расійскамоўнай краіне-суседцы будзе пагражаць кантролю Пуціна за інфармацыйным полем. У даследаванні, праведзеным расійскай службай навін, у расіянаў спыталі: «Ці лічыце вы, што палітычны крызіс, падобны да ўкраінскага, можа мець месца ў Расіі?» Каля 42 % адказалі «ніколі», 35 % – «так, але не цяпер», 17 % – «так, і хутка ён здарыцца»[3]. Падчас нашай размовы з Віктарам Пінчуком у студзені 2005 г. ён сказаў, што яго расійскія партнёры па бізнесу, калегі-алігархі, зайздросцяць той павазе, якую аказваюць у свеце ўкраінскім бізнесоўцам. Ён прыпомніў і жарт, пачуты ў Маскве: «Леанід Кучма напісаў кнігу «Украіна – не Расія». Цяпер Пуцін піша кнігу «Расія – не Украіна».

30 сакавіка 2005 г.

[3] RBC News,

Пераклаў з англійскай В. Р. з ласкавай згоды абодвух аўтараў і рэдакцыі часопісу «New York Review of Books»

10–11 студзеня 2005 г., 6130 рэспандэнтаў.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 4 (38) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/07
[image]

ТЫМАЦІ ГАРТАН ЭШ

Тымаці Гартан Эш брытанскі палітоляг і публіцыст. Яго апошняя кніга «Free World: America, Europe, and the Surprising Future of the West» (New York: Random House, 2004) была прааналізаваная ў мінулым нумары «ARCHE». «Эўропа ці Амэрыка?» – гэта лекцыя, якая была прачытаная 11.05.2004 г. у Варшаўскім

Шаноўны спадару Рэктару, шаноўнае спадарства.

Мне сапраўды прыемна мець магчымасьць зьвярнуцца да вас якраз у гэтым месцы і якраз у гэтую хвіліну. Гэтае месца – Вялікую аўдыторыю – я жыва памятаю з нагоды іншых, драматычных падзеяў, што абуджалі надзею і засталіся ў польскай гісторыі. Я памятаю гэтую залю з часоў першае «Салідарнасьці», калі амаль чвэрць стагодзьдзя таму тут ішлі зацятыя дэбаты, і калі якраз тут, амаль пятнаццаць гадоў таму, у чэрвені 1989 году, сабраліся кагадзе абраныя ў парлямэнт прадстаўнікі «Салідарнасьці» на чале зь Лехам Валэнсам і сваім мудрым правадыром, прафэсарам Браніславам Герэмэкам. На гэтай сустрэчы, калі гарачыя дыскусіі ішлі наконт выбару назвы для новага парлямэнцкага клюбу, да мяне падсеў Анджэй Вайда і прашаптаў: «Ну, бачыце, зараз яны кінуцца адзін на аднаго з шаблямі, як тая шляхта на соймікаx». Праўду гаварыў! (Праз пару гадоў мы мелі магчымасьць бачыць славутага «Пана Тадэвуша» ў ягонай рэжысэрскай пастаноўцы, як мне падалося, занадта суворы камэнтар да пэўных аспэктаў

сёньняшняй польскай палітыкі.) унівэрсытэце.

Сёньня мы сустракаемся з вамі якраз тут – у менш драматычную хвіліну, якая, аднак, будзіць больш надзеі, што, можа, прасьцей зразумець замежнаму гісторыку, чымся таму, хто жыве тут, сярод усіх вашых штодзённых польскіх клопатаў. Прынамсі, я, гледзячы на апошнія два стагодзьдзі, ня бачу больш спрыяльнага моманту. На ўсходзе ў Польшчы ёсьць новыя суседзі, і, такім чынам, з фармальнага пункту гледжаньня і ў дыпляматычным сэнсе яна ўжо не ляжыць паміж Нямеччынай і Расеяй. Але і ў глыбейшым разуменьні палажэньне паміж Нямеччынай і Расеяй перастала быць для Польшчы вызначальным чыньнікам яе геапалітычнага становішча і так званых дзяржаўных інтарэсаў.

Гэтаксама Польшча ўжо не ляжыць «паміж Усходам і Захадам». Што б не азначала ў розныя часы польскае гісторыі гэтая пераканаўчая і адначасна падманлівая формула, аднак з 1 траўня 2004 году Польшча сталася інтэгральнай часткай Захаду як паўнавартасны сябар Атлянтычнага пакту і Эўразьвязу. Альбо, прынамсі, таго, што нам засталося ад Захаду. Гэта так у той меры, у якой гэты новы Захад – альбо «пост-Захад» – азначае сябе ў апазыцыі да Ўсходу, якім, хутчэй, ёсьць не эўрапейскі Ўсход (Расея, Украіна, Беларусь), а арабскі Блізкі Ўсход.

Калі 25 гадоў таму я пачаў прыяжджаць у Польшчу і апавядаў сваім новым сябром пра Ангельшчыну, яны ўздыхалі: «Дай нам, Божа, вашыя клопаты!» Ну, цяпер вы іх маеце. Аб адным з гэтых клопатаў, адным з найважнейшых, я і хацеў бы зараз распавесьці. Вялікая Брытанія і Польшча – гэта дзьве эўрапейскія краіны, што апошнія пару гадоў перажывалі сур'ёзную праблему, якой быў канфлікт ляяльнасьці паміж Эўропай ды Амэрыкай. Мы не былі ў гэтым самотныя. Гішпанія і Італія перажывалі падобны разрыў – зрэшты, кожная эўрапейская краіна ў большай ці меншай ступені пакутавала з гэтай прычыны. Аднак нашыя дзьве краіны, Вялікая Брытанія і Польшча, асабліва востра адчувалі гэтую дылему.

Вядомыя ды ўплывовыя аўтары паабапал Атлянтыкі загадваюць нам выбіраць паміж Эўропай і Амэрыкай, а крыху больш

канкрэтна, паміж Парыжам і Вашынгтонам. Заслужаны перамоўнік з Эўразьвязам ад імя Польшчы, прафэсар Ян Кулакоўскі, так апісвае нашыя адчуваньні: «У нас пытаюцца, ты за Амэрыку ці за Эўропу? Гэта ўсё адно, каб жа пыталіся, ты любіш тату ці маму?» Рыхтык тое ж самае сказаў бы Тоні Блэр. Аднак якраз гэтае блэраўскае адмаўленьне выбару было, прынамсі, у вачох некаторых галістаў, атаясамленае з дакладна акрэсьленым выбарам – акурат гэтым недарэчным. Падчас ірацкае крызы, пасьля Ліста васьмёх і дэклярацыі Віленскае дзясяткі, прэзыдэнт Шырак дазволіў сабе зласьлівы камэнтар. Ён абвесьціў, што краіны Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы, якія мерацца ўступіць у Эўразьвяз, аказаліся «pas très bien élevés» (ня надта добра выхаванымі) і «не змаглі сядзець ціха». Такім чынам, мы бачым новую вэрсію слыннага афарызму з «Фэрмы» Оруэла – нехта на просьбу сьвіньні, што мела мянушку (як памятаем) Напалеон, намаляваў на сьцяне стадолы лёзунг: «Усе эўрапейцы роўныя, а некаторыя раўнейшыя».

Для мяне відавочна, што ўсе эўрапейцы маюць роўнае права на ўдзел у гэтых дэбатах: «Нічога пра нас бяз нас». Апераджаючы выснову гэтага выступу, скажу таксама, што мы ня можам, ня мусім і не павінны выбіраць паміж Эўропай і Амэрыкай. Гэта значыць, выбіраць паміж нашай новай старой Эўропай і той старой новай Эўропай з-за Атлянтыкі, бо, як некалі заўважыў швайцарскі гісторык Якаб Бурхарт, першым Эўразьвязам былі Злучаныя Штаты Амэрыкі.

Сярод прычынаў зьявы, пра якую ідзецца, трэба, безумоўна, назваць місіянэрскі унілятэралізм (аднабаковыя дзеяньні) адміністрацыі Буша, асабліва ў адказ на тэрарыстычныя замахі 11 верасьня. Аднак варта таксама заўважыць іншыя, глыбейшыя прычыны. Пасьля заканчэньня халоднае вайны Эўропа ўжо не аб'яднаная з Амэрыкай наяўнасьцю відавочнага супольнага ворага, якім быў Савецкі Саюз і ягонае Чырвонае войска. (Колішні брытанскі міністар замежных справаў у размове з мной пажартаваў: «Ах, каб жа ў нас зноў быў Брэжнеў!») Гэта таксама азначае драматычную страту Эўропай першаплянавай ролі ў тэатры сусьветнай палітыкі. Як ні парадаксальна, але халодная вайна штучна ўмацоўвала цэнтральнае геапалітычнае становішча Эўропы. Сёньня гэтага

ўжо няма. Злучаныя Штаты змагаюцца за права на сусьветнае першынство, як «новы Рым», «супэр-гіпэр-дзяржава», пуп «аднаполюснага сьвету», відаць, наймагутнейшая краіна ўва ўсёй гісторыі чалавецтва. Для шматлікіх вашынгтонскіх палітыкаў Эўропа сёньня – ужо толькі адным з многіх палітычных рэгіёнаў, больш за тое, рэгіён падзелены і здатны ствараць багата клопатаў.

Асабліва пасьля 1 траўня 2004 году – па вялікім пашырэньні Эўразьвязу на ўсход, якое сталася магчымым дзякуючы заканчэньню халоднае вайны – эўрапейцы шукаюць больш глыбокага, эмацыйнага вязьма, якое магло б злучыць вялізную палітычную супольнасьць 25 такіх адрозных міжсобку краінаў. Традыцыйна такім вязьмом быў так званы «іншы», «the Other», у супрацьпастаўленьні якому мы маглі б самавызначыцца. «Іншага» ў асобе Саветаў ужо няма. Былі зробленыя пэўныя спробы рэанімаваць першапачатковага «іншага», якім у сярэднявеччы ў эўрапейцаў быў сьвет ісламу – спробы сьмешныя і нават самагубчыя ў Эўропе, якая становіцца домам для ўсё больш шматлікага, дзесяцімільённага мусульманскага насельніцтва.

Пасьля 1945 году Эўропа акрэсьлівала сябе ў проціпастаўленьні своеасабліваму віртуальнаму «іншаму» – сваёй нядаўняй барбарскай мінуўшчыне, вайне, дыктатуры, генацыду. На маю думку, гэта вельмі грунтоўны й важкі шлях самаакрэсьленьня, асабліва ў сьвятле таго, што адбывалася цягам апошніх трынаццаці гадоў на Балканах. Аднак па меры згладжваньня сярод моладзі памяці пра вайну, слабне таксама матывацыйная дый аб'яднаўчая сіла закліку «Ніколі болей!». Што засталося? Амэрыка! Амэрыка як адзіны «іншы», супраць якога мы, эўрапейцы, можам нарэшце аб'яднацца…

«У суботу, 15 лютага, на вуліцах нарадзілася новая нацыя. Гэта – эўрапейская нацыя». Гэткую выснову зрабіў колішні французкі міністар фінансаў Дамінік Строс-Кан з дэманстрацыяў, што адбыліся ў гэты дзень ува ўсёй Эўропе супраць плянаў адміністрацыі Буша наконт вайны з Іракам. Ходзячы па вуліцах сваіх местаў альбо гледзячы эўрапейскае кіно – пісаў Строс-Кан – эўрапейцы ўсьведамлялі, што жывуць у

Эўропе. Кожны хворы, стары ці беспрацоўны цаніў тую сацыяльную бясьпеку, якую гарантавала эўрапейская мадэль, у адрозьненьне ад амэрыканскай, японскай, індыйскай ці кітайскай. Аднак гэта было нешта большае: «нараджэньне эўрапейскае нацыі. На адным кантынэнце, у адзін дзень людзі паўсталі з аднае і тае самае прычыны. Раптам мы зразумелі, што зьяўляемся адзіным народам». Мы таксама пераканаліся – але кім уласна ёсьць гэтыя «мы»? – «што эўрапейцаў яднае супольны погляд на тое, як павінен быць упарадкаваны сьвет, погляд, што моцна адрозьніваецца ад аднабаковых рашэньняў, прыманых у Авальным кабінэце, у адрозьненьне ад супольных рашэньняў, прыманых у рамках міжнародных органаў». Дамінік Строс-Кан тады кіраваў на запрашэньне старшыні Эўрапейскай камісіі пасяджэньнямі Круглага стала, на якім выбітныя эўрапейцы шукалі новае канцэпцыі альбо, як ён сам гэта назваў, «міту» заўтрашняе Эўропы.

Пазамінулым летам многія эўрапейскія газэты надрукавалі зварот Жака Дэрыды й Юргена Габэрмаса, двух найбольш славутых сучасных эўрапейскіх філёзафаў, з заклікам да «адраджэньня Эўропы». Ува ўступе Дэрыда піша, што абодва яны палічылі за «пільную неабходнасьць», каб «нямецкія і французскія філёзафы разам узялі слова». Тэкст Габэрмасавага аўтарства пачынаецца рытарычным супастаўленьнем дзьвюх нядаўніх падзеяў. Першай была публікацыя ў шэрагу газэтаў ліста васьмёх праатлянтычных эўрапейскіх лідэраў, другой – 15 лютага 2003 году, «калі натоўпы дэманстравалі на вуліцах Лёндану і Рыму, Мадрыду й Барсэлёны, Бэрліна й Парыжу, рэагуючы на гэты нечаканую амэрыканскую агрэсію». Падобна Строс-Кану, Габэрмас таксама адзначае эўрапейскія падзелы, а таксама існаваньне шырока зразуметага Захаду, як пэўнага «духовага праекту». Ён цьвердзіць, што 15 лютага магло б стацца каталізатарам працэсу стварэньня эўрапейскай ідэнтычнасьці – калі б на тое была нашая, эўрапейцаў, воля. Мы можам фармаваць гэтую ідэнтычнасьць сьвядома, «робячы нашымі» адныя складнікі гістарычнае традыцыі і адкідаючы іншыя.

Далей у тэксьце Габэрмас вылічыў шэсьць рысаў, якія складаюць эўрапейскую ідэнтычнасьць. Па-першае,

аддзяленьне рэлігіі ад дзяржавы: «у нашым геаграфічным рэгіёне цяжка ўявіць прэзыдэнта, які пачынае дзень з публічнай малітвы і які зьвязвае свае важныя палітычныя рашэньні з Боскім наканаваньнем». Па-другое, вера ў «рэгуляцыйную сілу дзяржавы», што выпраўляе заганы й хібы рынку. Па-трэцяе, партыйная сыстэма, што бярэ свае пачаткі з французскае рэвалюцыі і складаецца з кансэрватараў, лібэралаў і сацыялістаў – якія пастаянна супрацьдзейнічаюць «сацыяпаталягічным наступствам капіталістычнае мадэрнізацыі». Па-чацьвёртае, спадчына працоўнага руху і ягоных хрысьціянска-сацыяльных традыцыяў, якой зьяўляецца дух салідарнасьці і ўпартае патрабаваньне «большае сацыяльнае справядлівасьці», што супрацьпастаўляецца «індывідуалістычнаму духу прадукцыйнасьці, які дапускае існаваньне рэзкай грамадзкай няроўнасьці». Па-пятае – я працягваю называць складнікі эўрапейскай ідэнтычнасьці паводле Габэрмаса, – маральная чульлівасьць, што вынікае з памяці пра таталітарызмы ХХ стагодзьдзя й галакост і адлюстроўваецца, «між іншым, у адмове ад сьмяротнага пакараньня, разгляданага як адна з умоваў уступленьня ў Раду Эўропы ды Эўразьвяз». Урэшце, па-шостае, спосаб, якім Эўропа пераадольвала сваю ваенную мінуўшчыну, крочачы шляхам наднацыянальнага супрацоўніцтва, узмацніў пераканаьне эўрапейцаў, што «гэтаксама і на глябальным узроўні» забесьпячэньне цывілізаванага ўжываньня сілы з боку дзяржавы вымагае ўзаемнага абмежаваньня ўласнага сувэрэнітэту». Памятаючы пра ўздым і заняпад імпэрыяў, эўрапейцы могуць цяпер мець «Кантаву надзею на своеасаблівую сусьветную ўнутраную палітыку».

Габэрмас з уласьцівай для філёзафа сьцісласьцю, а Строс-Кан з характэрнай для палітыка схільнасьцю да красамоўнага перабольшваньня пераконваюць, што Эўропа *іншая*, чым Злучаныя Штаты, што ў гэтай сваёй іншасьці яна зазвычай *лепшая*, а ейная *ідэнтычнасьць* можа і павінна быць збудаваная на гэтых самых адрозьненьнях альбо перавагах. Эўропа – гэта, карацей кажучы, не-Амэрыка. Тры гэтыя тэзы досыць папулярныя ў сёньняшняй Эўропе. Іх чуваць раз за разам, часьцяком у больш рэзкіх фармулёўках, заўсёды ў суправаджэньні нейкага з гэткіх вось матываў: салідарнасьць і

сацыяльная справядлівасьць, дзяржава дабрабыту, аддзяленьне царквы ад дзяржавы, скасаваньне сьмяротнага пакараньня, ахова навакольнага асяродзьдзя і міжнароднае права, мірнае разьвязаньне канфліктаў і мультылятэралізм, абмежаваньне сувэрэнітэту, стварэньне процівагі ЗША. Ува ўнівэрсытэцкім дыскусійным клюбе «Oxford Union» адзін брытанскі студэнт зграбна падсумаваў перавагі быцьця эўрапейцам: «Менш верагоднасьці, што цябе падстрэляць. З гэтым парадак. А калі цябе падстрэляць, дык будзеш мець гарантаваны мэдычны догляд».

Аргумэнты за Эўропу як не-Амэрыку ў Парыжы чуваць на кожным кроку, але яны прысутнічаюць і ў закліках такіх брытанскіх аўтараў, як Ўіл Гатан (Will Hutton), які жадаў бы, каб Вялікая Брытанія «выбрала Эўропу». Яшчэ да прыходу да ўлады Джорджа Буша, сур'ёзны і шанаваны нямецкі журналіст Кляўс Кох умаўляў Эўропу, каб яна зразумела «неабходнасьць прызнаць амэрыканскую імпэрыю ворагам». Больш вытанчаныя прыхільнікі канцэпцыі не-Амэрыкі, накшталт Габэрмаса, не адмаўляюць існаваньня шырока зразуметага Захаду. Але, як кажа найспрытнейшы дыялектык нямецкае замежнае палітыкі Эган Бар, існуюць два Захады: эўрапейскі Захад і амэрыканскі Захад. Адказваючы на гучную крытыку дзяржсакратара абароны ЗША Рамсфэлда на адрас Францыі і Нямеччыны, залічаных да «старой Эўропы», нямецкі філёзаф Пэтэр Слотэрдайк пісаў: «Старая Эўропа, годна прадстаўленая Францыяй і Нямеччынай, зьяўляецца найбольш разьвітай часткай Захаду, што, засвоіўшы ўрокі XX стагодзьдзя, перайшла да этапу постгераічнае культуры ды адпаведных палітычных мэтадаў. Злучаныя Штаты ж, наадварот, засталіся на гераічным этапе».

Цікава й паказальна, што да ўсталяваньня ўяўленьня эўрапейцаў пра саміх сябе, якое афармляецца цяпер, спрычынілася і сама Амэрыка. На думку Робэрта Кагана, амэрыканцы працягваюць жыць у «анархічным Гобсавым сьвеце», дзе асобныя народы мусяць зьвяртацца да вайсковае сілы; Эўропа ж уступае ў сьвет «правоў, правілаў і міжнародных перамоваў […] у постгістарычны рай, у якім пануюць мір і адносны дабрабыт, у сьвет, які будзе зьдзяйсьненьнем

Кантавага ідэалу «вечнага міру». Канцэпцыя, што стала вядомая ад тае пары як «тэза Кагана», зьявілася вельмі своечасова – у момант, калі Амэрыка рыхтавалася да вайны з Іракам, – ды сутыкнулася з шырокім водгукам у Эўропе. «Так!» – крычалі захопленыя эўрапейцы. – «Акурат імі мы і зьяўляемся – вучнямі Канта, што любяць мір!» (На Канта спасылаліся таксама Дэрыда і Габэрмас.) Той факт, што ідэя паходзіла ад прадстаўніка амэрыканскае правіцы – больш за тое, чальца легендарнае, дэманізаванае групоўкі «нэакансэрватараў» – падвоіў сілу яе ўзьдзеяньня. Гэта ўсё адно як бы д'ябал выдаваў сэртыфікаты прыналежнасьці да анёлаў.

Эўрапейцы перанялі ў амэрыканцаў дзьве найважнейшыя палітычныя канцэпцыі пасьляхалоднаваеннага сьвету – я маю на ўвазе «канец гісторыі» Фрэнсіса Фукуямы і «сутыкненьне цывілізацыяў» Сэмюэля Гантынгтана. Як з Каганам, так і ў абодвух гэтых выпадках зыходным пунктам былі артыкулы ў часопісах з вострай, мэтанакіравана разьвітай тэзай. Пазьнейшыя спробы іх зьмякчэньня ў пашыраных кніжных выданьнях прайшлі амаль незаўважанымі. Але здарылася нешта большае. Бо эўрапейцы атрымалі ўласнае бачаньне саміх сябе, прадстаўленае ім амэрыканцамі ў паважным выданьні. Мы паходзім з розных плянэтаў! Эўрапейцы – з Вэнэры, амэрыканцы – з Марсу. І гэта павінна быць праўдай, бо гаворыць нам пра гэта *амэрыканец*…

Аднак гэта відавочная няпраўда.

Давайце цяпер уважліва паглядзім на чатыры галоўныя тэзы той школы палітычнага мысьленьня, якую я называю эўрагалісцкай. Па-першае, пра тое, што спосабы вырашэньня ўнутраных гаспадарчых, грамадзкіх і палітычных праблемаў у Эўропе іншыя, і ў цэлым лепшыя, чымся ў ЗША. Па-другое, што, маўляў, эўрапейцам уласьцівыя іншыя і ў цэлым лепшыя паводзіны ў сфэры міжнародных дачыненьняў. Па-трэцяе, што Эўропа мае свае ўласныя інтарэсы, якія фундамэнтальным чынам адрозьніваюцца ад амэрыканскіх – і яна павінна іх вызначыць і рэалізаваць. І ўрэшце, што для сьвету, і перш за ўсё для самой Эўропы, было б добра, калі б Эўразьвяз стаўся «сапраўды вялікай сусьветнай сілай», як сфармуляваў гэта

Рамана Продзі, выступаючы з нагоды пашырэньня ЭЗ. «Сапраўды вялікая сусьветная сіла» – гэта значыць такая, якая магла б, як мы разумеем, зраўняцца з Злучанымі Штатамі і нават паспаборнічаць зь імі.

Пачнём з грамадзкага і палітычнага ладу. Эўропу і Амэрыку разьдзяляюць выразныя і сур'ёзныя адрозьненьні. А як жа магло быць інакш? Найістотнейшыя зь іх засяроджаныя вакол шасьці пытаньняў: рэлігіі, ролі дзяржавы, пытаньня няроўнасьці ў грамадзтве, аховы навакольнага асяродзьдзя, дзяржаўнага сувэрэнітэту, і ўрэшце, што ня менш істотна, валоданьня зброяй і сьмяротнага пакараньня за яе выкарыстаньне. Амэрыканцы, як супольнасьць, значна больш рэлігійныя, чымся эўрапейцы. Пяцьдзясят восем адсоткаў зь іх сьцьвярджаюць, што толькі той, хто верыць у Бога, можа быць маральным чалавекам. Чацьвёра зь пяці вераць у жыцьцё па сьмерці, а кожны трэці ўважае, што Біблія – гэта «Слова Божае, даслоўная ісьціна». З гэтага пункту гледжаньня Амэрыка – вынятак сусьветнага маштабу, адзіная краіна, якая адначасова і заможная, і рэлігійная.

Амэрыканцы таксама мяркуюць, што ўрад павінен забясьпечыць іх магчымасьцямі свабодна дабівацца абраных мэтаў, тады як эўрапейцы хочуць, каб іх урады гарантавалі ім, што ніхто ня будзе пакутаваць ад нястачы. У выніку, у Эўропе больш «апякунскай дзяржавы», чымся ў ЗША.

Што датычыцца разьмеркаваньня маёмасьці й дабротаў, дык у Амэрыцы пануе большая няроўнасьць, чымся ў большасьці эўрапейскіх краінаў. Найбольш заможныя дзесяць адсоткаў насельніцтва зарабляюць амаль у шэсьць разоў болей, чым дзесяць адсоткаў самых бедных – у Нямеччыне і Францыі гэтыя суадносіны складаюць трохі больш чым тры да аднаго. У ЗША адзін адсотак найзаможнейшых распараджаецца амаль дзьвюма пятымі ўсіх рэсурсаў краіны. Амэрыканская сярэдняя кляса зацісьнутая паміж полюсам асуджанай на свой лёс галоты і полюсам супэрбагатыроў. Амэрыка гэтаксама адрозьніваецца ад іншых разьвітых краінаў неспатольным спажываньнем нафты, што ёсьць вынікам спэцыфічнага «American way of life», амэрыканскага ладу жыцьця.

Большасьць амэрыканцаў больш патрыятычна настроеная, чым большасьць эўрапейцаў. Яшчэ перад выбухам пачуцьцяў, спрычыненым атакамі 11 верасьня, семдзесят два адсоткі зь іх сьцьвярджалі, што яны «вельмі ганарацца» сваёй краінай – гэткае ж пераканаьне мелі, адпаведна, сорак дзевяць адсоткаў брытанцаў і сорак адсоткаў немцаў. Амэрыканцы, у адрозьненьне ад большасьці эўрапейцаў, часьцей набываюць зброю. У ЗША на дзесяць параў прыватных рук прыпадае дзевяць адзінак зброі – у Эўропе менш за дзьве. У ЗША ўзровень забойстваў у чатыры разы перавышае паказьнікі Вялікае Брытаніі, Францыі і Нямеччыны – і гэта нягледзячы на барбарскі, на думку многіх эўрапейцаў, мэтад запалохваньня, якім ёсьць сьмяротнае пакараньне.

Так што Габэрмасаў пералік адрозьненьняў, што разьдзяляюць Эўропу і Амэрыку, ня ўзяўся зьніадкуль. Зь іншага боку Атлянтыкі сацыёляг Сэймур Марцін Ліпсэт падсумаваў іх паняткам «American Exceptionalism», амэрыканская выключнасьць. Аднак статыстычныя зьвесткі – гэта толькі частка карціны. Спытаем, напрыклад, пра якую Эўропу ідзецца? Абагульненьні Габэрмаса ў пэўнай меры стасуюцца шасьцёркі краінаў-заснавальніц Эўрапейскае супольнасьці. Але нават у групе Пятнаццаткі, зь якой, у момант, калі ён пісаў свой тэкст, складаўся Зьвяз, і з пэўнасьцю ў цяперашнім Зьвязе 25-ці, ня кажучы ўжо пра геаграфічную Эўропу, якая налічвае больш за сорак краінаў, існуюць велічэзныя адрозьненьні.

Нельга, напрыклад, у эмпірычным сэнсе сур'ёзна гаварыць пра адзіную «эўрапейскую мадэль» дэмакратычнага капіталізму. Сур'ёзныя ўнівэрсытэцкія дасьледаваньні, прысьвечаныя параўнаньню «відаў капіталізму», вылучаюць два галоўныя тыпы капіталістычнай гаспадаркі: лібэральную рынкавую эканоміку і рэгуляваную рынкавую эканоміку. Да першай катэгорыі залічваюць Вялікую Брытанію, Ірляндыю, а таксама Амэрыку, да другой – Нямеччыну, Бэльгію, Галяндыю, а таксама скандынаўскія краіны. Аўтары гэтых дасьледаваньняў сьцьвярджаюць, што Францыя, Італія, Гішпанія, Партугалія і Грэцыя належаць да «прамежкавай групы», прадстаўляючы, магчыма, «чарговы варыянт капіталізму, азначаны некалі як «міжземнаморскі», з тыповым для яго магутным сэктарам

сельскае гаспадаркі і нядаўняй традыцыяй шырокага дзяржаўнага інтэрвэнцыянізму». Усе гэтыя краіны адрозніваюцца з пункту гледжаньня рынку працы, сацыяльнай палітыкі і падатковага цяжару.

Вось гэта тры роды капіталізму сярод усяго толькі пятнаццаці краінаў ЭЗ, але ж мы яшчэ не зьвярнулі ўвагі на гэтаксама вельмі адрозныя новыя капіталістычныя эканомікі Сярэдняй і Ўсходняй Эўропы, ня кажучы ўжо пра такія эўрапейскія краіны, як Беларусь, у якіх дагэтуль няма ані капіталізму, ані дэмакратыі і якія не імкнуцца да сяброўства ў ЭЗ. Жыцьцё адваката з Гамбургу больш нагадвае жыцьцё яго калегі па прафэсіі ў Кіеве ці ў Бостане? Мы адкажам, вядома, у Бостане. За прыкладам даўнейшых тэарэтыкаў сацыяльнага ладу, Габэрмас і іншыя прыпісваюць надзвычай разнастайнаму чалавечаму грамадзтву яшчэ неіснуючыя супольныя рысы з спадзяваньнем, што дзякуючы гэтаму тыя рысы зьявяцца. «Эўрапейская мадэль» – гэта пастулят, які маскуецца пад апісаньне.

Гэтаксама і з паказьнікамі, якія найбольш выразна дэманструюць трансатлянтычныя адрозьненьні. Разыходжаньні ў іх у межах шырэйшае Эўропы могуць быць надзвычай значнымі. Возьмем, да прыкладу, патрыятызм. Трое з чатырох жыхароў Ірляндыі «вельмі ганарацца» сваім краем – гэта больш, чым у Злучаных Штатах. Палякі ганарацца сваім амаль у гэткай самай ступені. Але ўжо толькі адзін зь пяцёх галяндцаў прызнаецца ў такім старасьвецкім пачуцьці. Альбо возьмем рэлігію. Габэрмас кажа, што цяжка ўявіць сабе эўрапейскага прэзыдэнта, які пачынаў бы дзень з публічнай малітвы – але ж акурат так робіць брытанскі парлямэнт. У Злучаных Штатах ніколі не было дзяржаўнай царквы. У Вялікай Брытаніі яна існуе і надалей, а ў прагрэсіўнай Швэцыі лютэранская царква перастала быць дзяржаўнай толькі ў 2000 годзе. Гэтаксама і Польшча не пасуе да Габэрмасавай схемы. Кажучы наагул, эўрапейскія грамадзтвы, бясспрэчна, больш сэкулярызаваныя – у цэлым разрыў паміж рэлігіяй і палітыкай пашыраецца ў Эўропе і зьнікае ў Амэрыцы. Аднак спадчына хрысьціянства па-ранейшаму аказвае магутны ўплыў на эўрапейскую ідэнтычнасьць, як мы маглі выразна пераканацца

падчас усяе спрэчкі наконт уступленьня Турэччыны ў ЭЗ.

Абагульненьні ў дачыненьні да Амэрыкі здаюцца больш бясьпечнымі. Але і ў гэтым разе аналіз апытаньняў сьведчыць пра трывалыя і глыбокія адрозьненьні паміж двума Амэрыкамі. Яны досыць падманліва для эўрапейца акрэсьліваюцца як «блакітная Амэрыка» (больш лібэральныя штаты, перадусім усходняга й заходняга ўзьбярэжжаў) ды «чырвоная Амэрыка» (кансэрватыўныя цэнтар і поўдзень, што ўтвараюць літару «L»). Калі разгледзім іх паасобку, дык высьветліцца, што «блакітная Амэрыка» часьцяком бывае зусім эўрапейскай і ружовай. У многіх прынцыповых грамадзкіх пытаньнях, што мелі б сьведчыць пра эўрапейскасьць, амэрыканскія дэмакраты аказваюцца бліжэйшымі да эўрапейцаў, чым да рэспубліканцаў. Гэтая «блакітная Амэрыка» ня ёсьць сьціплай, забітай меншасьцю. Калі мы складзем галасы, аддадзеныя ў прэзыдэнцкіх выбарах 2000 году за дэмакрата Эла Гора і незалежнага левага кандыдата Ралфа Нэйдэра, дык высьветліцца, што іх было на тры мільёны больш, чым сабраў кансэрватыўны рэспубліканец Джордж Буш.

Мора зброі сапраўды адрозьнівае Амэрыку ад Эўропы – калі абмінуць «Дзікі Ўсход» на Балканах і ў сучаснай Усходняй Эўропе (Украіна, Беларусь, Малдова), дзе па-ранейшаму няма праблемаў з набыцьцём агняпальнай зброі. Мы схільныя экстрапаляваць гэты амэрыканскі фэномэн – каўбоі ў сябе, каўбоі за мяжой. Амэрыканскі сатырык Майкл Мур паказвае гэта ў фільме «Боўлінг для Калюмбіны». Больш сур'ёзна гэты аргумэнт высоўвае Робэрт Каган: амэрыканцы і надалей гатовыя ўжываць вайсковую сілу ў нашым пагрозьлівым «гобсаўскім» сьвеце.

Але не абмінуць той факт, што ад заканчэньня віетнамскае вайны і да тэрарыстычных нападаў 11 верасьня якраз Францыя і Вялікая Брытанія, а не ЗША, больш ахвотна высылалі сваіх жаўнераў у раён канфліктаў. Ніхто іншы, як Тоні Блэр, умаўляў амэрыканскага прэзыдэнта выслаць наземныя войскі ў Косава, а Францыя раз за разам выпраўляла свае аддзелы ў Афрыку. Амэрыканскія ўрады слупянелі пры выглядзе чарговых мяшкоў з трупамі сваіх жаўнераў, так званых *body bags*. З гэтага пункту

гледжаньня дзьве найбольшыя вайсковыя сілы Эўропы – брытанцы й французы – былі лепшымі марсіянамі, чымся амэрыканцы. Пасьля 11 верасьня многія амэрыканцы прызналі, што на іх краіну напалі, і большасьць падтрымала войны ў Аўганістане ды Іраку. З часам мы даведаемся, наколькі ўстойлівай была гэтая зьмена поглядаў. 15 лютага 2003 году – у дзень народзінаў «эўрапейскае нацыі» – каля дзьвюхсот тысячаў чалавек у Сан-Францыска і сто тысячаў у Нью-Ёрку пратэставалі супраць плянаў Буша што да вайны з Іракам. Ці сталі яны эўрапейцамі? Калі зьмясьціць на гэтую мапу яшчэ Аўстралію, Канаду, Японію і іншыя разьвітыя краіны АЭСР (Арганізацыі эканамічнае супрацы і разьвіцьця), высьветліцца, што Амэрыка і Эўропа ніколі яшчэ не былі менш разьдзеленымі паміж сабой.

Вы можаце спытацца: добра, а што ж з *каштоўнасьцямі*, якія ляжаць у аснове эўрапейскасьці? Хіба яны ня іншыя, чым амэрыканскія? Няпроста вымяраць каштоўнасьці, але існуе група прафэсійных спэцыялістаў у апытаньнях грамадзкай думкі і дасьледнікаў, што ўжо больш за дваццаць гадоў намагаюцца якраз гэта рабіць. Супастаўляючы і параўноўваючы адказы больш як ста дваццацёх тысячаў рэспандэнтаў з васьмідзесяці аднае краіны ў найноўшай публікацыі «World Values Survey», Роналд Інглехарт склаў «культурную мапу» сьвету, якая фармуецца вакол дзьвюх восяў. Не існуе аднаго згуртаванага эўрапейскага блёку, супрацьпастаўленага Амэрыцы. Хутчэй, існуюць асобныя, але сумежныя групоўкі: каталіцкая Эўропа, пратэстанцкая Эўропа, ангельскамоўныя краіны, посткамуністычныя краіны. На мапе Інглехарта Францыя ляжыць бліжэй да Аўстраліі, чым да Швэцыі, ня кажучы ўжо пра Баўгарыю.

Эўрагалісты цьвердзяць, што Эўропа ня толькі іншая, але гэтаксама і лепшая (цяжка было б будаваць эўрапейскі патрыятызм вакол ідэі, што мы горшыя). У якім сэнсе гэта было б праўдай? Гісторыкі эканомікі ня могуць адназначна давесьці, што пэўны варыянт капіталізму паказаў сябе ў доўгатэрміновай пэрспэктыве больш эфэктыўным, чым іншыя. Розныя мадэлі маюць розныя перавагі – і заганы. Напрыклад, лібэральная рынкавая эканоміка дае большай колькасьці людзей

магчымасьць атрымаць аплачваную працу, тады як рэгуляваная рынкавая эканоміка зьмяншае адрозьненьні ў велічыні даходаў і гарантуе беспрацоўным лепшыя сацыяльныя выплаты. Аднак што лепш – мець добра аплачваную працу, як у Амэрыцы, ці крыху большую і даўжэй выплачваную дапамогу па беспрацоўі? Можна прытрымлівацца розных поглядаў наконт таго, што акажа на чалавека больш разбуральны ўплыў. Урэшце, сам Эўразьвяз замацаваў у сваёй хартыі правоў «права на працу».

Тыя эўрапейцы, якім пашчасьціла атрымаць працу, зазвычай маюць больш высокі гарантаваны мінімальны заробак і большыя правы ў дачыненьні з працадаўцамі. Мы называем гэта «сацыяльнай» Эўропай – і гэта таксама выбар. Асабліва ў «міжземнаморскіх» грамадзтвах гэта дае больш часу на іншыя радасьці жыцьця, накшталт сям'і, сяброў, добрага харчаваньня, адпачынку, la dolce vita. Аднак за ўсё трэба плаціць – найбольш плацяць беспрацоўныя з доўгім «стажам», у іх ліку непрапарцыйна вялікая колькасьць моладзі, што належыць да супольнасьці імігрантаў-мусульманаў.

Я мог бы працягнуць, зьвяртаючыся да прыкладаў зь іншых галінаў. Аднак сказанага, відаць, хопіць, каб зрабіць выснову, што пасьля бліжэйшага практычнага разгляду тэза Габэрмаса-Дэрыды аб унутранай згуртаванасьці, яднаньні, адметнасьці і вышэйшасьці сучаснае Эўропы, супрацьпастаўленай сучаснай Амэрыцы, рассыпаецца. Я гэтаксама згадваў ужо пра тое, што і тэза наконт адметнае палітычнае лініі ў міжнародных дачыненьнях павінна, прынамсі, суправаджацца агаворкамі. Аўтарамі найбольш праніклівай крытыкі унілятэралізму адміністрацыі Буша, ейнае пагарды да міжнародных арганізацыяў і стаўкі выключна на «цьвёрдую ўладу» (г. зн. вайсковую сілу) часта бываюць амэрыканцы, такія, як Джозаф Най (Joseph Nye) з Гарварду. Кандыдат ад дэмакратаў на прэзыдэнцкіх выбарах Джон Керы далучыўся да гэтай крытыкі, абвінаваціўшы адміністрацыю Буша ў тым, што яна сваімі дзеяньнямі настроіла супраць Амэрыкі яе сяброў на ўсім сьвеце (апрача, як некаторыя любяць думаць, Польшчы). У значнай меры з ініцыятывы амэрыканцаў пасьля 1945 году паўстаў увесь комплекс міжнароднага права і міжнародных арганізацыяў накшталт ААН. І ўрэшце, ці зьяўляецца такім ужо

вартым перайманьня ўзорам неахвота альбо няздольнасьць Эўропы выкарыстоўваць цьвёрдую, вайсковую сілу ў мэтах прадухіленьня генацыду, падобнага басьнійскаму? Карацей кажучы, гэтыя аргумэнты ня столькі ясна й выразна аддзяляюць Эўропу ад Амэрыкі, колькі падзяляюць ўпоперак абодва кантынэнты. Можна сказаць, што ў палітычным сэнсе Атлянтыка праходзіць праз цэнтар Эўропы і цэнтар Амэрыкі.

Застаюцца дзьве апошнія тэзы эўрагалізму: аб інтарэсах і аб магутнасьці. На канфэрэнцыі, прысьвечанай новаму геапалітычнаму становішчу Сярэдняй і Ўсходняй Эўропы, арганізаванай на мінулым тыдні Фондам імя Сьцяпана Батуры, я адкрыта запытаўся ў чатырох выбітных знаўцаў эўрапейскай замежнай палітыкі, ці існуюць якія-небудзь сур'ёзныя разыходжаньні інтарэсаў паміж Эўропай і Амэрыкай – паўтараю, ідзецца пра рэальныя сур'ёзныя інтарэсы, а не пра пункты погляду, уяўленьні ці падыходы да розных справаў. Я пачуў дзіўны адказ: не, ніякіх няма. Вядома інтарэсы Эўропы і Амэрыкі не зьяўляюцца ідэнтычнымі – і ня могуць быць такімі ў выпадку існаваньня дзьвюх розных палітычных супольнасьцяў. Аднак большасьць зь іх мае супольны характар, ці, прынамсі, яны ўзаемна дапаўняюць адзін аднаго – тое ж, што ня ёсьць супольным альбо камплемэнтарным, можна неяк узгадніць.

Гэта асабліва выразна бачна, калі разглядзець вялікія глябальныя выклікі нашага часу. Мірная мадэрнізацыі і ўрэшце дэмакратызацыя Блізкага Ўсходу. Гістарычны працэс разьвіцьця Кітаю ды іншых вялікіх азіяцкіх дзяржаваў, які азначае, што праз дваццаць гадоў Захад перастане быць рашаючай сілай, якая фармавала вобраз сьвету цягам апошніх пяціста гадоў, пачынаючы прыкладна з 1500 году. Бездань, што існуе паміж багатай Поўначчу і бедным Поўднем (дзе прыблізна тры мільярды людзей жывуць на менш чым два даляры ў дзень) і выклікае маральны супраціў. Урэшце ня менш небясьпечнае глябальнае пацяпленьне клімату ў выніку дзейнасьці чалавека – перш за ўсё, выкідаў дыяксіду вугляроду, – якое, калі мы не пачнём дзейнічаць проста цяпер, разбурыць экалягічную раўнавагу плянэты. Перад абліччам гэтых пагрозаў усе спрэчкі і штучныя разыходжаньні паміж Эўропай і Амэрыкай нагадваюць тое, што Зыгмунд Фройд назваў «нарцысізмам

дробных адрозьненьняў». На фоне гэтых пагрозаў відаць, што Амэрыку лучаць з Эўропай сапраўды супольныя інтарэсы – і гэтыя пагрозы можна ўстараніць толькі (калі гэта наагул магчыма) у рамках эўраамэрыканскага супрацоўніцтва.

Памкненьні да ролі супэрдзяржавы, жаданьне зраўняцца і нават супернічаць з Амэрыкай (альбо дагнаць і нават перагнаць Амэрыку) сапраўды шырока распаўсюджаныя ў сёньняшняй Эўропе. Паводле апытаньняў, пра гэта кажуць каля дзьвюх трацінаў рэспандэнтаў (у 25 краінах Зьвязу). Як я ўжо нагадваў, для старшыні Эўрапейскай Камісіі Рамана Продзі абгрунтаваньнем пашырэньня Эўразьвязу на ўсход была пэрспэктыва ператварэньня Эўропы ў «сапраўды вялікую сусьветную сілу». Гэткія амбіцыі настолькі ж сумнеўныя ў прынцыпе, наколькі і малазьдзяйсьняльныя на практыцы. Але, Эўропе патрэбна ўзмацніць свае сілы – так званую *hard power* (альбо вайсковую магутнасьць), эканамічны патэнцыял (яна ім ужо валодае, у дужых руках камісара ЭЗ па гандлі Паскаля Лям'і), а таксама так званую *soft power*, мяккую сілу. Сіла неабходная, каб бараніць нашы супольныя інтарэсы. Але гэтая сіла зьяўляецца сродкам, а ня мэтай самой па сабе. Амбіцыі Эўропы, накіраваныя на дасягненьне статусу сусьветнае сілы – *Weltmacht* – ня робяцца больш шляхетнымі толькі ад таго, што пра іх кажа супольнасьць нацыяў, а не як даўней Францыя, Вялікая Брытанія, Нямеччына ці іншыя вялікія дзяржавы, што спаборнічалі паміж сабой. Па сутнасьці, ува ўсіх гэтых размовах пра эўрапейскую звышдзяржаву мы чуем рэха даўніх летуценьняў элітаў гэтых дзяржаваў. Усё адно што казалі б: паасобку ўжо не дамо рады стаць вялікімі дзяржавамі, але разам… Я цалкам згодны з Адамам Міхнікам, які, адказваючы на пытаньне французскага камэнтатара Бэрнара Гуці, ці не павінна Эўропа стаць магутнай, каб стварыць процівагу для Амэрыкі, парыраваў: «Магутнай – так, процівагай для ЗША – не».

Гэткія памкненьні таксама нерэалістычныя – зь дзьвюх прычынаў. Па-першае, як мы маглі пераканацца падчас ірацкае крызы, калі Эўропа хоча як звышдзяржава проціпаставіць сябе Вашынгтону, Злучаным Штатам стае сілаў, каб «падзяляць і ўладарыць» на ейным падворку, як тое рабіла брытанская

імпэрыя ў XIX стагодзьдзі. Па-другое, дзьве траціны апытаных мо і жадаюць, каб Эўропа сталася звышдзяржавай, але калі мы спытаем у іх, ці гатовыя яны несьці неабходныя выдаткі на войска – палова адкажа «не». У меру старэньня нашых грамадзтваў і ўразаньня сацыяльных выдаткаў, спрычыненага вострай эканамічнай канкурэнцыяй з боку азіяцкіх краінаў, мы ня схільныя да значнага павялічваньня нашых вайсковых бюджэтаў. Прыклад Савецкага Саюзу даводзіць, што супэрдзяржава, якая існуе толькі ў адным вымярэньні – зьяўляецца супэр толькі ў адным, вайсковым сэнсе – доўга ня выстаіць. Але ніхто ніколі не бачыў супэрдзяржавы без магутнага войска.

Карацей кажучы, эўрагалісцкая спроба канструяваньня Эўропы (ува ўсіх сэнсах слова «канструяваць») як альтэрнатыўнага варыянту і канкурэнта Амэрыкі зьяўляецца нерэалістычнай – з практычнага, эканамічнага, маральнага і нават палітычнага гледзішча. Адзіным слушным і рэалістычным шляхам ёсьць тое, што Вацлаў Гавэл называў эўраатлянтызмам, альбо сьвядомая пабудова Эўропы як партнэра Злучаных Штатаў. Гэткую ж пазыцыю займае і Тоні Блэр. Праніклівы баўгарскі камэнтатар Іван Крастэў уважае, што ў ірацкім канфлікце Сярэдняя і Ўсходняя Эўропы пайшлі ня столькі за Бушам, колькі за Блэрам. Эўраатлянтызм зьяўляецца сёньня поглядам, якога прытрымліваецца значная частка польскай і брытанскай грамадзкай думкі. Аднак Блэрава палітыка ператварэньня Вялікае Брытаніі ў, як ён гэта называў, трансатлянтычны «мост» не дасягнула эфэктных посьпехаў. Пазалетась ня толькі многія жыхары кантынэнту, але і брытанцы казалі – часам не без *Schadenfreude* (злараднасьці), – што мост Блэра абваліўся.

Чаму Блэру было так цяжка ўтрымаць гэты мост? Сваю ролю адыграла, вядома, шмат прычынаў, у тым ліку меркаваньні брытанскай унутранай палітыкі, а таксама ўпарты унілятэралізм адміністрацыі Буша. Аднак была таксама і нейкая істотная канструкцыйная памылка. Мост Блэра павінен быў злучаць Эўропу з Амэрыкай. Але Вялікая Брытанія не ляжыць паміж Эўропай і Амэрыкай. Яна ляжыць у Эўропе, зьяўляецца чальцом Эўразьвязу і хаўрусьнікам Злучаных Штатаў. Мост Блэра абваліўся на эўрапейскі бок. Абваліўся, бо

быў завузкі, выключна брытанскі. Абваліўся, бо не ўдалося пераканаць дастаткова вялікай колькасьці эўрапейцаў у тым, што эўраатлянтызм зьяўляецца адзіным рэалістычным выйсьцем для Эўропы, а эўрагалізм вядзе ў нікуды. Аднак, каб дасягнуць посьпеху, эўраатлянтызм павінен засвоіць і «зрабіць сваім» адзін фундамэнтальны і слушны прынцып эўрагалізму: амэрыканская гіпэрдзяржава можа разглядаць у якасьці сур'ёзнага партнэра толькі больш аб'яднаную Эўропу, якая імкнецца, калі толькі гэта магчыма, прамаўляць адным голасам. Дзеля Блэра і ягоных шасьцідзесяці мільёнаў брытанцаў адміністрацыя Буша, якая нават не зважала на іншых, была гатовая другі раз зьвярнуцца да ААН, рызыкуючы дыпляматычнай паразай, якой дэ-факта ўсё і скончылася. Наколькі ж больш гатовы быў бы зрабіць Вашынгтон для Эўразьвязу, што неўзабаве будзе налічваць чатырыста шэсьцьдзесят мільёнаў жыхароў, з ВУП, роўным амэрыканскаму, калі той прамовіць адзіным, спакойным і сталым голасам, абвяшчаючы сябе стратэгічным партнэрам ЗША?

У гэтым палягаюць брытанскія стратэгічныя інтарэсы. У гэтым палягаюць стратэгічныя інтарэсы Эўропы. У гэтым палягаюць стратэгічныя інтарэсы ўсяго Захаду, альбо пост-Захаду. Наконт інтарэсаў Польшчы рашэньне павінны прыняць палякі. Аднак хацеў бы выказаць сваё меркаваньне, што гэта таксама і вашыя стратэгічныя інтарэсы.

Шэсьць дзён таму я браў удзел у банкеце, дадзеным у гонар прэзыдэнта Квасьнеўскага ў Букінгемскім палацы. Калі каралеўскі аркестар граў «God Save the Queen» і «Jeszcze Polska nie zginęła», мне падумалася: неймаверна, што Польшча і Вялікая Брытанія сёньня раўнапраўныя партнэры ў рамках таго самага Атлянтычнага пакту і таго самага Эўразьвязу. Таму што, калі 25 гадоў таму я ўпершыню ўваходзіў у гэтую залю, мы належалі ў геапалітычным пляне да зусім розных сьветаў. Цяпер у нас супольная геапалітычная дылема. Мы разам у Эўропе, мы з Амэрыкай, а з 1 траўня ў Эўразьвязе і з Злучанымі Штатамі. У Польшчы зазвычай шмат кажуць пра «дзяржаўны інтарэс». І гэта якраз, на маю думку, і ёсьць сёньня новым польскім «дзяржаўным» інтарэсам.

Дык давайце пагаворым – як эўрапеец з эўрапейцам – пра тое, як нам разам збудаваць патрэбны нам мост. Не брытанскі, ня польскі, але агульнаэўрапейскі мост цераз Атлянтыку – найбольшы мост сьвету, працягласьцю ў чатыры тысячы кілямэтраў, зь некалькімі палосамі руху.

Пераклаў з польскай з ласкавай згоды аўтара Сяргей Богдан паводле: Zeszyty Literackie. 2004. 3(87).

[image]

[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.

Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2006/01/07

[image]

Мінулае (з 2000)

[image]
ARCHE Пачатак № 4 (38) - 2005
[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]
[image] [image] [image] [

беларускага нацыянальнага руху. Ускосна гэта пацвярджае і той факт, што як і абвяшчэнне БНР у 1918 г., гэтак і ліквідацыя ўраду БНР у 1925 г. былі звязаныя з Нямеччынай – першае адбывалася падчас нямецкай акупацыі, а другое мела месца ў Берліне. Больш глыбока зразумець генезіс гэтых узаемных кантактаў дазваляе нам знаёмства з жыццём і дзейнасцю Эдмунда Аляксандра Рамана Зуземіля (Susemihl), які вядомы перш за ўсё як цэнзар беларускай віленскай газеты «Гоман» і, шырэй, куратар з боку нямецкай адміністрацыі ўсяго беларускага руху падчас германскай акупацыі заходняй часткі Беларусі ў 1915–1918 гг.

Асоба Зуземіля агорнутая таямнічасцю, і да гэтай пары ніхто нават не спрабаваў яе хоць бы часткова расхінуць. Аўтары артыкула робяць такую спробу, маючы ў сваім распараджэнні архіўныя дакументы з Архіва новых актаў і Цэнтральнага вайсковага архіва ў Варшаве (Польшча), Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, аддзелаў рукапісаў бібліятэк Літоўскай Акадэміі навук і Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі, дакументы з кнігі «Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі», апублікаваныя ўспаміны А. Луцкевіча[2] і Ю. Вітан-Дубейкаўскай[3], а таксама матэрыялы беларускага перыядычнага друку і сусветнага сецівa. Аўтары выказваюць падзяку ўсім асобам, якія дапамагалі ім пры падрыхтоўцы артыкула.

Трэба сказаць, што пра своеасаблівы «феномен Э. Зуземіля» коратка згадваў амерыканскі гісторык літоўскага паходжання Веяс Габрыель Люлявічус, які апісваў у сваёй працы этнічную трансфармацыю, якую перажывалі некаторыя нямецкія салдаты на ўсходнім фронце падчас Першай сусветнай вайны. «Адзіны нямецкі салдат, – сцвярджае Веяс Люлявічус, – які быў у стане пісаць па-беларуску, паводле сведчанняў афіцыйных асоб, сам пачаў адчуваць сябе беларусам». Гэты перакладчык, Зуземіль, «стаў настолькі гарачым прадстаўніком беларускіх інтарэсаў, як гэта можа толькі нямецкі ідэаліст». Ягоную апантанасць беларускай справай «было нават цяжка ўявіць». Э. Зуземіль нават узяў на сябе «пэўныя палітычныя ініцыятывы»[4].

Як відаць з вышэйпрыведзеных цытатаў, Зуземіль атрымаў

[1] Гутарка

пасаду сярод іншага і дзякуючы свайму валоданню беларускай мовай. Ужо адно гэта вымушае нас звярнуць большую ўвагу на высвятленне яго паходжання і перадваеннага жыцця. Тым больш што ўсе даступныя нам звесткі адназначна акрэсліваюць месца яго перадваеннага жыхарства – Пінскі павет. Так, Юліяна Вітан-Дубейкаўская сцвярджала, што Зуземіль «яшчэ да вайны працаваў у Пінску». Згодна з Антонам Луцкевічам, ён працаваў там у якасці настаўніка Пінскай гімназіі, а паводле звестак польскай выведкі – інспектарам рэальных вучылішчаў. Па інфармацыі Адольфа Клімовіча, Зуземіль выкладаў у Пінскай гімназіі лацінскую мову. Пасля польскай контрвыведкі Рамуальд Зямкевіч сцвярджаў, што Зуземіль нарадзіўся каля вёскі Парэчча ў ваколіцах Пінска, меў невялікія зямельныя ўладанні недалёка ад маёнтка Рамана Скірмунта[6]. Урэшце, мы маем і пададзеныя самім Зуземілем звесткі, што ён вучыўся ў школе ў нейкім Гаі.

Звесткі пра паходжанне роду Зуземіляў нам дае адзін з нямецкіх генеалагічных сайтаў[7]. Цікава, што чалавек, які непасрэдна паўплываў на развіццё гісторыі славянскага народа беларусаў, і сам меў славянскія карані – яго далёкія продкі былі лужыцкімі сербамі. Пры гэтым ужо само прозвішча Susemihl сімвалічнае. Паводле некаторых крыніц, гэта агульнавядомая назва лужыцкага роду Сімяонаў. Імя Сімяон літаральна азначае «любімы чужынцамі». Як адзначае дасведчаная ў гісторыі Зуземіляў Вітан-Дубейкаўская, «Мацей Зуземіль, такі імя насілі ў XVI стагоддзі многія з сяброў сям'і, будучы сучаснікам Сімяона Зуземіля, вядомага ў Вялікім Княстве Літоўскім пад імем Сымона Ажгірдовіча». Сам Зуземіль, як і ягоным продкі, «Зуземілі» былі тымі людзьмі, якія надзвычай добра ведалі сваю гісторыю і ганарыліся ёю. Цікава, што ў якасці герба Зуземілі выкарыстоўвалі ўласны варыянт герба Ажгірдовічаў, які ўяўляе сабой шчыт, падзелены на 4 часткі, у якіх чарга ў 1 і 4 частках – трохкутнік вяршынёй уверх, а ў 2 і 3 – вяршынёй уніз. Такім чынам, асноўнай часткай герба Зуземіляў з'яўляецца трохкутнік – сімвал агню, які ў старажытнасці лічыўся сімвалам Божага Духа. Ён нагадвае пра Божае Провідзенне, якое вядзе чалавека праз усе выпрабаванні жыцця. Трохкутнік можа быць таксама сімвалам Святой Троіцы, якая ахоўвае і дапамагае ў цяжкія часы. Ён нагадвае пра Божае Провідзенне, якое вядзе чалавека праз усе выпрабаванні жыцця. Трохкутнік можа быць таксама сімвалам Святой Троіцы, якая ахоўвае і дапамагае ў цяжкія часы.

1 Гл. Луцкевіч А. К. Да крыніц беларускага руху. Мінск, 2003. С. 87–105.

2 Вітан-Дубейкаўская Ю. Мацей Зуземіль // Запісы. 1994. Кн. 1. С. 6.

3 Lukavics V. G. War and Memory in the Eastern Borderlands. Kraków, 2000. P. 102.

4 Lukavics V. G. War and Memory in the Eastern Borderlands. Kraków, 2000. P. 102.

5 Беларускі архіў-бібліятэка імя Францыска Скарыны. Ф. 5, воп. 1, спр. 1.

6 Пераклад з польскай мовы. Арыгінал: Archiwum Państwowe w Pińsku, zespół 40, spis 1, jedn. 1303, k. 2475.

7 Сайт генеалагічных даследаванняў Susemihl. Дата звароту: 14.04.2026.

Юлія Вітан-Дубейкаўская. Беларускі пытанне ў Еўропе. Мінск, 1993.

Уладзімір Ляхоўскі. Пінскай гімназіі – 100 гадоў. Мінск, 2005.

Антон Луцкевіч. Да крыніц беларускага руху. Мінск, 2003.

Адольф Клімовіч. Беларускі пытанне ў Еўропе. Мінск, 1993.

Рамуальд Зямкевіч. Мой шлях. Мінск, 2001.

Archiwum Państwowe w Pińsku, zespół 40, spis 1, jedn. 1303, k. 2475.

Сайт генеалагічных даследаванняў Susemihl. Дата звароту: 14.04.2026.

Lukavics V. G. War and Memory in the Eastern Borderlands. Kraków, 2000.

Беларускі архіў-бібліятэка імя Францыска Скарыны. Ф. 5, воп. 1, спр. 1.

У 1870 або 1871 г. у Расійскую імперыю на сталае месца жыхарства прыехаў адзін з прадстаўнікоў гэтага роду, Хрысціян Генрых Зуземіль, які быў народжаны 17 траўня 1842 г. у Лепіне каля г. Дэмін у тагачасным Прускім каралеўстве. Спачатку ён арандаваў маёнтак Старая Вадалога ў Харкаўскай губерні, а ў 1884 г. асталяваўся ў маёнтку Гай каля Пінска (як удалося ўстанавіць, маёнтак Гай размяшчаўся

ў той час на захад ад Пінска, пры гэтым у такой непасрэднай блізкасці ад горада, што ў 40-я гг. XX ст. яго тэрыторыя ўвайшла ў гарадскую рысу). Там Хрысціян Генрых жыў да 1913 г., а пасля вярнуўся на радзіму, дзе і памёр 3 жніўня 1924 г. Разам са звесткамі пра Х. г. Зуземіля падаецца інфармацыя пра Берту Хільгендорф, 1845 года нараджэння, нараджэнку ваколіц Кёніца (цяперашні горад Хойніцэ ў Польшчы),

якая жыла ў згаданым Гаі яшчэ ў 1875 г., а 30 снежня 1877 г. памерла на сваёй радзіме[8]. Нягледзячы на няпоўнасць і нават некаторую супярэчлівасць паданых звестак, можна з вялікай доляй упэўненасці меркаваць, што ў дадзеным выпадку ідзе гаворка пра бацькоў галоўнага героя гэтага артыкула. Прынамсі, у дачыненні да Х. г. Зуземіля гэтая верагоднасць амаль стопрацэнтная. Што тычыцца Б.

Хільгендорф, то яна, нягледзячы на раннюю смерць, таксама, у прынцыпе, можа быць маці Э. Зуземіля, які, паводле пазнейшых звестак польскіх спецслужбаў, нарадзіўся 29 ліпеня (ці жніўня) 1881 г. у Харкаве. Не выключаная простая памылка з боку стваральнікаў сайта, калі замест 1880-х гг. у біяграфіі Б. Хільгендорф фігуруюць 1870-я.

Цяжка сказаць, калі і якім чынам Эдмунд вывучыў беларускую мову. Яе ён ведаў яшчэ да вайны, і наўрад ці толькі дзякуючы кантактам з сялянамі на Піншчыне, бо гаворка ў тых мясцінах, паводле сведчання недалёкага суседа Зуземіля па маёнтку Рамана Скірмунта, «вельмі розніцца ад беларускай». Трэба, аднак, улічваць, што Зуземіль ведаў не толькі беларускую, але і польскую мову. Рамуальд Зямкевіч узровень валодання немцам

беларускай мовы ацэньваў як «выдатны». А. Луцкевіч моўныя веды Зуземіля ацэньваў больш сціпла, зазначаючы, што апошні быў «знаёмы з беларускай мовай». У той самы час лісты да Вацлава Ластоўскага ў 20-я гг. XX ст. Зуземіль пісаў па-расейску. Па-расейску пісаліся і лісты немца ў рэдакцыю газеты «Наша Ніва»[9]. Відаць, прынамсі, на пісьме, расейская мова для Зуземіля была ўсё ж больш зручная, чым беларуская. Сам ён у сваіх паштоўках, дасланых да Баляслава Пачопкі ў 30-я гг. XX ст., сцвярджаў, што пісаў вершы «па-радзіміцку» яшчэ ў 1894 г. падчас навучання ў школе. Аднак агітацыйны характар гэтых пасланняў вымушае ставіцца да падобнай інфармацыі крытычна, тым больш што ўсе прыведзеныя Зуземілем узоры нібыта тагачасных твораў у тым ці іншым выглядзе ўтрымоўваюць элементы радзіміцкай тэорыі. У той самы час нішто не паказвае на тое, што падобная тэорыя была створаная Зуземілем раней, чым у 30-я гг. XX ст. (у ліставанні з В. Ластоўскім у 20-я гг. ён карыстаўся прапанаваным Ластоўскім тэрмінам «крывіч»).

Пра жыццё Эдмунда Зуземіля да Першай сусветнай вайны вядома зусім не шмат. Калі верыць яго ўласным сведчанням, вышэйшую адукацыю ён атрымоўваў за мяжой, у Эдынбургскім універсітэце, вывучаючы там філасофію. Невядома, ці адтуль ён прывёз веданне класічных моваў, але можна прыпусціць, што настаўнікам лаціны ён быў неблагім і сваім прадметам (ВДАМЛіМ), захоплены. Прынамсі, на ўсё жыццё ён захаваў звычку ўжываць сабе лацінскамоўныя псеўданімы і ўжываць у сваіх творах лацінскія словы і выразы. Гэта, дарэчы, часта памагае вызначаць тэксты яго аўтарства, публікаваныя ў розных беларускіх друкаваных выданнях.

[9] Беларускі архіў-музей літаратуры і мастацтва (ВДАМЛіМ), ф. 3, воп. 1, спр. 98, а. 10–20.

Першы на сённяшні дзень выяўлены выпадак з’яўлення Зуземілевага артыкула ў беларускім друку датуецца самым пачаткам 1914 г. Тады ў газеце «Наша Ніва» з’явіліся дзве кароткія зацемкі карэспандэнта з Піншчыны, падпісаныя псеўданімам Argus. Зуземілева аўтарства гэтых публікацый не выклікае сумневу, бо падобны псеўданім выкарыстоўваўся ім пазней для публікацыяў у ковенскім беларускім часопісе «Крывіч». У зацемках пісалася пра ўзнікненне беларускага руху на Піншчыне. Асабліва акцэнтавалася аўтарам тое, што прыхільнасць да яго пачынаюць выяўляць людзі, якія займаюць

не самыя нізкія месцы ў грамадстве. У якасці доказу гэтага пазітыўнага факту прыводзіўся прыклад неназванай памешчыцы, якая «загадала свайму служачаму, каторы гаварыў з ёй на «культурнай» расейскай мове, гаварыць па-беларуску». У той жа самы час сцвярджалася, што «няма большых ворагаў беларускаму адраджэнню, як рэнегаты-«інтэлігенты», сыны Беларусі», да якіх залічаліся «іншыя свяшчэннікі з вышэйшай навукай ды іншыя вучыцелі рэальнай школы, а за імі і другія інтэлігенты-беларусы».

Пасля выезду свайго бацькі ў 1913 г. на сталае жыхарства ў Нямеччыну, Зуземіль вырашыў прадаць пакінуты ім маёнтак у Гаі. Абвестка пра гэта змяшчалася ў шэрагу нумароў «Нашай Нівы» ў пачатку 1914 г. Гэта, дарэчы, практычна адзіны факт, калі Зуземіль фігураваў на старонках беларускага друку пад уласным імем, не прыкрываючыся псеўданімам. Што тычыцца зместу абвесткі, то з яго складаецца ўражанне, што Зуземіль намагаўся выкарыстаць, на першы погляд, чыста гаспадарчую аперацыю дзеля стварэння сабе пазітыўнага іміджу ў вачах беларускіх нацыянальных дзеячаў. Зямельныя ўчасткі прадаваліся з растэрміноўкай аплаты і – што варта асабліва падкрэсліць – толькі сялянам-беларусам. Зусім не выключана, што гэтая піяраўская акцыя праводзілася з далёкім прыцэлам, улічваючы, што да пачатку вайсковых дзеянняў паміж Нямеччынай і Расіяй заставалася трохі больш, чым паўгода. Ва ўсялякім разе, ніхто з тых, хто пакінуў нейкія звесткі пра Зуземіля, не сумняваўся, што апошні супрацоўнічаў з нямецкай выведкай яшчэ да Першай сусветнай вайны. Ю. Вітан-Дубейкаўская называла яго «старым нямецкім агентам», Р. Зямкевіч – «нямецкім шпіёнам», а Адольф Клімовіч – «дазнаным работнікам нямецка-кайзераўскай разведкі ў тагачаснай царскай Расіі». Ды і выезд незадоўга перад вайной старога Зуземіля на гістарычную радзіму мог быць невыпадковым і звязаным з незвычайнай інфармаванасцю ягонага сына.

Ва ўсялякім разе, пасля ўсталявання нямецкага акупацыйнага рэжыму на беларускіх землях у 1915 г. кар'ера былога правінцыйнага настаўніка-лацініста атрымала імклівае развіццё. Ён пераязджае ў Вільню, уладкоўваецца на службу ў

структуры Обэр-Оста і ў хуткім часе пачынае курыраваць выданне беларускай газеты «Гоман». Праца гэтая, аднак, сталася для яго чымсьці большым, чым толькі выкананне абавязкаў цэнзара. Можна паставіць пад сумненне верагоднасць гісторыі В. Люлявічуса аб нямецкім перакладчыку, які пачаў адчуваць сябе беларусам, аднак тое, што Э. Зуземіль выйшаў за рамкі, адведзеныя ягонай кампетэнцыяй, падаецца бясспрэчным. Значна пазней ён пісаў пра сябе як пра стваральніка беларускага руху, сцвярджаючы, што гэта ўласна ён стварыў беларускі народ. У пэўнай меры гэта слушна, калі ўдакладніць, што Зуземіль «стварыў» беларусаў не наогул, а толькі для нямецкага камандавання, актыўна, наколькі дазваляла ягоная пасада, прасоўваючы думку пра самастойнасць беларускай нацыі сярод нямецкіх вайскоўцаў. Аднак і перабольшваць ролю Зуземіля не варта. Нямецкі генерал, кіраўнік Обэр-Осту Э. Людэндорф у сваіх вайсковых успамінах пра беларусаў згадвае толькі як пра «вельмі распаўсюджанае, але скрайне апалячанае племя, якое стаіць на такой нізкай ступені культуры, што дапамагчы ім можна было толькі працяглым уздзеяннем»[10]. Пра асобу ж Зуземіля ў гэтых успамінах наагул няма ніякай згадкі. В. Люлявічус пісаў пра Зуземіля, абапіраючыся на матэрыялы асабістага архіўнага фонду Фрайхера Вільгельма фон Гайля, які быў падчас Першай сусветнай вайны начальнікам палітычнага аддзелу Обэр-Осту. Відаць, у асноўным з апошнім Зуземіль і кантактаваў падчас выканання сваіх службовых абавязкаў.

Такая асабістая заангажаванасць Э. Зуземіля ў развіццё нацыянальнага руху самімі беларусамі ўспрымалася ім розначытаннем, у першую чаргу ў сувязі з унутранымі канфліктамі ў тагачасным беларускім асяроддзі на тэрыторыі нямецкай акупацыі. Калі даўнія супярэчнасці паміж братамі Луцкевічамі і Вацлавам Ластоўскім, па сутнасці, правадырамі беларускага руху на абшарах Обэр-Оста, набылі рысы адкрытага супрацьстаяння, Э. Зуземіль адкрыта стаў на бок апошняга. Гэта пацвярджае ў сваіх успамінах Юліяна Вітан-Дубейкаўская, наўпрост называючы Ластоўскага «пратэжэ Зуземіля». Менавіта Вацлаў Ластоўскі пасля на доўгі час стане галоўным палітычным партнёрам немца.

[10] Людендорф Э. Мои воспоминания 1914–1918 гг. Москва-Минск, 2015. С. 185.

Браты Луцкевічы і блізкія да іх асобы, у адрозненне ад Ластоўскага, успрымалі Зуземіля выразна негатыўна. Ва ўспамінах Ю. Вітан-Дубейкаўскай гэтая асоба згадваецца рэгулярна, прытым з выключна негатыўнага боку. Паводле гэтай крыніцы, Луцкевічы вельмі насцярожана ставіліся да немца, і ўсе больш-менш важныя справы імкнуліся па магчымасці абмяркоўваць пры яго адсутнасці. Ва ўспамінах Вітан-Дубейкаўскай захаваўся і слоўны партрэт нямецкага службоўца: «высокі немец, гадоў больш за сорак, са звыклым тварам, але з прыкрымі вачыма», у якіх было штосьці «фальшывае, змяінае». Не менш катэгарычным за Вітан-Дубейкаўскую ў ацэнцы ролі Зуземіля быў сам А. Луцкевіч, які пісаў: «Для Зуземіля […] рэквізуюць часць кватэры Луцкевічаў, і ён мае магчымасць сачыць за кожным іх крокам. Зуземіль развівае цэлую сець інтрыг, скіраваных проці братоў Луцкевічаў […] і вядзе атаку галоўным чынам проці Івана Луцкевіча, сваёй рэзкасцю выступленняў асабліва дадзеўшага акупантам. Пачынаецца работа дзеля развалу ўсіх беларускіх устаноў, так ці гэтак звязаных з імем Луцкевічаў». Менавіта з інтрыгамі Зуземіля А. Луцкевіч звязваў няўдачу ў арганізацыі Беларускага настаўніцкага саюза, які быў задуманы Іванам Луцкевічам.

Як у ранейшы, так і ў пазнейшы час Зуземіль выяўляў цікавасць да літаратурна-навуковай творчасці. Таму няма сумнення, што сваё становішча фактычна другога і галоўнага рэдактара ў «Гомане» ён скарыстоўваў дзеля выступлення з уласнымі, часам нечаканымі поглядамі на розныя праблемы. Натуральна, што свайго прозвішча Зуземіль пад артыкуламі не ставіў. Таму публікацыі ў «Гомане», якія, магчыма, належалі яго пяру, можна вызначыць толькі па нейкіх ускосных прыкметах, абапіраючыся на ўжо вядомыя нам пра гэтую асобу звесткі. Так, безумоўна, прыцягваюць увагу непадпісаныя артыкулы з лацінскамоўнымі назвамі – «Vestigia nostra prodeunt!» (Нашы штандары ідуць упярод!) ад 22 верасня 1916 г. і «Per aspera ad astra» (З цемры да зор) ад 8 снежня 1916 г. Асабліва цікавы першы з іх, у асноўным прысвечаны вывучэнню беларускага пытання нямецкімі навукоўцамі. У ім аўтар, вельмі станоўча ацэньваючы факт зацікаўленасці беларускім пытаннем з боку іншаземцаў, прыраўноўваў беларускае адраджэнне да

аналагічнага чэшскага і рабіў выснову, што «беларуская справа зышла з мёртвага пункту. Для поўнага адраджэння нашага народу патрэбны толькі жывыя, шчыра адданыя нашай справе людзі-кіраўнікі, не гэтулькі палітыкі, як скромныя, мо мала відочныя работнікі на ніве народнай, духаўнікі, народныя вучыцелі і інш.».

Безумоўна, не ўсе непадпісаныя ці падпісаныя псеўданімамі матэрыялы пісаліся рукой Зуземіля, аднак несумненна, што іх было нямала. Цікава, што адзін час «Гоман» выходзіў адразу з дзвюма перадавіцамі, адна з якіх падпісвалася імем Івана Мялешкі (псеўданім А. Луцкевіча), а другая друкавалася ананімна.

Артыкул пад назвай «Tutejszy» і «deutsch» з'явіўся на старонках «Гомана» 15 жніўня 1916 г. У ім аўтар сцвярджаў, што «беларусы – не ядыны народ, каторы называе сябе «тутэйшым». Мо гэта шмат для каго будзе неспадзяванкай, але «тутэйшымі» называюць сябе… немцы. «Deutsch» (нямецкі) – гэта старое германскае слова, каторае праз некалькі стагоддзяў крыху змянілася і значыла… «тутэйшы»!.. Гэтак бачым аналогію між імем, каторым называюць сябе беларусы, і імем нямецкага народу». Артыкул быў падпісаны псеўданімам «Nie-tutejszy». А недзе праз месяц у «Гомане» быў надрукаваны і ліст у адказ пад псеўданімам «Tutejszy», у якім адзначалася, што «вашая стацця навяла мне думку, ці сапраўды не называць нашу мову тутэйшай. Насмешлівае ў вустах нязваных гасцей нашага Краю слова «тутэйшы» няхай служыць для нас пачэсным імем!». Падабенства ў стылістыцы абодвух допісаў наводзіць на думку пра ідэнтычнасць іх аўтараў. Дакладней, аднаго аўтара – Эдмунда Зуземіля. Ва ўсялякім выпадку, апошні і ў пазнейшыя часы выступаў у друку з артыкуламі, прысвечанымі беларуска-нямецкім сувязям. Ды і пытанне тэрміну для азначэння беларускай нацыі не было для яго зусім чужым, асабліва калі згадаць пра распрацаваную ім «радзіміцкую тэорыю», пра што будзе гаворка пазней.

Палітычная актыўнасць Э. Зуземіля на беларускай глебе дасягае свайго піку ў 1918 г. Па пропуску на імя «Кузьміцкага» ён у сакавіку 1918 г. нават ездзіў з Вільні праз лінію старых

акопаў у Менск, хутчэй за ўсё, з мэтай нейкім чынам паўплываць на мясцовых дзеячаў. Пакуль няма дакладнай інфармацыі пра дзеянні немца ў Менску, аднак толькі пасля ягонага вяртання ў Вільню віленскія беларускія дзеячы атрымалі ад нямецкіх вайсковых уладаў дазвол на паездку ў Менск, якая, як вядома, завяршылася абвяшчэннем незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі.

Мяркуючы па далейшых падзеях, Зуземіль адразу ж выявіў імкненні да актыўнага ўдзелу ў вызначэнні напрамкаў палітыкі навастворанай дзяржавы. Ужо 24 красавіка 1918 г. А. Луцкевіч пісаў да Я. Варонкі і Р. Скірмунта ў Менск: «Мне немцы пазвалення на падарожу ў Менск не далі – затое далі пазваленьне пану Ластоўскаму, каторы, як Вам вядома, працуе ў цесным звязку з «таварышам Кузьміцкім» у мундзіры. Відаць, пад кірункам апошняга п. Ласт[оўскі] выпусьціў сваю «лістоўку» ў справе фэдэрацыі з Украінай»[11].

А. Луцкевіч меў на ўвазе спробу пераарыентаваць беларускі цэнтр у Менску з літоўскага на ўкраінскі напрамак, каторую гэтую ідэю «фікцыяй, за якой укрываецца «тав. Кузьміцкі». «Мы тут бачым у немцаў (гакатыстаў)[12] тэндэнцыю аддаць Беласточчыну сабе, – дадаваў ён, – а Гродзеншчыну і Віленшчыну дараваць Літве». Цяжка сказаць, быў ці падобнай ідэі сам Зуземіль ці ягонае вышэйшае начальства, аднак, як вынікае з далейшага тэксту ліста, адпаведныя менскіх беларусаў збіраліся выкарыстаць у сваіх замежнапалітычных інтарэсах нямецкія ўлады навалі самога тагачаснага райхсканцлера Георга фон Гертлінга.

Расшыфроўка Луцкевічам носьбіта псеўданіму «Кузьмінкі» дазваляе з вялікай доляй упэўненасці сцвярджаць, што Зуземіль не абмяжоўваўся закулісным кіраваннем беларускімі справамі, але і афіцыйна ўваходзіў у беларускія арганізацыі, прытым найвышэйшага ўзроўню. Прозвішча «Кузьмінкі» прысутнічае ў спісе кааптаваных сяброў Беларускай народнай управы, створанай 17 лістапада 1918 г. Гэтая ўправа, якая «Беларускай Народнай Рэспублікі», выбрала ўрадам Беларускай Народнай Рэспублікі.

[11] Гісторыя беларускіх выданняў: Архіў Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1–2. Вільня–Нью-Йорк–Менск–Прага, 1998.

[12] Гакатысты – так у беларускай гістарыяграфіі называюць прыхільнікаў нямецкага ўплыву на Беларусі ў 1918 г. Назва паходзіць ад прозвішча прускага міністра Ганса Гакатыста, які ў 1908 г. прапанаваў план германізацыі Польшчы і Літвы.

Кузьміцкі Іван Іванавіч (?) — старшынёй Цэнтральнай Гаспадарчай камісіі Рады БНР. Ягонае прозвішча фігуруе і ў каштарысе на выплату заробкаў сябрам Рады, аднак толькі за травень 1918 г. За чэрвень ён грошы ўжо не атрымоўваў, аднак невядома, ці сведчыла гэта пра вывад «Кузьміцкага» са складу Рады. Улічваючы, што менавіта на гэты час (26 красавіка 1918 г.) прыпала высылка сумнавядомай тэлеграмы кайзеру Вільгельму, можна дапусціць, што Зуземіль таксама ў большай ці меншай меры спрычыніўся да гэтага кроку, тым больш што ініцыятыва яе адсылкі належала групе яго ранейшага суседа і, хутчэй за ўсё, даўняга знаёмага Рамана Скірмунта. Магчыма, немец меў дачыненне і да няўдалай спробы фармавання новай Рады Рэспублікі ў чэрвені–ліпені 1918 г. пад кіраўніцтвам усё таго ж Скірмунта.

Падсумоўваючы вынікі гэтага перыяду ў беларуска-нямецкіх адносінах, на фармаванне якіх вялікі ўплыў аказваў Эдмунд Зуземіль, мае сэнс зацытаваць даведку аб дзейнасці Народнага Сакратарыяту БНР за восень 1918 г., г. зн. на час апошніх месяцаў нямецкай акупацыі:

Усталяваўшы ўладу, Германскае Камандаванне зменшыла правы Народнага Сакратарыяту, але ў той жа час Германскае Камандаванне лічылася і лічыцца да гэтай пары з Народным Сакратарыятам і (Радай) як з вярхоўным органам Беларусі, неафіцыйна прызнаючы за ім усе правы, але афіцыйна, на падставе Брэсцкай Дамовы і права акупацыі, трымаючы ўсе галіны кіравання ў вайсковых руках. У апошнія месяцы працяглыя перамовы з Германскім Камандаваннем прывялі да таго, што гандаль, прамысловасць (Гандлёвай Палаты), асвета, пошта, зносіны пакрысе пераходзяць у рукі беларускіх арганізацыяў. Мала таго – Германскае Камандаванне запатрабавала, каб Народны Сакратарыят прызначыў сваіх дарадцаў (асаблівыя пасады нагляду) у Літоўскую частку Беларусі (Ваўкавыск і інш.), а таксама і ва Украінскую частку Беларусі (Брэст-Літоўск, Гомель і інш.).

Не выключана, што многія з пералічаных саступак з боку нямецкага камандавання былі зробленыя дзякуючы

лабіраванню беларускіх інтарэсаў Э. Зуземілем. Магчымасці апошняга, аднак, былі даволі абмежаваныя. Р. Зямкевіч, які ў 1918 г. жыў у Менску і якраз тады пазнаёміўся з Зуземілем, дакладваў, што

пасля заняцця Менску ён пастаянна круціўся сярод беларусаў, і хоць быў вайскоўцам найніжэйшага рангу – сяржантам, пан доктар Зуземіль літаральна ўсюды меў доступ да ўладаў. Рабіў беларусам дробныя паслугі, даваў грошы на выданне газет. […] Хоць Зуземіль хадайнічаў перад нямецкімі ўладамі пра прызнанне Беларусі ў якасці незалежнай адзінкі, аднак нямецкія ўлады ў 1918 г., складзеныя з баварцаў, супраціўляліся гэтай ідэі, паводле іх бессэнсоўнай.

Ад канца 1918 і да восені 1921 г. не ўдалося выявіць ніякіх фактаў уплыву Эдмунда Зуземіля на беларускія справы, што, аднак, зусім не сведчыць пра тое, што гэтага ўплыву наагул не было. Вядома толькі, што пасля заканчэння Першай сусветнай вайны Зуземіль пасяляецца ў Кёнігсбергу, і ягоныя сувязі з беларускім рухам цалкам не перапыніліся. Восенню 1921 г. ён быў у Коўне, адкуль перадаваў інфармацыю для нямецкіх газет у Кёнігсбергу, у тым ліку – на беларускую тэматыку. У 1922 г. Э. Зуземіль звярнуўся да В. Ластоўскага з прапановаю за свой кошт выдаваць у Кёнігсбергу беларускія кнігі. «Аб пладах маёй беларускай агітацыі ў Нямеччыне, – пісаў ён у сваім лісце, – вы, спадзяюся, даведаліся з лаянкі ў польскай прэсе, якая ніяк не магла здагадацца, якім гэта чынам беларускае пытанне было не так даўно ўзнятае нават у германскім парламенце». У канцы 1922 г. ён зноў звяртаецца да В. Ластоўскага, на гэты раз не непасрэдна, а, хутчэй за ўсё, праз Аляксандра Карабача[13], з прапановаю набыць дзве тысячы паасобнікаў беларускага перакладу «Закона Божага», выдадзенага лацінскім шрыфтам. «Па сканчэнні гэтай справы, – дадаваў ён напрыканцы, – я гатовы прыступіць да выдання расійска-беларускага слоўніка сп. Ластоўскага». Можна меркаваць, што за справу арганізацыі выдання беларускіх кніг у Кёнігсбергу Зуземіль узяўся сапраўды сур'ёзна, бо 14 снежня 1922 г. інфармаваў Ластоўскага пра расцэнкі на друкарскія справы ў гэтым горадзе, а 15 лютага 1923 г. ужо прапаноўваў падрыхтаваць

для беларускага выдавецтва цікавыя рукапісы.

Адначасова з гэтым Э. Зуземіль знаёміў нямецкае грамадства з беларускім пытаннем, друкуючы, напрыклад, у нямецкай газеце «Deutsche Rundschau» («Нямецкі агляд») артыкулы пра крывіцкі рух і заснаваны Ластоўскім у Коўне часопіс «Крывіч». Супрацоўнічаў ён і з самім «Крывічом», дасылаючы ў рэдакцыю розныя нататкі і артыкулы, якія пасля друкаваліся пад рознымі імем. Найбольш вядомым, але не адзіным псеўданімам Зуземіля быў «доктар філёлёгіі А. Чужыловіч». Таксама выкарыстоўваўся яшчэ даваенны псеўданім «Аргус». У псеўданімы можна ўстанавіць па ўскосных прыкметах. Так, Зуземіль у адным з лістоў да Ластоўскага згадваў, што ў 1923 г. ён змясціў «тры артыкулы агульным аб'ёмам 14 старонкі». Ведаючы сферу інтарэсаў Зуземіля, можна меркаваць, што яго пяру, акрамя артыкула, падпісанага псеўданімам «Аргус», належыць і матэрыял, падпісаны крыптанімам «Ч. У.», тым больш што ў папярэдніх нумарах нататкі «Філалагічныя закметкі» падпісваліся як крыптанімам «Ч. У.», так і бясспрэчна зуземілеўскім псеўданімам «Чужыловіч». Можна з вялікай доляй упэўненасці таксама сцвярджаць, што пад псеўданімам «Semper militaris» хаваецца былы настаўнік-лацініст.

13 Кадэцкая Аляксандр – беларускі крывіцкі і беларускі дзеяч, супрацоўнічаў з «Крывічом». У 1922 г. пасяліўся ў Латвіі, дзе і памёр у 1938 г.

Звычайным зместам зуземілеўскіх артыкулаў з'яўляюцца сувязі беларускай мовы з іншымі еўрапейскімі мовамі, у першую чаргу з лацінскай, старажытнагрэцкай, нямецкай і польскай. Аднак у некаторых артыкулах яскрава праступае захапленне іх аўтара расавай тэорыяй. Так, у артыкуле пад характэрнай назвай «Мова, народ, раса», апублікаваным пад псеўданімам «Чужыловіч», выказваецца думка, што

найбольш чыстымі па крыві славянамі трэба лічыць Крывіцкі і Польскі народы. […] У горшым палажэнні вялікарускі народ, які кампетэнтнымі вучонымі прызнаецца нават за неславянскі, у лепшым прыпадку за славяна-мангольскі. […] З пункту гледжання антрапалогіі розніцы паміж Французамі і Італьянцамі з аднэй стараны і Крывічамі з другой далёка не так вялікі, як розніца паміж Крывічамі і Маскалямі.

Выдатны прадстаўнік Віленскага Беларускага нацыянальнага камітэту ў Коўне.

Гэты артыкул не прайшоў незаўважаным у беларускіх асяродках. Так, Я. Станкевіч у сваім лісце да В. Ластоўскага з Прагі восенню 1923 г. адзначыў:

Меркаванні ў стацці «Мова, народ, раса» д-ра Чужыловіча мне падабаліся. Ён піша аб рэчах элементарных і наагул ведамых, але надзвычайна важна тое, што не глядзіць на палітыку і не баіцца Маскалёў. Хто гэта такі д-р Чужыловіч, адкуль ён і дзе жыве?

Супрацоўніцтва Зуземіля з «Крывічом» атрымалася інтэнсіўнае, але непрацяглае. Ужо ў канцы 1923 г. ён паведаміў В. Ластоўскаму пра немагчымасць далейшага свайго супрацоўніцтва з «Крывічом» дзеля матэрыяльных цяжкасцяў. Тым не менш, адносін з Ластоўскім ён не перарываў і надалей.

Гэтыя адносіны, прынамсі, знешне, мелі выразна сяброўскі характар: «Калі вы з пані Станіславаю, – пісаў ён у лісце ад 15 лютага 1923 г., – ці пан Карабач па якой небудзь прычыне будзеце ў Кёнігсбергу, дык прыходзьце проста з вакзала да мяне, бо ж мой пакой заўсёды ў вашым ці Карабача распараджэнні». У іншым лісце Э. Зуземіль сцвярджаў: «Кватэра пані Рэйман [...] да Вашых паслугаў. […] Калі ў Вас ёсць нейкая інтымная блізкая сяброўка, дык яна таксама можа тут спыніцца». Аўтары не маюць інфармацыі, кім была гэтая пані Рэйман, аднак Зуземіль у іншым лісце перадаваў, што яна захопленая «Крывічом». З усяго сказанага можна меркаваць, што згаданая пані адыгрывала не апошнюю ролю ў асабістым жыцці Зуземіля і ён меў на яе немалы ўплыў. Не выключана, аднак, і чыста прафесійнае супрацоўніцтва гэтых асоб па лініі нямецкай выведкі. Магчымы і трэці варыянт: ніякай «пані Рэйман» наогул не існавала ў прыродзе, а пад гэтым імем была зашыфраваная нейкая іншая асоба або нават цэлая арганізацыя.

На карысць апошняй версіі сведчыць тое, што Зуземіля з Ластоўскім аб'ядноўвалі не толькі асабістыя і літаратурныя пытанні, але і нейкія іншыя патаемныя інтарэсы. Сутнасць іх пры сучасным стане даследавання праглядаецца слаба, і

наконт гэтага можна рабіць пакуль толькі прыпушчэнні. «Усё ідзе вельмі добра – чытаем мы ў лісце да В. Ластоўскага з Кёнігсбергу ад 8 кастрычніка 1923 г., – і абяцае даць найлепшыя вынікі. Памешчыкам патрэбныя рабочыя, памяшканне будзе, завод моцна цікавіць. […] Спадзяюся, што застаняцеся задаволеныя маёй бегатнёй». Як відаць з цытаты, гаворка тут нібыта ідзе пра нейкія супольныя эканамічныя інтарэсы, аднак вельмі верагодна, што і «памешчыкі», і «рабочыя», і «завод» былі толькі элементамі нейкага шыфра, і такім чынам Зуземіль імкнуўся перадаць Ластоўскаму нейкую сакрэтную інфармацыю. 6 сакавіка 1924 г. Э. Зуземіль выклікаў В. Ластоўскага з Коўна ў Кёнігсберг «па вельмі спешнай справе». Мяркуючы па тым, што камплект «Крывіча» Р. Зямкевічу ў Варшаву, высланы ў сакавіку 1924 г. з Кёнігсберга, быў падпісаны ўласнаручна Ластоўскім, апошні неадкладна выканаў просьбу немца.

Наогул, з часам ліставанне абодвух дзеячаў набывала ўсё больш канфідэнцыяльны характар. Зуземіль у лісце за 4 траўня 1925 г. зазначае, што «астатнія тэмы Вашага ліста [за 29.04] я тут не буду закранаць, бо гэта залішне далікатная справа». У канцы траўня – пачатку чэрвеня 1925 г. Э. Зуземіль тэрмінова выязджае ў Гданьск на нейкую нараду і сустрэчу з «заморскімі гасцямі» – як гэта ён сам акрэсліў у двух лістах да В. Ластоўскага. У апошнім вядомым нам лісце да Ластоўскага ад 7 жніўня 1925 г. Э. Зуземіль прапанаваў арганізаваць у Коўне штодзённую беларускую газету дзеля выцяснення расейскамоўнага і польскамоўнага штодзённага друку ў Літве.

Зуземіль не абмяжоўваў сваю дзейнасць на беларускім полі толькі адносінамі з ковенскім урадам Ластоўскага. Ён стараўся падтрымоўваць стасункі з тымі віленскімі беларусамі, якія ў 20-х гг. XX ст., у адрозненне ад сімвалічнага Ураду БНР, праводзілі рэальную палітыку, валодаючы пэўнымі ўплывамі ў беларускім грамадстве і нават маючы сваіх прадстаўнікоў у польскім парламенце. Адзін з іх – Антон Аўсяннік – быў, паводле сведчання Р. Зямкевіча, асабістым сябрам Зуземіля і ў свой час дастаўляў яму інфармацыю пра дзеянні польскага корпусу генерала Ю. Доўбар-Мусніцкага ў Бабруйску. З рапарту Зямкевіча ў II аддзел Генеральнага штабу ад 15

студзеня 1923 г. мы атрымоўваем і інфармацыю пра візіт Зуземіля ў Вільню адразу пасля правядзення паспяховых для беларусаў парламенцкіх выбараў:

У Вільню інкогніта прыязджаў нямецкі шпіён, вядомы яшчэ з часоў акупацыі 1916–1918 гг. – цэнзар і беларускі апякун Зуземіль. Ён выдатна валодае як беларускай, так і польскай мовамі. Знаходзіўся ён тут паміж 30 снежня і 3 студзеня, пасля чаго нібыта выехаў у Горадню. Антон Луцкевіч яго не прыняў, таму ён дзейнічаў праз літоўцаў і праз іх уплываў на беларусаў. Гаворка ідзе ні больш ні менш як пра арганізацыю беларускага паўстання.

Другое з'яўленне Зуземіля ў Вільні адбылося летам 1924 г. Аднак перад гэтым ён заехаў у Варшаву, дзе на кватэры Браніслава Тарашкевіча 4 ліпеня 1924 г. выпадкова сустрэўся з тым самым Зямкевічам. У сваім чарговым рапарце ў II аддзел Зямкевіч даволі сцісла, але змястоўна апісаў далейшыя планы немца:

Зуземіль едзе ў Вільню. Хоча пазнаёміцца з станам беларускага руху. Хоча купіць усе гадавікі газет мінулых часоў. Запрапанаваў мне купіць маю калекцыю за высокую цану. Я не пагадзіўся. Яму хочацца ведаць дынаміку руху. Прапануе матэрыяльную дапамогу ў выданні газет, класікаў беларускай літаратуры, навуковых і школьных прац. Што датычыць палітыкі, то ён раіць несаступлівасць, пратэсты, нават скандалы і эксцэсы, што ў найбліжэйшай будучыні багата аплоціцца. Выданне друкавалася б у Берліне або Лейпцыгу. Ластоўскі мне яго рэкамендуе як ідэальнага літаратурнага кіраўніка выданняў.

Размова двух агентаў і адначасова старых знаёмых яшчэ з часоў вайны працягнулася вечарам таго ж дня ў кавярні, і, як выглядае, кожны з іх імкнуўся падчас яе выконваць перш за ўсё прафесійныя абавязкі:

Ён цягнуў мяне за язык і я яго. Ён пытаўся маю думку пра

Тарашкевіча, з якім раней не быў знаёмы. […] Прасіў мяне дапамагчы ў фармаванні думкі пра неабходнасць паразумення з Літвой і літоўцамі. Я сказаў, што гэта цяжка, асабліва цяпер, калі нацыянальныя супярэчнасці і нетактоўнасць літоўскіх палітыкаў выклікалі пагаршэнне адносін. Ён прызнаўся, што прыехаў, каб самому даследаваць адносіны на месцы. Матэрыяльная дапамога для ўзмацнення руху і планы на будучыню будуць вызначаныя толькі пасля даследавання ўсёй справы. Пра паўстанне, узброены рух і меркаваную вайну ён не ўспамінаў ані словам. […] Запісаў сабе мой адрас. Я яго прасіў, ці не мог бы я праз яго дастаць беларускія выданні, якія друкаваліся ў Коўне і Берліне, а ў нас забароненыя цэнзурай. Ён паспешліва паабяцаў, што ўсё мне прышле праз нямецкую амбасаду.

Звесткі пра наступныя сустрэчы Зуземіля падчас гэтага візіту, ужо ў Вільні ў сярэдзіне ліпеня 1924 г., мы атрымоўваем з агульнага рапарту II аддзелу Генеральнага штабу. Адзначаецца, што гэтая інфармацыя была атрыманая II аддзелам ад уласнага канфідэнта. Гэта не выключае таго, што яе крыніцай таксама быў Р. Зямкевіч, які, паводле ўласнага сведчання, збіраўся ехаць у Вільню ўслед за немцам. Гэтым разам Зуземіль наведаў Антона Луцкевіча. Пры размове прысутнічалі і некаторыя з соймавых паслоў. Зуземіль пераконваў прысутных, што

Нямеччына ніколі не забудзе беларусам, што яны занялі такую рашучую антыпольскую і антыфранцузскую пазіцыю. Абяцаў, што за гэта немцы падтрымаюць іх акцыю ў гэтым кірунку. Пакуль жа раіў як мага мацней супраціўляцца ўсім мерапрыемствам польскіх уладаў, адначасова асцерагаючы ад празмернага даверу да СССР. Што да СССР, то раіў выкарыстоўваць і яго ўплывы.

Дадатковую інтрыгу дзеянням Зуземіля надаюць яго таямнічыя кантакты з польскімі спецслужбамі, якія мелі месца перад гэтай паездкай[14]. У сакавіку 1924 г. на адрас Генеральнага консульства Польшчы ў Кёнігсбергу прыйшоў ліст ад Зуземіля, у якім апошні, называючы сябе арганізатарам беларускага руху падчас сусветнай вайны, запрапанаваў сустрэцца з мэтай

абмеркавання некаторых праблемаў, датычных беларускага пытання. Прозвішча Зуземіля нічога не казала консульскім службоўцам. Яны ўспрынялі яго як «аднаго са шматлікіх псеўдабеларускіх дзеячаў, якія дзеля грошай гатовыя ствараць новыя беларускія арганізацыі», і адмовіліся выслаць свайго прадстаўніка на сустрэчу. У адказ Зуземіль выступіў з вялікім артыкулам у мясцовай газеце «Tannenberg», якая з'яўлялася органам прыхільнікаў былога камандуючага Усходнім фронтам генерала Эрыха Людэндорфа. Артыкул меў назву «Мы і беларусы», і ў ім аўтар даволі падрабязна апісаў сваю дзейнасць у 1915–1918 гг., вядома, значна перабольшыўшы свае заслугі перад беларускім рухам. Аднак сваёй мэты ён дасягнуў: пасля прачытання артыкула супрацоўнікі польскіх спецслужбаў зацікавіліся асобай Зуземіля і прапанавалі яму выкласці свае пастулаты ў адмысловым мемарыяле.

Мемарыял быў неадкладна пададзены. У ім Зуземіль[14] Усе сцвярджаў, што «насуперак поглядам большасці польскіх матэрыялы, расейскіх палітыкаў, я перакананы, што беларускае дашэнне для расейскага і польскага народаў з'яўляецца важнейшым за ўкраінскае. […] Узброеная спрэчка паміж Польшчай і Расеяй вырашыцца не на ўкраінскай тэрыторыі, а на беларускай». Затым, пасля кароткага гістарычнага экскурсу, ён рабіў выснову, што ў інтарэсах Нямеччыны – або моцная Польшча, або ніякай. Дзеля ўзмацнення Польшчы ён прапаноўваў сваім паслугі ў справе фармавання паланафільскай арыентацыі ў асяроддзі заходнебеларускіх палітыкаў. Зуземіль дэкларатыўна: «Я рэзка асуджаю бандыцкую палітыку, якую беларускі праводзяць цяпер у Вільні, Гародні, Беластоку ды на Дзвіне. Я асуджаю гэтую палітыку не таму, што яна шкодзіць беларускай справе, таму, што яна бессэнсоўная і ніякай карысці беларускаму прынесці не можа. Гэта быў мой сталы погляд, і на I.303/4.2475, пазіцыі я застаюся сёння. […] Мушу зазначыць, што падзяляюць таксама і некаторыя беларускія дзеячы. Я маю сваіх прыхільнікаў у Расеі, у Польшчы, у Латвіі і Літве. […] Сярод беларусаў нямала ёсць такіх, якія глядзяць на беларускую акцыю як на сродак здабывання грошай, але, на шчасце для беларускай справы, беларусы маюць і іншы тып дзеячаў – людзей у вышэйшай ступені ідэйных, сумленных і фанатычна адданых нацыянальнай справе. Іх немагчыма

[14] Цэнтральным ўладам ён прапаноўваў свае паслугі ў Берліне, Вене і Ватыкане. Пенсіянер, былы палкоўнік генеральнага штаба, сын. 21. 1918 г. ён ад

купіць, але існуе магчымасць іх зацікаўлення на карысць польскай арыентацыі, што можа прынесці карысць як Польшчы, так і беларусам».

У сувязі з гэтым цікава тое, што яшчэ ў сваім газетным артыкуле Зуземіль паведамляў пра факт адсылкі беларускімі дзеячамі тэлеграмы генералу Людэндорфу, пастаўленаму перад мюнхенскім судом за ўдзел у т. зв. «піўным путчы» ў лістападзе 1923 г. Тэлеграма высылалася «ў гадавіну абвяшчэння раўнапраўя беларусаў з іншымі народамі ўсходу» і была падпісаная В. Ластоўскім і былым рэдактарам газеты «Гоман» Язэпам Салаўём. Паказальна, што хутка пасля гэтага Салавей стаў адным з заснавальнікаў паланафільскай Часовай беларускай рады, і нават кароткі час рэдагаваў яе друкаваны орган «Грамадзкі голас». Не выключана, што рашэнне аб прыняцці такой палітычнай арыентацыі было прынятае ім не без уплыву з боку Эдмунда Зуземіля.

Кіраўнік жа польскага консульства ў Кёнігсбергу, перасылаючы копію мемарандуму Зуземіля ў Варшаву, адзначаў, што апошні «пры асабістай сустрэчы склаў уражанне ідэйнага маньяка, і відавочна, што ён добра інфармаваны пра цяперашнюю дзейнасць беларускіх лідэраў, а таксама, будучы адпаведна намі кіраваны, мог бы быць ужыты пры правядзенні спрыяльнай нам прапаганды ў тых беларускіх сферах, якія гуртуюцца па-за тэрыторыяй Польскай Рэспублікі».

Падобна на тое, што вышэйзгаданая ліпеньская паездка Зуземіля ў Варшаву была зробленая ў першую чаргу з мэтай непасрэднага навязання кантактаў з кампетэнтнымі людзьмі з II аддзелу польскага Генеральнага штабу. Даволі цікавая інфармацыя на гэтую тэму ўтрымоўваецца ў папярэдне ўжо цытаваным рапарце Р. Зямкевіча. Нібыта ў прысутнасці Б. Тарашкевіча Зуземіль

жартаўліва зазначыў, што трэба было б мяне [Зямкевіча. – **А. П., А. Ч.**] *пабойвацца, бо маю адносіны з афіцэрам дэфензівы Блонскім*[15]. […] *Зуземіль на маё вялікае здзіўленне сказаў, што паводле некаторых звестак, якімі ён валодае, не было нічога*

лягчэйшага, як падкупіць Блонскага, што гэта было толькі пытанне сумы і яе велічыні. Я зразумеў, што тут Зуземіль гаворыць як выведнік, а думка пра Блонскага прымусіла мяне задумацца, хоць у праўду гэтага паверыць не магу.

Польскія службоўцы, аднак, з асцярогай ставіліся да прапановы паслугаў немца, апасаючыся правакацыі з боку нямецкіх спецслужбаў. Аднак і сувязяў з ім яны не перарывалі, імкнучыся па магчымасці выкарыстаць у сваіх мэтах Зуземіля жа падаваў усё новыя і новыя прапановы. Так, у канцы 1925 ці 1926 гг. ён запрапанаваў прадаць ІІ аддзелу звесткі пра заходнебеларускіх дзеячаў, звязаных з бальшавікамі, але не не пагадзіліся ў суме. А 12 снежня 1926 г. немец звярнуўся адным з прадстаўнікоў ІІ аддзелу і заявіў, што яму ўдалося стварыць групу з 8 беларускіх дзеячаў, якія жывуць у дзяржавах: Польшчы, СССР, Літве і Нямеччыне. Гэта, нібыта мела сваіх давераных асоб у Менску і ставіла за мэту стварэнне самастойнай беларускай дзяржавы, арыентаванай у сваёй палітыцы на Польшчу. Зуземіль падкрэсліў, што «на дэфензіўную працу мы не пойдзем, а гаворка ідзе галоўным чынам пра барацьбу з бальшавізмам на аснове растлумачвання беларускаму насельніцтву пра пагрозу для яго з боку Масквы». Прозвішчы сваіх паплечнікаў немец абяцаў назваць толькі пры ўмове прыняцця яго асабіста кіраўніцтвам ІІ аддзелу ў Варшаве. Польскім выведнікам такая прапанова падалася дастаткова перспектыўнай, нягледзячы на натуральную ў тых умовах боязь правакацыі: «ці працуе Зуземіль у паразуменні з Нямеччынай – цяпер гэтага дакладна сцвярджаць немагчыма, але ва ўсялякім разе яго прыезд у Варшаву і наша знаёмства з прозвішчамі дзеячаў з яго групы можа кінуць пэўнае святло на магчымыя камбінацыі з нямецкага боку […]. Трэба было б правесці з ім перамовы на нейтральным грунце, бо для ўсёй камбінацыі было б лепей, как Зуземіль быў перакананы, што размаўляе з прадстаўнікамі Міністэрства ўнутраных справаў».

Візіт Зуземіля ў Варшаву спачатку планаваўся на студзень 1927 г., але потым быў перанесены на сярэдзіну сакавіка таго ж года. Падчас візіту была запланаваная сустрэча з кіраўніком аддзелу нацыянальных справаў пры МУС Польшчы капітанам

15 Блонскі Станіслаў (1890–1939) – пач. XX ст. – 1925 г. – Генеральнага штабу ў Польскага

Сухэнкам, а таксама з афіцэрамі II аддзелу Генеральнага штабу. Зуземіль абавязаўся сярод іншага «прывезці палякам матэрыялы, якія выкрывалі бальшавіцкую шпіёнскую акцыю на польскіх землях, а таксама, магчыма, ад імя сваёй групы выступіць на беларускім працэсе (відаць, працэсе Беларускай сялянска-работніцкай грамады. – **А.П., А.Ч.**) з доказамі, што ўся беларуская акцыя накіроўвалася бальшавікамі».

Хутчэй за ўсё, гэты візіт Зуземіля ў Варшаву ўрэшце адбыўся. Аднак нічога канкрэтнага ад яго палякам дабіцца не ўдалося і гэтым разам. Прынамсі, ужо пасля візіту нейкі польскі капітан пісаў да нейкага маёра, што немец настойвае на сваёй ідэі перапраўкі ў Польшчу 8 беларускіх дзеячаў, але прозвішчы іх падаць па-ранейшаму адмаўляецца. Сам Зуземіль пры гэтым выказваў жаданне з'ездзіць на некалькі тыдняў у Вільню, каб пазнаёміцца са станам беларускіх справаў. Акрамя таго, ён сцвярджаў, што ў апошнія дні атрымаў прапанову ад супрацоўніка савецкай амбасады ў Коўне аб дапамозе ў выведвальнай працы на тэрыторыі Польшчы. Пры гэтым адрас Зуземіля, па словах апошняга, амбасада атрымала ад выехаўшага незадоўга перад гэтым у БССР Вацлава Ластоўскага. Капітан рабіў у сваім рапарце выснову, што «гэтая справа трохі смярдзіць» і абяцаў не выпускаць немца з-пад свае апекі, каб што-небудзь з яго выцягнуць.

Маёр у адказ на гэты ліст засведчыў, што «Зуземіля я лічу вычарпаным чалавекам, без сур'ёзных кантактаў, які набівае сабе цану фантазіямі. Мне падаецца, што з ім ніхто не хоча размаўляць. Яго можна ўжываць у кароткачасовых негатыўных справах, але ніколі – у пазітыўных, г. зн. арганізацыйна-творчых. Напрыклад, калі б ён даў доказы шпіёнскай або агітацыйнай працы ў Польшчы, то іх можна ўзяць, праверыць, магчыма заплаціць, і на гэтым канец». Капітану было загадана не размаўляць з Зуземілем на сур'ёзныя тэмы, а толькі адсочваць яго крокі. Пры выкарыстанні немца як магчымага польскага агента ён павінны быў атрымоўваць толькі дакладна вызначаныя і канкрэтныя даручэнні без раскрыцця яму мэтаў і планаў II аддзелу. Урэшце, любая інфармацыя, пададзеная Зуземілем, мусіла перасылацца ў Варшаву для праверкі і ацэнкі, бо «шкада нават аднаго гроша на гэтага шалапута».

Пасля нядаўняй публікацыі А. Сідарэвічам ліста Антона Луцкевіча, напісанага апошнім 15 ліпеня 1931 г. да Людмілы Краскоўскай, дачкі вядомага беларускага дзеяча Івана Краскоўскага, рэпрэсаванага па справе Саюза вызвалення Беларусі ў Менску[16], высвятляюцца новыя абставіны гэтай справы. Аказваецца, што беларускія дзеячы ў Вільні даведаліся пра перамовы Зуземіля з польскай выведкай і зрабілі з гэтай інфармацыі ўласныя высновы. Луцкевіч, спасылаючыся на інфарматара, асоба якога «не выклікае сумлеву ў праўдзівасці яго апавядання», пісаў, што «перад «пакаяннем» і выездам у Менск Л[астоўскага] прыязджаў ад яго імя ў Варшаву да міністэрства ўнутраных справаў (да п. Сухэнка) той самы Зуземіль. Аб чым там вяліся перагаворы – няма ведама. Але магчыма, што з гэтага і завязалася ўся гісторыя». Паводле інфармацыі Луцкевіча, пасля свайго візіту ў польскае МУС Зуземіль адпаведным чынам паўплываў на былога прэм'ера Урада БНР, у выніку чаго Ластоўскі, прыехаўшы ў БССР, заявіў, што «хутка мае быць ваенная інтэрвэнцыя ў СССР, і дзеля гэтага нацыянальна сьведамыя беларусы мусяць стварыць свой тайны цэнтр, які будзе прызнаны «белымі» за ўладу «вызваленае» Беларусі». Такім чынам, на Зуземіля фактычна ўскладалася адказнасць за пачатак разгрому камуністычнымі ўладамі беларускага руху ў БССР у 30-х гг. XX ст. Праўда, у дадзеным выпадку трэба браць пад увагу тую даўнюю непрыязь і нават варожасць, якую А. Луцкевіч меў як у дачыненні да Зуземіля, так і ў дачыненні да Ластоўскага.

Мала вядома пра ўплыў Зуземіля на беларускія справы ў Польшчы ў 30-я гг. XX ст. Аднак жа наагул кантакту з беларусамі ў гэты час ён не траціў. 19 ліпеня 1930 г. у віленскай беларускай газеце «Наперад» у раздзеле «Хроніка» з'явілася кароценькае паведамленне, што «Э. Зюзэм[ан] (немец) палажыў у Нямецкі Дзяржаўны Банк 11 000 польскіх злотых за найлепшыя беларускія гістарычныя раманы з часоў канца XVI і пачатку XVII сталеццяў». Галоўная прэмія складала 5000 злотых, вялікую па тых часах суму. Цікавы, аднак, не ўласна сам факт падобнай прапановы немца, як публікацыя пра яе ў друкаваным органе «Цэнтральнага саюзу беларускіх культурна-асветных арганізацый і інстытуцыяў», які кіраваўся даўнім ворагам Зуземіля Антонам Луцкевічам.

16 Луцкевіч А. Ліст да Людмілы Краскоўскай (дачкі Івана Краскоўскага) // Дзеяч. 2005 № 1(8). С. 13–18.

Вядома таксама пра сувязі Зуземіля з уніяцкім святаром Баляславам Пачопкам. Падчас Першай сусветнай вайны Пачопка арганізаваў настаўніцкую семінарыю ў Свіслачы. Вядома, гэта было немагчыма без дазволу нямецкіх акупацыйных уладаў, таму Пачопка ніяк не мог абмінуць Зуземіля. Відаць, яны знайшлі ў той час ўзаемапаразуменне, бо захавалі цёплыя асабістыя адносіны і праз шмат гадоў. Прынамсі, з 1932 па 1938 гг. Пачопка пастаянна атрымоўваў ад Зуземіля паштоўкі, якія сваім зместам сведчылі пра тое, што Зуземіль стварaў т. зв. «радзіміцкую» канцэпцыю, падобную да «крывіцкай» канцэпцыі В. Ластоўскага[17]. Невядома, якім мэтам мусіла гэтая канцэпцыя служыць, аднак сабе Зуземіль у ёй адводзіў галоўную ролю, без лішняй сціпласці называючы сябе «бацькам радзіміцкага руху». Свой «радзіміцкі» стаж ён адлічваў з 1894 г., калі, будучы яшчэ школьнікам, напісаў «першыя радзіміцкія вершы». Хоць на ўсіх паштоўках пададзены хатні адрас Зуземіля ў Кёнігсбергу, аднак на паштоўках 1932 і 1933 гг. фігуруе і нейкае «Радзіміцкае выдавецтва ў Эсціі, Калывань», у якім нібыта быў выдадзены ў 100 паасобніках «Эпас Радзімічаў» аўтарства Зуземіля.

Што датычыць адрасата, Б. Пачопкі, то яго Зуземіль тытулаваў «бацькам беларускай філалогіі», «аўтарам слаўнае «Hramatyki biełaruskaj mowy», выдадзенай у Свіслачы ў 1917 г., у якога «пан Тарашкевіч зрабіў пазыку».

Цяжка сказаць дакладна, чаму Зуземіль менавіта да Пачопкі ставіўся з такой павагай, улічваючы тое, што ў 1934 г. Пачопка на беларускія справы ніяк не ўплываў, бо служыў святаром правінцыйнай уніяцкай парафіі ў в. Баброві Косаўскага павету і, паводле асабістага прызнання, «заўсёды адчуваюцца матэрыяльны недастатак». Магчыма, як вынікае з лістоў Зуземіля ў адказ на паштоўку 1934 г. (які быў перахоплены польскай палітычнай паліцыяй)[18], пэўнае значэнне ў справе зблізкі гэтых двух дзеячаў мела агульная непрыязь да Антоніна Луцкевіча. Пачопка пісаў: «Бачу, што браты Луцкевічы не змаглі зашчапіць Вам упярэджання да маёй асобы. Праўда, я, па-вашаму «слаўная», імі наогул не спамінаецца, а «Гадавіку Бел. Навук. Т-ва» спомніў яе «пан Антон», «вельмі непрыхільна».

[17] Пачопка Б. Беларусы. Кн. 1–10.

У той жа час у каментары польскай дэфензівы да перахопленага ліста згадвалася, што прыблізна за два гады да гэтага (г. зн. у 1932 г.) Зуземіль звярнуўся да Беларускага выдавецкага таварыства ў Вільні з просьбай выслаць яму 1000 паасобнікаў беларускай граматыкі і 500 паасобнікаў чытанкі. Адначасова ён прапаноўваў выслаць давераную асобу ў Гданьск «для абмеркавання асабістых справаў». Тагачасныя кіраўнікі таварыства А. Луцкевіч і Р. Астроўскі ўхіліліся ад завязвання непасрэдных кантактаў з такім небяспечным партнёрам, а выданні пагадзіліся выслаць толькі пры ўмове іх папярэдняй аплаты. Відаць, урэшце кантакты з Зуземілем з усіх беларусаў у Польшчы пагадзіўся падтрымоўваць толькі Пачопка, пра што ўскосна сведчыць тое, што першыя паштоўкі (у 1932 і 1933 гг.) мелі агульны характар, а ў наступных тым ці іншым чынам вельмі пазітыўна згадвалася асоба Пачопкі і расхвальвалася ягоная граматыка.

Аднак жа галоўную пікантнасць усёй гэтай справе надае тое, што паліцыя перахапіла не арыгінал ліста Пачопкі да Зуземіля, а яго фатакопію, на якой рукой Зуземіля быў дапісаны ўлікавы адрас. Гэтая фатакопія была накіраваная Зуземілем у архіў Беларускай гімназіі ў Вільні. Улічваючы тое, што ліст меў чыста прыватны характар і ніякім чынам не мог быць карысным кіраўніцтву гімназіі ў вырашэнні прафесійных задач, не выключаецца магчымасць наўмыснай правакацыі Зуземілем беларускага руху з мэтай выклікаць супраць яго рэпрэсіі з боку польскіх уладаў. Ва ўсялякім разе, польскія ўлады захавалі перахопу дадзенага ліста сапраўды паднялі пытанне аб нямецкай агентуры сярод беларускіх дзеячаў на тэрыторыі Рэчы Паспалітай, хоць і не змаглі знайсці нейкага лагічнага тлумачэння дзеянням Зуземіля.

Разгубленасць супрацоўнікаў спецслужбаў у поўнай меры характарызуе абцякальная фраза з рапарту, што «падкрэсленне ў яго (Пачопкі. – **А. П., А. Ч.**) лісце сваёй цяжкой фінансавай сітуацыі наводзіць на пэўныя дапушчэнні, якія, аднак, вельмі цяжка дакладна скрышталізаваць». Тым не менш, віленскі гарадскі староста абавязваўся «ўзмацніць выведку, каб устанавіць, ці іншыя беларускія арганізацыі і інстытуцыі атрымалі падобныя лісты з Кёнігсбергу», а таксама «ўзмацніць

18. Фатакопія ліста Зуземіля Пачопкі з подпісам і зваротным адрасам Зуземіля, складзеная польскай цэнзурай пасля перахопу ліста ў Берліне (Польшча), фонд Міністэрства замежных спраў 1918–1939 гг., сыгн. 5290a, a. 39–42.

нагляд над карэспандэнцыяй, якая прыходзіць з Нямеччыны, выкарыстоўваючы дадзеныя старостам паўнамоцтвы ў дачыненні да антыдзяржаўных друкаў».

Мы не маем дастаткова крыніц для таго, каб дакладна сцвярджаць, чым займаўся Зуземіль у Нямеччыне пасля прыходу да ўлады Нацыянал-сацыялістычнай партыі. Аднак падаецца вельмі верагодным, што былы службовец прэс-бюро знайшоў сваё месца і ў III Рэйху. Пра гэта могуць сведчыць погляды Зуземіля на расавую праблему, якія ў найбольш выразнай форме былі выказаныя яшчэ 15 красавіка 1924 г. у адкрытым лісце да В. Ластоўскага на нейтральную, на першы погляд, тэму «Што ўяўляюць з сябе так званыя ільменскія славяне?». Ліст быў падпісаны псеўданімам «Amicus rerum historiarum Crivitschorum» і ў ім сцвярджалася, што

за апошнія гады пытанне аб расах зрабіла ва ўсіх краінах, а асабліва ў Нямеччыне, вялікую эвалюцыю. Прыкметай народнасці цяпер у Нямеччыне прынята лічыць не мову і не рэлігію, а выключна расавую прыналежнасць… Над гэтай праблемай варта яшчэ вельмі моцна папрацаваць беларускім дзеячам. Расавая праблема, калі яна будзе правільна вырашаная, калі з гэтага рашэння будуць зробленыя лагічныя практычныя высновы, паставіць усю крывіцкую палітыку на зусім новую базу і адчыніць крывіцкім дзеячам зусім новыя гарызонты.

Як бачым, у сваім звароце Э. Зуземіль фактычна сфармуляваў ідэалагічныя падставы беларускага нацыянал-сацыялізму, прытым адразу пасля т. зв. «піўнога путчу» ў Нямеччыне!

Пакуль не выяўленыя звесткі, што Зуземіль нейкім чынам спрычыніўся да практычнага завяршэння фармавання пранямецкай плыні ў беларускім нацыянальным руху ў 30-я гг. XX ст. Апошняй да гэтай пары выяўленай праявай ягонай дзейнасці на беларускай ніве з'яўляецца паштоўка да Пачопкі, высланая, хутчэй за ўсё, у 1938 г., у якой памерлы ў снежні 1937 г. нямецкі генерал Людэндорф называўся «тварцом радзіміцкага руху».

Тым не менш, улічваючы характар ранейшай дзейнасці Э. Зуземіля, нельга выключаць, што ён меў нейкае дачыненне да стварэння, напрыклад, Беларускай нацыянал-сацыялістычнай партыі Фабіяна Акінчыца або т. зв. «Беларускай пляцоўкі даверу» ў Берліне пад кіраўніцтвам князя Лявона Сапегі. Бясспрэчна, у любым выпадку, што роля Зуземіля ў ажыццяўленні нямецкага ўплыву на беларускіх дзеячаў у міжваенны перыяд была значная.

У чэрвені 1939 г. пад кіраўніцтвам прафесара А. г. Мендэ з Берліна, нямецкага чыноўніка з ведамства Розенберга, адбываеццца Усебеларуская нацыянальная канферэнцыя, якая, па сутнасці, мела на мэце стварэнне пранямецкай партыі беларускіх асяродках з разлікам на хуткі збройны канфлікт на Еўропе. Мендэ, у прыватнасці, заявіў, што нямецкі ўрад акажа падтрымку беларусам у барацьбе з Польшчай, ССРС і іх саюзнікамі з краінамі Балтыі за ўласную незалежнасць[19]. Прозвішча Зуземіля не згадвалася сярод арганізатараў самой канферэнцыі, аднак гэта ўжо не мела вялікага значэння. На першы план у перыяд беларуска-нямецкіх адносінах выходзілі новыя асобы, а падмурак гэтых адносін быў закладзены іх папярэднікамі, у тым ліку і Эдмундам Зуземілем.

19. Сакалоўскі Ул. Ці хочуць беларусы Уласнай Дзяржавы? Нямецкія планы ўтварэння Беларускай Самастойнай Дзяржавы ў 1939 г. // Беларускі Гістарычны Агляд. Т. 1. Сш. 1. Мінск, 1994. С. 9.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 4 (38) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [mk]. Абнаўленьне [czyk].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/07
[image]

ГЕОРГІЙ НАВІЦЫЯН
магістар міжнародных дачыненьняў Цэнтральнаэўрапейскага ўнівэрсытэту ў Будапэшце, Вугоршчына (1998). Друкаваўся ў часопісах «ARCHE» і «Спадчына», сталы аўтар Беларускай энцыкляпэдыі. Даследчыя інтарэсы ўключаюць сучасныя міжнародныя адносіны, раньнесярэднявечную гісторыю Беларусі, антычную цывілізацыю.

Георгій Навіцыян Перадумовы ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага ў святле ўзаемадзеяння Рыма і варвараў у I–VI стст.

Беручыся за гэтую невялічкую працу, шаноўнаму чытачу давядзецца ізноў сутыкнуцца са спробай даследавання перадумоў утварэння Вялікага Княства Літоўскага. Спробы такія ёсць справай даволі няўдзячнай. Паколькі тэма дадзеная распрацавана ў гістарычнай навуцы вельмі падрабязна і многія гісторыкі і людзі іншых заняткаў маюць на яе вельмі рэзка акрэслены пункт гледжання, любому новаму выказванню звычайна наканаваны няўдзячны лёс: у адных выпадках яно проста праходзіць незаўважаным сярод безлічы іншых меркаванняў, у іншых – жорстка крытыкуецца з самых розных навуковых ці палітычных пазіцый. Тым не менш, пытанне ўтварэння ВКЛ ёсць невычарпальным нават само па сабе ў сілу сваёй складанасці і цікавасці. Калі ж улічыць, што яно ўтрымлівае ключ да разумення многіх наступных стагоддзяў гісторыі краін, што ўваходзілі ў яго склад, і нават іх суседзяў,

то становяцца зразумелымі бясконцыя спробы гісторыкаў да асэнсавання гэтай тэмы. Таму папросім у чытача індульгенцыі за спробы прапанаваць яму разважанне над тым, што ён і сам, магчыма, рупліва вывучаў. Наша работа не мае імкнення зрабіць поўны аналіз паходжання і ўтварэння ВКЛ. Яна не прэтэндуе на абвяржэнне ці ўдасканаленне існуючых на гэты конт агульных тэорый. Яна толькі спрабуе падаць іншы погляд на асобныя аспекты гэтага гістарычнага працэсу і дазволіць пабачыць добра вядомыя і грунтоўна даследаваныя рэчы ў іншым ракурсе.

Перш за ўсё, паколькі, паводле нашага трывалага меркавання, гістарычны працэс у грамадстве развіваецца пераважна ў палітычных формах, мы пакінем убаку этнічныя і іншыя фактары працэсу як другасныя. Гэта дазволіць нам пазбавіцца многіх неістотных дэталяў, якія зацямняюць ход падзей, і засяродзіцца на агульных заканамернасцях, якія дапамогуць аднавіць вялікую панараму.

Па-другое, ідучы ў рэчышчы палітычнай гісторыі, вызначымся з колам дзейных палітычных суб'ектаў. Пры гэтым мы выкарыстаем шырокі падыход і не будзем абмяжоўвацца рэгіёнам Панямоння як калыскай ВКЛ. Нават у часы сярэднявечнай дробнасці маленькія ваяўнічыя дзяржавы ніколі не складаліся ў простую арыфметычную суму, а ў сукупнасці дзейнічалі як пэўная сістэма, хай сабе рыхлая і кепска структураваная. Таму падзеі ў Панямонні спараджаліся фактарамі, якія ўзнікалі далёка за межамі рэгіёну. Працэсы ж, якія там адбываліся, рабілі далёкасяжны ўплыў. Адпаведна, мы будзем звяртаць увагу не толькі на Літву, Ятвязь, панямонскія старажытнарускія землі і Полацкае княства, але і на Смаленскую і Тураўскую землі, Валынь, Польшчу, крыжакаў у Падзвінні, падуладных Полацку ліваў, латгалаў і земгалаў. У якасці галоўных суб'ектаў працэсу мы вылучым з, так бы мовіць, балцкага боку Літву і Ятвязь, са старажытнарускага – Полацкую, Смаленскую, Тураўскую і Валынскую (разам з яе панямонскімі ўладаннямі) землі. Абмовімся асобна, што пералічаныя старажытнарускія землі мелі падобны палітычны і грамадскі лад і знаходзіліся ў параўнальным знешне- і ўнутрыпалітычным становішчы, што і прыцягнула іх да працэсу

ўтварэння ВКЛ.

Па-трэцяе, зыходзячы з пастулату аб цыклічнасці і паўтаральнасці гісторыі, мы будзем параўноўваць нашу сітуацыю з іншымі падобнымі працэсамі сусветнай гісторыі. Аналогіі з іншымі падзеямі дапамогуць нам лепей прасачыць логіку падзей і вылучыць заканамернасці сярод мноства фактаў. Асноўнай аналогіяй будзе параўнанне працэсу ўтварэння ВКЛ як узаемадзеяння старажытнай Русі і Літвы з узаемадзеяннем паміж Рымскай імперыяй і варварамі, якое прывяло да ўтварэння варварскіх каралеўстваў, што спалучалі ў сабе рымскія і германскія элементы.

Па-чацвёртае, мы не будзем кідацца ў вір падзей XIII ст., у якіх ВКЛ і выкрышталізавалася. Паколькі нашай задачай ёсць даследаванне *перадумоваў* утварэння ВКЛ, то мы засяродзімся на падзеях XII ст., якія гэтаму ўтварэнню і папярэднічалі. Даследуем карані, каб лепей разумець шаты. На першы погляд, гэта можа падацца дзіўнаватым. Гэта выглядае як дэтэктыў з ужо ўсім вядомым канцом, бо такія падзеі XIII ст., як узвышэнне Міндоўга, барацьба з крыжакамі, паступовае праяўленне абрысу будучай Беларусі, дрэйф земляў Русі ў розныя бакі пасля ваенных катастроф сярэдзіны стагоддзя, даследчыкамі апісаныя вельмі падрабязна. Прыгледзеўшыся, мы заўважым, што падабенства да канчатку дэтэктыва сапраўды прысутнічае. Мы бачым герояў і ў асноўных рысах ведаем іх учынкі, але карані і матывы іх дзеянняў вядомыя слаба, бо захапіўшыся развязкай падзей, тыя, хто даследаваў XIII ст., значна менш увагі звярталі на іх завязку. Досыць часта робяцца спробы асэнсаваць найважнейшыя працэсы грамадскага развіцця ў XIII ст. зыходзячы з семантычнага тлумачэння пэўнай фразы ў летапісе і звесці іх да механічнага набору асобных ваенных і палітычных падзей, якія ў выніку склаліся пэўным чынам, але пад уплывам выпадковых фактараў маглі скласціся цалкам адрозна, як шкельцы ў калейдаскопе. Гісторыя набывае выпадковы і суб'ектывізаваны характар, залежны ад адвольных учынкаў дзейных асоб і збегу абставін. Будучы аддаленымі на светлавыя гады ад гістарычнага дэтэрмінізму, мы ўсё ж мусім прызнаць, што падзеі XII ст. ужо праторылі рэчышчы, у якіх персанажам XIII

ст. даводзілася дзейнічаць, і да пэўнай ступені прадвызначылі лініі іх паводзін. Таму будзем ласкава прасіць чытача не крыўдаваць на нас за незавершанасць нашага дэтэктыва. Справа гэтая была зроблена яшчэ да нас, і мы толькі спрабуем трошкі дапамагчы майстрам канчатка разабрацца з завязкай.

Як мы і абяцалі, пачнём з палітычных працэсаў, якія мелі месца ў старажытнай Русі ў XII ст. Асноўным працэсам у Полацкім княстве і Кіеўскай дзяржаве было іх драбленне на асобныя ўдзелы. Полаччына распалася на шэраг удзелаў. З Кіеўскай дзяржавы выдзеліліся Смаленская і Тураўская землі, з якіх у меншай ступені Смаленшчына і ў большай Тураўшчына таксама зведалі працэс драблення. З'ява гэтая адбывалася цалкам натуральна і нагадвала працэсы ў іншых краінах Еўропы. Развіццё дзяржаўнай інфраструктуры на прасторах Русі рабіла магчымым і мэтазгодным аўтаномію асобных земляў у супрацьвагу вялізным і няўклюдным раннесярэднявечным дзяржавам, якія страцілі эфектыўнасць і не адпавядалі запытам грамадства. Поспехі мясцовай гаспадаркі ў спалучэнні з яе натуральным характарам стваралі эканамічны падмурак самадастатковасці асобных земляў. Аб'ектыўныя памкненні земляў да самастойнасці знаходзілі прыхільную рэакцыю з боку князёў. Ранейшая сістэма часовага прызначэння князя для кіравання асобнай зямлёй з наступнай ратацыяй рабіла іх становішча вельмі нетрывалым і ненадзейным. Укняжанне ў асобнай зямлі і магчымасць перадачы свайго стала ў спадчыну значыла замацаванне іх статусу і задавальненне асабістых амбіцый. Спалучэнне аб'ектыўных патрэб земляў і суб'ектыўных імкненняў князёў прывяло да распаду Полацкага княства і Кіеўскай дзяржавы і замацавання на мясцовых пасадах асобных дынастый. Войны за адасабленне склалі значную частку падзей палітычнай гісторыі. На этапе заваявання самастойнасці ад сваіх былых цэнтраў (адпаведна, Полацка і Кіева) унутрыпалітычнае становішча розных полацкіх удзелаў, Смаленскай і Тураўскай земляў характарызаваліся супадзеннем інтарэсаў князя, мясцовай знаці ды паспольства і адсутнасцю вялікіх канфліктаў паміж імі. Ваенныя акцыі звычайна праходзілі пры актыўным удзеле паспалітага рушэння. У гэтай сувязі дастаткова прыгадаць мужную абарону Глебам Усяславічам Менска ад

паўднёварускіх войскаў у 1104 і 1117 гг., якая не магла ажыццяўляцца без падтрымкі насельніцтва, народную падтрымку ваенных мерапрыемстваў Расціслава Мсціславіча Смаленскага ці сумеснае адстойванне Юр'ем Яраславічам і тураўцамі незалежнасці сваёй зямлі ў 1158 г.

Але сітуацыя неўзабаве змянілася. Замацаванне асобных адгалінаванняў Рагвалодавічаў і Рурыкавічаў на мясцовых стальцах прывяло да таго, што князі пачалі разглядаць свае землі як «вотчыны», то бок як нейкую дадзенасць, якой вольна было распараджацца паводле свайго жадання. Князі пераставалі разглядаць сябе як урадоўцаў, пастаўленых да ўлады са згоды паспольства зямлі дзеля абароны яе інтарэсаў. Дзяржаўны апарат у асобе князёў і іх дружын набываў самадастатковасць і пераследаваў, у першую чаргу, свае ўласныя інтарэсы. Гэтая тэндэнцыя знайшла выражэнне ў бясконцых войнах паміж князямі з мэтай перараэмеркавання ўдзелаў, памнажэння сваёй магутнасці і ўплыву, набыцця матэрыяльных каштоўнасцяў. Міжкняжацкая барацьба набыла пераважна дынастычную форму. Гэта значыць, змаганне ішло за інтарэсы княжацкіх сем'яў, а не земляў. Прэтэнзіі на той ці іншы пасад грунтаваліся на прынцыпах старшынства ці спадчыннасці, абумоўленых не інтарэсамі зямлі, а асабістымі роднаснымі адносінамі паміж адгалінаваннямі княжацкіх родаў. Саюзы паміж князямі часта заключаліся ў форме дынастычных шлюбаў, што ізноў пры вызначэнні напрамкаў знешняй палітыкі прыводзіла да перавагі асабістых сувязяў над грамадскімі інтарэсамі. У выніку, палітыка на Русі набыла характар найскладанейшага хітраспляцення саюзаў і варожасці паміж шматлікімі адгалінаваннямі княжацкіх родаў. Другараднага канфлікту з-за перыферыйнага горада магло быць дастаткова, каб дэстабілізаваць усю палітычную сістэму Русі з непрадказальнымі наступствамі.

Важным фактарам, які дазваляў князям весці сваю палітыку такім адвольным і эгаістычным чынам, было набыццё імі пэўнай эканамічнай самастойнасці. XII ст. было часам росту княжацкай «вотчыны» ў вузкім сэнсе гэтага слова. Калі пад «вотчынай» у шырокім сэнсе разумелася ўся падуладная князю зямля, якой ён кіраваў паводле спадчыннага прынцыпу,

«вотчына» ў вузкім сэнсе зводзілася да дамену князя. Дамен быў княжацкай уласнасцю, а статус ягоных насельнікаў ужо насіў рысы асабістай залежнасці ад князя. Такім чынам, у дамене ўжо можна ўбачыць зародак феадальнай будовы грамадства, якая атрымала развіццё ў пазнейшыя стагоддзі.

Існавалі розныя шляхі ўзнікнення княжацкага дамену і яго далейшага росту. Першапачатковы дамен, відаць, уяўляў сабой абшчынную зямлю, дадзеную князю дзеля пракорму яго і ягонай сям'і, як гэта было ў Смаленскай зямлі. Далей ён мог пашырацца як мірным, так і гвалтоўным шляхам. Першы палягаў у асваенні ці набыцці незанятых земляў, якіх пры невялікай шчыльнасці насельніцтва на Русі было шмат. Меншую, але таксама важную ролю адыгравала гвалтоўнае пашырэнне дамену, што таксама добра прасочваецца на прыкладзе Смаленскай зямлі. Адным спосабам гвалтоўнага пашырэння было прыўлашчванне князем заваяваных земляў. Значная частка дамеяіяльных уладанняў смаленскіх князёў знаходзілася ў землях паўночных радзімічаў, захопленых Расціславам Мсціславічам у чарнігаўскіх Ольгавічаў. Для замацавання гэтых земляў за сабой смаленскі князь заснаваў там гарады Імсціслаў (Мсціслаўль) і Рослаўе (Расціслаўль). Як можна выснаваць на падставе Статута Расціслава 1136 г., княжацкі дамен развіваўся і ў цэнтральнай частцы Смаленскай зямлі. Гэты працэс адбываўся ўжо іншым спосабам – спосабам гвалтоўнага падпарадкавання сабе вольных абшчыннікаў. Менавіта аб такіх дзеяннях кажа ў сваім пасланні мітрапаліт Клімент Смаляціч: «Да скажю ти сущих славы хотящих, иже прилагают дом к дому и села к селом, изгои же и сябры, и бърти, и пожни, ляда же и старины». Дамены пашыраліся і на іншых старажытнарускіх землях, аб чым кажа адзначанае ў іпацьеўскім летапісе дараванне ўдавой Глеба Усяславіча Анастасіяй Яраполкаўнай Кіева-Пячэрскаму манастыру пяці сёлаў з людзьмі.

Маюць рацыю тыя даследчыкі, якія кажуць аб нязначнасці княжацкага землеўладання ў агульнай карціне грамадскага ладу Русі XII ст. Усё ж, нават і на нязначнай ступені развіцця дамен быў у стане забяспечыць пэўную эканамічную самастойнасць князя ад знаці і паспольства падуладнай яму

зямлі, каб праводзіць сваю палітыку без аглядкі на іх думку. Варта таксама кінуць хуткі позірк на прыроду даменіяльнай гаспадаркі і мэты, якім яна служыла. Як высвятляецца, асноўнай галіной даменіяльнай гаспадаркі была жывёлагадоўля, і больш спецыфічна конегадоўля, якая развівалася вельмі шпаркімі тэмпамі ў параўнанні з земляробствам. Войны «бес перестани» патрабавалі зброі і коней. Князям давялося заняцца конегадоўляй для ваенных патрэб. Выснова гэтая адкрывае нам сапраўднае значэнне развіцця княжацкага дамену ў XII ст. і ўнёсак, які яно зрабіла ў палітычную і ваенную гісторыю. Дамен быў часткова народжаны вайной і для вайны ж і выкарыстоўваўся. Папросту кажучы, уласная гаспадарка князёў стала іх своеасаблівым ваенна-прамысловым комплексам, які дазваляў ім эканамічна падтрымліваць свае ваенныя мерапрыемствы і пастаўляў ім некаторыя віды неабходных рэсурсаў, у прыватнасці, баявых коней. З'яўленне і пашырэнне княжацкіх даменаў было адным з фактараў, якія далі князям магчымасць распачынаць войны на ўласны страх і рызыку. Не дзіўна, што гісторыя XII ст. была насычаная вялікімі і малымі войнамі настолькі, што любы яе пераказ нязменна заблытвае нашчадкаў у гушчары падзей і робіць вельмі цяжкім адсочванне іх асноўных ліній.

Тым часам, занятыя міжусобнымі войнамі і звадамі князі адарваліся ад сваіх земляў ва ўсіх сэнсах гэтага слова. Набыўшы самастойнасць ад грамадства, яны ў той жа час сталі гэтаму грамадству менш патрэбнымі, але страта пачуцця рэчаіснасці не дазволіла ім гэта хутка зразумець. Калі ў XI ст. у сваіх памкненнях да стварэння завершанай і эфектыўнай сістэмы палітычнай арганізацыі грамадствы Полацкага княства і Кіеўскай дзяржавы звярталіся да князёў і дружын, то ў XII ст. засяроджванне князёў на міжусобных войнах вымусіла грамадства асобных земляў да развіцця інстытуту самакіравання ў выглядзе адноўленага веча. Стары-новы палітычны інстытут, які чакаў князёў па іх вяртанні дадому з бясконцых войнаў, часта быў для іх непрыемным сюрпрызам. Не адзін князь зведаў на сабе цяжкую руку народнага прадстаўніцтва.

Веча XII ст. было спадкаемцам народных сходаў перыяду

ваеннай дэмакратыі, але ўжо далёка не ўяўляла сабой сходу ўсіх вольных і ўзброеных мужчын дадзенага грамадства. Яно мела характар ужо не агульны, а прадстаўнічы. Тэрытарыяльная арганізацыя грамадства проста фізічна не дазваляла ўсім вольным абшчыннікам, раскіданым па вялізных абшарах, браць удзел у прыняцці рашэнняў. Фактычна абмеркаванне і вырашэнне надзённых справаў абмяжоўвалася насельніцтвам стольнага горада зямлі, якому абавязаныя былі падпарадкоўвацца і іншыя гарады зямлі, званыя прыгарадамі. Больш за тое, даследаванні паказваюць, што памер тых плошчаў, на якіх праводзіліся зборы веча ў рускіх гарадах, не дазваляў сабраць там нават усіх мясцовых жыхароў. Гэта вядзе нас да думкі, што веча складалася толькі з прадстаўнікоў канцоў ці іншых тэрытарыяльных адзінак гораду, якія і мусілі выражаць волю агульнай масы грамадства. Іншым пытаннем было, наколькі яны гэтую волю сапраўды выражалі. Даследчыкі разыходзяцца ў ацэнках сацыяльнага характару веча, але мы выкажам асцярожнае меркаванне, што вечавыя прадстаўнікі ў асноўным паходзілі з верхніх слаёў грамадства. Гэта была земская знаць, якая вяла сваё паходжанне ад старой родавай невайсковай знаці, старэйшыя дружыннікі, якія з нейкіх прычын разарвалі сувязі з княжацкай службай, а таксама разбагацелыя гандляры і рамеснікі. Калі мы маем рацыю, то веча мела характар да пэўнай ступені арыстакратычны. Веча было формай альтэрнатыўнай арганізацыі грамадства ў супрацьвагу княжацкай уладзе. Арыстакратычны ж яго характар яшчэ і ўзмацняў супярэчнасць з княжацкай уладай, што імкнулася да самаўладства. Аднаўленне веча дало магчымасць земскай знаці ўзяць рэванш за сваю паразу на досвітку дзяржаўнасці.

Магчымасць была тым больш рэальнай, што інтарэсы большасці грамадства заўважна разыходзіліся з княжацкімі. Занятыя ўласнымі інтарэсамі князі хацелі ваяваць. Рэшта люду хацела мірна займацца ўласнай справай. Зазначым, што ўжо ў XI ст. індывідуальныя межы свету для чалавека звузіліся ў параўнанні з рамантычным перыядам IX–X стст., калі жыхары, напрыклад, цяперашніх беларускіх земляў хадзілі з ваяўнічымі нарманскімі конунгамі на Візантыю і Каспій. Пра XII ст. мы можам сказаць, што свет з пункту гледжання асобнага чалавека

сціснуўся яшчэ больш да памераў адной зямлі ці нават маленькага ўдзельнага княства. Развіццё натуральнай гаспадаркі дазваляла большасці насельніцтва забяспечваць сваё існаванне, не пакідаючы далёка родныя мясціны. Вядома, усюдыісныя гандляры па-ранейшаму везлі тавары ў далёкія краіны, але яны больш не бралі на сябе функцыі рабаўнікоў і заваёўнікаў, як тое было за нарманамі. Вайна шкодзіла і натуральнай гаспадарцы, і гандлю. Ваенныя дзеянні знішчалі вёскі і нівы. Палітычныя ўскладненні пагражалі гандлёвым аперацыям. У гэтым сэнсе паказальныя падзеі 1161 г. Выгнанне з Ноўгарада князя Святаслава Расціславіча штурхнула ягонага бацьку Расціслава Мсціславіча Смаленскага, які ў той час княжыў у Кіеве, на рэпрэсіі супраць наўгародскіх гасцей у адказ. «И повеле изоимати Новгородци и оуметати е оу Пересеченьскыи погребъ и въ одину ночь оумре ихъ 14 мужи» (Іпацьеўскі летапіс). Можна ўявіць, наколькі натхняла купцоў да вядзення справаў перспектыва ў адну ноч нечакана сканаць у халодным склепе на чужой зямлі з-за недарэчных палітычных перыпетый!

У веча, якое складалася з такіх гандляроў ці прадстаўляла іх, былі важкія падставы быць незадаволеным бесперапыннымі княжацкімі войнамі. Між тым, нягледзячы на далейшую прафесіяналізацыю вайны, разлічваць на перамогі ў значных кампаніях сіламі адной толькі дружыны без удзелу паспалітага рушэння князі не маглі. Адпаведна, яны мусілі перакладаць не толькі пасіўную, але і актыўную нагрузку вядзення ваенных дзеянняў на плечы шырокіх мас насельніцтва, што спараджала шматлікія канфлікты паміж князем і вечам. Вядома ж, многія з гэтых канфліктаў дыктаваліся прычынамі выключна ўнутранымі, а не знешнепалітычнымі. Але мы засяродзімся якраз на апошніх.

Як гэта адбывалася з многімі іншымі тэндэнцыямі гістарычнага развіцця, першай з земляў Русі гэтую сцяжыну выпрабавала Полацкая зямля. Пазнейшыя беларуска-літоўскія летапісы XVI ст. адносяць узнікненне моцнага веча на Полаччыне да часоў князя Барыса. «И пануючы ему в Полоцку был ласкав на подданные свои и дал им волность вечем ся судити и в звон звонити, и по тому ся справовати, як у Великом Новегороде и

Пъскове». Звесткі гэтыя могуць быць праўдзівыя, бо ў пэўнай ступені засноўваюцца на вуснай фальклорнай традыцыі, якая магла данесці да нашчадкаў даволі дакладнае ўяўленне аб інстытуце народнага прадстаўніцтва. Першым зафіксаваным выпадкам канфлікту паміж полацкім князем і вечам былі ўжо вядомыя нам падзеі 1128 г., калі палачане «выгнаша» князя Давыда Усяславіча пад пагрозай наступу кіеўскіх войскаў. Нагодай для гэтага магла быць неразважлівая антыкіеўская палітыка Давыда, які не ўлічыў перавагу сілаў Кіеўскай дзяржавы над Полацкам і такім чынам падставіў зямлю пад удар варожых войскаў.

Наступным разам веча выявіла сваю незадаволенасць князем у 1151 г., калі палачане «яша… Рогъволода Борисовича князя своего и послаша Меньску». Рагвалод быў жанаты з дачкой Ізяслава Мсціславіча Кіеўскага, і менавіта ў 1151 г. княжанне апошняга апынулася пад пагрозай нашэсця Юрыя Даўгарукага і Святаслава Ольгавіча Чарнігаўскага. Такім чынам, адной з прычынаў падзення Рагвалода была яго невыгодная для Полацка знешнепалітычная лінія, арыентаваная на кіеўскіх Манамахавічаў.

Падобны лёс чакаў і яго стрыечнага брата Расціслава Глебавіча Менскага, суперніка і пераемніка Рагвалода на полацкім стальцы. Абставіны страты ім полацкага княжання і роля ў іх ваеннага фактару заслугоўваюць асобнага разгляду. Як вядома, у 1158 г. у Полацку адбыўся мяцеж супраць Расціслава, які скончыўся ягонымі ўцёкамі ў Менск і аднаўленнем на полацкім стале Рагвалода Барысавіча. Але летапіс не кажа, з якой прычыны палачане задумалі злое супраць Расціслава. Паспрабуем супаставіць мяцеж з іншымі тагачаснымі падзеямі полацкай гісторыі. У тым жа 1158 г. палачане ў складзе вялікай кааліцыі хадзілі ў паход на Тураў супраць Юрыя Яраславіча. Самая працяглая аблога ў гісторыі старажытнай Русі, якая цягнулася дзесяць тыдняў, скончылася нічым. Пачаўся мор сярод коней, і саюзнікам давялося разысціся па дамах. Пры апісанні гэтых падзей летапіс асабліва вылучае палачан, якія падзялілі дрэнную славу рабаўнікоў і марадзёраў з качэўнікамі-бярэндзічамі. Бярэндзічы паваявалі мясцовасць ля Пінска і забраліся за Прыпяць. «Полчане пришедше к Турову

пожгоша села около его». Відаць, «подзвігі» іншых удзельнікаў паходу параўнацца з гэтым не маглі, бо летапіс пра іх не згадвае. Чаму ж менавіта палачане аказаліся найбольш жорсткім кантынгентам у саюзным войску? Адказ можа палягаць у тым простым меркаванні, што мэты паходу пасавалі ім менш за ўсіх іншых удзельнікаў. Полацкае княства не мела рэальных інтарэсаў на Тураўшчыне. Увесь паход мог ажыццяўляцца з мэтай пашырэння менскіх уладанняў Расціслава і Валадара Глебавічаў, якія межавалі з Тураўшчынай, альбо з надзеяй на ваенную здабычу, большая частка якой непазбежна дасталася б таксама Расціславу. Для полацкага рушэння ўдзел у гэтай авантуры сэнсу не меў. Наадварот, стаянне пад горадам на працягу 10 (!) тыдняў у эпоху, калі вынік гаспадарчага сезону і самае эканамічнае выжыванне люду часта залежалі ад кароткага прамежку часу, нанесла палачанам сур'ёзную шкоду, якую яшчэ ўскладніла і вопадзь коней. Натуральна, што рабункам Тураўшчыны яны імкнуліся кампенсаваць свае страты і даць выйсце свайму шалу. Па вяртанні дадому шал гэты звярнуўся супраць Расціслава, як завадатара ўсёй авантуры. Бессэнсоўны і няўдалы паход каштаваў князю стальца.

Падобныя з'явы бачым мы і ў Смаленскай зямлі, хаця веча было там заўважна слабейшым за полацкае і выйшла на палітычную арэну пазней. Першай яго праявай стала звяржэнне са смаленскага стала Яраполка Раманавіча ў 1174 г. і замена яго Мсціславам Расціславічам. Цікавай праявай нязгоды смалянаў з княжацкай палітыкай быў славуты бунт смаленскага войска ў 1185 г. супраць Давыда Расціславіча ля Трэполя ў паходзе дзеля абароны поўдня Русі ад полаўцаў. Падабенства паводзін войска да практыкі народнага самакіравання, як яно ажыццяўлялася ў самім Смаленску, падкрэсліваецца словамі летапісца аб тым, што «Смолняне же почаша вече деяти». Пажаданні смалянаў зводзіліся да патрэбы засяродзіцца на ўнутраных справах зямлі і іх незацікаўленасці ў паўднёварускіх справах, няхай сабе і такіх традыцыйна важных, як абарона Русі ад полаўцаў. «Мы дошли до Киева, даже бы была рать, билися быхом, нам ли иное рати искати, то не можем, ауже ся есмы изнемогле» (Іпацьеўскі летапіс). Гучныя скаргі смалянаў дасягнулі княжацкага вуха, і паход быў спынены. Як змяніўся

час! У 1095 г. смаляне без асаблівых ваганняў далі вояў прышламу чарнігаўскаму князю Алегу Святаславічу для адваявання далёкай Мурамшчыны. Праз дзевяноста гадоў яны ўзбунтаваліся супраць свайго спадчыннага князя, каб не ўдзельнічаць у абароне Русі ад полаўцаў, якая лічылася несумненным грамадзянскім і рэлігійным абавязкам для жыхароў былой Кіеўскай дзяржавы. Кантраст гэтага ўчынку смалянаў з ранейшым часам асабліва падкрэсліваецца тым фактам, што неабходнасць у іх далейшым руху на полаўцаў на паратунак Пераяслаўлю была выкліканая страшэннай паразай Ігара Святаславіча, якая зрабіла ашаламляльнае ўражанне на сучаснікаў. Аднак мясцовыя інтарэсы і антываенныя настроі для смалянаў пераважылі ўсе іншыя меркаванні.

Нейкі сур'ёзны канфлікт паміж Давыдам Расціславічам і смаленскім вечам адбыўся ў 1186 г., калі «въстань бысть Смоленьске промежи князьмь Давыдомь и смолняны, и много головъ паде луцьшихъ муж». Невядома, ці мела гэтае супрацьстаянне цікавыя для нас ваенныя ці знешнепалітычныя карані, але праз дзесяць гадоў смаляне дакладна выявілі незадавальненне ваеннымі акцыямі Давыда. У 1196 г. пасля прайгранай бітвы за Віцебск палонныя смаляне расказалі чарнігаўцам, што «братья их не добре с Давыдом». Як бачым, і смаляне праз веча як прадстаўнічы інстытут выказваліся на карысць засяроджвання на мясцовых справах і асцярожнай знешняй палітыкі, арыентаванай на захаванне бяспекі Смаленскай зямлі. Праз гэта яны ўступалі ў канфлікт з князямі, якія імкнуліся да агрэсіўнай і часам авантурнай знешняй палітыкі. Канфлікты гэтыя набывалі вострыя формы беспарадкаў і бунтаў, хаця такой вастрыні, як у Полацкай зямлі, на Смаленшчыне яны не дасягнулі.

Такім чынам, становішча, якое склалася на землях Русі да канца XII ст., можа быць ахарактарызавана як палітычны крызіс. Крызіс гэты быў выкліканы спадчынным замацаваннем княжацкіх дынастый на сталах асобных княстваў і земляў і правядзеннем імі своекарыслівай і агрэсіўнай дынастычнай знешняй палітыкі, якая ішла ўпоперак інтарэсаў земскай знаці і шырокіх слаёў грамадства. Такая палітыка ставіла пад пагрозу знешнюю бяспеку старажытнарускіх земляў і выклікала

шматлікія ўнутраныя пратэсты. Неабходна сказаць, што крызіс гэты сам па сабе не насіў усёабдымнага характару і не пагражаў паралюшам усёй палітычнай сістэмы. Хутчэй, ён меў «верхавінкавую» прыроду і зводзіўся да адрыву кіроўнага ваенна-дружыннага слою на чале з князямі ад інтарэсаў паспольства і фактычнага правалу ў выкананні гэтым слоем сваіх функцый абароны грамадства. У большай ступені крызісныя з'явы закранулі Полацкую зямлю, у меншай – Смаленскую і Тураўскую. Цяжка не пагадзіцца з выказаным на гэты конт меркаваннем В. Е. Данілевіча.

Міжкняжацкая палітыка за ўвесь гэты перыяд можа быць ахарактарызавана як палітыка эгаізму; найпершы клопат кожнага князя палягаў у павелічэнні ўласных уладанняў, і ўсё прыносілася яму ў ахвяру: земскі мір, сваяцкія сувязі. (…) Высылка ў Царград прымусіла Усяславічаў зразумець усю марнасць барацьбы з кіеўскімі князямі, і па вяртанні з высылкі яны адразу ж змянілі палітыку ў дачыненні да апошніх. Здавалася б, што цяпер яны атрымалі поўную магчымасць зблізіцца з зямлёй і ўмацаваць сваё становішча, але яны і не падумалі пра гэта. Зразумеўшы сваё бяссілле і немагчымасць павялічваць свае ўладанні за кошт суседніх земляў, яны абмежавалі поле сваёй дзейнасці толькі Полацкай зямлёй, але затое цяпер яны напоўніцу выявілі сваю эгаістычную палітыку – імкненне любым коштам павялічыць свае ўладанні. (…) Дарма што змаганне вялося, у асноўным, з дапамогай дружын, але зямля ад яго цярпела, а гэта выклікала ў земстве незадавальненне да князёў, якое яшчэ больш узрастала праз тое, што Усяславічы пастаянна ўцягвалі ў свае ўнутраныя справы іншыя рускія землі. Імкненне да павелічэння ўладанняў даводзіла Усяславічаў да таго, што яны не даражылі нават прыхільнасцю паспольства да іх, а гэта, у сваю чаргу, прывяло да таго, што насельніцтва Полацкай зямлі перастала даражыць сваімі князямі і звыкла да іх замены пры найменшым незадавальненні імі[1].

Сапраўды, старажытнарускае грамадства імкнулася адужаць узніклы крызіс натуральным шляхам маніпуляцыі розныя княжацкімі групоўкамі і адбору з іх найбольш эфектыўных і

[1] Данилевич В. Е. Очерк

паспяховых у выкананні сваіх функцый. Пры іншых Полацкай зямлі да
далёка не катастрафічны крызіс мог быць гэткім чынам
пераадолены. Аднак сітуацыя была больш складанай
прысутнасці знешніх фактараў, якія скарачалі час,
якога дадзеныя праблемы маглі быць вырашаныя
прыцягненнем унутраных рэсурсаў. Ва ўмовах менавіта
знешнепалітычнага аслаблення Полацкай зямлі і
старажытнарускіх земляў такім фактарам было з'яўленне на
знешнепалітычнай арэне рэгіёну новых дзейных сілаў: Літвы і
крыжакоў.

Літва ж і яцвягі ў гэты час таксама перажывалі пэўны
знешнепалітычны крызіс. Пасля шэрагу гучных ваенных
перамог над пскавічамі, лівамі і палачанамі ў 1180-я гг. яны
сутыкнуліся з трывалым супрацівам рускіх земляў і пацярпелі
шэраг параз у 1190-я гг. Літва парвала ланцугі данніцкай
залежнасці ад Русі ў 1183 г., калі «бишася пльсковици съ
Литвою, и много ся издея зла пльсковицемъ». Першая
самастойная кампанія літоўцаў супраць Пскова, ажыццёўленая
праз тэрыторыю Полацкай зямлі, былога гегемона Літвы, была
пралогам для іх далейшых ваенных поспехаў. Каля 1185 г.
надышла чарга і Полаччыны, па якой былыя полацкія даннікі
прайшліся агнём і мячом. Яны не абмяжоўваліся нападамі на
Русь. Зімой 1184–1185 гг. яны, «спустошыўшы Лівонію, вельмі
многіх вывелі ў палон»[2].

Неўзабаве, аднак, пераможнае шэсце балцкіх дружын
землях сустрэла адпор. Князі розных земляў незалежна адзін
ад аднаго ацанілі літоўскую і яцвяжскую пагрозу на
чынам і прымалі захады для яе спынення. Ачуняўшы
палачане ўжо ў 1191 г. уклалі саюз з Ноўгарадам і
паход на Літву, аднавіўшы раўнавагу сілаў. Літоўскую і
яцвяжскую небяспеку добра ўсведамлялі і на поўдні.
у паход на Літву выправіўся Рурык Расціславіч Оўруцкі,
«пошелъ на Литву и бысть в Пинески оу тещи своея
своея, тогда бо бяше свадба Ярополча, и бсть теплоЪ
снегъ и не лзе бо имъ доити земли ихъ и възвратишася
свояси». У 1193 г. Рурык паўтарыў сваю спробу, але
же нелюбьемь рче емоу: «Брате и сватоу, ажь ты идеши
очины своея на свое ороудье, а язъ паки идоу за Днепръ

[2] Хроника Ливонии Генриха Латвийского (Henrici Chronicon Livoniae). I, 5 // Монументы Ливонии, Курляндии и Пруссии XII–XIII вв. Т. I. Рига, 1853. С. 11–12.

Полацкай зямлі да канца XIV ст. // Гістарычны альманах. 2006. № 10. С. 201–202.

деля ороудеи, а в Роускои земли кто ны ся останеть? Тое, што не ўдалося зрабіць Рурыку, ажыццявіў іншы рускі князь. Зімой 1196–1197 гг. валынскі князь Раман Мсціславіч рушыў на яцвягаў «отомьщиваться бяхоуть бо воеваша область его». «И тако Романъ вниде в землю ихъ они же могоучи стати противоу силе его и бежаша во свои тверди а Романъ пожегъ волость ихъ и отомъстився возвратися во свояси». Яшчэ раней Раманаў меч зведала Літва. Але маштаб ягоных дзеянняў супраць балтаў быў нашмат большым, чым простая помста за набег. Раман цвяроза ацэньваў сур'ёзнасць пагрозы з боку ваяўнічых яцвягаў і Літвы. Таму ён не абмяжоўваў свае дзеянні ваеннымі акцыямі, але імкнуўся вырваць самыя карані набегаў і пазбавіць балтаў магчымасці наносіць шкоду яго землям. Перш за ўсё, валынскі князь выводзіў літоўцаў і яцвягаў у палон на землі Паўднёвай Русі. Па-другое, ён сілай саджаў іх на зямлю, прымушаючы займацца сельскай гаспадаркай. З аднаго боку, гэта павінна было адбіць у іх патрэбу да рабаўніцкіх набегаў, з іншага – паставіць іх саміх у прыступнае становішча, бо нівы іх былі гэтак жа адкрытыя для валынскіх войскаў, як валынскія – для літоўскіх і яцвяжскіх. Жорсткае абыходжанне валынскага гаспадара дало такі плён, што літоўская фальклорная традыцыя захавала памяць аб эксперыментах Рамана на многія стагоддзі. У прыватнасці, храніст XVI ст. Мацей Стрыйкоўскі (праўда, блытаючыся ў падзеях і прыпісваючы барацьбу з Літвой Раману Расціславічу Смаленскаму) перадае прымаўку, якая існавала сярод літоўцаў: «Рамане, Рамане! Ліхам сябе корміш, Літвою арэш!»[3]. Звесткі гэтыя пацвярджаюць і перапісчыкі Іпацьеўскага летапісу, характарызуючы Рамана як чалавека, які «Литвою оравъ».

Русь была не адзіным бар'ерам на шляху літоўскіх і яцвяжскіх набегаў. Не лепшым чынам склалася для яцвягаў сітуацыя і на заходнім напрамку. У 1192–1193 гг. супраць іх выступіў польскі кароль Казімір Справядлівы. Цяпер яцвягі, па словах называць польскія хронікі, «паляшане», «народ надзвычай жорсткі, жахлівейшы за любога лютага звера» і слаўныя сваімі набегамі на суседзяў, мусілі цярпець спусташэнне сваіх земляў польскім войскам. Перш за ўсё Казімір накіраваў свой удар на дарагічынскага князя, саюзніка яцвягаў. «Замкнёны у Бельзе Ях,

Тексты, перевод, комментарий. – Москва, 2002. с. 55.

3 Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska, Żmódzka i Wszystkiej Rusi Tom I. Warszawa, 1846. VI, 1.

горада, які з'яўляецца сталіцай княства і называецца202.
Дарагічын, князь аказаўся настолькі ўціснуты нягодамі аблогі, што не толькі здаўся паводле закону, але і прыняў умовы вечнага рабства»[4]. Калі польскае войска ўварвалася затым у яцвяжскія землі, іх насельнікі пахаваліся ў самых цяжкадаступных месцах і не прымалі бітвы. Каб змусіць іх да пакорлівасці, «котлішчы іх Казімір знішчыў паходнямі, рассек ударамі дроцікаў і мячоў, і, пасля таго як усё згарэла, найзнатнейшыя людзі усёй правінцыі паляшан з узнятымі рукамі і нахіленымі шыямі ўпалі да ног Казіміра, молячы пашкадаваць рэшткі радзімы і іх жыццё»[5]. Казімір атрымаў ад яцвягаў запэўненні ў пакорлівасці і абяцанні выплаты даніны і з перамогай вярнуўся дадому.

Як бачым, нягледзячы на некалькі пераможных набегаў у 1180-я гг., поспехі літоўцаў і яцвягаў аказаліся нетрывалымі. Карыстаючыся нязгодамі паміж удзельнымі князямі, яны спустошыць асобныя ўдзелы той ці іншай зямлі. Мекаторак адбылося з Полацкай зямлёй, калі бяздзеянне з боку Брачыслава і Усевалада Васількавічаў прывяло да пагібелі іх брата Ізяслава. Разам з тым, сілаў літоўцаў і яцвягаў відавочна не ставала, каб ажыццявіць паспяховы напад на Полаччыну ці Валынь, калі мясцовым князям удавалася пераадолець свае супярэчнасці і выступіць адзіным фронтам. Больш за тое, набегі правакавалі ўдары польскіх і рускіх правіцеляў у адказ, якія наносілі вялікую шкоду палітычнай магутнасці, эканоміцы і дэмаграфіі балцкіх земляў.

[4] Хрон. 1180-х гг. // Матэрыялы... Ч. 1. С. 39.

[5] Там жа. С. 40.

[6] Гл. напрыклад: Пашуто В. Т. Образование Литовского государства. М., 1959; Насевич В. Л. Балтийские племена в междуречье Немана и Западной Двины. М., 1987; Gimbutas M. The Balts. London, 1963.

Такія ідэалагічныя пабудовы, як сцвярджанне г. Мазаўра 1987 (Gimbutas M. The Balts. London, 1963. P. 127.

дружыннага слою, для якога вайна была асноўным заняткам. Вайна спрыяла нарошчванню дружынай палітычнай магутнасці, эканамічнага дабрабыту і ўрэшце замацоўвала набыццё ёй улады як першага элемента дзяржаўнасці. Рускія землі паставілі на дарозе літоўскай экспансіі той заслон, які мог замарудзіць і працэсы ўнутранага развіцця ў Літве. Ваяўнічыя літоўскія дружыны маглі нанесці вялікія спусташэнні і шкоду Полаччыне, Пскоўшчыне ці Валыні, але не маглі прэтэндаваць на рэальную ўладу над імі. Наяўныя рэсурсы былі занадта малымі для дасягнення гэтай мэты. Калі Літва не магла адужаць Полаччыну і іншыя рускія землі ў сутыкненні наўпрост, то перад яе правадырамі стаяла задача знайсці іншае прымальнае рэчышча для сваёй ваяўнічай энергіі.

Паспрабуем акрэсліць шляхі выхаду з крызіснай сітуацыі, якія адкрываліся перад Полацкай зямлёй, Літвой і іншымі дзяржавамі рэгіёну. Найперш згадаем, што становішча, якое склалася, было далёка не унікальным у гісторыі. Аналагічна чалавецтва ведалі шмат выпадкаў суіснавання паміж дзяржавамі, якія мінулі зеніт сваёй магутнасці, і іх маладымі суседзямі, якія былі толькі на досвітку сваёй дзяржаўнасці. Кароткі позірк на такія выпадкі дазволіць нам скарыстацца пэўнымі аналогіямі. У якасці аднаго з прыкладаў такога суіснавання можна прывесці адносіны паміж Рымскай імперыяй і суседнімі германскімі народамі. Як і любая аналогія, параўнанне паміж Рымам і германцамі, з аднаго боку, і Полацкай зямлёй і Літвой, з іншага, ёсць не вельмі дакладным. Крызіс Рыма і экспансія германцаў мелі пад сабой іншыя, уласцівыя свайму часу і абставінам прычыны. Але па-за дэталямі агульная карціна ўзаемадзеяння развітай і магутнай, але заняпалай дзяржавы з маладымі і агрэсіўнымі народамі мае дастатковае падабенства з прадметам нашага доследу і таму дазваляе правесці пэўныя паралелі.

Падзеі гісторыі Рыма і германцаў выдатна задакументаваныя і даследаваныя ў сусветнай гістарыяграфіі, таму спынімся на іх каротка. Пачынаючы з другой паловы II ст. Рымская імперыя ўступіла ў эпоху палітычнага крызісу, што характарызаваўся жорсткай міжусобнай барацьбой прэтэндэнтаў на

Lowmiański H. Studia nad początkami społeczeństwa litewskiego. T. 2: Wojna, 1932. 227–228, 350–351.

імператарскую ўладу, якія прадстаўлялі розныя рэгіянальныя, сацыяльныя і дынастычныя групоўкі. Вядзенне шматлікіх міжусобных і знешніх войнаў адбівалася ў росце вагі рымскай арміі ў палітычным жыцці імперыі. Пры гэтым мы не пойдзем супраць ісціны, калі ўжывём слова «армія» ў множным ліку. Прынцып добраахвотнай вербоўкі, упершыню ўведзены Гаем Марыем на мяжы II і I стст. да н. э., прывёў да масавага прытоку ў войска маламаёмасных грамадзян, якія атрымлівалі плату за службу. Усё ў большай ступені такое войска было асабіста адданым свойму палкаводцу і матэрыяльна залежным ад яго, пры гэтым паступова трацячы сацыяльную сувязь з паспольствам. Таксама такое войска часта станавілася асабістай арміяй таго ці іншага палкаводца і служыла яму вернай апорай у міжусобнай барацьбе. Упершыню гэтая з'ява праявілася ў грамадзянскіх войнах I ст. да н. э., а ў войнах I і III стст. яна стала асноўным фактарам, які вырашаў вынік палітычнай барацьбы. Перыяд другой трэці III ст. стаў вядомы пад назвай «эпохі салдацкіх імператараў» і адзначыўся бесперапыннымі і бессэнсоўнымі войнамі прэтэндэнтаў на рымскі стол з дапамогай падкантрольных ім армій. Разам з тым, рымскія арміі паступова трацілі эфектыўнасць у справе абароны імперыі ад знешніх ворагаў. Даследчыкі адзначаюць, што аслабленне Рыма перад знешняй пагрозай было выклікана не так крызісам унутранай арганізацыі, у чым імперыя якраз мела велізарную перавагу перад сваімі варварскімі суседзямі, як палітычнымі прычынамі, а менавіта памяншэннем сацыяльнага базісу ўлады. Памяншэнне гэтае, у сваю чаргу, вяло да ваеннай слабасці і выклікала патрэбу ў пошуку новых спосабаў ваеннай арганізацыі.

Зніжэнне эфектыўнасці рымскай абароны ішло поруч з нарастаннем варварскай пагрозы на паўночнай мяжы імперыі, якая ішла па Рэйне і Дунаі. Пасля смерці ў 117 г. імператара Траяна, апошняга вялікага заваёўніка ў гісторыі Рыма, імперыя вымушана была перайсці да стратэгічнай абароны. Спакойныя дзесяцігоддзі II ст. абарваліся з пачаткам у 166 г. Маркаманскай вайны з кааліцыяй германскіх і іншых плямён на Дунаі. Аднак пры ўсёй шкодзе, якую яны наносілі рымскім правінцыям, і варварам не ўдавалася дамагчыся вырашальнай перамогі над Рымскай імперыяй і прарваць іх умацаваную

мяжу – лімес. Нягледзячы на страты, рымлянам пад камандаваннем імператара Марка Аўрэлія ўдалося стрымаць маркаманаў і іх саюзнікаў і мірам 180 г. адстаяць дунайскую мяжу. Нават у найзмрачнейшым для імперыі III ст. імператарам Галіёну, Клаўдыю II і Пробу ўдалося разбіць готаў, якія ў 230-я – 270-я гг., падобна бурлівай плыні, каціліся па Балканах і сваімі марскімі набегамі апярэдзілі вікінгаў больш чым на пяцьсот гадоў. Такім чынам, і варварам, унутранае развіццё якіх штурхала іх на экспансію на прасторы Рымскай імперыі, даводзілася ў дадатак да набегаў шукаць больш дзейсныя формы гэтай экспансіі.

Калі Рымскую імперыю немагчыма было скрушыць у прамым сутыкненні, многія варварскія правадыры і іх ваяры абіралі натуральную лінію паводзін і далучаліся да інстытутаў імперыі, у першую чаргу арміі. У меру пашырэння імперыі патрэба ў вайсковай сіле расла, і горад Рым з Італіяй ужо не маглі пастаўляць дастатковай колькасці рэкрутаў. Ужо ў эпоху Рэспублікі многія легіёны набіраліся з правінцыялаў. Следам за правінцыяламі ў армію рушылі варвары. Працэс варварызацыі войска ўзмацніўся і ў сувязі з тым, што эканамічны росквіт імперыі ў I–II стст. змяншаў у Італіі і правінцыях колькасць ахвотных да рызыкоўнай ваеннай службы. Спярша варвары ўліваліся ў рымскую легіённую арганізацыю паасобку, засвойвалі ўзоры рымскага ваеннага майстэрства і ўвогуле ўпісваліся ў ваенную сістэму імперыі. З паступовым адставаннем гэтай сістэмы ад надзённых патрэб абароны дзяржавы яна змянялася, засвойваючы менавіта варварскія ўзоры. Легіёны адыходзілі ў мінулае, а замест іх на службу ў войска прымаліся цэлыя варварскія аддзелы. У канцы IV ст. сучаснікі папракалі імператара Грацыяна тым, што ён забыўся на старую рымскую доблесць і аддаваў перавагу наймітам-аланам замест выпрабаваных легіёнаў. Распаўсюджанне атрымаў інстытут федэратаў – варварскіх плямёнаў, якім было дазволена пасяліцца на рымскай тэрыторыі ў абмен на іх ваенную службу.

Такое развіццё сітуацыі ў цяжкія для імперыі часы, калі ўнутраны палітычны крызіс дапаўняўся знешняй пагрозай з усіх бакоў, дало падставу тагачасным пісьменнікам і

прамоўцам казаць аб тым, што варвары былі адзінымі, хто ўзняў зброю ў абарону Рыма, калі самі рымляне адмовіліся гэта рабіць. У многіх войнах I–V стст. варварам, якія рушылі на імперыю пад сваімі баявымі значкамі, супрацьстаялі варвары пад рымскімі сцягамі. Найяскравейшым прыкладам гэтага – славуты бой на Каталаўнскіх палях у 452 г., дзе гуны, остготы і гепіды пад камандаваннем Атылы былі разбітыя вестготамі, франкамі, аланамі, бургундамі і саксамі пад камандаваннем «апошняга вялікага рымляніна» Аэцыя. Адыграўшы важную ролю ў абароне Рыма ад знешніх ворагаў, варвары да пэўнай ступені ахоўвалі і асабістыя правы і вольнасці рымлян ад уціску прагнілага ўраду і драпежных ваяўнічых узурпатараў, якія мала адрозніваліся ад знешніх ворагаў. Рымскія тэрыторыі пад патранатам асобных варварскіх правадыроў рабіліся своеасаблівымі выспамі вольнасці, дзе маглі знайсці прытулак роспачныя рымляне. Паводле словаў пісьменніка V ст. Сальвіяна,

яны [уцекачы-рымляне] *ідуць на службу да готаў, ці бакаудаў, ці да якіх-небудзь іншых варвараў, што панаюць паўсюль, і не каюцца ў сваім учынку. Яны болей жадаюць жыць вольна, носячы імя рабоў, чым быць рабамі, захоўваючы адно толькі вольнае імя. Перш імя рымскага грамадзяніна высока цанілася і дорага куплялася; цяпер жа ад яго адмаўляюцца, бо яно зрабілася пагарджаным і агідным*[7].

Далёка не ўсе рымляне, аднак, былі задаволеныя масавым пранікненнем варвараў у імперыю. «Ганебна для нас, што дзяржава наша, якая мае такое шматлікае насельніцтва, перадае гонар вядзення вайны іншаземцам, перамогі якіх няславяць нас нават у тым выпадку, калі яны нам прынясуць карысць», – лямантаваў рытар IV–V стст. Сінесій. З ім згодны хрысціянскі паэт IV ст. Прудэнцый, які казаў, што рымляне адрозніваюцца ад варвараў, як людзі ад быдла. Аднак альтэрнатывы ўзаемадзеянню двух элементаў ужо не было ў ўмовах унутранага крызісу, калі рымская эліта не толькі была здольнай яго вырашыць, але сама ж была адной з прычын, адбываўся натуральны працэс яе выцяснення з палітычнага жыцця. Паточаныя знутры заганамі свайго грамадства і ўплеценыя ў павуцінне рэгіянальных і сацыяльных

[7] Salvian. De gubernatione dei. Цыт. паводле: Сальвиан. О божественном управлении. Пер. с лат. Ю. А. Кулаковского. Изд. 2-е, испр. и доп. Киев, 1891. С. 160–161.

супярэчнасцяў, рымляне саступалі сваё месца энергічным, *vir novus*'ам, псіхалагічна і сацыяльна мабільным выхадцам з варварскіх народаў, якія не баяліся ўносіць жыццядайныя імпульсы ў застаялую імперскую палітыку. Яны хутка праходзілі шлях ад чужынца да носьбіта рымскай славы, ад простага легіянера да імператара. Такую кар'еру зрабіў ужо пачатку III ст. сын гота і аланкі Максімін Фракіец. Дасягнуў паўтарылі Філіп Араб, Галерый, Макісімін Дая, Магненцый і іншыя.

Але няправільна было б казаць, што Рым быў толькі статычным матэрыялам для творчых варвараў: мэтаю рабаўніцтва для варвараў варожых і кар'ерным полем для варвараў саюзных. Як грамадства непараўнальна больш развітае, Рым прапанаваў суседнім народам распрацаваную палітычную сістэму, высокаразвітую эканоміку, выкшталцоную культуру і заканадаўства. Фактычна, ён раскінуў перад варварамі гатовыя ўзоры, паводле якіх яны і маглі будаваць далей сваю цывілізацыю. Ужо Цэзар у I ст. да н. э. сваім хвацкім позіркам заўважыў той уплыў, які рабіў Рым нават на тыя народы, якія яшчэ не былі яму падуладныя: «Што ж датычыцца галаў, то блізкасць рымскіх правінцый спрыяе развіццю ў іх дабрабыту і новых патрэб».

Dzeich, *Vhem o dal'she* (Как история средних веков. От падзення Заходняй Рымскай імперыі да Карла Вялікага. (476–768 гг.) / Сост. М. М. Стасюлевич. – Москва–Санкт-Пецярбург, 2001. с. 70–71.

У выніку такога ўзаемадзеяння ўяўна падзеленыя дунайска-рэйнскай мяжой Рым і варвары на самай справе стварылі складаную дуалістычную мадэль суіснавання. Яшчэ да падзення Рымскай імперыі абодва элементы гэтай сістэмы залежалі адзін ад аднаго, рабілі ўзаемны ўплыў і актыўна пераймалі дасягненні адзін у аднаго. На думку даследчыкаў, урэшце пагадненне аказвалася непазбежным, прычым гаворка ішла аб доўгім і знясільным працэсе інфільтрацыі і асіміляцыі, узаемнага прыцягнення і адштурхоўвання. Рабіць адрозненне паміж «Раманіяй» і «Готыяй» мае сэнс хіба з пункту гледжання гістарыяграфічнага тэарэтызавання. Што ж датычыцца гістарычных працэсаў, якія ахоплівалі перыяд V–VI стст., як і той крыві, што цякла ў жылах галоўных дзейных асоб эпохі, то мае значэнне толькі адзін факт – новае аб'яднанне, сінтэз народаў, які з цягам часу прывядзе да стварэння новай цывілізацыі.

Пасля падзення Заходняй Рымскай імперыі ў V ст. гэта прывяло да стварэння на яе тэрыторыі так званых варварскіх каралеўстваў, якія спалучалі ў сваім дзяржаўным ладзе і ваеннай арганізацыі як рымскія, так і варварскія элементы. У найбольшай ступені рымска-варварскі дуалізм адлюстроўвалі Остготскае каралеўства ў Італіі і Вестготскае каралеўства ў Іспаніі і Галіі са сталіцай у Тулузе. Паколькі прычынай пранікнення варвараў у імперыю была яе ваенная слабасць, на рымскія землі яны прыходзілі ў якасці вайсковай сілы: альбо як абаронцы імперыі, альбо як яе заваёўнікі. Адпаведна, у такой дуалістычнай сістэме варварскі элемент непазбежна насіў ваенны характар, пакінуўшы цывільныя сферы рымлянам. Варвары канчаткова выцеснілі няздольных выконваць свае функцыі рымлян у якасці палітычнай эліты і ваеннага слою. Пры гэтым яны ўсялякім чынам клапаціліся аб стварэнні трывалай лініі пераемнасці паміж імперскай дзяржаўнасцю і сваёй уладай. Остготскі кароль Тэадорых Вялікі (493–525 гг.) разглядаўся ўсходнярымскімі імператарамі як рымскі магістрат, якому ў кіраванне была перададзена асобная правінцыя. Сам ён не аспрэчваў гэтай прававой асновы сваёй улады нават на вяршыні магутнасці, а фактычна лічыў сябе пераемнікам заходнярымскага імператара. У яго вачах Італія заставалася *res publica romana*, якая супрацьстаяла варварскім народам. Таму Тэадорых на законных падставах узначаліў рымскае войска, якое, праўда, складалася выключна з германцаў, бо рымлян адтуль павыганялі.

І ўсё ж не трэба перавялічваць ступень знікнення рымскіх ваенных традыцый. Нягледзячы на пераважнае панаванне варвараў у войску, рымская ваенная арганізацыя і ваеннае майстэрства праглядалі праз пазнейшыя наслаенні. Вядомы ў вестготаў, бургундаў і франкаў інстытут графа горада, які спалучаў у сваёй асобе ваенную і цывільную ўладу, меў як рымскія, так і варварскія карані. Захаваўся стары рымскі звычай выдачы грашовых падарункаў ваярам, да якога звярнуўся вестготскі кароль Аларых II перад бітвай пры Вуе ў 507 г. Нарэшце, ёсць звесткі, якія падтрымліваюцца ці аспрэчваюцца рознымі гісторыкамі, аб існаванні яшчэ ў VII ст. у гарадах Італіі мясцовай міліцыі, якая магла паходзіць ад старой рымскай ваеннай арганізацыі.

У цывільнай сферы рымскія і варварскія элементы таксама суіснавалі, хаця ў сілу колькаснай перавагі рымскага насельніцтва ў Італіі і гала-рымскага ў Галіі тут перавага належала рымскаму элементу. У Остготскім і Вестготскім каралеўствах рымляне займалі высокія пасады ў дзяржаўным апараце, а ў судаводстве захоўвала сілу рымскае права, якое зрабіла ўплыў і на развіццё германскага права.

Вынікам стала становішча, якое ў большай ці меншай ступені задавальняла абодва бакі. Паплечнік Тэадорыха Вялікага рымлянін Касіядор казаў: «Ведучы вайну, яны [готы. – **Г. Н.**] абараняюць інтарэсы ўсяго грамадства. Яны бяруць на сябе ратную працу дзеля дабра ўсіх. Пакуль готская армія ваюе, рымлянін можа жыць мірна». Варварскія каралі хутка ператварыліся з шукальнікаў славы ў дзяржаўных мужоў і пачалі дамагацца сваіх мэтаў і абараняць інтарэсы грамадства не толькі ваеннымі, але і мірнымі сродкамі, часам выяўляючы дыпламатычныя таленты. Спачатку іранічную ўсмешку, а затым захапленне выклікае чытанне працытаванага Касіядорам ліста Тэадорыха Вялікага да франкскага караля Кладавея, які ілюструе пераўтварэнне ліхога бадзяжнага правадыра варвараў у мудрага ўрадоўца:

Бог злучае каралёў святымі сувязямі дзеля таго, каб на іх міралюбных адносінах засноўваць пажаданы спакой народаў. (…) Каралі ўступаюць у сваяцтва дзеля таго, каб нацыі, падзеленыя паміж сабою, маглі мець адну волю, і каб праз гэтыя сувязі, як правадзнікі згоды, аб'ядноўваліся думкі народаў[8].

Готскія каралі запомніліся сучаснікам і нашчадкам не толькі як воіны, абаронцы сваіх краін, але і як падтрымальнікі ў іх уладаннях парадку і працвітання, аб чым сведчыць ліст таго самага Тэадорыха да намесніка правінцыі Северыяна, у якім ён патрабуе абараніць насельніцтва ад залішніх падаткаў і забяспечыць яму справядлівы суд. Апафеозам пахвалы варварскаму каралеўству, у якім злучыліся рымская і варварская плыні, стала паэма гала-рымскага арыстакрата Сідонія Апалінарыя, у якой той апісвае двор вестготскага караля Эўрыка. Той самы Сідоній, які раней асуджаў сасланую ў Арверна (сучасны Клермон-Феран) готам як верны і годнага

[8] Кассиодор. Variarum. Книга I, 41.

занявольвання авернцаў, затым пісаў:

> І ты, рымлянін, цячэш сюды прасіць аб дапамозе, і працягваеш рукі да Эўрыка, каб супрацьпаставіць яго сілы фалангам скіфскіх краін, калі Вялікая Мядзведзіца пагражае табе збянтэжаннем. Так, адной прысутнасцю Марса, які пануе на гэтых берагах, магутная Гарона заступаецца за абмялелы Тыбр[9].

Великого к Клодовею, королю франков). (Cassiod. XII Libri Variar.). III, 4 // История средних веков… с. 245.

9 Сидоний Аполлинарий. Двенадцать книг его писем // Памятники средневековой латинской литературы IV–VIII веков. Киев, 1970. С. 408.

Вернемся цяпер з цёплых прастораў Італіі і Галіі ў пасмяротныя пушчы і зробім належныя высновы з нашага экскурсу ў гісторыю Рыма і варвараў, у які мы выправіліся зусім не дарэмна. Мы ўжо адзначылі аналогію знешнепалітычнага становішча паміж Рымам і германцамі, з аднаго боку, і Русі (найперш Полацкай зямлёй) і Літвой, з іншага. Калі прыгледзецца, то мы заўважым, што і развіццё сітуацыі падобным чынам. Шчыльнае ўзаемадзеянне Полацкай зямлі і Літвы ў XII ст. рухалася ў знешнепалітычным і ваенным рэчышчы і было выклікана крызісам кіравання на зыходзе XI ст., які ў Полацку дасягнуў найбольшай ступені. Тады як цывілізацыя Русі ў цэлым працягвала сваё паступальнае развіццё, сістэма яе палітычнага кіравання зайшла ў тупік. Крызісныя з’явы знайшлі сваё найяскравейшае развіццё ў знешнепалітычнай і ваеннай сферах. Занятыя бясконцымі звадамі паміж сабой і з іншымі князямі Русі, полацкія князі мелі пастаянную і пільную патрэбу ў вайсковай сіле. Між тым, вольнае насельніцтва Полаччыны ўсё ў меншай ступені было надзейнай крыніцай яе папаўнення. З эканамічнага пункту гледжання, поспехі эканомікі, развіццё вытворчасці і абмену рабілі людзей больш зацікаўленымі ў мірных занятках, чым у ваенных выправах. З пункту гледжання палітыкі, бессэнсоўныя дынастычныя спрэчкі князёў мелі мала дачынення да інтарэсаў простага люду і не знаходзілі водгуку ў яго сэрцах. Заклікі князёў да зброі выклікалі апатыю ці нават актыўнае супраціўленне, як гэта адбылося з палачанамі ў 1158 г. Нават спакайнейшая Смаленшчына зведала выпадкі супраціўлення насельніцтва ваеннай актыўнасці Давыда Расціславіча ў 1185 і 1196 гг. Цяжар вядзення вайны ўсё больш прыпадаў на

прафесійных ваяроў – дружыннікаў. Аднак пры ўсёй прафесіяналізацыі ваеннай справы дружына была занадта малалікай і нязначнай для вядзення буйных кампаній. Узнікла патрэба ў сіле, якая б кампенсавала змяншэнне паспалітага рушэння, што сціскалася, нібы тая шчагрынавая скура.

У Полацкай зямлі такой сілай сталі дружыны і рушэнні падуладных літоўскіх земляў. Можна думаць, што з XI ст. полацкае войска ўключала літоўскія кантынгенты. Паколькі ваенная служба літоўцаў для Полацка не насіла прафесійнага характару і была іх калектыўнай павіннасцю, то малаверагодна, што літоўцы далучаліся да полацкага войска індывідуальна. Хутчэй, яны змагаліся пад полацкімі сцягамі ў складзе сваіх аддзелаў і пад камандаваннем сваіх князёў. Яны не ўключаліся ў структуру ўласна полацкай ваеннай арганізацыі і былі элементам, хутчэй, знешнім, чым унутраным. З цягам часу становішча змянілася. Падзенне ролі народнага полацкага апалчэння прывяло да адпаведнага росту значэння літоўскіх аддзелаў. Ужо пры апісанні бітвы Валадара Глебавіча з Рагвалодам Барысавічам пад Гарадцом у 1162 г. летапісец называе ў складзе войска Валадара толькі Літву, не згадваючы ўласна менскія аддзелы. Літоўцы адыгралі важную ролю ў аблозе Друцка ў 1180 г. і паходзе на Ноўгарад у 1198 г., у ходзе якога літоўцы і палачане спустошылі Вялікія Лукі. Мы таксама маем няпэўныя звесткі Рыфмаванай хронікі аб сумеснай аперацыі палачанаў і літоўцаў каля 1200 г. супраць крыжакоў у Лівоніі пад Кукенойсам:

Здарылася ў хрысціян у Лівоніі
У той час бітва.
Яе літоўцы пачалі,
З іншага боку рускі аддзел
Да Кокенгузена на поле прыйшоў.
Смерцю там трэба было заплаціць:
Трыста хрысціян там ляжаць засталіся.
І ў паганцаў таксама
Шмат мёртвых засталіся на полі.

Апошняя бітва паказвае, наколькі спрыяла полацка-літоўскаму

ваеннаму супрацоўніцтву наяўнасць супольнага небяспечнага ворага ў выглядзе нямецкіх крыжакоў у Падзвінні. Сама ідэя крыжовага паходу з мэтай распаўсюджвання каталіцкагаі хрысціянства не пакідала надзеі на спакойнае жыццё ні схізматам-русінам, ні паганцам-літоўцам. У тэорыі крыжовы паход мусіў скончыцца толькі з навярненнем у правільную веру ўсіх няверных, на практыцы ж ён мог скончыцца на тым рубяжы, ня якім дазвалялі наяўныя рэсурсы. А рэсурсамі крыжакоў былі неверагодная моц папскага стала і шматлікае ваяўнічае заходнееўрапейскае рыцарства. Таму крыжовая небяспека была болей чым рэальнай для Полацка, Літвы, а потым і Валыні з Берасцем, Дарагічынам і яе іншымі пабужскімі і панямонскімі ўладаннямі. З гэтай прычыны Літва і Русь мусілі выпрацаваць узаемапрымальную мадэль адносін, якая б не толькі дазваляла ім выступаць адзіным фронтам супраць знешняй небяспекі.

Паводле ўрыўкавых звестак летапісаў і хронік цяжка меркаваць, наколькі шчыльна літоўцы ўпісаліся ва ўласна полацкую ваенную арганізацыю і якую кар'еру пад полацкімі сцягамі зрабілі военачальнікі літоўскага паходжання, аднак адмаўляць іх велізарную ролю ў вядзенні Полацкай зямлёй у XII ст. знешніх і міжусобных войнаў немагчыма. Таксама паразы, нанесеныя літоўцамі Полаччыне каля 1185 г., ясна паказалі, наколькі важна мець літоўцаў у якасці прыяцеляў, а не ворагаў.

Але і Полаччына недарэмна прыцягвала да сябе позіркі з Панямоння. За некалькі стагоддзяў свайго існавання ў якасці дзяржаўнага ўтварэння ў складзе Кіеўскай дзяржавы і як самастойнае княства Полацкая зямля набыла складаную палітычную структуру, стварыла заканадаўства высокага ўзроўню, дамаглася значных поспехаў у эканоміцы і культуры. Усе гэтыя набыткі полацкай цывілізацыі маглі быць выкарыстаныя і выкарыстоўваліся Літвой у яе грамадскім развіцці. Паказчыкам полацкага ўплыву на працэсы, якія адбываліся ў літоўскім грамадстве, можа служыць будаўніцтва ўздоўж межаў Літвы з Полаччынай драўляных замкаў, якія былі асяродкамі палітычнага жыцця Літвы. Як піша г. Лаўмянскі, на Русі «ўжо існавала гатовая для захопнікаў дзяржаўная

арганізацыя»[10]. Безумоўна, польскі гісторык можа перабольшваць ролю знешніх фактараў у станаўленні літоўскай дзяржаўнасці, але цяжка сумнявацца ў тым, што суседства з Полаччынай было моцным яе каталізатарам. Таксама прысутнасць у літоўскай мове эканамічнай тэрміналогіі, запазычанай са старажытнарускай ці старабеларускай мовы сведчыць аб пераняцці літоўцамі ў русінаў пэўных спосабаў гаспадарання[11].

У любым разе, літуанізацыя ўзброеных сілаў Полацкай зямлі і цывілізацыйны ўплыў Полаччыны на Літву адзначылі новы ўзровень іх адносін на прынцыпова новы ўзровень. Літва была для Полацка нашмат цікавейшай за простую крыніцу вайсковай сілы. Полацк быў для Літвы чымсьці большым за проста тэрыторыю для вайсковай кар'еры ці тэрыторыю для рабаўніцтва. Полацк і Літва сталі своеасаблівымі «Раманіяй» і «Готыяй», якія ўжо рэзка адрозніваліся адна ад адной і мелі добрую магчымасць для сумеснага існавання. Больш за тое, Полацкае княства было толькі невялікай часткай «Раманіі», якая хутчэй за ўсіх суседзяў прайшла шлях самастойнага развіцця і таму раней аказалася гатовай да новага супрацоўніцтва. Патэнцыял для ўдзелу ў гэтым працэсе на «раманскім» баку таксама мелі Смаленшчына, Тураўшчына і іншыя землі Русі.

[10] Labuda G. Studia nad początkami stosunków polsko-litewskich w średniowieczu. T. II. S. 350.

[11] Пашуто В. Т. Образование Литовского государства. — Москва, 1959. с. 257–258.

Супрацоўніцтва ў палітычнай і ваеннай сферы адкрывала магчымасць да паступовага і частковага выяснення ў будучыні старога полацкага ваенна-дружыннага слою літоўцамі. Князі з дынастыі Рагвалодавічаў, якія загрузлі ў дынастычных спрэчках і распачыналі праз гэта бясконцыя войны, ужо не маглі належным чынам выконваць свае функцыі: ажыццяўленне палітычнай улады ў інтарэсах паспольства, абарону краю і падтрыманне ўнутранага парадку. Наадварот, у многіх выпадках менавіта яны ўяўлялі сабой пагрозу бяспецы краю. Таму патэнцыйная замена іх ваяўнічымі князямі літоўскага паходжання была крокам, які палягчаў вырашэнне гэтых пытанняў. Больш за тое, паколькі палітыка таго часу мела ў вялікай ступені дынастычны характар, замена Рагвалодавічаў, цесна звязаных шлюбнымі і сваяцкімі сувязямі з рознымі адгалінаваннямі Рурыкавічаў, адным ударам разрубала павуцінне, што ўцягвала Полаччыну ў чужыя ёй войны. Разам з

тым, падобная замена не мела негатыўным чынам адбіцца на шматлікіх дружынніках сярэдняга і ніжэйшага слою, якія былі надзейнай апорай князёў любой дынастыі і трывалай асновай усяго войска.

Супрацоўніцтва ў грамадзянскай сферы значыла захаванне полацкіх палітычных, эканамічных і культурных узораў, якія маглі б развівацца больш бяспечным чынам пад аховай больш здольнага і эфектыўнага літуанізаванага ваеннага слою. У цэлым, XII ст. падвяло Полацкую зямлю і Літву да мяжы ўтварэння таго, што можна назваць аналагам варварскага каралеўства на тэрыторыі былой Рымскай імперыі, якое спалучала б у сабе цывілізацыйныя дасягненні аднаго боку з маладой ваеннай моцай другога. Паколькі Смаленшчына, Тураўшчына і некаторыя іншыя землі Русі развіваліся падобным з Полаччынай шляхам, то ў больш аддаленай перспектыве такім шляхам маглі рушыць і яны. Ці адбылося гэта і як развівалася сітуацыя ў далейшым, паказвае гісторыя XIII ст.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 4 (38) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/07
[image]

СЯРГЕЙ БАЛАХОНАЎ

Сяргей Балахонаў Там нехта ёсьць, або Ростані постсавецкай беларускай літаратуры

пісьменнік, піша пра літаратуру, музыку, палітыку, а таксама мастацкую прозу і вершы. Працуе настаўнікам гісторыі ў Гомелі. Сталы аўтар газэты «Наша Ніва» і часопісу «ARCHE». Зьбіральнік і дасьледнік сучасных сат. Артыкул быў напісаны на замову чэскага часопісу «Host» і

Сярод разнастайных чыньнікаў, што ўплываюць на літаратуру сучаснае Беларусі, найперш неабходна назваць складаны працэс станаўленьня і разьвіцьця беларускае дзяржаўнасьці. Пасьля абвяшчэньня незалежнасьці (1990–1991) у нашай краіне адбывалася нацыянальна-культурнае адраджэньне, праходзіла беларусізацыя зрусіфікаванага грамадзтва, вярталіся зь нябыту забароненыя камуністычным рэжымам імёны і цэлыя пэрыяды беларускае гісторыі. Зусім заканамерна, што прага да абуджэньня нацыянальнае сьвядомасьці праявілася ў напісаньні твораў гістарычнага жанру. На хвалі адраджэньня зьявіліся кнігі Леаніда Дайнекі («Меч князя Вячкі», «Жалезныя жалуды»), Кастуся Тарасава («Пагоня на Грунвальд»), Уладзімера Арлова («Пяць мужчын у лесьнічоўцы»), Віталя Чаропкі («Храм бяз Бога»). Адраджэнскім патасам была напоўнена лірыка як старэйшых (Ніл Гілевіч, Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін), так і больш маладых (Анатоль Сыс, Леанід Дранько-Майсюк, Славамір Адамовіч) паэтаў. Але за гэтым патасам часьцяком гублялася здаровая развага, сасьцізгвала разуменьне таго, што простай і маланкавай перамогі ў

дэсаветызацыі краіны ня будзе. Прарочыцай выявілася паэтка Тацяна Сапач, якая яшчэ ў часы гарбачоўскае «перабудовы», напрадвесні незалежнасьці Беларусі напісала верш «Адзінота»:

І зараз мне няма куды сьпяшацца –
падлічаны учора страты ловаў,
і меч яшчэ ня высах ад крыві,
і значыць, можна жыць цяпер спакойна.
Да часу! Будзе дзень і будзе дзея,
і той, хто быў сьляпы, відушчым стане,
і будзе наш нябога ўладаром...
А толькі мне няма куды ісьці,
і ўжо даўно няма куды ісьці –
там
нехта ёсьць,
і я яго баюся.

Гэты паўстрашлівы «нехта» – значная частка грамадзтва, якая абыякава, нярэдка і чыста варожа ставіцца да беларускае мовы і культуры.

АЎТАРЫТАРНЫ КАНТЭКСТ

У 1994 г. прэзыдэнтам Беларусі быў абраны Аляксандар Лукашэнка – чалавек, які вызнае падобныя антынацыянальныя каштоўнасьці. Таму ўжо на другі год ягонага кіраваньня праз рэфэрэндум адбылося скасаваньне дзяржаўнага статусу нацыянальнай сымболікі, а расейскай мове быў нададзены статус другой дзяржаўнай мовы. Пачалося імклівае згортваньне беларусізацыі. Уладны цэнтар, прыстасоўваючы да сучаснасьці савецкую спадчыну, інтуітыўна ўзяў курс на фармаваньне беларускай палітычнай нацыі. Нездарма ў новай рэдакцыі дзяржаўнага гімну Беларусь услаўляецца як «народаў братэрскі саюз». Падзеі 1994–1995 гг. выклікалі ў асяродзьдзі беларускіх пісьменьнікаў сапраўдны шок, ад якога некаторыя ў прамым сэнсе не змаглі аправіцца (памёр, напрыклад, паэт Максім Танк). Рэакцыя маладзейшых творцаў мела іншы характар – яны ўступілі ў адкрыты інтэлектуальны супраціў антыбеларускай па сваёй сутнасьці ўладзе.

Супраціў набываў розныя формы: ад эпатажных тэкстаў (ананімная паэма «Лука Мудзішчаў прэзыдэнт», верш Славаміра Адамовіча «Убей президента») да стварэньня недзяржаўных выдавецкіх праектаў «Фрагмэнты» (рэдактар Ігар Бабкоў) і «ARCHE» (рэдактар Валер Булгакаў), якія ня проста палемізавалі з аўтарытарным рэжымам, але імкнуліся яго пакласьці на хірургічны стол і прэпараваць. Добрым прыкладам гэтага ёсьць эсэ «Адна інкарнацыя змаганьня» Міхаіла Баярына ды «Геній Лукашэнкі» В. Булгакава. Інтэлектуальную апазыцыю рэжыму склаў і часопіс «Крыніца» (рэдактар Уладзімер Някляеў, а пасьля ягонай эміграцыі – Ала Канапелька), заснавальнікам якога быў Саюз пісьменьнікаў Беларусі. На старонках «Крыніцы» друкаваліся творы многіх сучасных беларускіх пісьменьнікаў, нават тых, хто адкрыта канфрантаваў з рэжымам. Да таго ж часопіс стаў свайго кшталту перакладніцкай лябараторыяй. Амаль у кожным нумары зьяўляліся пераклады з сусьветнае літаратуры, пачынаючы ад Бакачча і сканчаючы Стывэнам Кінгам.

Сымбалем маральнае перавагі над лукашэнкаўскім рэжымам стаў пісьменьнік Васіль Быкаў. Яшчэ ў 1960-я гг. ён ці ня першым зь беларускіх літаратараў стаў праўдзіва, бяз штучнага савецкага ідэалягічнага бляску апісваць быцьцё чалавека ва ўмовах Другое сусьветнае вайны. У творчым разьвіцьці ён немінуча прыйшоў да высновы аб блізкай сутнасьці фашызму і бальшавізму (аповесьць «Знак бяды», 1982), а ў творах канца 1980-х – пачатку 1990-х гг. зьвярнуўся да трагічных падзеяў антыбальшавіцкага супраціву («На чорных лядах») і сталінскага тэрору («У тумане», «Жоўты пясочак»). Шчырая грамадзянская пазыцыя, угрунтаваная на нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасьцях, выклікала шаленства беларускага дзяржаўнага афіцыёзу, які паразытуе на саветчыне: фільм па творах Быкава ня быў дапушчаны да пракату, дзяржаўнае выдавецтва адмовіла друкаваць яго кнігу «Сьцяна»*, пачалося публічнае цкаваньне пісьменьніка праз СМІ. У выніку ён мусіў часова пакінуць бацькаўшчыну і жыць у Фінляндыі, Нямеччыне, Чэхіі. У 2003 г. В. Быкаў, адчуваючы хуткую сьмерць, вярнуўся ў Беларусь. Пахаваньне народнага пісьменьніка сталася сапраўды народным і, нягледзячы на ўладную мітусьню вакол гэтай Нацыянальнай Трагедыі, паспрыяла маральнай

кансалідацыі здаровых нацыянальных сілаў.

Рэжым А. Лукашэнкі мэтадычна рабіў і робіць захады, каб звесці зьвесьці да мінімуму ўплывы беларускіх пісьменьнікаў недзяржаўным грамадзтва. Вітаюцца літаратары, што ляяльна ставяцца Беларускім ўлады. У 2002 г. Саюз пісьменьнікаў Беларусі быў пазбаўлены дзяржаўнага фінансаваньня, а пэрыядычныя выданьні фондам літаратурна-мастацкага кірунку страцілі сваіх былых «Наша Ніва» рэдактараў і атрымалі новых, прызначаных згары. У 1997 г. створана рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова пад назвай мэдыя-холдынгу «Литература и искусство». Частка пісьменьнікаў, ня згодных зь сілавым узьдзеяньнем рэжыму, пакінулі свае месцы працы і сталі гуртавацца вакол грамадзка-палітычнага часопісу «Дзеяслоў» (рэдактар Барыс Пятровіч). Ранейшая «Крыніца» была пераўтворана новай рэдакцыяй у панславісцкае выданьне «Крыніца. Славянскі свет», перш чым канчаткова зачыніцца. Адносным лібэралізмам сярод холдынгавых выданьняў вызначаецца хіба часопіс «Маладосць» (рэдактарка Раіса Баравікова).

Але нават ва ўмовах жорсткага ўладнага прэсінгу і ** Сфэра русіфікатарскай палітыкі** многія беларускія пісьменьнікі працягваюць працаваць над мастацкім пераасэнсаваньнем мінуўшчыны краіны. Ужо за часы кіраваньня А. Лукашэнкі ў дзяржаўных і недзяржаўных выдавецтвах зьявіліся кнігі Ігара Шамякіна «Вялікая княгіня», Вольгі Іпатавай «Альгерд», дзіда» (залучае ў сябе цыкль раманаў пра пачаткі Вялікага Княства Літоўскага), Алеся Пашкевіча «Пляц Волі» (крымінальны дакумэнт», прысьвечаны барацьбе беларусаў за сваю дзяржаўнасьць у першай палове XX ст.), Андрэя Федарэнкі «Нічые» (у цэнтры ўвагі – антыбальшавіцкае Слуцкае паўстаньне 1920 г.), празаічная нізка Ўладзімера Арлова «Полацкія апавяданьні» (іранічнае пераасэнсаваньне гісторыі БССР) ды інш. Спробы паказаць істу сучаснага беларускага аўтарытарызму, раскрыць мэханізмы яго функцыяваньня амаль ня мелі месца. Сяргей Дубавец, рэдактар «Нашай Нівы» з 1991 па 2001 гг., разважаючы над гэтай праблемай, узгадваў раман г. г. Маркеса «Восень патрыярха» і адзначаў: «Беларуская літаратура не нарадзіла нагэтулькі магутнага раману пра дыктатара. Дакладней, пра сваёго дыктатара. Дакладней, пакуль не нарадзіла». Магчыма, гэтым

Вялікага Княства Літоўскага), Алеся Пашкевіча «Пляц Волі» (крымінальны дакумэнт», прысьвечаны барацьбе беларусаў за сваю дзяржаўнасьць у першай палове XX ст.), Андрэя Федарэнкі «Нічые» (у цэнтры ўвагі – антыбальшавіцкае Слуцкае паўстаньне 1920 г.), празаічная нізка Ўладзімера Арлова «Полацкія апавяданьні» (іранічнае пераасэнсаваньне гісторыі БССР) ды інш. Спробы паказаць істу сучаснага беларускага аўтарытарызму, раскрыць мэханізмы яго функцыяваньня амаль ня мелі месца. Сяргей Дубавец, рэдактар «Нашай Нівы» з 1991 па 2001 гг., разважаючы над гэтай праблемай, узгадваў раман г. г. Маркеса «Восень патрыярха» і адзначаў: «Беларуская літаратура не нарадзіла нагэтулькі магутнага раману пра дыктатара. Дакладней, пра сваёго дыктатара. Дакладней, пакуль не нарадзіла». Магчыма, гэтым

творам мог бы стаць раман Уладзімера Някляева «Крэматорый» (друкаваўся толькі ўрывак), галоўнага героя якога звалі Андрэй Гаўрылавіч Лукашэнка. Калі меркаваць па водгуках ўрыўку, пісьменьнік ня ўнікнуў самацэнзуры, схаваўшыся за гратэск (Андрэй Гаўрылавіч мяркуе пачаць палітычную кар'еру, узначаліўшы крэматорый, дзе аддаюць агню памерлых вызначэнных людзей).

Творчасьць маладых беларускіх аўтараў другой паловы 1990-х гг. (пэрыяд «Менскай вясны») мела яскрава антылукашэнкаўскі характар. У аснове кароткіх апавяданьняў, эсэ, рэфлексіяў, вершаў, друкаваных у сталых рубрыках газэты «Наша Ніва» «Эпікон» і «Грамафон», было жыцьцё маладога чалавека ў віры дэманстрацыяў пратэсту, распаўсюду ўлётак, турэмных адседак etc.

ЗРАБІ СЯБЕ САМ

Ня толькі ўплываюць на сучасную беларускую літаратуру, але і абумоўліваюць яе спэцыфічнае становішча такія важныя фактары, як пераход Беларусі да рынкавай эканомікі і глябалізацыя. Выпрацаваная ў савецкія часы завядзёнка дзяржаўнае падтрымкі беларускай літартуры рэзка пахіснулася зь сярэдзіны 1990-х гг. Беларускі пісьменьнік зь дзяржаўнага службоўцы мусіў пераквалiфікоўвацца ў пісьменьніка-камэрсанта, здатнага ня толькі пісаць, але і прадаваць свае творы, шукаць магчымасьці для выданьня сваіх кніг, пагатоў дзяржаўная манаполія на выдавецкую дзейнасьць зьнікла пры канцы 1980-х. Яскравым увасабленьнем падобнага тыпу пісьменьніка стаў Адам Глёбус (сапр. Уладзімер Адамчык), які, апроч літаратурнай творчасьці, мае спаважны кнігавыдавецкі бізнэс.

Некаторыя дасьледнікі культуры (напрыклад Сяргей Парашкоў) лічаць «пранікненьне і замацаваньне духу практыкі і камэрцыі» ў беларускай літаратуры (і наагул у культуры) зьявай нэгатыўнага кшталту. З гэтым меркаваньнем цяжка пагадзіцца. Насамрэч для бальшыні пісьменьнікаў, ня толькі маладых, недзяржаўныя выдавецтвы гарантуюць хуткае надрукаваньне кнігі без шматгадовых чэргаў, як тое бывае ў выдавецтвах

дзяржаўных. Да таго ж сама дзяржаўная палітыка падштурхоўвае да камэрцыялізацыі, прынамсі, часткі літаратурнага працэсу. Гаворачы пра камэрцыялізацыю, мусім адразу ж абмовіцца, што гаворка не ідзе пра фармаваньне масавай беларускай літаратуры. Такой, на правялікі жаль, не існуе. Прычынамі таго найперш русіфікаванасьць вялізнай масы патэнцыйных чытачоў, а таксама жорсткая канкурэнцыя з боку сусьветнага пісьменьніцтва. Адмысловасьць глябалізацыі для Беларусі палягае ў тым, што мы п'ем тую ж самую «Кока-колу», як і чэхі, але «Гары Потэра» чэхі чытаюць па-чэску, а мы мусім карыстацца расейскімі перакладамі. Той жа Глёбус, усьведамляючы каньюнктуру рынку, ільвіную долю кніг выдае па-расейску. Камэрцыйным посьпехам у нашых умовах уяўляецца выданьне ўласнай беларускамоўнай кнігі накладам 1000–2000 асобнікаў і яе рэалізацыя хаця б цягам колькіх гадоў саматугам, празь сетку незалежнага распаўсюду або празь дзяржаўны кнігагандаль. Апошняе магчыма, калі кніга не адпудзіць кнігарню якой-кольвек «крамолай». Так, зборнік аўтабіяграфічнае прозы пісьменьніка і барда Зьмітра Бартосіка «Чорны пісталет» кнігарні адмовіліся браць толькі таму, што адзін з тэкстаў мае назву «Лукашэнка памёр».

Справа пашырэньня гатовага літаратурнага прадукту ўскладняецца яшчэ і тым, што імёны сучасных беларускіх пісьменьнікаў для масавага спажыўца знаёмыя мала. Кепскую паслугу тут робіць моцная інфармацыйна-культурная прывязанасьць беларусаў да Расеі («Тут паблізу Масква, тут Масква ў галаве // Тут Масква ў тэлевізары і ў газэце // Тут расейскія песьні развучваюць дзеці», – адкамэнтараваў заганную сытуацыю рокер Лявон Вольскі). Акром таго, быў досыць працяглы пэрыяд (прыблізна 1998–2001), калі дзяржаўныя мэдыі папросту ігнаравалі прадстаўнікоў літаратурнага цэху. І толькі цяпер сытуацыя патроху-патроху зьмяняецца да лепшага. Нарэшце літаратар мае шанец «раскруціць» сваё імя, быць у станоўчым сэнсе заўважным нават газэтай, заснаванай адміністрацыяй прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі. І беларускі чытач, такім чынам, адкрывае амэрыкі найноўшае беларускае літаратуры. Можа быць, таму зьмяняецца і стаўленьне прыватных выдаўцоў да нашых пісьменьнікаў, і яны (выдаўцы) не баяцца ўкладаць свае грошы

ў рэалізацыю тых ці іншых літаратурных праектаў. Спаміж такіх выдаўцоў найперш варта назваць Ігара Логвінава, чыё выдавецтва за апошнія тры гады выпусьціла ў сьвет больш за трыццаць найменьняў кніг беларускіх пісьменьнікаў (пераважна – авангард і постмадэрнізм).

Увогуле ж працэсы капіталізацыі знайшлі ў сучаснай беларускай літаратуры разнастайную ацэнку. Чым далейшы канкрэтны пісьменьнік ад прадпрымальніцкага асяродзьдзя, тым больш адмоўны вобраз бізнэсоўцаў, іх дзейнасьці і ладу жыцьця ён прэзэнтуе ў сваіх творах. Найбольш жорсткае стаўленьне да прадпрымальнікаў выказаў у сваіх творах Юры Станкевіч. Хістаньні паміж скрайнасьцямі ў адлюстраваньні прадпрымальніцтва дэманстраваў адзін із старэйшых пісьменьнікаў Іван Шамякін («Сатанінскі тур», «Падзеньне», «У засені палацу»). Апалёгіяй камэрцыйнае чыннасьці зь яе мабільнасьцю, пакручастасьцю, захапляльнасьцю поўняцца мініятуры Леаніда Маракова.

У цяперашніх умовах многія пісьменьнікі пераўвасабляюцца ў гэткіх вагантаў, падарожнічаючы па краіне для сустрэчаў з чытачамі (У. Арлоў, З. Бартосік, А. Хадановіч). У пераважнай большасьці разоў такія сустрэчы ладзяцца з дапамогаю няўрадавых арганізацыяў, што сьведчыць пра пэўнае ўмацаваньне грамадзянскае супольнасьці. Для саміх творцаў гэта ня толькі рэальная магчымасьць правесьці жывы дыялёг з чытачамі ды гарантавана прадаць нейкую частку сваіх кніг, але і справа ўздыму прэстыжнасьці беларускае мовы й літаратуры ў грамадзтве.

УЦЯКАЮЧЫ АД САЦРЭАЛІЗМУ

У адрозьненьне ад савецкіх часоў літаратура незалежнае Беларусі характарызуецца разнастайнасьцю напрамкаў, традыцыяў, творчых мэтадаў. Сацыялістычны рэалізм амаль цалкам адышоў у нябыт і, калі прысутнічае, дык толькі як атавізм у творах некаторых старых пісьменьнікаў. Ужо з канца 1980-х гучалі прапановы інтэлектуалаў перагледзець усю літаратурную спадчыну савецкага пэрыяду на яе далейшую прыдатнасьць як для школы, гэтак і для агульнаграмадзкага

спажываньня. Але найбольш выразна гэтыя думкі былі выкладзеныя ў артыкуле Сяргея Дубаўца «Ружовы туман» (1998). Артыкул выклікаў сярод пісьменьнікаў старэйшага пакаленьня неўразуменьне, і канструктыўнай дыскусіі, якую аўтар імкнуўся справакаваць, не адбылося.

Рэалізм у сучаснай беларускай літаратуры прысутнічае і, мабыць, будзе яшчэ прысутнічаць надалей, дзеля існаваньня спэцыфічна тутэйшага кірунку «вясковае прозы», якога не зракаюцца многія члены СПБ. На агульным тле рэалістаў у апошнія 15 гадоў вылучаліся прадстаўнікі розных пакаленьняў: Іван Шамякін («Без пакаяння», «Выкармак»), Ніл Гілевіч (раман у вершах «Лодачкі»), Андрэй Федарэнка («Смута»), Франц Сіўко («Удог»). Для бальшыні іхных твораў уласьцівай ёсьць менавіта рэалістычная дамінанта, хоць, безумоўна, пісьменьнікі зазнаюць уплывы іншых творчых напрамкаў. Але апошняе ў іх прыкмячаецца ня так яскрава, як у літаратараў, пра якіх будзе весьціся гаворка троху ніжэй.

Вельмі блізкая да літаратуры экзыстэнцыялізму творчасьць Васіля Быкава. Пісьменьнік імкнуўся адлюстраваць сутнасьць чалавечага існаваньня праз разьмяшчэньне герояў сваіх твораў у т. зв. «памежныя сытуацыі». Героі Быкава пастаянна вымушаны рабіць выбар між агнём і полымем. Але ў адрозьненьне ад французскіх экзыстэнцыялістаў беларускі пісьменьнік ня лічыць пакутлівы выбар у «памежных сытуацыях» сьведчаньнем абсурднасьці існаваньня чалавека. Сьмерць у творах Быкава – не абсурд, а вызваленьне ад заганнай рэчаіснасьці. Пісьменьнік сьцьвярджае права чалавека памерці свабодным («Ваўчыная яма», «Балота»).

Добрым прыкладам беларускага пісьменьніка-мадэрніста ёсьць паэт Алесь Разанаў. Вынаходнік новых вершаваных формаў (пункціры, вэрсэты, вершаказы), ён знарочыста абмінае ўсталяваныя ў беларускай традыцыі паэтычныя рамкі (кнігі «Рэчаіснасьць», «Танец з вужакамі»). Характэрны філязафічны пункцір Разанава:

Цягнецца з коміну дым

па-над сьнежным бязьмежжам:
адна сьцяжына – і тая ў неба.

Творчасьць Славаміра Адамовіча варта азначыць як «асьцярожны мадэрн». Паэт выкарыстоўвае традыцыйныя вершаваныя формы, але рашуча адрынае традыцыю савецкага вершаванага афіцыёзу. У вершах с. Адамовіча гіпэртрафаваны мужчынскі пачатак. Скразныя тэмы – каханьне і вайна – пераплятаюцца, часам вельмі гратэскна:

Гляджу, гляджу, каханая, якая ты сьветлая,
стаіш пад поўняю, пад сонцам і дажджом,
усё табе пасуе – хоць кабура пісталетная,
хоць новы аўтамат, хоць старое ружжо.

Адзін зь ягоных зборнікаў мае характэрную назву «Каханьне пад акупацыяй». Паэт зладзіў палітычны пэрформанс, абвясьціўшы пра існаваньне ультранацыяналістычнай арганізацыі «Правы рэванш». А паколькі ў 1996 г. за напісаны па-расейску верш «Убей президента» с. Адамовіч апынуўся за кратамі, спэцслужбы актыўна шукалі сьляды гэтай «палітычнай структуры».

Імкненьне да абнаўленьня мастацкай практыкі, разрыву зь яе сталымі традыцыямі і формамі дэманстравалі сябры літаратурнага аб'яднаньня «Бум-Бам-Літ» (Зьміцер Вішнёў, Віктар Жыбуль, Ільля Сін ды інш.). Характэрным прыймом бумбамлітаўцаў былі (і застаюцца пасьля скону аб'яднаньня) публічныя літаратурныя акцыі, суправаджаныя пэрформансамі. Сымбалічнае дыстанцыяваньне бумбамлітаўцаў ад ранейшае традыцыі праявілася, да прыкладу, у празьмерным выпінаньні (псэўда)афрыканскіх матываў у творчасьці (назвы кніг З. Вішнёва характэрныя: «Афрыканскія матывы», «Штабковы тамтам», «Тамбурны маскіт»). Самі былыя бумбамлітаўцы схільныя сёньня называць сябе постдэкадэнтамі. Хаця яшчэ ўчора яны пнуліся менавацца постмадэрністамі.

Пэўныя дасьледнікі (гісторык Сьвятлана Куль-Сяльвестрава, філёзаф Валянцін Акудовіч) пэрыяд разьвіцьця беларускае

культуры з канца 1980-х па сёньняшні дзень схільныя называць постмадэрнісцкім. Але спрэчкі аб наяўнасьці/адсутнасьці беларускіх постмадэрнісцкіх твораў не аціхаюць. Доўгатрывалая дыскусія, што завязалася ў 2001 г. між публіцыстам Данілам Жукоўскім і аўтарам гэтых радкоў, працягваецца, шторазу пашыраючы кола дыскутантаў. Многія творцы доўгі час хаваліся за шыльду постмадэрнізму: або з прычыны неразуменьня ягонай сутнасьці, або ў разьліку на недасьведчанасьць чытацкае аўдыторыі. Між тым, прадстаўнікоў беларускага постмадэрнізму «ўсяго чалавек дзесяць», як сказала радыёжурналістка Надзея Кудрэйка. Найбольш выбітныя зь іх Ігар Бабкоў (раман «Адам Клакоцкі і ягоныя цені»), Андрэй Хадановіч (зборнік вершаў «Лісты з-пад коўдры»), Альгерд Бахарэвіч (кніга прозы «Натуральная афарбоўка»), Людміла Шчэрба (фільмаслоў «Уладар рыбаў»).

Галоўным героем раману І. Бабкова ёсьць сон – сон Беларусі і сон аб Беларусі. У гэтым сэнсе назіраецца немінучае падабенства з «Хазарскім слоўнікам» Міларада Павіча.

Паэт А. Хадановіч стварае перапоўненыя іроніяй каляжныя тэксты, дзе нават малападрыхтаваны чытач адчувае нешта знаёмае (цытаты зь беларускіх і сусьветных клясыкаў, вобразы масавай культуры і г. д.). Гэткі дэмакратычны, калі не сказаць папулісцкі, постмадэрнізм Хадановіча і зрабіў яго за лічаныя гады адным з самых вядомых паэтаў сёньняшняй Беларусі.

У рамане А. Бахарэвіча адчуваецца пакепліваньне з эгацэнтрызму некаторых пісьменьнікаў. Герой ягонага твору – літаратар-постмадэрніст, які дзеліць сваё жыцьцё на дзьве разнаякія паловы: з аднаго боку творчасьць і рэдакцыі, зь іншага – фізычная праца і расчынаньне ў масах.

Цэнтральнай постацьцю нечаканага для крытыкаў твору Л. Шчэрбы выступае гратэскавая дэманічная істота – кот з рыбінай у лапах, адлюстраваны на карціне галоўнага героя пісьменьніка. У творы прасочваюцца істотныя паралелі з Э. Т. Гофманам, Я. Баршчэўскім, М. Булгакавым ды інш. Галоўная тэма – творчасьць і каханьне, даведзеныя да абсурду ў эпоху постмадэрнізму ды інфармацыйных тэхналёгіяў.

ЧАС МАСТАЦКАЙ РАЗНАСТАЙНАСЬЦІ

Сам час, дыктуючы мастацкую разнастайнасьць, змушае аўтараў знаходзіцца на скрыжаваньні напрамкаў. Таму розныя пласты творчасьці багата якіх пісьменьнікаў можна аднесьці да розных кірункаў. Адам Глёбус у «Дамавікамэроне» (жорсткаіранічны сынтэз урбаністычнага і традыцыйнага фальклёру), хутчэй, выглядае постмадэрністам, а ў зборніках прозы «Койданава» і «Браслаўская стыгмата» – рэалістам. Вершы Людмілы Рублеўскай (напрыклад, зборнік «Балаган») – нэарамантызм, ейная ж проза, прынамсі кніга «Старасьвецкія міты гораду Б.» зь пераніцаванымі антычнымі сюжэтамі – постмадэрнізм. Уладзімер Арлоў у рамках кожнага свайго твору прымудраецца быць і рэалістам, і містычным рэалістам (ня горшым за Жоржэ Амаду!), і постмадэрністам (найперш праз сваю непаўзьдзержную іронію), і не ўнікаць яшчэ пры тым рамантычнага антуражу. Тое ж можна сказаць і пра ягонага земляка Пятра Васючэнку, які піша творы па вонкавым антуражы дзіцячыя, а па сваёй унутранай сутнасьці – вельмі дарослыя, як, прыкладам, «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі».

Творчасьць Юр'я Станкевіча цяжка паддаецца напрамкавай ідэнтыфікацыі. Ягоную прозу (зборнік «Любіць ноч – права пацукоў») умоўна можна вызначыць як *чорны беларускі рэалізм*. Аўтар выхоплівае з рэчаіснасьці ўвесь бруд, змрок, пачварнасьць і бязьмежна гіпэртрафуе іх, не пакідаючы чытачу шанцу ўбачыць за гэтай чарнатою сонца будзь-якой надзеі. Герояў сваіх твораў – бандытаў, прастытутак, вычварэнцаў – Ю. Станкевіч паказвае досыць просталінейна і аднастайна.

Досыць хуткі працэс трансфармацыі беларускага грамадзтва, зьмена каштоўнасных арыенціраў перашкаджае пісьменьнікам панарамна, аб'ёмістымі творамі, адлюстроўваць сучаснасьць. У постсавецкую эпоху вельмі распаўсюджанымі сталіся размаітыя творы малых жанраў. Большыя ў параўнаньні з савецкімі часамі магчымасьці для замежных падарожжаў выклікалі пэўны бум падарожных нататкаў (напрыклад, «Амстэрдам» А. Глёбуса, «Божая кароўка зь Пятай авэню» У. Арлова). Вандроўкі па Беларусі, кантакты з жыхарамі правінцыі, назіраньні за бегам

жыцьця знутры народных гушчаў таксама стаюцца нагодай для літаратурных рэфлексіяў (эсэ З. Бартосіка «4000 км па ідэальнай БССР», с. Адамовіча «Бытавуха»). Постсавецкая абыдзёншчына знайшла свой адбітак у шматлікіх літаратурных дзёньніках («Турэмны дзёньнік» с. Адамовіча, «Койданаўскі дыярыюш» г. Матусевіч, «Зацемкі зь левай кішэні» Л. Галубовіча). Досыць хваравіта пісьменьніцкая і каляпісьменьніцкая грамада ўспрыняла пасьмяротную частковую публікацыю дзёньнікаў празаіка Вячаслава Адамчыка, зробленую яго сынам (Адамам Глёбусам). Але чытацкая аўдыторыя ўспрыняла іх абнародаваньне зь цікавасьцю. Аўтар дзёньнікаў вельмі востра адгукаўся аб многіх сваіх сучасьніках, выказаў непрымірымае стаўленьне да існага ў Беларусі рэжыму і ягоных кіраўнікоў (таму публікацыя і адбывалася з купюрамі). Комплексы і фобіі сучасных беларусаў атрымалі фіксацыю ў абсурдысцкіх і парадаксальных показках Віктара Шніпа «Сабачыя гісторыі», што спарадзілі плойму пераймальнікаў.

Такім чынам, не зважаючы на татальную русіфікацыю грамадзтва, наяўнасьць аўтарытарнага прасавецкага рэжыму, складанасьці адаптацыі да рынкавых умоваў, беларуская літаратура знаходзіць унутраныя рэзэрвы для разьвіцьця. Літаратурны працэс абнаўляецца і амалоджваецца. Няма такога напрамку, у якім бы ні спрабавала сябе беларуская літаратура. У ёй няма цяпер забароненых тэмаў. Кнігі, абмінаючы цэнзарскія нажніцы, выходзяць і распаўсюджваюцца. Беларускія пісьменьнікі жывуць для сябе і для грамадзтва, якое па-ранейшаму жадаюць сваімі ўплывамі зьмяніць.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 4 (38) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/01/07**
[image]

АДАМ ГЛОБУС

культавы беларускі пісьменнік. Летась у выдавецтве «Логвінаў» выйшаў яго раман «Дом». У Беларусі Адама Глёбуса таксама ведаюць як таленавітага мастака і пасьпяховага кнігавыдаўца.

Адам Глобус
Мой бедны таварыш, мой Сыс і дні незалежнасці

---

7 траўня. Субота.

23:15. Ляжу. Чытаю пра культуру маркетынгу ды маркетынг культуры. Жонка заходзіць у спачывальню з вялізным і, па ўсім відаць, дарагім букетам:

– Ты кветкі прынёс?

– Дзе ты іх знайшла?

– На лесвічнай пляцоўцы, пад дзвярыма нашай кватэры і студыі. Хочаш сказаць: букет прынеслі табе? Прыхільнікі з прыхільніцамі пачалі высцілаць твой шлях кветкамі?

– Я сплю. Букет твой. Ты знайшла, значыцца – кветкі твае! Запіскі ў букеце не было?

– А я ўзрадавалася, падумала: ты мяне кахаеш і кветкі прынёс, – жонка растрыбушвае букет, але ніякага паслання не знаходзіць.

– Слухай, у студыі 12 манекеншчыц, можа, каму з іх букет

прынеслі?

– Не, яны ўсе, як адна, адмовіліся.

– Выдатна, будзем лічыць, што букет наш агульны.

24:00. Жонка ідзе дафатаграфоўваць 12 чарговых прыгажунь у новых карсетах. Я стаўляю кветкі ў вазу, пасярод пакою, і кладуся чытаць пра культурны маркетынг. Начытваюся пра масавую свядомасць, загнаную ў гіпермаркеты, і засынаю ў кветкавым водары.

8 траўня. Нядзеля.

03:45. Нехта, вельмі не раўнадушны да маёй асобы, не спіць і распаўсюджвае ў Інтэрнеце паведамленне: «Памерла жонка Глобуса. Інсульт». Замест подпісу ставіцца: «Я ў шоку!»

11:00. Мяне такім мэсіджам не праб'еш, жонку маю тым больш не зачэпіш. Але знаходзяцца ўражлівыя людзі, якія вырашаюць праверыць праўдзівасць інтэрнетнага паведамлення. Адзін Вова тэлефануе да другога Вовы, другі Вова – да маёй мамы… Ну і коціцца дэзінфармацыя, як свабоднае кола з амерыканскай горкі.

14:00. Паўдня я з жонкаю цешуся яе пазачарговым уваскрашэннем.

– Што з жонкаю?

– Уваскрэсла. З мёртвых паўстала.

15:00. Гісторыя пра смерць і ўваскрашэнне вельмі развесяляе гасцей на дні нараджэння Таццяны – жонкі майго брата. Мы ямо смажанае ягня ў грузінскай рэстарацыі і адзначаем у тостах два дні народзінаў. Весела, не тое слова, смяемся да сутаргаў у страўніках.

19:30. Пасля вялікага балявання сам сябе выгульваю ў горадзе. Звоніць Паўліна Сцепаненка:

– Памёр Сыс!

– Поля, калі гэта падман, калі гэта жарт, калі Толік жывы, я да цябе прыеду і заб'ю! Я паўдня ўсім знаёмым казаў, што мая жонка не памерла, цяпер я буду ўсіх знаёмых абзвоньваць і казаць, што замест маёй жонкі Сыс памёр?! Так? Зараз паеду да яго, і не дай ты Бог, каб ён быў жывы!

Паўліна нейкая млявая і абыякавая да маіх вербальных экспрэсіяў. Яна ўжо аплаквае смерць вялікага паэта. А я спадзяюся на чарговую памылку. Маю падставы…

Першага беларускага красавіка – свята дурня. Менавіта першага красавіка дурні забываюцца на тое, што яны – дурні поўныя. Выключэнняў не існуе. На свята дурня дурэюць і дурнеюць усе.

– Званілі з твайго могілкавага таварыства «Кальварыя»? – падземным голасам спытала ў мяне жонка. Дурань мог бы здагадацца: рыхтуецца падман. Я паверыў.

– Твой Сыс памёр. Трэба хаваць!

– Хто дакладна званіў?

– Паверыў, паверыў, падманула!

Я паспрабаваў парадавацца, што Толік жывы. Радасць атрымалася змушаная. Такая ж безымпэтная радасць была і ў Віктара Шніпа, якога разыгралі з той жа, доўгачаканай, смерцю Сыса.

– Як падумаў, што давядзецца за 300 кіламетраў везці труну, дык страшэнна расстроіўся. А каб ён згарэў, гэты наш Толік!

Карацей, у мяне ёсць падставы не верыць Паўлінцы. Але маецца важкі аргумент, каб спраўдзіць навіну. Голас у Паўліны быў з непадробна-жалобным адценнем.

Варта нагадаць: усе мы любім Сыса. Шчыра, аддана, па-сапраўднаму любім і шануем паэта.

20:15. Заходжу на працу. Знаходжу стары тэлефонны даведнік. Адшукваю нумар Алы Канапелькі – Толікавай суседкі. Набіраю. Голас старой жанчыны цікавіцца, што мне трэба.

– Алу!

– Алу? Выдатна. Вам якую Алу, бландынку ці брунетку? У нас сягоння вялікі выбар. Раскажыце пра свае пажаданні, і мы выберам самую адпаведную, самую сексуальную Алу…

– Прабачце, я, здаецца, памыліўся …

– Ды не саромцеся, расказвайце, якую жанчыну вы хацелі б любі…

Абрываю сувязь.

20:30. Набіраю сотавік Барыса Пятровіча.

– Так! Праўда, памёр! Мы з хлопцамі збіраемся ехаць на ягоную кватэру. Праз паўгадзіны будзем.

– Там і сустрэнемся.

22:15. У кватэры паэта вісіць густы і цяжкі дух чалавечай крыві.

– Вось тут ён ляжаў. Бачыш плямы? Сястра замывала, але не замыла, – Ала не можа адвесці вачэй ад цёмных плямінаў на жаўтавата-залацістым ліноліуме. Праходжу з вітальні ў пакой.

– Хаваць будзем на Раданіцу, бо 10 траўня, на Раданіцу, брама ў рай адчыненая; і наш Цішка пойдзе адразу ў рай. Цішка… У нашым Гарошкаве Сысоў многа, таму нас клічуць Цішкамі. Бацька наш – Цішка, і мы ўсе ягоныя Цішкі, а не Ціханавічы, – твар Анатолевай сястры Валянціны зморшчваецца ад пакутлівай горычы, і яна пачынае плакаць.

22:30. Звоніць Вольга Караткевіч з радыё «Свабода». Прапануе з самай раніцы, а сёмай, сказаць у жывым эфіры колькі слоў пра Сыса. Пагаджаюся. Шкадую, што не адмовіўся, але запозна.

Кажу да Валі:

– Пакуль мы тут усе свае, збярыце рукапісы Анатоля, складзіце ў скрыню ды аддайце Але ці Барысу.

– Не, мы з сястрою іх забярэм і завязем у Гарошкаў, а то вы знойдзеце нешта брыдкае, надрукуеце, а я не хачу…

Згадваецца, як Наталля – сястра Уладзіміра Караткевіча – спаліла братавы лісты, а потым шкадавала.

Іду на кухню, састаўляю пад стол пустыя бутэлькі з-пад гарэлкі і віна. Куру. Сыходжу не развітваючыся. Па дарозе дамоў пішу развітальны верш, у якім выпраўляю душу Сыса ў светлы і празрысты, райскі дом.

Ёсць меркаванне, нібыта сапраўдныя вершы пішуцца толькі ўначы, але я ў гэта не веру. Я мала ў што веру.

9 траўня. Панядзелак.

02:15. Стомлены, як звяруга-валацуга, валюся спаць.

03:15. Прачынаюся. Варочаюся з боку на бок. Не спіцца. Устаю. Сядаю за стол і пішу развітальныя словы:

Памёр паэт. Памёр беларус Анатоль Сыс. Ён быў для мяне паплечнікам і сябрам. Для нашай Бацькаўшчыны Анатоль Сыс быў, ёсць і застанецца вялікім паэтам. Лёс падараваў мне знаёмства з многімі паэтамі, але толькі Анатоль Сыс мог насіць гэта званне без усялякіх дадатковых азначэнняў. Сыс быў паэтам і больш нікім. Паэтам, які не напісаў ніводнага кепскага радка. Сыс – проста паэт. У простасці ягоная веліч. Дзякуючы

такім, як Анатоль Сыс, беларускі народ узняўся на барацьбу за сваё вызваленне. Дзякуючы Сысу над Беларуссю зноў залунаў бел-чырвона-белы сцяг, пад якім Беларусь наноў здабыла дзяржаўнасць. Анатоль не стаў палітыкам, не стаў дзяржаўным дзеячам – Анатоль застаўся паэтам. Ён застаўся верны лёсу і залатымі літарамі ўпісаў сваё імя ў гісторыю беларускай паэзіі. Паэтычная зорка Анатоля Сыса будзе вечна свяціць для тых, хто любіць жывую Беларусь. Таму сапраўдная Беларусь сягоння ў вялікім смутку: яна плача, яна страціла свайго паэта.

Плакатна выйшла, манументальна, з непрыхаванай прапагандысцкай жорсткасцю. На 9 траўня, на дзень Перамогі, інакш і не выкажашся, бо не пачуюць.

Вайна – народнае свята. У Беларусі святкаванне дня заканчэння другой усясветнай бойні ўжо 60-ты раз набывае форму масавага запою з адценнем вар'яцтва.

Не сплю. Чакаю званка з радыё. Не тэлефануюць. Чаму? Батарэйка села. Падключаю тэлефон.

07:15. Званок. Наконт абставінаў смерці Сыса кажу наступнае:

Гэта драматычныя абставіны. Яго знайшла паэтка Ала Канапелька, яна тры дні бачыла, як гарэла святло ў ягонай кватэры і потым вырашыла выклікаць міліцыю. Міліцыянты адмовіліся ламаць замок, бо не было сваякоў. Давялося выклікаць сястру. З Брэста прыехала Валянціна. Анатоль ляжаў у вітальні, колькі дзён як нежывы. Цела адвезлі ў бальніцу. Сёння эксперты дадуць заключэнне аб смерці. Потым ужо вырашыцца, дзе адбудзецца развітанне. Пахаваюць Анатоля ў Гарошкаве, на радзіме.

Тут і пачынаецца ваеннае народнае свята. Вайскоўцы ідуць. Народ п'е. Прэзідэнт вітае народ і дзячыць ветэранам. Толькі свята ў іх не атрымліваецца, бо неба несупынна плача халодным дажджом.

12:00. Тэлефаную Алісе Бізяевай, каб спраўдзіць інфармацыю, што менавіта Вова-23 напісаў дурню́ пра інсульт маёй жонкі. Тэлефон не адказвае. Неўзабаве ад Алісы прыходзіць эсэмэс: «Спадар Глобус! Даруйце, калі ласка, я ў Прыднястроўі. Ці не маглі б Вы звязацца са мной па мэйле?»

12:15. Пішу ліст: «Аліса, не знішчай постынг Рыдля-23, хай ён застанецца для гісторыі. Калі чалавек, нават несвядома, прыадчыняе дзверы смерці, скразняк зносіць слабое. Галінку «Кальварыя» я праз нейкі час перараблю, стварыўшы нешта падобнае. Ваш Глобус, які пайшоў развітвацца з Сысом».

12:30. Іду ў Саюз пісьменнікаў, дзе разам з Міхасём Скоблам рыхтую залу для развітання. Выносім крэслы ў бібліятэку, састаўляем сталы, на якія паставіцца труна. Паціху пачынаюць збірацца людзі. Міхась кажа, што ў бюро рытуальных паслуг няма праваслаўнага шасціканцовага крыжа, засталіся толькі простыя. «Возьмем просты крыж. Мы, напэўна, апошняе пакаленне, якое не звяртае ўвагі на такія ўмоўнасці», – кажу Міхасю.

14:15. З моргу звоніць Барыс, каб паведаміць, што Сыса ўжо апранаюць. Прыходзіць мая жонка з вялікай белай лілеяю. Яна ніколі не любіла розных умоўнасцяў, таму прыносіць адну кветку і кладзе яе на жалобны стол, у пустой зале. Згадваецца Апалінэраў верш: «Тры лілеі, лілеі тры, на магіле маёй без крыжа…» Падыходзяць і падыходзяць людзі. Іх усё больш і больш. У руцэ Сяргея Панізніка бачу тры паэтычныя зборнічкі: Сысоў, Сокалава-Воюша і мой. Робіцца ніякавата, нібыта тутэйшая публіка збіраецца пахаваць і частку мяне. Іду ў парк. Падыходзіць Паўліна:

– Пайшлі, кветкі пакладзем.

– Няма ў мяне кветак.

– У мяне 4. Табе 2 нарцысы і мне 2. Любіш нарцысы?

– Астры люблю.

15:00. У натоўпе Лявон Баршчэўскі штурхае мяне пад локаць, крохкія сцябліны нарцысаў пераломліваюцца напалам. Такія пераламаныя кветкі я і кладу каля засланай бел-чырвона-белым сцягам труны. Слухаць развітальныя прамовы не хочацца. Гледзячы на калялітаратурны тлум, думаю: «А над труною Толіка Сыса яны падзеляць месца першага паэта…» Разам з братам Міраславам і пляменнікам Чэсікам крочу на праспект, які ў гэты дзень пераназываецца з праспекта Скарыны ў праспект Незалежнасці. Буду лічыць, што пераназыванне робіцца ў гонар Сыса, які ўсё сваё жыццё празмагаўся за незалежнасць.

15:15. Думаецца такое: Сыс насамрэч памёр у 1991 годзе, у дзень абвяшчэння Незалежнасці Беларусі, з 1991 па 2005 Сыс піў, што да вершаў, апублікаваных пазней, дык ён проста ўспамінаў складзенае раней і запісваў. Да 1991-га мы пісалі і выдавалі кнігі, каб атрымаць незалежнасць, калі не поўную незалежнасць, дык хоць бы праспект Незалежнасці. Атрымалі, і стала горка. Атрымліваем, і робіцца яшчэ гарчэй.

10 траўня. Аўторак.

13:00. З Міхасём Талочкам у кавярні «Брыганціна» памінаем Сыса. Міхась п’е каньяк і есць перасоленую юшку. Я абыходжуся гарбатаю. За вокнамі «Брыганціны» праплывае Ганна Кісліцына. «Патэлефанаваць? Запрасіць?» – «Тэлефануй!». Званю. Ганна не чуе. Праспект Незалежнасці шумны.

11 траўня. Серада.

16:00. Сын Мікалай расказвае, што да яго заходзіла Ядзя з пісьмом ад былога ўхажора Сашы. Гэта ён прынёс букет кветак з пальмавымі лістамі і паклаў пад дзвярыма студыі, а пісьмо

схаваў пад дыванок. Таму мы яго і не знайшлі. У пісьме ён зноў прызнаваўся ў каханні да маёй дачкі і нават пагражаў скончыць жыццё самагубствам, калі Ядзя выйдзе замуж за другога. Ну, гэта справа Ядзі і Сашы. А вось другая частка паслання тычылася непасрэдна мяне. У ёй Саша пісаў, што выправіўся, што займаецца сваёй адукацыяй і ўсталяваннем побыту, што можа забяспечыць нашай дачцэ дабрабыт і шчаслівае жыццё.

18:00. Барыс Пятровіч расказвае, што ў Гарошкаве магілу выкапалі Алесь Наварыч з Андрэем Федарэнкам. Ім яшчэ давялося спілаваць і выкарчаваць вялікую бярэзіну. Яшчэ Барыс распавядае пра морг, дзе патолагаанатам зрабіў ускрыццё і пакрыў твар Сыса бальзамічным растворам, каб плоць не спаўзала з чэрапа. Твар паэта быў чорны, як зямля. Нябожчыка шчыльна загарнулі ў цэлафан і закрылі ў труну. Адкрываць труну дактары забаранілі, бо на паветры цела імгненна распаўзецца. Барыс моцна перажывае, што пагадзіўся глядзець на труп.

12 траўня. Чацвер.

08:00. Boeing. Лячу з Менска ў Маскву. На крэсле, у кішэні, пад адкідным столікам, разам з планам экстраннай эвакуацыі ляжыць часопіс «Horizons BELAVIA». Часопіс гламурны, дзяржаўна-глянцавы, адпаведны боінгу. Зрэшты, ён і рабіўся на замову авіякампаніі. У часопісе ёсць артыкул «Сферы Глобуса» Міхася Талочкі, дзе распавядаецца пра стварэнне літаратурнага таварыства «Тутэйшыя». «Яны былі таленавітымі рамантыкамі» – гэта пра такіх, як Сыс. «Глобус быў таленавітым рэалістам» – пра мяне. «Яны былі нацыяналістамі» – зноў пра такіх, як Сыс. «Глобус мысліў глабальнымі катэгорыямі». Вось яна – наша слава. Цяпер кожная беларуская стуардэса пазнае мяне ў твар і ведае, у што я апранаюся і як рэкламую «BOSS».

14:00. З Якавам Хелемскім і Аляксандрам Івановым узгадняю выдавецкія планы. Недарэчны званок:

– Я Рыдаль-23!

– Слухаю цябе, Вова-23.

– Давайце жыць мірна і не будзем больш сварыцца.

– Скажы Алісе, каб прыбрала з галінкі «Кальварыя» твой допіс пра смерць маёй жонкі, і будзем лічыць інцыдэнт вычарпаным.

13 траўня. Пятніца.

15:00. У скрыні знаходжу паведамленне, Аліса даслала свой ліст і ліст Каткоўскага: «Alisa, pryvitannie! Jak majessia? Szto robisz? Ja ciapier u Miensku, ale uzo zautra jedu nazad… Maju da ciabie malenkuju prosbu: zniszczy, kali laska, moj dopis pra zonku Hlobusa u halincy «Kalvaryja». Dziakuj! Добры дзень, спадар Глобус! Па просьбе Рыдля вынішчыла гэты камэнтар. Не крыўдуйце. Думаю, так лепей – такое і для гісторыі пакідаць не трэба. Усяго найлепшага. Жывіце доўга!»

15:15. Дзе слёзы? Чаму я распавядаю пра смерць Сыса без слёз? Можа, у мяне наагул скончыліся слёзы? Не. Толькі хай Толю аплакваюць слязьмі іншыя. На Анатоля Сыса слёз больш няма, у мяне няма. Сціскаю зубы. Скрыгат. Металічную каронку, што прастаяла 20 гадоў, выплёўваю на далонь. Яшчэ і каронка! Пятніца, 13-га, 9 дзён, як карона беларускай паэзіі згубіла гаспадара, а тут яшчэ і зуб зламаўся, усё не дзякуй богу.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/07
[image]

АКСАНА БЯЗЛЕПКІНА
асьпірантка філфаку БДУ.
Аўтарка кнігі «Разам і паасобку: Таварыства «Тутэйшыя» (Менск: Беларускі кнігазбор, 2003).

ЯГАМОСЦЬ

Ён стаяў у атачэнні даўніх знаёмых на ганку выставачнага цэнтра на вуліцы Янкі Купалы. 15 чэрвеня 2004-га. Год таму. Пра сустрэчу было дамоўлена. Мой тэлефон яму далі ў выдавецтве, дзе выйшла кніга пра «Тутэйшых» з невялікім раздзелам пра Сыса («Вы недаацанілі Сыса», – сказалі выкладчыкі пра маю дыпломную работу).

– Як ты мяне пазнала? – у голасе Сыса змяшаліся пісьменніцкае какецтва і гонар за тое, што яго ўсё яшчэ пазнаюць.

– Бачыла фатаздымкі, – адказ задаволіў паэта, хаця складана было б не вылічыць яго ў пераважна жаночай кампаніі.

Я марна спрабавала адшукаць у ягоным абліччы нешта, што паказала б мне яго тым – маладым, таленавітым, вядомым. Але...

На твары шчацінне, як пожня жытнёвая,
вочы – праталіны мутнай вады...

На сустрэчу я абачліва захапіла і ягоную кнігу, і фотаапарат.

Мы падпісалі адно аднаму кнігі, і абое сурочылі. Я спадзявалася на плённае супрацоўніцтва (*Ты ж ведаеш, як інтэрв'ю робіцца? Бярэш бутэльку гарэлкі, палку лівернай... і яшчэ... Здымкі прынясі!*), а ён напісаў «Бязлепкіна, ляпі! Толькі каб гліна не перасохла».

Гліна перасохла на наступны дзень. Цытую па нататніку:

– Прывітанне, гэта Анатоль. (Па голасе Сыса было чуваць, што чалавеку тэрмінова трэба даць інтэрв'ю з бутэлькай і ліверкай, можна без здымкаў.) Прыязджай зараз да мяне. Я табе ўсё раскажу.

Я адмовілася, за што мае даследчыцкія здольнасці і прафесійная апантанасць былі досыць невысока ацэнены Сысам дасяжным яму спосабам.

Ёсць агідныя словы.
Агідных паэтаў няма.

Такога знаёмага не сорамна мець толькі ў тым выпадку, калі памятаць яго іншым. А мая віна перад Анатолем Сысом была хіба што ў тым, што я не заспела ягонага росквіту. І было агідна...

Кажуць, паводзіны яго былі супярэчліва-хвалістыя: ад грубых эксцэнтрычных учынкаў да амаль дзіцячай радасці. Зараз, калі хочацца ўспамінаць пра Сыса толькі добрае, прыгадваецца, з якой ахвотай ён пазіраваў перад фотаапаратам. Але пасля вышэйзгаданай размовы здымкаў так і не атрымаў...

Ларыса Раманава, сустрэтая на навуковай канферэнцыі за месяц-два да Сысовай смерці, нагадала мне пра тыя здымкі: «Анатоль любіць, калі да яго людзі добра ставяцца». «І людзі любяць», – адказала я, хаця аніякай крыўды на Сыса не трымала. Бессэнсоўна крыўдаваць на птушак, сабачак, малых дзяцей... і паэтаў? Але для сябе я тады ўжо вырашыла, што бачыць яго зноўку не хачу, што лепей буду лічыць, што мы незнаёмыя, чым такое знаёмства.

Я
яшчэ
не попел
і не прысак
пакахай мяне
такім як ёсць –
у боскіх іскрах
і ў шампанскіх пырсках
Ягамосць!

І калі Леанід Галубовіч выказаў спадзяванне (якое па сутнасці было амаль загадам для калег-крытыкаў-літаратуразнаўцаў-мемуарастваральнікаў), што ў гісторыі застанецца толькі Сыс-паэт, а не Сыс-чалавек, я была абсалютна згодная: сапраўды, хай застануцца толькі ягоныя вершы!

ПАСІЯНАРЫЙ

Жыць у эпоху перамен – незайздросны лёс. Хіба што за выняткам тых, хто народжаны адмыслова дзеля таго самага моманту – пераменнага. Сыс-паэт можа застацца ў літаратуры без Сыса-чалавека, але робіцца мізэрным без гістарычнага кантэксту.

Алесь Аркуш звязваў крах паэта з крахам таварыства «Тутэйшыя», з наступнымі гістарычнымі падзеямі. Мушу не пагадзіцца. Анатоль Сыс – узор пасіянарыя. Чалавек адной місіі.

Гэта лёс. Вы не верце, што гэта стыхія,
пэўна ж, трэба камусьці
вось так расказаць пра жывых,
каб пачулі глухія, відушчымі сталі сляпыя
дый убачылі – зоркі ўзыходзяць
таксама й для іх.

Гісторыя можа разгортвацца паводле любога сцэнара, але пераход на іншыя рэйкі раней ці пазней заканчваецца, і

пасіянарыі робяцца непатрэбнымі ў спакойным штодзённым жыцці. Яны пакутуюць самі і катуюць іншых, бо жывуць у атачэнні «янычараў» і «груганоў». Яны гіперадказныя за лёс краіны, мовы, культуры, ужо і не зразумець – шчыра ці штучна.

ты адзін, ты адзін, ты адзін,
ты застаўся адзін на славяншчыне,
і Радзіма твая, паглядзі, –
русакосая янычаршчына.

Яны ўрэшце пачынаюць блюзнерыць, злоўжываючы *эфектам эфекту*. Такіх людзей змяшчалі ў вязніцы, каралі, выпраўлялі ў крыжовыя паходы, абы толькі выключыць з грамадскага жыцця. Сыс выключыўся сам.

І ягоныя вершы засталіся актуальнымі для колішніх паплечнікаў (як напамін пра вірлівую маладосць) і для такіх самых асоб, зацятых ды імпэтных, ад якіх нічога не залежыць.

Я – тут! Я шугаю полымем!
Праз боль я з сябе бяру
Каменне рукамі голымі
І гэткім, як сам, дару.

Аўдыторыя прымае і «каменне», і «полымя» – як шлюз, як сублімацыю дзеянняў, што несумненна карысна для грамадскага спакою. Калі ў 1980-х гадах вершы Анатоля Сыса крытыкавалі за нейкія недарэчнасці, гэта было бессэнсоўна і безвынікова: для гледачоў-чытачоў Сыса змест і мастацкія вартасці ягонай паэзіі значэння не мелі: для іх быў нашмат важнейшы адраджэнскі пафас з усімі ягонымі складнікамі.

У вершы Сыса неабавязкова ўдумвацца (нават так!), за імі болей, чым імі сказана. Філалагічны разбор на «малекулы» ім зусім не пасуе. Чытаеш іх у цішыні за пісьмовым сталом і бачыш, што яны часам нелагічныя, з сэнсавымі праваламі, пераскокваннямі, а прачытаеш уголас, хаця б і не перад публікай – перад люстэркам (нават не валодаючы «шаманскім

тэмпераментам» аўтара), – і гучаць, і клічуць, і плачуць! І ўжо не чапляецца вока за «паэты-санеты» і «вочы-ночы».

Адзначыўшы саракагадовы юбілей, ён абяцаў пісаць, ён угаворваў сябе, што верыць у вяртанне натхнення...

СЫС УСЕМАГУТНЫ

Ён быў шчодры: пісаў вершы пра сябе і ахвяроўваў іх выбітным асобам Беларусі. Ён пісаў пра сябе ўяўнага – больш трагічнага, больш значнага, роўнага ўжо не Купалу – Богу.

Я думаў,
вершы мае відушчыя,
аж пакуль не аслепнуў сам
ад маланкі, самім жа пушчанай,
я гарэў, як бязбожны храм,
сам сабе я ў ім здаўся богам,
адпускаў сам сабе грахі...

Усведамленне ўласнай абранасці перапаўняла паэта. «Мама, такога народзіць не кожная» і «Ніхто не мае права спаць з Паэтам» – тут самае сціплае і зразумелае. Напісаў бы такое іншы паэт, выклікаў бы смех ці абурэнне, а верагодна – проста не заўважылі б. А Сысу можна, яму напраўду можна.

Паэт – боская птушка,
яго нельга чапаць,
трэба Хрыста чакаць,
трэба Хрысту ногі цалаваць...

А мо і спраўды – абраннік? Які можа дазволіць сабе быць і ўладаром, і маргіналам у адной асобе. Наймагутнейшы («Я зжэр бы свой народ») і найслабейшы («Не ганіце мяне! Не ганіце...»).

Мой мужчына каханы,
Айцец, Сын, Святы Дух!

І ўсё-ткі падступна варушыцца сумненне – абраннік ці закладнік эфектнасці? Напраўду заручаны з Айчынай і паэзіяй ці спекулянт? Бог, Ісус, маці, Айчына, гайворан віновай масці, кбты – усё настолькі самаахвярнае і пакутлівае аж да бяспройгрышнасці. *Ты прабач, у мяне закаханая*, – кажа лірычны герой і свядома абірае паэзію, Айчыну, катаванні, сцяканне крывёй – а значыць, адзіноту і безнашчадкавасць.

Я ведаю, атаясамліваць паэта і яго лірычнага героя – несумленна. Але Сыс сам імкнуўся да гэткага зліцця героя і аўтара (нават у неабавязковых дробязях: *Ёсць каханка, прыйдзе ў хату, скажа: Толік*), ды ягоны герой не жыў, ён пакутаваў напоўніцу. Цяпер, напэўна, немагчыма сказаць, чыя пакута там была першаснай (аўтара ці героя) – і ці не была яна спачатку прыдумана, а потым нязграбна ўвасоблена. І ці была яна наогул?

Я ўсім кажу, што я паэт найпершы,
калі ж папраўдзе: першы жыццялюб!

АПОШНІ ТЭСТ, АЛЬБО МАЯ ХАТА БЕЗ СЯБРОЎ – НЕ ХАТА
На адкрыцці канферэнцыі, прысвечанай памяці выбітнай беларускай паланісткі, казала прамову яе даўняя сяброўка і каляжанка. Спачатку я расчулілася ад таго, які складаны, пакручасты лёс можа быць у чалавека, сапраўдная гісторыя змагання і навуковай упартасці. Гэта ўжо пасля я прагматычна падумала, што мала самому пражыць годнае і плённае жыццё, але яшчэ важна сябраваць з чалавекам, які зможа *потым* расказаць і пра годнасць тваю, і пра плён, правільна расставіўшы акцэнты.

Кожны вядомы чалавек – як яблычак на рынку: можна выставіць яго прывабным румяным бачком, а можна – падрапаным, і яшчэ раскалупаць. Сыс – гэта з’ява ў беларускай

літаратуры, але сапраўднае, самае каштоўнае і самае праўдзівае слова пра яго могуць сказаць тыя, хто ведаў паэта асабіста з маладых гадоў. Новыя пакаленні літаратуразнаўцаў патрапяць прачытаць ягоныя вершы і аднавіць кантэкст, але без сведчанняў ягоных сучаснікаў тэорыя застанецца неаплодненай.

І сталі дружна, шчыра, шчыльна,
як на касьбе ці на сяўбе,
паэт сказаў: п'ем за Айчыну!
І кожны выпіў – за сябе...

Цяпер менавіта ад сяброў Анатоля Сыса залежыць, што яны ўспомняць пра выбітнага паэта, што яны пакажуць наступнікам – яго побыт ці светапогляд. Вершы пішуцца паэтамі, легенды ствараюцца атачэннем.

Як іду, дык вянец мае скроні
балюча шкрабе,
а душа ўся ў балячках,
бы вопратка сейбіта ў зернях.
Я памру, землякі, а легенду
пакіньце сабе,
а дакучлівых вошай шукайце
ў пакінутых цернях.

Першы крок да стварэння легенды зроблены – паэт памёр. Далей усё залежыць не ад яго. Цяпер колішнім паплечнікам Сыса вырашаць, якое месца ён заслужыў у беларускай літаратуры сваім жыццём і творчасцю – каморку ці пентхаўз. Напэўна ж, пентхаўз, але няма чым мэбляваць.

Помню, як аднойчы чытала зборнік твораў ды ўспамінаў, дзе аўтар так захапіўся збіраннем літаратурнай спадчыны ў самым шырокім сэнсе, што нават паклапаціўся пра захаванне для нашчадкаў фразаў, якімі пэўны расійскі класік суправаджаў гульню ў карты.

Ці парупіцца хто-небудзь пра «мэбляванне пентхаўза» для Сыса? Яму наканавана прайсці апошні зямны тэст – на сяброў, як і ягоным сябрам – на сяброўства...

У Анатоля Сыса ніколі не будзе Збору твораў ці нават томіка ў цвёрдай вокладцы. Ён напісаў занадта мала, меней за Максіма Багдановіча ці нават Сяргея Палуяна. У тоненькую кніжачку «Сыс» увайшло амаль усё, створанае ім (за выключэннем некалькіх вершаў і паэмы «Агонь-птушка»). Але не колькасцю напісанага вызначаецца талент.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 4 (38) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/07
[image]

АЛЕСЬ АРКУШ
пісьменнік, публіцыст. Выдавец легендарных альманахаў «Калосьсе» і «Ксэракс беларускі». Яго апошняя паэтычная кніжка – «Прывід вясны» (Менск: Логвінаў, 2003).

Алесь Аркуш Сысова сьвятасьць і паганства

ЗНАЁМСТВА

З Анатолем Сысом я пазнаёміўся напачатку ліпеня 1986 году ў рэдакцыі «Маладосці». Я прынёс Яўгеніі Янішчык новыя вершы для публікацыі, і на калідоры сустрэў Сыса з Шніпом. Апошні мяне і прадставіў. Прыйшоў у Дом друку я зь дзяўчынай. Пакуль размаўляў у кабінэце зь Янішчык, Сыс, разьвітаўшыся са Шніпом, чакаў мяне з Ларысай на калідоры. Сам прапанаваў схадзіць куды-небудзь разам.

Пайшлі ў кавярню «Батлейка». Сыс пачаў агітаваць, каб паўсюль гаварылі па-беларуску – ня толькі міжсобку. Маўляў, спачатку нязручна, нібыта сорамна, ніякавата, але варта сябе пераадолець. «Вось глядзіце, як я зараз зь ім буду размаўляць». Сыс падыходзіць да стойкі і зьвяртаецца да бармэна: «Калі ласка, нам тры марозівы і тры філіжанкі кавы». Маладзён пачаў выконваць замову. «Ну, во, зразумеў зь першага разу», – узрадавана канстатаваў Сыс.

Мы селі за столік, Сыс узяўся нас абслугоўваць.

– А ты ведаеш, што ён мне сказаў, пакуль мы цябе чакалі? – пытаецца Ларыса гульлівым голасам.

– І што? – мне сапраўды цікава, пра што яны гаварылі на калідоры безь мяне.

– Сказаў, што ты добры хлопец, і мне варта трымацца цябе.

– І слушна сказаў, – жартую з пачуцьцём удзячнасьці да новага знаёмага.

Гучна сьмяёмся.

У размовах мінулі амаль дзьве гадзіны. Анатоль гаварыў пра «Талаку», пра моладзь, якая выбрала беларушчыну, пра маладую беларускую літаратуру, параіў зьвярнуць увагу на Разанава і Галубовіча. Напрыканцы сустрэчы запрасіў узяць удзел у масоўцы чарговай тэлеперадачы пра беларускую рок-музыку, якую рабіў на БТ Віталь Сямашка.

Перадача запісвалася 15 ліпеня з удзелам «Бонды». Я прыйшоў з Ларысай і братам Віктарам. Брат троху паздымаў нас сваім «Зэнітам». Гэта, бадай, найлепшыя здымкі Анатоля, якія ёсьць у маім архіве. Малады, амбітны, са сьветлым тварам. І толькі калі Сыс пасьміхаўся, на ягоным твары праяўлялася блазенская пячатка.

УРОКІ ЛІТАРАТУРЫ

Увосень 1986 году мы сустракаліся амаль штотыдзень. Пераважна на літаратурных вечарынах. 23 верасьня ўпершыню пабачыў і пачуў, як Сыс чытае свае вершы са сцэны. У Доме літаратара адбывалася сустрэча рэдакцыі «Маладосці» з чытачамі. Свае вершы чыталі Някляеў, Макаль, Аўрамчык, Канапелька і Сыс. Анатоль «прашаманіў» свае галоўныя «гіты»: «Спаўзаючы зь церня…», «У гэтай краіне ня маю я дому…», «Пацір». Нават Някляеў, які меў багаты досьвед чытаньня з эстрады, выглядаў побач з Сысом блякла. Гэта быў тэатар аднаго паэта. І нават не тэатар, а нешта стыхійнае, містычнае – рытуальныя малітвы на паганскім капішчы. Слухаць чытаньне Сыса было страшна.

У той жа час я ўпершыню наведаў інтэрнацкі пакой Сыса на

Авангарднай. Ён у той час працаваў на тэлебачаньні, прычым ня творчым супрацоўнікам, а тэхнічным, і ад працы меў жытло. Мяне зьдзівіў парадак у пакоі. Я быў студэнтам «наргасу» і прывык да бязладзьдзя студэнцкіх клятушак. А тут пабачыў амаль хатнюю ўтульнасьць. Дарэчы, у Сыса быў таксама надзвычай ахайны почырк.

Пасярэдзіне пакою, дзелячы яго на дзьве часткі (з Сысом разам жыў нехта яшчэ, але начаваў рэдка), стаяла вялікая кніжная паліца. Чаго там толькі ні было! Памятаю, як Сыс, нібыта найвялікшую каштоўнасьць, паказваў цяжкую таміну «Гісторыі беларускай (крыўскай) кнігі» Ластоўскага, іншыя «нацдэмаўскія» старадрукі. Сыс любіў Разанава і шмат яго чытаў. З расейскіх паэтаў у той час захапляўся Юр'ем Кузьняцовым. Зь вялікай павагай і цеплынёю ён ставіўся да Ларысы Геніюш. Наведваючы родную Гомельшчыну, Сыс заўсёды скупляў усе вартыя кнігі ў вясковых і местачковых кнігарнях – і дарыў знаёмым. Ёсьць сысоўскія падарункі і ў маёй бібліятэцы, напрыклад, «На чабары настоена» Ларысы Геніюш.

Сыс, ці то жартам, ці ад жаданьня, як сапраўдны вялікі паэт, мець вучняў, прапанаваў мне свае ўрокі паэзіі. Я прыносіў Анатолю новыя вершы, ён іх уголас дэклямаваў і выносіў вэрдыкт. Часта гэта гучала нешматслоўна: «херня».

Існуе легенда, што Сыс быў самародкам з божым таўром, народжаны ў пажары. Сыс сам гэтую легенду пашыраў, даводзячы, што ў яго «выпендрываньняў няма». Насамрэч, ён быў адукаваным і начытаным паэтам. Сын вясковай настаўніцы, ён скончыў філфак Гомельскага ўнівэрсытэту, свой шлях у літаратуру пачынаў з эпіграмаў на «сямідзясятнікаў», а гэта значыць, добра ведаў літаратурны наробак сваіх папярэднікаў, разумеў яго хібы і вартасьці. Няшмат ягоных калегаў па літцэху мелі такую адукацыю. Галубовіч і Шніп, якія таксама прыйшлі ў літаратуру зь вёскі, побач зь ім выглядалі самавукамі. Сыс разьбіраўся ў тэорыі вершаскладаньня, мог адрозьніць ямб ад харэю, жаночую рыфму ад мужчынскай, – гэта было рэдкай зьявай у коле тагачаснай літмоладзі. Культура вершаскладаньня добра заўважная ў ягоных вершах.

Яны прасякнуты літаратурнымі алюзіямі, культурніцкімі беларускімі мітамі, схаванымі цытатамі.

НАРОДЖАНЫ АДРАДЖЭНЬНЕМ

Шмат хто ўва ўспамінах пра Сыса згадвае, што ён называў сябе сынам Янкі Купалы. Я таксама ад яго гэта чуў. У 1986 годзе Анатоль паўсюль хадзіў са значкам з выявай Купалы. Па-мойму, няслушна трактаваць гэтае сысоўскае «прымазваньне» да клясыка як праяву «зорнага трызьненьня». Гэтым «самазванствам» Сыс, найперш, імкнуўся засьведчыць сваю місію «будзіцеля нацыі», каб завершыць справу Купалы.

Менавіта Сыс першым у 1980-х выйшаў на палітычныя мітынгі з паэтычным словам. Ягоныя выступы несьлі вялікі эмацыйны зарад. Яны заводзілі натоўп, як добрая рок-музыка. У той час ніводнае масавае палітычнае мерапрыемства ў Менску не адбывалася без удзелу Сыса. Я бачыў дзясяткі яго выступаў: на сцэне Дому літаратара, на мітынгу ў Верхнім горадзе, на паседжаньнях «Тутэйшых», у Вязынцы ля помніка Купалу, на Вальным Сойме маладзёвых суполак. Сыс рыхтаваўся да іх, як рок-музыґкі рыхтуюцца да канцэрту. З раніцы напярэдадні выступу ён хваляваўся, «накручваў» сябе, як спружыну.

Дарэчы, Сыс любіў рок-музыку. Неяк апавёў мне пра тое, як займаўся патрыятычным выхаваньнем хлопцаў з гурту «Магістрат», якія пасьля яго «апрацоўкі» засьпявалі па-беларуску. А аднойчы прызнаўся, што калі б не заняўся паэзіяй, дык абавязкова стаў бы рок-музыґкам. Сыс вельмі ўсьцешваўся, калі на ягоныя вершы пісалі песьні. Ён мог бы стаць і добрым акторам.

У «Тутэйшых» Сыс ачольваў фракцыю «патрыётаў», якія ператваралі літсуполку ў палітычную арганізацыю, што ішла ў фарватэры моладзевага нацруху разам з «Талакой».

Калі хваля адраджэньня 1980-х разьбілася аб хвалярэзы 1990-х, з Сысом адбылася трагедыя разбурэньня. Гэтак бывае з прафэсійнымі спартоўцамі, якія кідаюць займацца спортам.

СУПРАЦЬСТАЯНЬНЕ З ГЛЁБУСАМ

Мне цяжка сказаць, у чым тое супрацьстаяньне палягала, але яно было і адбілася на жыцьці Сыса. У 1986–1987 гадах, калі я часта бачыўся і размаўляў з Сысом, амаль пры кожнай гутарцы ён згадваў Глёбуса. Пераважна нэгатыўна, маўляў, ён і піша ня так, і паводзіць сябе несумленна. Сыс нават прыдумаў тэрмін для ўрбаністычнай паэзіі Глёбуса – «гудрон», а суполку Глёбуса – Сьцяпан, Шайбак, Клімковіч, Сіўчыкаў – называў не інакш як «глябусятнік». Неаднойчы чуў аповеды пра бойкі між Сысом і Глёбусам, пра канфлікты, разборкі, зьвягі.

23 кастрычніка 1986 году я наладзіў у «наргасе» сустрэчу студэнтаў з Сысом і Сіўчыкавым. Яна скончылася канфліктам паміж гасьцямі. Усё, што нахвальваў Сіўчыкаў, Сыс ваяўніча аспрэчваў. «Наргасаўская» шматтыражка «Экономист» з гэтай нагоды 29 кастрычніка 1986 году напісала:

Когда закончилось чтение, разошлись не сразу. И о прозвучавших стихах спор разгорелся, и о позиции авторов. И даже сами поэты крепко поспорили.

Сыс мэтанакіравана адваджваў мяне ад «глябусятніка». «Я цябе пазнаёмлю зь іншымі людзьмі», – сказаў Анатоль пасьля «наргасаўскай» сустрэчы і павёз на кватэру Ганны Фурс, якую прадставіў мне як сяброўку Ларысы Геніюш.

Віктар Шніп у шостым нумары «Крыніцы» за 2001 год, прысьвечаным Сысу, апісаў, як Глёбус «разьбіраў» рукапіс першай кнігі Анатоля:

З усяго рукапісу (будучага «Агменю») Глёбус пахваліў нейкую пару вершаў. Сыс заплакаў… Пазьней мне Глёбус казаў, што рукапіс вельмі сыры і слабы, а да ўсяго – з Сыса нічога асаблівага ня будзе (выдасьць пару кніжак, і ўсё) і закончыць ён вельмі дрэнна…

Ня думаю, што крыўда ад тае бязьлітаснай крытыкі і сталася

прычынай супрацьстаяньня паэтаў. Было нешта іншае, больш істотнае, сьветагляднае. Сыс пачуваўся побач з сынам вядомага пісьменьніка, якому было значна прасьцей уладкоўвацца ў жыцьці, гэткім клясычным «пралетарам», які мусіць сам дамагацца «месца пад сонцам». Але і гэта не галоўнае. Па-мойму, між імі ішла барацьба за лідэрства ў тагачасным асяродзьдзі літмоладзі. І кожны не зьбіраўся саступаць адзін аднаму. Гэтая барацьба ўзмацнілася падчас заснаваньня і дзейнасьці літсуполкі «Тутэйшыя». Кожнае паседжаньне завяршалася «перабрэхваньнем» паміж Сысом і Глёбусам.

У беларускай савецкай вёсцы 1970-х, якая выхавала Сыса, быць «крутым» значыла многа піць і быць мацнейшым у бойцы. У горадзе канца 1980-х «круцізна» вызначалася іншым паказчыкам: колькасьцю і вартасьцю купюраў у кішэні.

Сыс з Глёбусам спаборнічалі да канца.

ЗОРНАЯ ХВАРОБА

Тое, як Сыса пачала апаноўваць «зорная хвароба», адбывалася ўжо не на маіх вачах – у другой палове 1987-га я зьехаў у Полацак.

Але і раней Сыс пры любой нагодзе дэманстраваў сваю творчую перавагу над іншымі, асабліва ў асяродзьдзі раўналетак. Памятаю, у траўні 1987-га едзем на электрычцы ў Вязынку на сьвята паэзіі. Сыс нешта апавядае-апавядае і раптам зьвяртаецца да мяне:

– А ты ніколі ня будзеш пісаць лепш за мяне!

Я мушу годна адказаць:

– Буду, пачакай, мой час наперадзе.

Як бы падыгрываю яму.

– Давай паспрачаемся на пляшку каньяку!

– Давай!

Спрачаемся, нехта перабівае нам рукі. Анатоль адразу пераключаецца на нешта іншае. Гучна сьмяецца з сваіх, часам задужа прымітыўных, жартаў.

У 1992 годзе на музычны фэст «Басовішча» на Беласточчыну прыехаў ужо зусім іншы Сыс, якога я ня ведаў раней. Ён беспрабудна піў і скандаліў. Бедная Міра Лукша некалькі дзён запар цягала яго на сваіх дзявочых плячах. У мяне ёсьць відэазапіс, як Сыс выйшаў на сцэну пасьля выступу «Крамы» і пачаў чытаць «Пацір». Лысы, у бруднай майцы, у нагавіцах зь неахайна задранымі калашынамі. Разагрэтая публіка пачала сьвістаць і галёкаць. Сыса гэта яшчэ больш распаліла. Ён пачынаў раўсьці ў мікрафон нечалавечым голасам. Прачытаўшы радок «і сталі дружна, шчыра, шчыльна», ён спыніў чытаньне, нясьпешна прайшоўся па сцэне, прафэсійна вытрымаў паўзу, узяў загадзя падрыхтаваную шклянку з гарэлкай у рукі і дачытаў верш:

І сталі дружна, шчыра, шчыльна,
Як на касьбе ці на сяўбе.
Паэт сказаў: п'ем за Айчыну!
І кожны выпіў за сябе…

Гэта выглядала прыкладна гэтак сама, як Маякоўскі чытаў у кавярнях у жоўтай кофце: «Вот вы, мужчина, у вас в устах капуста…»

Скончыўшы чытаньне, Сыс тэатральна выпіў шклянку гарэлкі. Адразу загучалі першыя акорды «Мроі». Сыс пачаў танчыць і блазнавацца на сцэне, затым за руку выцягнуў з натоўпу на подыюм хлопца. Удвух яны ўзяліся імітаваць ігру на гітарах. «У мяне сола, а ў яго бас», – пракрычаў Сыс у мікрафон. Відэакамэра здымала са сцэны, чуваць, як Сыс на вуха кажа хлопцу: «Ня бойся». Гэтых «гітарыстаў» ледзь сьцягнулі з сцэны.

Гэта быў вялікі пэрформанс. Сыс разьвітваўся з мроямі. Сусьвет не зьмяніўся ад ягоных малітваў. Беларусь не пачула беларуса. «Ніхто яго не пакахаў…»

ПАЭЗІЯ – ГЭТА СЬВЯТОЕ
Пры ўсёй дэпрэсіі, у якой Сыс знаходзіўся апошнія 15 гадоў свайго жыцьця, уласная паэзія заставалася для яго вялікай сьвятыняй. Ён заўсёды верыў у яе прызначэньне і «абранасьць».

Але ён зайздросьціў тым пісьменьнікам-раўналеткам, хто здолеў стварыць нармальныя сем'і, нарадзіць дзяцей. Ён разумеў, што з гэтым шчасьцем незваротна разьмінуўся. Ён шкадаваў, што не пабраўся ў маладосьці шлюбам зь дзяўчынай, якую кахаў. Ён маніў, што недзе растуць яго дзеці, часта называў імёны жанчын – іх матак. Выглядала гэта непрыгожа, бо жанчыны гэтыя мелі сем'і, і дзеці тыя былі абсалютна не сысоўскія. Ён марыў! Ён трызьніў!

Сваю першую кнігу «Агмень» ён падпісаў мне наступным чынам: «Алесь, віншую цябе з нараджэньнем сына і з выхадам кніжкі! 30.XI.88 г. Менск». Ён як бы падкрэсьліваў, што сын важнейшы за кніжку.

Сыс гасьцяваў у мяне ў Полацку аднойчы. Напрыканцы лістапада 1999 году разам з Чаропкам ён прыехаў на прэзэнтацыю сёмага нумару часопісу «Калосьсе». Я сустрэў іх на чыгуначным вакзале п'яных і добра пакамечаных. Па дарозе яны ад душы «накаруселілі». Сыс пачаў калярытна, як тое мог рабіць толькі ён, апавядаць пра іх прыгоды. Пасьля доўга мяне ўгаворваў, каб я даў яму выпіць да прэзэнтацыі. Прыйшлося здацца. Але найперш Сыс прыняў ванну і адпрасаваў свой гарнітур, які прывёз з сабой.

– Падарунак з Амэрыкі, ад Валі Якімовіч, – патлумачыў ён нам.

– Сыс, канчай ты ўжо піць, пара за розум узяцца, – сказала яму мая жонка Тацяна.

– Ты што, мне сьмерці хочаш? Ды я не магу без гарэлкі, мой бацька мяне такім зрабіў, калі зачаў – палова было спэрмы, палова алькаголю.

Я прапанаваў Сысу выдаць ягоны новы зборнік у сэрыі «Бібліятэка часопісу «Калосьсе».

Ён спытаў:

– А ты ганарары плаціш?

– Не.

– Ну дык чаго прапаноўваеш, я выдаюся толькі ў «Мастацкай літаратуры».

І адмовіўся.

У наваполацкай бібліятэцы, дзе адбывалася прэзэнтацыя, ён перапужаў сваім чытаннем і сьпітым тварам бібліятэкарак, якія сядзелі ў першым радзе. Чытаць у яго не выходзіла. Спыніўся на палове першага ж верша і скрушна прамовіў: «Чаму так плакаць хочацца?» На ягоныя вочы сапраўды наварочваліся сьлёзы. Сеў, затым зноў пачаў чытаць са зборніка «Пан лес», затым зь нейкіх паперак, якія шпурнуў па прачытаньні ў залю. Ён заставаўся артыстам, але гэта ўжо была цьмяная копія Сыса канца 1980-х. Для чытаньня сваіх вершаў ужо не было энэргіі. Чары зьніклі, бо ў грамадзтве зьнікла запатрабаванасьць у гэтых чарах. Сьвятасьць аказалася апаганенай. Капішча раскіданым. Адраджэньне скончылася чарговым правалам.

Увечары, калі пасьля прэзэнтацыі ён зноў выпіў, яму зрабілася блага. Жаліўся на язву страўніка, піў ваду з содай. Але празь нейкі час зноў сеў за стол з чаркамі.

Сыс, нават з хворым страўнікам, працягваў піць. У яго зьявілася плойма эпігонаў, якія капіявалі ягоныя «антысацыяльныя» паводзіны і ў п'яным чадзе разважалі пра сваю абранасьць. Дапамагчы Сысу было ўжо немагчыма. Набліжаўся канец.

Чэрвень 2005, Полацак
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 4 (38) - 2005
[image]да Зьместу

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/07
[image]

Ідэі – рэч сур’ёзная, а часам і небясьпечная.

Зыходзячы з гэтага простага перакананьня, амэрыканскі часопіс «Foreign Policy» пры канцы 2004 году папрасіў васьмёх уплывовых мысьляроў загадзя папярэдзіць сьвет, якія ідэі ў бліжэйшай будучыні будуць мець найбольшую разбуральную сілу. Некаторыя зь іх маюць доўгую, часьцяком крывавую гісторыю. Астатнія – яшчэ ў зародку, жывяцца зь вялікіх адкрыцьцяў навукі і тэхнікі. Адныя – палітычныя, і мы ўжо чуем пагрозьлівыя раскаты грымотаў, што абвяшчаюць іх набліжэньне. Іншыя – больш адцягненыя, але ня менш заганныя. І ўсё ж, як вынікае з прапанаваных эсэ, небясьпечныя ідэі дасяжныя для стрэлаў удумлівага аналізу і адкрытага абмеркаваньня.

«ARCHE» цешыцца з магчымасьці прапанаваць гэтыя эсэ і беларускаму чытачу.

РОБЭРТ РАЙТ. Вайна са злом
ПОЛ ДЭВІС. Адмаўленьне свабоднае волі
САМАНТА ПАЎЭР. ААН: усё ў норме
ЭРЫК ГОБСБАЎМ. Распаўсюд дэмакратыі
ФРЭНСІС ФУКУЯМА. Трансгуманізм
МАРТА НАСБАЎМ. Рэлігійная нецярпімасьць
ЭЛІС М. РЫЎЛІН. Дармавыя грошы

Робэрт Райт
Вайна са злом

Зло вядомае сваёй нязводнасьцю. Каб зьнішчыць яго ў адным толькі Міжзем'і, спатрэбіліся тры даўжэзныя сэрыі «Валадара пярсьцёнкаў». Але ня менш жывучы і канцэпт зла – асабліва той, які акурат і выяўляецца ў фільме паводле Дж. Р. Р. Толкіена. Я пра ідэю, што за ўсім благім у сьвеце стаіць адна сусьветная цёмная сіла. І колькі багасловаў бы яе ні абвяргала, якой бы нестасоўнай да сучаснай навукі яна ні была, гэтая ідэя вяртаецца да нас зноў і зноў.

Здавалася б, сьвяты Аўгустын выбавіў ад яе сьвет яшчэ паўтара тысячагодзьдзя таму. Ён настолькі апантана змагаўся супраць падобнага ўяўленьня пра зло, супраць усёй маніхейскай тэалёгіі, часткай якой яно было, што ад яго ў сур'ёзным багаслоўскім дыскурсе нічога не засталося. З тае пары зло ўспрымалася не як нешта канкрэтнае, а як адсутнасьць дабра – падобна да таго, як цемра – гэта адсутнасьць сьвятла. Але потым прыйшлі пратэстанты, а разам зь некаторымі зь іх вярнулася і маніхейская ідэя сусьветнага змаганьня паміж сіламі дабра і зла.

Нядаўна выйшла кніга «Прэзыдэнт дабра і зла: этыка Дэкорда У. Буша». Яе аўтар, вядомы філёзаф Пітэр Сінгер выказвае думку, што прэзыдэнт – нашчадак менавіта гэтай плыні пратэстантызму. Безумоўна, прыклад Буша яскрава сьведчыць, як цяжка раз і назаўжды зьнішчыць уяўленьні пра існаваньне носьбітаў зла. Перад прыходам Буша да ўлады, у эпоху постмадэрну, калі халодная вайна засталася ў мінулым, слова «ліхадзеі» выкарыстоўвалася хіба ў іранічным сэнсе, а Саддам на кітчавых герояў мас-культу. Але пасьля 11 верасьня Буш пачаў ужываць яго на поўным сур'ёзе дый паабяцаў «вызваліць сьвет ад зла», а затым абвясьціў Іран, Ірак і Паўночную Карэю «восьсю зла».

Дык што тут благога? Чаму мне так муляюць ягоныя разважаньні пра зло? Таму, што ідэя зла – небясьпечная, а ў сучасных

РОБЭРТ РАЙТ, філёзаф, аўтар кніжак «NonZero: The Logic of Human Destiny» (New York: Pantheon Books, 2000) і «The Moral Animal: The New Science of Evolutionary Psychology» (New York: Pantheon

геапалітычных абставінах і вельмі зваблівая.

Некаторыя кансэрватары, як ад назойлівай мухі, адмахваюцца ад лібэралаў, калі іх перасмыкае ад Бушавых размоваў пра зло: ізноў, маўляў, яны са сваім маральным рэлятывізмам. Але адмаўляць ягонае разуменьне зла – ня значыць адмаўляць ідэю маральных абсалютаў, добрага і благога. Зло ў маніхейскім сэнсе ня ёсьць абсалютнае «ліха» – гэта адна ўсёахопная прычына «благога», калі самыя розныя яго праявы паходзяць з адной крыніцы. У «Валадару пярсьцёнкаў» усе сьціжыны пачвараў-ворагаў: оркі, прывіды-пярсьцёнкаслужкі і да т. п. – былі злом у маніхейскім сэнсе, бо пакланяліся яны ўладзе аднаго жудаснага Саўрона.

Для сілаў дабра: гобітаў, эльфаў, Буша – адзінства зла значна спрашчае задачу. Калі ўсе твае ворагі – лялькі ў руках Сатаны, дык навошта імкнуцца ўгледзець тонкія адрозьненьні між імі? Навошта думаць, дзе зло непапраўнае, а дзе ня ўсё яшчэ страчана? Яны ўсе ліхадзеі да мозгу касьцей, так што змагайся зь імі на кожным кроку, ня бойся налажыць галавою і г. д., і да т. п.

А што, калі ў сьвеце ня ўсё так проста? Што, калі адныя тэрарысты не супакояцца, пакуль не сатруць Злучаныя Штаты з твару зямлі, а іншыя хочуць проста мець свой нацыянальны анкляў, як Чачня ці Мінданао*?
І калі ўсіх тэрарыстаў пад адзін капыл падганяць, ставіцца законам, дык ці й праўда ня зробяцца яны на адзін (Mindanao) – большымі антыамэрыканістамі, большымі фанатыкамі праўда заўвага: калі прэзыдэнт Роналд Рэйган назваў Савецкі Саюз «імпэрыяй зла», СССР сапраўды ўяўляў сабою маналіт, ад якой зыходзіла пагроза. Таму гэта іншы выпадак.

А калі Іран, Ірак і Паўночная Карэя – насамрэч не адна, а некалькі розных праблемаў? І калі іх правадыры, колькі б дрэнных учынкаў ні было на іхным рахунку, усё ж ня страцілі чалавечага аблічча і рацыянальна рэагуюць на ўзьдзеяньне, звонку? Калі вы сапраўды верыце ў такую магчымасьць, дык, пэўна, усьцешыцеся, што жорсткі дыктатар перад пагрозай вайны дапусьціў у сваю краіну інспэктараў ААН. А калі сьвята верыць, што дыктатар – ня проста дрэнны: ён – увасабленьне

Books, 1994).

Супрацоўнік Цэнтру чалавечых вартасьцяў («Center for Human Values») пры Прынстанскім універсытэце, каардынатар праграмы ў фундацыі «New America».

*Мінданао (Mindanao) – другі па велічыні востраў Філіпінскага архіпэлагу, аддзяленьне якога ад цэнтральнага дзяржавы існуе сэпаратысцкі рух. – Рэд.

сусьветнага зла, дык тады, мусіць, вы ўсё адно палічыце сваім абавязкам звяваць ягоную краіну. Не ісьці ж вам на дамову з д'яблам.

І, вядома, калі верыць, што ўсе тэрарысты – служкі абсалютнага зла, тады, хутчэй за ўсё, вы ня надта будзеце дбаць пра грамадзянскія свабоды падазраваных у тэрарызьме ды пра годнае абыходжаньне ў турме з асуджанымі за тэрарызм. Урэшце, зло вымагае палітыкі «выпаленай зямлі». Але што, калі праз гэтую палітыку шмат мусульманаў і ў ЗША, і за мяжой адчуваюць на сабе ўціск, і ў выніку папаўняюцца шэрагі тэрарыстаў?

Адмовіцца ад гэткай «мэтафізыкі з адваротным вынікам» не азначае скаціцца ў рэлятывізм ці нават адкінуць канцэпт зла. Можна думаць, што ўсё благое мае адзіную крыніцу – і пры гэтым не западаць у маніхейства, якое рухае Бушам. Можна верыць, што недзе ў чалавечай натуры сядзіць зерне ліха, у якім – прычыны плоймы брыдоцьця, што робяць людзі. Хрысьціянін пад гэтым зернем ліха разумее першародны грэх. Атэіст, мабыць, патлумачыць яго зь нерэлігійнага гледзішча: напрыклад, як вялікае сябелюбства, якое часам скрыўляе нашыя маральныя арыенціры і нашэптвае нам, што можна спакойна ўспрымаць, нават вітаць пакуты тых, хто пагражае нашым інтарэсам.

Калі глядзець на зло як на сілу, прысутную ўва ўсіх людзях, адкрываецца карціна, вельмі далёкая ад сьветаўспрыманьня Буша. Можа ўзьнікнуць пытаньне: «Калі ў кожным з нас ад нараджэньня пасеянае зерне ліха, дык чаму ў адных яно дае багацейшыя плады, чым у іншых?» Тады вы, магчыма, зацікавіцеся тым натуральным асяродзьдзем, у якім растуць розныя гатункі ліхадзеяў. Тады вы заўважыце, што ў розных месцах прычыны тэрарызму – розныя.

А яшчэ падобная ідэя зла можа прымусіць пільна прыгледзецца да сябе. Можа, вы насьцярожыцеся, заўважыўшы, што і ваш рахунак сумленьня пакрыўся цьвільлю асабістых, палітычных або ідэалягічных прыхільнасьцяў. Скажам, калі вы распачалі вайну, у якой загінула 10 000 чалавек, вас калі-нікалі будзе грызьці чарвяк сумневу: а ці не памыліўся я ў сваім рашэньні,

ці сапраўды меў чыстыя намеры? Вас ня будзе перапаўняць упэўненасьць, што вы – абраны слуга Божы, і таму вольны ад граху.

Карацей кажучы, пры такой ідэі зла сьвет атрымліваецца зусім не падобны да анонсу «Валадара пярсьцёнкаў», дзе ўсе «бякі» падпарадкаваныя адзінаму «цэнтру» ды яшчэ, каб, крый Божа, ніхто не пераблытаў, усе да жудасьці пачварныя. Сьвет не такі адназначны, у ім зло стаілася ў кожным з нас, а дасьведчаная палітыка мусіць быць далікатнай. Зрэшты, нават у «Валадару пярсьцёнкаў» ёсьць намёкі на гэткае бачаньне зла. Вось падступны пярсьцёнак: у кожным, хто на яго глядзіць, прачынаецца адчайнае жаданьне ім завалодаць. Калі яго не зацугляць, можна ўшчэнт сапсець душою. Здаецца, ідэя ў тым, што праз слабасьць сваю кожны можа зрабіцца носьбітам зла: гобіт, эльф і нават асобна ўзяты амэрыканец.

[да зьместу артыкула]

Пол Дэвіс
Адмаўленьне свабоднае волі

ПОЛ ДЭВІС філёзаф. Выкладае ў Аўстралійскім цэнтры астрабіялёгіі ва Ўнівэрсытэце Макўоры ў Сыднэі. Аўтар 25 кніжак, апошнія зь якіх «The Fifth Miracle: The Search for the Origin and Meaning of Life» (New York: Simon & Schuster, 1999) і «How

Вы вольныя не чытаць гэтага артыкула. А калі чытаеце, ці маглі яго прапусьціць? Напэўна, вам здаецца, што выбар: чытаць або не чытаць – за вамі. Але ці так гэта насамрэч?

Вера ў тое, што чалавеку ў пэўнай ступені дадзеная свабодная воля, супольная для ўсіх культураў. Менавіта свабода волі збольшага і робіць нас людзьмі. На ёй грунтуюцца нашыя этычныя сыстэмы і заканадаўства. Аднак сёньня навукоўцы й філёзафы ўпарта адколваюць ад гэтага слупа, на якім трымаецца грамадзтва, кавалак за кавалкам – відавочна мяне надта задумваючыся, чым можна было б яго замяніць.

Яны ставяць пад сумнеў папулярную псыхалёгію, што разважае прыкладна так: у кожным з нас ёсьць сваё «я», сьвядомая асоба, якая сузірае сьвет і прымае рашэньні. У некаторых выпадках (але, мабыць, не ўва ўсіх) яна ў той ці іншай меры мае выбар і ўсьведамляе, што робіць. З гэтай простай мадэлі «чалавек – дзейная асоба» вынікаюць такія знаёмыя нам паняткі, як

адказнасьць, віна, годнасьць. Напрыклад, закон разумнага злачынства, зьдзейсьненае ў самнамбулічным стане пад гіпнозам, і ў здаровым розуме, з поўным усьведамленнем наступстваў. Можа падацца, што гэта агульнавядомая ісьціна, але філёзафы й пісьменьнікі стагодзьдзямі яе абвяргалі, а ў наш час гэты наступ усё мацнее. «Навука спрэс сьведчыць супраць свабоды волі», – заўважыў брытанскі літаратурны крытык Сэмюэл Джонсан. У 40-х гг. XX ст. прафэсар філязофіі Оксфардзкага ўнівэрсытэту Гілбэрт Райл сваёй іранічнай фразай «дух у машыне» затаўраваў шырокараспаўсюджанае меркаваньне, што наш мозг зьмяшчае нематэрыяльную існасьць, якая кантралюе дзейнасьць нэўронаў. Сучасны амэрыканскі філёзаф Дэніэл Дэнэт кажа пра «хісткасьць міту», нібы ў галаве чалавека ёсьць нейкі «прывід-лялькавод».

Тіпічнае Machine (New York; Viking, 2002)

Для тых, хто скептычна ставіцца да ідэі свабоднай волі, выбар, які робіць чалавек, альбо абумоўлены ўсёй ягонай прыродай і ягоным паходжаньнем, альбо, наадварот, абсалютна адвольны, прадыктаваны імгненнай прыхамацьцю. У абодвух выпадках падобна на тое, што сапраўдная свабода выбару – відзеж, фікцыя. Першы залп па свабодзе волі даюць, як правіла, фізыкі. Паводле клясычнай Ньютанавай схемы, сусьвет – гіганцкі гадзіньнікавы мэханізм, які пакорліва падпарадкоўваецца законам дэтэрмінізму. Дык дзе ж тады свабодная дзейная асоба? У замкнёнай сыстэме прычынаў і вынікаў проста немагчыма, каб нематэрыяльная сьвядомасьць кіравала рухам атамаў, не ўваходзячы ў супярэчнасьць з законамі фізыкі. І ўсім вядомая недэтэрмінаванасьць у квантавай мэханіцы таксама ня сьведчыць на карысьць таго, што над матэрыяльным сьветам пануе сьвядомасьць. Няпэўнасьць у паводзінах квантаў не стварае свабоды. Сапраўдная свабода прадугледжвае, што нашыя ўчынкі мусіць нязьменна вызначаць нашая воля.

Фізыкі сьцьвярджаюць, што свабодная воля – гэта проста чалавечае адчуваньне, а насамрэч сьвядомасьць нічога не абумоўлівае. Адкуль жа зьяўляецца гэтае адчуваньне? Аўтар выдадзенай у 2002 г. кнігі «Ілюзія сьвядомай волі» псыхоляг Гарвардзкага ўнівэрсытэту Дэніэл Ўэгнэр апісвае арыгінальныя лябараторныя экспэрымэнты. Яны сьведчаць, як у чалавека ўзьнікае падманлівае ўражаньне кантролю над сытуацыяй,

нават калі яго сьвядомыя думкі ў рэчаіснасьці не спрычыняюцца да падзеяў, што адбываюцца ў яго на вачох.

Разьвіцьцё генэтыкі таксама падрывае веру ў тое, што чалавек нараджаецца вольным стварацъ уласны лёс. Навукоўцы прызнаюць, што гены перадвызначаюць ня толькі будову цела, але і сьвядомасьць. Псыхолягі-эвалюцыяністы спрабуюць зьвязаць рысы характару (напр., альтруізм, агрэсіўнасьць) з дарвінаўскім мэханізмам адвольнай мутацыі і натуральнага адбору. «Усе мы – машыны выжываньня, робаты, сьлепа запраграмаваныя на захаваньне сябелюбных малекулаў, вядомых пад назвай «гены», – піша біёляг Рычард Докінз з Оксфардзкага ўнівэрсытэту.

А тыя складнікі сьвядомасьці, што не падпарадкоўваюцца генэтыцы, здаюцца на літасьць «мэмэтыкі». Мэмы – адпаведнікі генаў для сьвядомасьці: ідэі, пераканаьні, павевы, якія множацца і змагаюцца між сабою на манер генаў. Брытанскі псыхоляг С'юзан Блэкмар нядаўна заявіла, што нашая сьвядомасьць – усяго толькі набор мэмаў: мы іх падхопліваем, як вірусы, а ўсьведамленьне свайго «я» – фікцыя, створаная мэмамі дзеля нейкіх сваіх мэтаў.

Гэтыя ідэі – небясьпечныя, бо маюць у сабе больш як зерне ісьціны. Існуе вялікая рызыка, што іх спрымітывізуюць, імі будуць апраўдваць злачынствы (маўляў, усё дазволена), міжнацыянальныя канфлікты, нават генацыд. А людзі, упэўненыя ў ілюзорнасьці ўласнага выбару, могуць пасіўна прымаць усё, што навяжа ім эксплюататарская грамадзкая ці палітычная сыстэма. Калі эўгеніка вам здавалася жудасным адхіленьнем ад навукі, уявіце сабе сьвет, дзе большасьць людзей ня вераць у свабоду волі.

Атака навукоўцаў на свабодную волю выклікала б менш трывогаў, калі б на зьмену ёй магла прыйсьці нейкая новая этычная ці праўная канцэпцыя. Ды ніхто і блізка не разумее, як яна выглядае. Да таго ж памятайце: навукоўцы могуць памыляцца ў сваіх сумневах наконт свабоднай волі. Было б вялікай неабачлівасьцю думаць, што фізыкі сказалі апошняе слова ў праблеме прычыннасьці або што навука спасьцігла ўсе працэсы, якія адбываюцца ў мозгу і ў сьвядомасьці. Але нават

калі дасьледчыкі маюць рацыю і свабодная воля сапраўды проста фікцыя, магчыма, варта было б не разьвейваць гэтай ілюзіі. Фізыкі й філёзафы часта разгортваюць пераканаўчыя аргумэнты ў вузкім навуковым коле, але не зважаюць на іх на практыцы. Напрыклад, лёгка засвоіць, што бег часу – падман: для фізыкі час не «прамінае», ён проста ёсьць. Але ў штодзённым жыцьці ніхто не абыдзецца без паняткаў «мінулае», «цяпер», «будучыня». Бязь веры ў ілюзію, што час сыходзіць, грамадзтва не змагло б існаваць. Тое ж самае і са свабодай удзельнічаць у тым, што адбываецца навокал. Калі перафразаваць пісьменьніка Ісаака Башэвіса Зынгера, мы мусім верыць у свабоду волі – у нас няма выбару.

[да зьместу артыкула]

САМАНТА ПАЎЭР
выкладчыца палітычных навук Школы кіраваньня імя Джона Ф. Кэнэдзі пры Гарвардзкім унівэрсытэце, аўтарка кнігі «Problem from Hell: America and the Age of Genocide» (New York: HarperCollins, 2003), якая назалетась атрымала Пулітцэраўскую прэмію.

Саманта Паўэр
ААН: усё ў норме

Для ААН выхад на першыя ролі можа абярнуцца нявыгадай небясьпекай, чым яе другараднасьць. Адміністрацыя Буша за год прайшла шлях ад зьедлівых папрокаў на адрас ініцыятыў міжнароднай арганізацыі да ўмольных просьбаў аб дапамозе. Неўзабаве ў Багдад прыбудзе адмыслова падрыхтаваная каманда ААНаўцаў, каб даваць парады ірацкаму ўраду ў адбудове краіны, у арганізацыі грамадзкага сэктару, забесьпячэньні правоў чалавека, а таксама каб непасрэдна дапамагаць у правядзеньні выбараў. Пры гэтым у Бурундзі, Дэмакратычнай Рэспубліцы Конга, на Гаіці, у Кот-д'Івуары высаджваюцца або пашыраюць сваю прысутнасьць міратворчыя сілы ААН. Выглядае, што на канец 2004 г. у апэрацыях падтрыманьня міру будзе задзейнічаная рэкордная ў гісторыю колькасьць «блакітных касак».

Хоць некаторыя прыхільнікі ААН ад усяе душы радуюцца, што яна пачынае адыгрываць у сьвеце больш істотную ролю, час для самазадаволенасьці яшчэ не прыйшоў. На плечы арганізацыі, якую нацыянальныя ўрады хацелі бачыць слабой, ускладаюцца цяжкія абавязкі. Запушчаная 60 гадоў таму ААНаўская машына здаецца як ніколі раней непрыдатнай, каб

рабіць сваю справу, а давер да яе рэзка ўпаў. Цяпер, калі вялікія дзяржавы вядуць вайну з тэрарызмам і займаюцца пытаньнямі ўнутранай бясьпекі, да ААН пяройдзе істотная, але няўдзячная праца, якую яны калісьці спрабавалі рабіць самі (або папросту не зьвярталі на яе ўвагі). Калі карэнным чынам не рэфармаваць ААН, яна можа надарвацца пад цяжарам.

Меркаваньне, што ААН можа і надалей існаваць у цяперашнім атрафаваным стане, вельмі даспадобы ў шмат якіх сталіцах і нават у некаторых кабінэтах штаб-кватэры ААН. Але спадзявацца, што захаваньня *status quo* будзе дастаткова, – небясьпечна.

На жаль, большасьць з тых, хто мог бы паспрыяць зьменам, зацікаўленыя ў тым, каб рэформы не праводзіліся. Ніхто са сталых сяброў Рады Бясьпекі ААН ня хоча адмовіцца ад права вэта. Малым краінам прыемна, што на пасяджэньнях Генэральнай Асамблеі іх галасы важаць столькі ж, колькі й вялікіх. Рэпрэсіўныя рэжымы цешацца з удзелу ў працы ААНаўскіх структураў па правох чалавека, дзе яны могуць патапіць любую крытычную рэзалюцыю. Каб умацаваць міратворчыя сілы ААН, патрэбныя войскі і сродкі заходніх дзяржаваў, але тыя маюць іншыя прыярытэты. Нават сярод ААНаўскага чынавенства шмат хто з вэтэранаў унікае карэнных рэформаў: за дзесяцігодзьдзі яны дасканала засвоілі старыя працэдуры, а перамены – справа рызыкоўная. Так, функцыянэры ААН, улучна з Генэральным Сакратаром, заўсёды вінавацяць у абмежаваньнях, зь якімі яны сутыкаюцца, дзяржавы-ўдзельніцы (і слушна робяць). Але ім вельмі рэдка стае мужнасьці назваць пайменна канкрэтныя дзяржавы, чыя ўпартасьць, сквапнасьць і нядобрая воля падрываюць прынцыпы, закладзеныя ў Хартыі ААН.

Вядома, шмат у чым папракаюць ААН абсалютна дарэмна. Па вялікім рахунку, ААН – гэта проста будынак. Месца, дзе спрачаюцца ці вядуць перамовы розныя дзяржавы – у адпаведнасьці са сваімі нацыянальнымі інтарэсамі. А з гледзішча практычнай дзейнасьці ААН выконвае незаменную ролю: дае харчаваньне і дах над галавою мільёнам людзей, праводзіць вакцынацыю, нават займаецца раззбраеньнем

войскаў сумнавядомага ірацкага дыктатара. Але рост ці падзеньне аўтарытэту арганізацыі залежаць ад таго, наколькі эфэктыўна і правамоцна дзейнічаюць тры яе самыя галоўныя складнікі: Рада Бясьпекі, Камісія па правох чалавека і міратворчыя сілы. Кожны зь іх скрайне неабходна рэфармаваць або проста ратаваць. Тое, што пяць месцаў у Радзе Бясьпекі замацаваныя за дзяржавамі-пераможцамі ў Другой сусьветнай вайне (плюс Кітай), выглядае жудасным анахранізмам. Брытанія і Францыя ня могуць прэтэндаваць на дзьве пятыя ўладных паўнамоцтваў у сусьветным маштабе. Калісьці пяць сталых сяброў Рады Бясьпекі прадстаўлялі амаль 40 % насельніцтва Зямлі. Цяпер гэтая лічба зьнізілася да 29 %. У іх лік не ўваходзіць найбуйнейшая дэмакратычная краіна сьвету – Індыя, рэгіянальныя лідэры кшталту Нігерыі й Бразыліі, ня кажучы пра ўвесь ісламскі сьвет. Менавіта сталыя сябры Рады Бясьпекі вырашаюць, калі сытуацыя даходзіць да той жахлівай мяжы, што патрабуецца ўмяшаньне ААН. Але рашэньне прымаюць два найгоршыя парушальнікі правоў чалавека (Расея і Кітай) і дзяржава, не зьвязаная большасьцю міжнародных пагадненьняў па правох чалавека (ЗША). Хоць у некаторых выпадках санкцыя Рады Бясьпекі застаецца жаданай мэтай, увогуле яна імкліва страчвае свой былы бляск. Камісія па правох чалавека ў складзе 53-х дзяржаваў са штаб-кватэрай у Жэнэве ператварылася ў палітычны фарс. Паколькі ў камісію можа ўваходзіць любая краіна (месцы вылучаюцца паводле рэгіянальнага прынцыпу), у яе трапляюць некаторыя самыя адыёзныя рэжымы. У 2003 г. камісію ўзначальвала Лібія, а ў 2004 г. да яе далучыўся Судан – краіна, што праводзіць этнічныя чысткі, ад якіх церпяць сотні тысячаў афрыканцаў у Дарфуры. Покуль уваходжаньне ў склад камісіі ня будзе зьвязанае з абавязкамі ў галіне правоў чалавека, яна будзе прыкрываць зашмат парушальнікаў правоў чалавека, а асуджаць – замала.

Калі Рада Бясьпекі даручае Генэральнаму Сакратару ўтаймаваць бясчынцаў, перад ягонымі міратворцамі часьцяком ставяцца невыканальныя задачы. Іх закідваюць у самыя небясьпечныя «гарачыя кропкі» ў сьвеце – апроч тых, дзе задзейнічаныя эканамічныя ці палітычныя інтарэсы вядучых заходніх дзяржаваў. І невыпадкова міратворчым сілам заўжды

бракуе сродкаў, каб сапраўды падтрымліваць мір. Калі ў 90-х гг. XX ст. міратворцаў ААН у Сэрбіі прыкавалі да вулічных ліхтароў, гэта яскрава засьведчыла нямогласьць міжнароднай супольнасьці. І ня дзіва: заходнія дзяржавы накіравалі ў Руанду й былую Югаславію лёгка ўзброеныя войскі, якія ня мелі ні мандату, ні рэальнай магчымасьці спыніць генацыд. Каб неяк даць рады нечаканаму ўсплёску ў попыце на міратворчыя сілы, што назіраецца цягам апошняга году, Генэральны Сакратар Кофі Анан заклікаў вылучыць больш вайсковых фармаваньняў, выдаткаваць больш рэсурсаў на выведку і матэрыяльна-тэхнічнае забесьпячэньне, а таксама дазволіць пры неабходасьці прыцягваць падмацаваньне. Фінансаваньне міратворчых сілаў крыху павялічылася, але патрабуецца яшчэ 1 мільярд даляраў. І нават больш істотна, каб ААН магла прыцягваць вайскоўцаў з разьвітых дзяржаваў – за апошнія гады яны адшкадавалі ўсяго некалькі сотняў салдатаў. Краіны, якія пастаўляюць значны вайсковы кантынгент – у т. л. Пакістан, Банглядэш, Уругвай, Нігерыю, – як правіла, прываблівае магчымасьць атрымаць за адзін толькі ўдзел у апэрацыях жывыя грошы і ваенную тэхніку. Таму зразумела, што камандаваньне і кантроль за міратворчымі сіламі часта знаходзяцца на вельмі нізкім узроўні. Калі вялікія дзяржавы будуць і надалей эканоміць грошы на міратворчых сілах, Рада Бясьпекі зноў зробіць ААН вінаватай у паразах – і паставіць пад пагрозу жыцьці мільёнаў мірных грамадзянаў, у якіх няма іншага выйсьця, як спадзявацца на блакітны ААНаўскі сьцяг.

У вялікай ступені ЗША і іншыя дзяржавы-ўдзельніцы маюць тую ААН, якую хочуць і заслугоўваюць. Але прыхільнікам рэфармаваньня трэба паглядзець на ірацкую праблему як на шанец, які нельга ўпусьціць. Замест таго, каб бачыць ува ўзрослай ролі ААН сьведчаньне яе посьпехаў, Генэральны Сакратар мусіць пераканаць упартыя дзяржавы-ўдзельніцы, што ў цяперашнім сваім нягеглым стане ААН ня зможа даць рады сур'ёзным наднацыянальным праблемам, якія ставіць XXI стагодзьдзе.

Другі Генэральны Сакратар ААН Даг Гамарск'ёльд любіў паўтараць, што ААН створаная не на тое, каб прывесьці чалавецтва ў рай, а на тое, каб выбавіць яго ад апраметнай. Але

нават дзеля гэтай мэты неабходная міжнародная арганізацыя, здольная выконваць сваю місію.

[да зьместу артыкула]

Эрык Гобсбаўм
Распаўсюд дэмакратыі

ЭРЫК ГОБСБАЎМ прафэсар

Сёньня мы назіраем нібыта плянавае пераўладкаванне сьвету з магутнымі дзяржавамі. Войны ў Іраку й Аўганістане, хоць толькі частка быццам бы ўсеагульных намаганьняў стварыць новы сусьветны парадак праз «распаўсюд дэмакратыі», ад пачатку проста донкіхоцкая, а небясьпечная. Вакол гэтага «крыжовага паходу» ўзьнялася прапагандысцкая шуміха – зь яе дапамогай нам навязваюць думку, што дэмакратыя мусіць укараніцца ейнай узорнай (заходняй) форме, што яна паўсюль прывядзе плён, што гэта панацэя, якая дапаможа вырашыць наканецьняя наднацыянальныя праблемы і прынясе мір, а не пасеяжка канфлікты. Нічога падобнага.

Крыніцай дэмакратыі павінен выступаць народ. У 1647 г. у Англельшчыне левэлеры абвясьцілі, што «ўсялякая ўлада ад свабоднай згоды людзей». Яны дабіваліся права голасу для ўсіх. Вядома, усеагульнае выбарчае права можа ня спрацаваць палітычных спадзяваньняў, а правядзеньне выбараў не азначае, што новая ўлада іх не адменіць – згадайма хоць бы Вайнарскую Рэспубліку. Да таго ж вельмі малаверагодна, што дэмакратыя і свабодныя выбары забясьпечаць вынікі, патрэбныя прэтэндэнтам на сусьветнае панаваньне. (Вайны ў Іраку проста не было б, калі б рашэньне залежала ад свабоднай згоды «міжнароднай супольнасьці».) Але ўсе гэтыя «дробязі» ня змусяць ахвочых экспартаваць дэмакратыю й свабодныя выбары прыглушыць свае галасы.

Ёсьць і іншыя чыньнікі, якія падтрымліваюць небясьпечную ілюзію, нібы дэмакратыю могуць пасьпяхова прынесьці на штыхох замежныя войскі. У выніку глябалізацыі ствараецца ўражаньне, што чалавецтва ў сваім разьвіцьці набліжаецца да адзінага ўсеагульнага ўзору. Калі бэнзакалёнкі й кампутары ўва ўсім сьвеце аднолькавыя, дык чаму з палітычнымі

Ён аўтар кнігі «Эпоха крайнасьцяў: Гісторыя сучаснага сьвету, 1914–1991» (New York: Pantheon Books, 1994).

інстытутамі мусіць быць іначай? Думаць так – значыць не разумець, наколькі складана ўладкаваны сьвет. Новы ўсплёск крывавых канфліктаў і анархіі, што назіраецца ў многіх краінах сьвету, таксама дадае прывабнасьці ідэі распаўсюдзіць «новы парадак». Падзеі на Балканах паказалі, што ў раёнах масавых узрушэньняў і гуманітарных катастрофаў патрабуецца ўмяшаньне – часам нават ваеннае – моцных і стабільных дзяржаваў. Пры адсутнасьці дзейсных міжнародных структураў некаторыя чалавекалюбцы і цяпер гатовыя выступаць «за» сусьветны парадак, сілаю навязаны Злучанымі Штатамі. Але ніколі ня варта давяраць заваёўніку, які кажа, што робіць паслугу сваім ахвярам і сьвету, калі скарае слабейшых.

Ёсьць і яшчэ адзін чыньнік – мабыць, самы галоўны. ЗША апанаваныя гігантаманіяй у спалучэньні з мэсіянствам, якое нарадзілася ў часы змаганьня за незалежнасьць. На сёньня ніхто ня можа аспрэчыць ваеннага й тэхналягічнага першынства Амэрыкі. Яна перакананая, што яе грамадзка-палітычнай сыстэме няма роўных. А з 1989 г. няма каму ёй нагадваць, як заўсёды нагадвалі нават самым вялікім імпэрыям-заваёўніцам, што ў яе магутнасьці ёсьць межы. Падобна да прэзыдэнта Вудра Ўілсана (выбітнага палітычнага няўдачніка свайго часу), сёньняшнія ідэолягі думаюць, што ідэальнае грамадзтва ўжо створанае – у Злучаных Штатах. Яго рэцэпт – праўная дзяржава, лібэральныя свабоды, канкурэнцыя, прыватнае прадпрымальніцтва і рэгулярныя выбары на аснове ўсеагульнага выбарчага права. Засталося ўсяго нічога: перарабіць сьвет паводле вобразу й падабенства гэтага «свабоднага грамадзтва».

Прыхільнікі гэтай небясьпечнай ідэі падбадзёрваюць адно аднаго, каб ня падаць духам. Так, вялікадзяржаўніцкія дзеі могуць прыносіць маральнае задавальненьне й жаданы палітычны вынік. Але падтрымліваць іх – небясьпечна, бо ў сваёй лёгіцы й мэтадах дзеяньня дзяржава кіруецца не патрэбамі міжнароднай супольнасьці. Усе дзяржавы на першае месца ставяць уласныя інтарэсы. Калі ёй стае моцы, а мэта здаецца таго вартай, дзяржава апраўдвае любыя сродкі, каб яе дасягнуць (хоць гэта рэдка робіцца публічна). Асабліва калі верыць, што зь ёю Бог. І «імпэрыі дабра», і «імпэрыі зла»

спрычыніліся да нашага ўсеагульнага зьдзічэньня, а «вайна з тэрарызмам» багата да яго дадала.

Кампанія па распаўсюдзе дэмакратыі падрывае веру ў непарушнасьць агульначалавечых каштоўнасьцяў. Але яна не дасягне сваёй мэты. Як паказала XX стагодзьдзе, ніводная дзяржава ня ў стане перарабіць сьвет ці прысьпешыць хаду гісторыі. І экспарт інстытутаў дэмакратыі празь дзяржаўныя межы ня будзе лёгкім сродкам зьмяніць грамадзтва. Нават у нацыянальных дзяржавах са сваёй тэрыторыяй нячаста складаюцца ўмовы для дзейснай дэмакратычнай сыстэмы кіраваньня: незалежнасьць краіны, правамоцнасьць уладаў, грамадзкая згода і ўменьне вырашаць канфлікт паміж рознымі групамі праз дыялёг. Без такога паразуменьня ня можа быць адзінай сувэрэннай нацыі, а значыць, арытмэтычная большасьць не правамоцная выступаць ад яе імя. Калі гэткай згоды – рэлігійнай, этнічнай ці той і другой – няма, перастае дзейнічаць дэмакратыя (як у Паўночнай Ірляндыі), распадаецца дзяржава (як у Чэхаславаччыне), або грамадзтва скочваецца ў прорву няспыннай грамадзянскай вайны (як на Шры-Ланцы). «Распаўсюд дэмакратыі» і пасьля 1918 г., і пасьля 1989 г. у шматнацыянальных, шматкультурных рэгіёнах прывёў да абвастрэньня этнічных канфліктаў і скончыўся распадам цэлых дзяржаваў. Пэрспэктыва бязрадасная.

Апроч мізэрных шанцаў на посьпех, спробы распаўсюдзіць дэмакратыю ў ейнай стандартнай – заходняй – форме натыкаюцца на яшчэ адзін глыбокі парадокс. Шмат хто лічыць, што дэмакратыя вырашыць істотныя наднацыянальныя праблемы сучаснасьці. Грамадзкае жыцьцё ўсё больш і больш дзеецца не пад кантролем выбарцаў – у наднацыянальных публічных ці прыватных структурах, дзе няма электарату (прынамсі, дэмакратычнага). На ўзроўні, вышэйшым за нацыянальную дзяржаву, дэмакратыя са свабоднымі выбарамі ня можа працаваць эфэктыўна. Выходзіць, што магутныя дзяржавы спрабуюць распаўсюдзіць сыстэму, якую самі прызнаюць неадпаведнай сучасным задачам і праблемам.

Гэта пацьвярджае прыклад Эўропы. Эўразьвяз змог стаць моцнай і дзейснай структурай акурат таму, што ня мае іншага

электарату, акрамя кіраўніцтва дзяржаваў-удзельніцаў (іх мала, хоць лічба і павялічваецца). Без «дэфіцыту дэмакратыі» Эўразьвяз не пасунуўся б ні на крок. Яго парлямэнт ня мае будучыні, бо няма «народу Эўропы» – ёсьць толькі шэраг «народаў Эўропы», а ў 2004 г. на выбарах у Эўрапарлямэнт падбала прагаласаваць менш за палову «эўрапейцаў». Сёньняшняя «Эўропа» – дзейснае ўтварэньне, але, адрозна ад яе дзяржаваў-удзельніцаў, неправамоцнае з гледзішча народнай дэмакратыі і ўсеагульных выбараў. Ня дзіва, што як толькі Эўразьвяз ад міждзяржаўных перамоваў пачаў пераходзіць да простых дэмакратычных працэдураў, ён адразу сутыкнуўся з праблемамі.

Спробы распаўсюдзіць дэмакратыю нясуць у сабе яшчэ адну небясьпеку – можа, больш прыхаваную. У тых, хто не жыве пры дэмакратыі, ствараецца ілюзія, нібы пры дэмакратычнай сыстэме сапраўды пануе дэмакратыя. Але ці так гэта? Мы крыху даведаліся пра тое, як прымаліся рашэньні аб увядзеньні войскаў у Ірак, прынамсі, у дзьвюх дзяржавах, чыя дэмакратычнасьць, як жонка Цэзара, вышэйшая за падазрэньні: у Злучаных Штатах і ў Аб'яднаным Каралеўстве. Выбарчая дэмакратыя і прадстаўнічая ўлада ня мелі да гэтага працэсу ніякага дачыненьня – хіба што спрычыніліся да праблемаў наўмыснага падману і ўтойваньня інфармацыі. Усё вырашалася цішком у вузкім коле, амаль гэтаксама, як у недэмакратычных краінах. На шчасьце, у Брытаніі прымусіць незалежныя СМІ маўчаць аказалася ня так проста. Але сапраўдную свабоду слова, правы грамадзянаў і незалежнасьць судоў зусім не абавязкова гарантуе дэмакратыя са свабоднымі выбарамі.

[да зьместу артыкула]

Фрэнсіс Фукуяма
Трансгуманізм

ФРЭНСІС ФУКУЯМА прафэсар міжнароднай палітычнай эканомікі Школы дасьледаваньняў міжнародных

Цягам апошніх некалькіх дзесяцігодзьдзяў у разьвітых краінах убіраецца ў моц дзіўны вызваленчы рух. Яго сьцягавікі цэляць куды вышэй, чым абаронцы правоў чалавека, дэмакратыі ці сэксуальныя меншасьці. Яны жадаюць ня больш ня менш як

вызваліць род чалавечы з палону ягонай біялёгіі. Надумкаваньняў «трансгуманістаў», чалавек мусіць вырваць свой біялагічны лёс з-пад сьляпое ўлады эвалюцыі зь яе адвольнай мутацыяй і прыстасаваньнем і ўзьняцца як від на новую вышыню.

Вельмі хочацца адмахнуцца ад трасгуманізму як ад чарговай дзівацкай сэкты, як ад звычайнай навуковай фантастыкі, да якой чамусьці залішне сур'ёзна ставяцца. Каб пераканацца, што трансгуманісты хапілі цераз край, зазірніце на іх ўэб-сайты, пачытайце прэс-рэлізы («Мысьляры-кібаргі зоймуцца будучыняй чалавецтва», – абвяшчаецца ў адным зь іх). Планы некаторых трансгуманістаў замарозіць сваё цела ў крыятанкай установуцы ў спадзеве на будучае ажыўленьне толькі пацьвярджаюць, што гэтая плынь знаходзіцца недзесьці задворках навуковага мысьленьня.

Але ці сапраўды нам настолькі далёкая асноўная ідэя трансгуманізму – што аднойчы пры дапамозе біятэхналёгіяў мы зробімся мацнейшымі, разумнейшымі, вызвалімся ад гвалту і будзем жыць доўга-доўга? У праграмах досьледаў па сучаснай біямэдыцыне, можна сказаць, ёсьць шмат ад трансгуманізму. Усё тое новае, што нараджаецца ў нетрах дасьледчых лябараторыяў і ў клініках – прэпараты дзеля карэгаваньня настрою, нарошчваньня масы цягліцаў, выбаркавага сьціраньня памяці, а таксама дародавае вывучэньне геному, генная тэрапія, – можа гэтак жа лёгка выкарыстоўвацца, каб «удасканаліць» від *homo sapiens*, як і для лекаваньня.

Хоць прарывы ў біятэхналёгіі часта сеюць у глыбіні душы нейкую цьмяную трывогу, тая інтэлектуальная або маральная небясьпека, што яны нясуць, не заўсёды заўважная. Урэшце, чалавек – проста вартая жалю істота: ён ня можа пазбавіцца ад учэпістых хваробаў, фізычнай недасканаласьці, і жыцьцё ў яго такое кароткае… Дадайце сюды чалавечую зайздрасьць і рэўнасьць, гвалт, бесьперапынныя перажываньні – і задума трансгуманістаў адразу падасца абсалютна слушнай. Калі б была такая магчымасьць, хто б не хацеў пераўзысьці сваю біялягічную прыроду? Ува ўяўнай слушнасьці гэтага праекту, асабліва калі разглядаць яго па асобных маленькіх кроках, таксама крыецца небясьпека. Малаверагодна, каб усё

Дуглас Дж. Гопкінса. Яго апошняя кніжка называецца «State Building: Governance and World Order in the 21st Century» (Ithaca: Cornell University Press, 2004).

грамадзтва зьнянацку падпала пад звабу трансгуманізму. Але цалкам магчыма, што мы па кавалачку будзем заглытваць прынады біятэхналёгіі, не ўсьведамляючы, коштам якіх жахлівых маральных выдаткаў яны набытыя.

Першай ахвярай трансгуманізму можа пасьці роўнасьць. У амэрыканскай Дэклярацыі аб незалежнасьці гаворыцца, што «ўсе людзі створаныя роўнымі». Самыя жорсткія палітычныя бітвы ў гісторыі Амэрыкі вяліся вакол таго, хто падпадае пад азначэньне паўнавартаснага чалавека. Калі ў 1776 г. Томас Джэфэрсан падпісваў Дэклярацыю, жанчын і чарнаскурых яна не датычылася. Спатрэбіўся доўгі, пакутлівы шлях, каб прасунутае грамадзтва зразумела, што сам факт прыналежнасьці да роду чалавечага ёсьць падставай для роўнасьці ў палітычных правох і роўнасьці перад законам. Мы практычна акрэсьлілі, хто такі чалавек, і абвясьцілі яго асобу сьвятой і недатыкальнай.

Ідэя роўнасьці грунтуецца на перакананьні, што ўсе мы маем чалавечую сутнасьць, перад якой блякне ўсялякая розьніца ў колеры скуры, вонкавым выглядзе, нават у інтэлекце. Гэтая вера ў чалавечую сутнасьць, а значыць, і ў неад'емную каштоўнасьць кожнай асобы, ляжыць у самай аснове палітычнага лібэралізму. А ў аснове трансгуманізму – імкненьне зьмяніць гэтую чалавечую сутнасьць. Калі мы пачнем ператварацца ў нейкіх вышэйшых істотаў, то на якія правы яны будуць прэтэндаваць і якія правы будуць мець у параўнаньні з «адсталымі» людзьмі? Калі нехта рушыць наперад, ці можа хто-небудзь сабе дазволіць раскошу не даганяць? Гэта вельмі балючыя пытаньні нават у багатым, разьвітым грамадзтве. А ўявіце, што чакае грамадзянаў найбяднейшых краінаў сьвету, для якіх дзівосы біятэхналёгіяў застануцца па-за межамі дасяжнасьці, і вы зразумееце: ідэя роўнасьці апынаецца перад яшчэ большай пагрозай.

Прыхільнікі трансгуманізму думаюць, што ведаюць, з чаго складаецца добры чалавек. Яны гатовыя з радасьцю адкінуць недасканалых, сьмяротных людзей, якія яны ёсьць, дзеля чагосьці лепшага. Але няўжо яны і праўда разумеюць, у чым найвышэйшая чалавечая дасканаласьць? Нягледзячы на ўсе

свае відавочныя недахопы, мы, людзі, – неверагодна складаны прадукт доўгага працэсу эвалюцыі. Прадукт як цэлае непараўнальна большы за суму сваіх складнікаў. Нашыя добрыя рысы непарыўна зьвязаныя з благімі. Калі б ня жорсткасьць і агрэсіўнасьць, мы б ня ўмелі пастаяць за сябе. Калі б не адчуваньне ўласнай выключнасьці, мы б не былі адданыя сваім блізкім. Калі б мы ня ведалі рэўнасьці, то ня ведалі б і каханьня. Нават нашая сьмяротнасьць адыгрывае надзвычай важную ролю ў тым, што чалавечы від як цэлае можа прыстасоўвацца і выжываць. (А менш за ўсё мне б хацелася бачыць неўміручымі трансгуманістаў.) Зьмена любой з нашых ключавых характарыстык непазьбежна цягне за сабою зьмену ўсяго складанага комплексу ўзаемазьвязаных рысаў, і тут ніколі немагчыма прадбачыць канчатковага выніку.

Ніхто ня ведае, якія ўзьнікнуць тэхналягічныя магчымасьці, каб зьмяняць чалавечую натуру. Але ўжо ў тым, як мы лекавымі прэпаратамі спрабуем падправіць паводзіны й індывідуальнасьць сваіх дзяцей, заўважныя парасткі прамэтэйства. Экалягічны рух навучыў нас пакоры і павазе да прыроды, жывой і нежывой. Нам бракуе гэтай пакоры перад прыродай чалавечай. Калі яе тэрмінова ня выпрацаваць, мы ў хвіліну замарачэньня можам даць трансгуманістам давесьці іхнымі генэтычнымі бульдозэрамі й псыхатропнымі гіпэрмаркетамі чалавецтва да зусім звыродлівага стану.

[да зьместу артыкула]

МАРТА НАСБАЎМ
прафэсар права і этыкі ўніверсытэту Мічыгану ў Адзінбургу
вывучае
Indiana
Bloomington,
Shaanxi,
the Parsis

Марта Насбаўм
Рэлігійная нецярпімасьць

Часам найбольш небясьпечнымі бываюць ідэі старыя, як сьвет. Мала знойдзецца старэйшых за тыя, што ляжаць у падмурку рэлігійнай нецярпімасьці. На вялікі жаль, яны зноў вяртаюцца да жыцьця. У 2002 г. у індыйскім штаце Гуджарат ініцыяваныя з падтрымцы афіцыйных уладаў і паліцыі забілі некалькі тысяч мусульманаў. Ня можа не палохаць, што ў Эўропе апошнім часам назіраецца ўздым антысэмітызму, а ў мусульманскім сьвеце ўсё больш вернікаў прыцягваюць радыкальныя вэрсіі

ісламу. У Злучаных Штатах надзвычай востра адчуваюцца (Princeton: антымусульманскія прымхі, людзі схільныя атаясамліваць Princeton ісламу з тэрарызмам. І гэтак далей, і гэтак далей… Ненавісьць University спараджае нянавісьць, а праявы нецярпімасьці падкідваюць Press, 2004). дроваў у агонь і даюць падставу ўва ўласнай агрэсіі бачыць законны сродак абароны.

Рэлігійная нецярпімасьць, непавага да іншых веравызнаньняў, як правіла, сілкуецца дзьвюма ідэямі. Першая палягае на веры чалавека ў тое, што ягоная рэлігія – адзіная сапраўдная, а ўсе іншыя – непраўдзівыя і заганныя з маральнага гледзішча. Але прыхільнікі гэтай ідэі зазвычай лічаць, што іншыя людзі заслугоўваюць павагі да іхных рэлігійных перакананьняў, пры ўмове, што яны ня чыняць нічога благога. Нашмат больш небясьпечная другая ідэя: што дзяржава і яе грамадзяне паасобку павінны змушаць усіх трымацца «слушнай» веры. І гэтая думка шырока распаўсюджваецца нават у шмат якіх сучасных дэмакратычных грамадзтвах. Напрыклад, вельмі турбуе нежаданьне Францыі трываць рэлігійную сымболіку ў школах, а таксама настойлівыя патрабаваньні «правых» у Індыі, каб этнічныя меншасьці прынялі індускую культуру. Вяртаньне такіх поглядаў нясе сур'ёзную пагрозу лібэральнаму грамадзтву, заснаванаму на ідэях свабоды і роўнасьці.

Няцяжка зразумець, чым прываблівае рэлігійная нецярпімасьць. Людзі з самага маленства ўсьведамляюць сваю бездапаможнасьць у найважнейшых пытаньнях існаваньня, такіх, як ежа, каханьне, нават самое жыцьцё. Рэлігія дапамагае перажыць боль страты, пераадолець страх перад сьмерцю. Яна вучыць маральным прынцыпам і заахвочвае іх трымацца. Але акурат таму, што рэлігія – такі магутны чыньнік у фармаваньні маральнасьці і ў аб'яднаньні супольнасьці, яна вельмі лёгка можа зрабіцца сродкам унікнуць бездапаможнасьці, навязаўшы іншым свой прыгнёт, сваю герархію. У імклівым сучасным сьвеце людзі знаходзяць новыя, часам вельмі небясьпечныя спосабы даваць рады этнічным і рэлігійным адрознасьцям. Калі чалавек апантана хапаецца за, як яму здаецца, праўдзівую рэлігію, атачае сябе адзінаверцамі, а потым падпарадкоўвае сабе іншых, тых, хто не жадае прымаць ягоную рэлігію, ён на некаторы час можа забыцца пра сваю слабасьць, пра

непазьбежнасьць сьмерці.

Каб пераадолець гэтую па сутнасьці псыхалягічную і грамадзкую праблему, недастаткова добрых законаў. У лібэральным грамадзтве даўно зразумелі, як важна, каб на заканадаўчым узроўні, у канстытуцыйных нормах замацоўвалася свабода веравызнаньня і роўнасьць усіх рэлігіяў. Вядома, праўны аспэкт надзвычай істотны, але законы і канстытуцыі ня самі сябе выконваюць, а грамадзкія нормы без апірышча на адукацыю й культуру – пусты гук.

Значыць, нам трэба яшчэ раз добра падумаць, што можа зрабіць публічна прамоўленае слова (а таксама паэзія, музыка, мастацтва) дзеля падтрымкі плюралізму і талерантнасьці. Лідэры праваабарончага руху ў ЗША ўсьведамлялі, наколькі неабходная такая падтрымка. Прыклад Марціна Лютэра Кінга сьведчыць, як аратарскае майстэрства здольнае дапамагчы людзям убачыць сябе роўнымі, а ў сваёй адметнасьці ўгледзець каштоўнасьць, а не падставу для страху. Падчас апошняй выбарчай кампаніі ў Індыі лідэрам партыі Нацыянальны Кангрэс, асабліва Соні Гандзі, удалося стварыць яскравы вобраз Індыі як краіны неад'емнай культурнай размаітасьці. (У індыйскім нацыянальным гімне, напісаным паэтам Рабіндранатам Тагорам, таксама апяваецца яе этнічная шматстайнасьць). Цяперашняя адміністрацыя ЗША выступіла зь вельмі важнымі заявамі пра тое, што нельга дэманізаваць іслам. Але некаторыя афіцыйныя асобы ў публічных выступах усяляк падкрэсьліваюць першынство хрысьціянства, чым расхіствaюць рэлігійную талерантнасьць. Напрыклад, Генэральны Пракурор ЗША Джон Эшкрафт настойвае, каб ягоныя падначаленыя сьпявалі хрысьціянскія гімны. А на пасадзе сэнатара ЗША Эшкрафт назваў Амэрыку «культурай, якая ня мае іншага ўладара, апроч Ісуса».

Мысьляры-лібэралы стагодзьдзямі думалі адно пра канстытуцыйныя і праўныя шляхі да талерантнасьці. Аднак пры гэтым забываліся на эмацыйнае і вобразнае ўзьдзеяньне на людзей. Лібэралы сабе на шкоду не зважаюць на аратарскае майстэрства. Ува ўсіх сучасных дзяржавах усе лідэры ствараюць уяўленьні пра рэлігійную роўнасьць або няроўнасьць

пры дапамозе належна выбраных моўных сродкаў і вобразнасьці. Зьвяртаючыся ў 1789 г. да квакерскай супольнасьці, прэзыдэнт Джордж Вашынгтон адзначаў: «Да пытаньняў сумленьня трэба падыходзіць вельмі далікатна». Нам бракуе гэтай далікатнасьці. Калі ў сваіх выступах лідэры ня будуць дбаць пра тое, каб выхоўваць павагу да іншых, чалавечая роўнасьць застанецца рэччу вельмі крохкай.

[да зьместу артыкула]

Эліс М. Рыўлін
Дармавыя грошы

ЭЛІС М. РЫЎЛІН
прафэсар Джорджтаўнскага ўнівэрсытэту. Ужо 20 гадоў ён вывучае, як палітыка ўплывае на эканоміку, а таксама ацэньвае, як фінансавыя рынкі ўплываюць на палітыку. Кіраваў аддзелам фінансавых рынкаў міністэрства фінансаў ЗША падчас прэзыдэнта Клінтана, а таксама кансультаваў урады ў розных краінах па пытаньнях, зьвязаных з фінансавымі справамі.

У палітыцы фінансавая безадказнасьць прывабная, з-за таго ж самае, што верыць, нібы зь нічога можна атрымаць нешта. Грунтаваць найбуйнейшую ў сьвеце эканоміку на спадзяваньні, што агульныя правілы фінансавага разьліку яе не датычацца, надзвычай небясьпечна. Вялікі, трывалы дэфіцыт бюджэту ЗША ставіць пад пагрозу ня толькі дабрабыт Амэрыкі, але й эканамічную стабільнасьць ува ўсім сьвеце.

Агромністыя дзяржаўныя даўгі ЗША паглынаюць ашчаджэньні іншых краінаў, каб фінансавалася найбагацейшая эканоміка сьвету. Магчыма, неўзабаве гэта выкліча рост працэнтных ставак і замаруджваньне эканамічнага росту. Марнатраўства Амэрыкі можа справакаваць міжнародную фінансавую крызу, якая абернецца для людзей неверагодна цяжкімі стратамі.

Малыя краіны ня могуць дазволіць сабе фінансавую безадказнасьць на працягу доўгага часу: нацыянальная валюта абясцэньваецца, і ўрад больш ня здольны браць пазыкі. Але Злучаным Штатам інвэстары дазваляюць адхіляцца ад бясьпечнага курсу. Іх дзяржаўны доўг – знакамітыя доўгатэрміновыя аблігацыі дзяржпазыкі ЗША – дасюль лічацца надзвычай надзейным укладаньнем сродкаў. Дзякуючы сталай прывабнасьці дзяржаўных аблігацыяў вядучыя амэрыканскія палітыкі паверылі, што агульныя фінансавыя правілы іх не датычацца. Калі яны зразумеюць, што правілы ёсьць правілы, можа быць запозна. Сьвет можа ахапіць фінансавая крыза,

маштабы якой выйдуць з-пад усялякага кантролю.

Каб ня чуць казаняў пра стрыманасьць у фінансавых паводзінах, у ЗША часта затыкаюць вушы. Хто ж адмовіцца ад бясплатнага сыру, калі даюць? Падвышэньне падаткаў і скарачэньне выдаткаў – заўсёды балючы захад, і палітычныя лідэры мусяць дакладна ведаць, што ён таго варты. Але давайце паглядзім на прыклад нядаўняга мінулага, каб хоць так абудзіць нашае палітычнае соннае царства.

На пачатку 80-х гг. XX ст. адміністрацыя Рэйгана скараціла падаходны падатак і павялічыла выдаткі на абарону, але не абмежавала іншыя вытраты. Прыхільнікі скарачэньня падаткаў прадказвалі: яно будзе такім стымулам эканамічнага росту, што ад дэфіцыту не застанецца ані знаку. Яны сьцьвярджалі: на дэфіцыт няма чаго зьвяртаць увагі, бо працэнтныя стаўкі ў выніку росту дзяржпазыкаў не павялічваюцца. Яны памыліліся і ў тым, і ў другім, а за бясплатны сыр давялося дорага заплаціць. На шчасьце, у 80-я гг. XX ст. высокі бюджэтны дэфіцыт выклікаў і ў дэмакратаў, і ў рэспубліканцаў аднолькавую рэакцыю. Абедзьве партыі прагаласавалі за павелічэньне падаткаў і знайшлі ў сабе сілы скараціць рост выдаткаў. Да канца 90-х гг. мінулага стагодзьдзя фінансавая адказнасьць і моцная эканоміка ператварылі дэфіцыт у прафіцыт.

Сёньня безадказнасьць вяртаецца. Зноў амэрыканская адміністрацыя прапагандуе рэзкае зьніжэньне падаткаў як спосаб стымуляваць эканамічны рост. Зноў нашмат павялічваюцца ваенныя выдаткі. Зноў бюджэтны дэфіцыт, які раней тлумачылі эканамічным спадам, не скарачаецца, нават калі эканоміка ідзе ўгору. Калі Злучаныя Штаты ў найбліжэйшай будучыні ня зьменяць курсу, цягам наступных дзесяці гадоў бюджэтны дэфіцыт захаваецца на ўзроўні 3,5 % ад ВУП, а потым рэзка ўзрасьце, бо старэньне грамадзтва будзе вымагаць росту выдаткаў на сацыяльную абарону і ахову здароўя.

Шмат у чым сёньняшні бюджэтны дэфіцыт яшчэ небясьпечнейшы за той, што быў у 80-я гг. XX ст. Да выхаду на пэнсію пакаленьня бэбі-буму засталося на дваццаць гадоў

менш. Да таго ж, ЗША з найбуйнейшага ў сьвеце крэдытора ператварыліся ў найбуйнейшага даўжніка. Значна ўзрасла доля аблігацыяў дзяржпазыкі ЗША, якія належаць замежным інвэстарам, асабліва азіяцкім цэнтральным банкам. Павялічваецца залежнасьць ЗША ад зьменлівых настрояў іншаземцаў. Прыйдзе дзень, калі абачлівыя замежныя інвэстары ў якасьці кампэнсацыі за тое, што трымаюць свае актывы ў далярах ЗША, запатрабуюць больш высокіх працэнтаў. І што горш за ўсё, палітычная воля вырашыць праблему дэфіцыту разьвеялася, як дым. На прынятыя ў 90-х гг. XX ст. правілы наконт выдаткаў забыліся, а дзьвюхпартыйная кааліцыя, якая імкнулася аднавіць фінансавую дысцыпліну, распалася.

Паводле найбольш верагоднага сцэнару, амэрыканская адміністрацыя, як і раней, будзе пакрываць дэфіцыт за кошт пераважна замежных пазыкаў. Галоўнымі ахвярамі фінансавай безадказнасьці стануць амэрыканцы: яны на сабе адчуюць рост працэнтных ставак, рост інфляцыі, замаруджваньне тэмпаў эканамічнага разьвіцьця. На абслугоўваньне дзяржаўнага доўгу будзе ісьці большая доля сабраных падаткаў. Узрослы доўг цяжкім бярэмем ляжа на плечы наступнага пакаленьня падаткаплатнікаў, якім да таго ж давядзецца сутыкнуцца з праблемай хуткага старэньня насельніцтва. Урэшце ўрад уздыме падаткі і скароціць вытраты значна больш, чым калі б на гэтыя захады пайшлі раней. Аслабеньне амэрыканскай эканомікі амаль непазьбежна адаб'ецца на эканоміцы сусьветнай. І гэта ў самым лепшым выпадку. Яшчэ больш змрочны варыянт – гэта калі інвэстары (а сярод іх багата й амэрыканцаў) страцяць веру ў здольнасьць ЗША весьці свае фінансавыя справы і скіруюць свае сродкі ў іншыя краіны. Велізарны адток капіталу паскорыць абвал даляра, выкліча скачок працэнтных ставак і інфляцыю. Гэтае цунамі ў найбуйнейшай эканоміцы сьвету абрынецца на міжнародныя рынкі, станецца бедзтвам для шмат якіх разьвіваных краінаў.

Палітычных лідэраў Амэрыкі чакае выпрабаваньне: як пазьбегнуць магчымай катастрофы ці яшчэ больш верагоднага павольнага прамантачваньня багацьця? Ці прызнаюць абраныя ўлады, што прадыктаваныя здаровым сэнсам правілы

фінансавай адказнасьці датычацца ЗША, як і кожнай іншай краіны? Ці зробяць яны цяжкі выбар, безь якога не аднавіць фінансавага здароўя самай галоўнай у сьвеце эканомікі?

[да зьместу артыкула]

Фарыд Закарыя
Нянавісьць да Амэрыкі

ФАРЫД ЗАКАРЫЯ публіцыст, рэдактар «Newsweek International». Яго апошняя кніжка — The Future of Freedom: Illiberal Democracy at Home and Abroad» (New York: W. W. Norton & Co., 2003).

---

12 верасьня 2001 г. рэдактар газэты «Le Monde» Жан Марі Калянбані напісаў знакамітую фразу: «Сёньня мы ўсе амэрыканцы». Прайшло тры гады, і цяпер, здаецца, мы ўсе — антыамэрыканцы. Ніколі цягам апошніх 50 гадоў нянавісьць да Злучаных Штатаў не была настолькі глыбокай і ўсёабдымнай. Часта сьцьвярджаюць, што заходнеэўрапейцы не прымаюць замежнай палітыкі ЗША, бо іх зрабілі мяккацелымі і дабрабыт. Але ЗША сутыкаюцца з амаль аднолькавай антыамэрыканскімі настроямі і ў Турцыі, і ў Індыі, і ў Пакістане, а ніводную з гэтых краінаў не назавеш бяскрыўдна постмадэрнай або пацыфісцкай. Ніводная краіна, апрача Ізраілю і Брытаніі, ня мае сёньня трывалай праамэрыканскай большасьці.

У наш постыдэалягічны час антыамэрыканізм запоўніў вакуўм, пакінуты сьветапоглядамі сыстэмамі, што сплылі ў Лету. Ён зрабіўся магутнай і, мабыць, самай небясьпечнай тэндэнцыяй у міжнароднай палітыцы. Так, з амэрыканскім гегеманізмам ёсьць шмат праблемаў, але калі сьвет будзе на ўзроўні інстынктаў паўставаць супраць ЗША, у ім стане менш міру, менш узаемадзеяньня, менш заможнасьці, менш адкрытасьці і менш стабільнасьці.

Вядома, хваля антыамэрыканізму ў нечым выкліканая палітыкай адміністрацыі Буша і, што ня менш важна, стылем ягоных паводзінаў. З таго часу, як у Белым Доме атайбаваўся Буш, узровень сымпатыяў да ЗША рэзка ўпаў. Напрыклад, у 2000 г. 75 % інданэзійцаў называлі сябе праамэрыканцамі. На сёньня больш як 80 % варожа ставяцца да дзядзькі Сэма. У адказ на пытаньне, чаму яны ня любяць Злучаныя Штаты,

людзі ў іншых краінах увесь час згадваюць Буша і ягоную палітыку. Але самая глыбіня і ўсёахопнасьць гэтай зьявы сьведчыць: рэч ня толькі ў Бушу. Зрэшты, французскі міністар замежных справаў зьедліва назваў «гіпэрдзяржаваю» Амэрыку Біла Клінтана, а ня Джорджа У. Буша.

Уздым антыамэрыканскіх настрояў зьвязаны таксама і зь фігурай улады. Сёньня ЗША – наймагутнейшая дзяржава за ўсю гісторыю сьвету. А засяроджваньне ўлады ў адных руках не абяцае нічога добрага. Як правіла, іншыя краіны пачынаюць хаўрусаваць, каб стварыць супрацьвагу звышдзяржаве. Як даводзіць гісторыя, астатнія аб'ядноўваюцца і зрынаюць прэтэндэнтаў на сусьветнае панаваньне – ад Габсбургаў і Напалеона да кайзэра Вільгэльма і Гітлера.

Больш за 50 гадоў Злучаныя Штаты пры дапамозе мастацтва дыпляматыі рабілі ўсё, каб адхіліць гэты нібыта непазьбежны закон гісторыі. ЗША карысталіся ўладай, у прынцыпе, па-добраму: дзейнічалі празь міжнародныя арганізацыі, разьвівалі адкрытую сыстэму гандлю, што спрыяла эканамічнаму росту іншых краінаў, прапаноўвалі дапамогу тым дзяржавам, якія мелі ў ёй патрэбу. Каб паказаць, што ад ЗША не зыходзіць пагрозы, Амэрыка штораз выяўляла глыбокую павагу, нават шанаваньне да значна слабейшых краінаў. Грубым сьцьвярджэньнем сваёй улады, ігнараваньнем міжнародных структураў адміністрацыя Буша паставіла крыж на дзесяцігодзьдзях тонкай дыпляматыі. Яна паказала, што раней Амэрыка абмяжоўвала сябе сама і што фактычна яна можа й адна рабіць усё, што захоча. Ня дзіва, што астатнім дзяржавам дужа не даспадобы гэты дысбалянс, і яны шукаюць спосабаў ставіць Амэрыцы палкі ў колы.

Аднак у прасоўваньні антыамэрыканізму ня меншую ролю адыгрывае ідэалягічны вакуўм. Палітоляг Фрэнсіс Фукуяма меў рацыю: распад Савецкага Саюзу азначаў таксама канец вялікай спрэчкі ідэалёгіяў, як лепш арганізаваць эканамічнае і палітычнае жыцьцё. Больш за стагодзьдзе супрацьстаяньне паміж сацыялізмам і капіталізмам ува ўсім сьвеце вызначала сутнасьць палітычных дэбатаў, фармавала палітычныя партыі і іх праграмы. Зь перамогай капіталізму сьвет застаўся без

ідэалёгіі пратэсту, без сыстэмы ідэяў, што крытычна ставілася б да наяўнай рэчаіснасьці.

На пратэстную ідэалёгію заўжды ёсьць попыт. Яна дазваляе тым, хто не трапляе ў «асноўную плынь», будаваць свае дачыненьні са сьветам. Падобныя ідэалёгіі зазвычай узьнікаюць як рэакцыя на паноўныя тэндэнцыі. Росквіт капіталізму й дэмакратыі цягам апошніх 200 гадоў спарадзіў пратэстныя ідэалёгіі як «левых» (камунізм, сацыялізм), гэтак і «правых» (звышнацыяналізм, фашызм). Сёньня паноўная тэндэнцыя – улада Злучаных Штатаў, і паводзяцца яны пры гэтым надзвычай агрэсіўна. Антыамэрыканізм робіцца тыпам мысьленьня, сьветаўспрыманьнем, спосабам пазначыць сваё месца ў сьвеце. Ён сягае за межы палітыкі – у эканамічную й культурную сфэры. У Бразыліі, Нямеччыне, Пакістане, Кувэйце, Гішпаніі стаўленьне да Злучаных Штатаў было важным пунктам у нядаўніх выбарчых кампаніях. І паўсюль непрыманьне ўлады ЗША заваёўвала дадатковыя галасы выбарцаў. У шмат якіх краінах антыамэрыканізм выступае складнікам нацыяналізму. Пытаньне ставіцца рубам: ці можам мы супрацьстаяць звышдзяржаве? Столькі гаварылася пра тое, што зрабіць Злучаным Штатам, каб спыніць і пераламіць гэтыя тэндэнцыі. Але давайце на хвіліну ўявім, што будзе, калі ЗША перастануць выконваць ролю сусьветнага лідэра. Нават калі не заходзіць гэтак далёка ўсьлед за багатай фантазіяй і інтэлектам брытанскага гісторыка Наяла Фэргюсона, які ў артыкуле «Сьвет перад абліччам безуладзьдзя» малюе карціну поўнага хаосу, усё роўна атрымліваецца даволі змрочнае відовішча. Шмат у чым ЗША выступаюць як адзіная дзяржава, здольная на карысьць усім вырашаць набалелыя пытаньні. Хтосьці мусіць займацца праблемай тэрарызму, распаўсюду ядзернай і біялягічнай зброі. Можна абурацца некаторымі дзеяньнямі ЗША, але хто яшчэ захоча застрашаць, упрошваць, падкупляць краіны накшталт Лібіі, каб тыя адмовіліся ад тэрарызму і згарнулі праграмы стварэньня зброі масавага зьнішчэньня? Што датычыцца барацьбы з тэрарызмам, гандлю, СНІДу, распаўсюду ядзернай зброі, рэформы ААН, гуманітарнай дапамогі, то тут ЗША выконваюць незаменную функцыю.

Мацней за ўсё жаданьне абысьціся самім, без ЗША, будзе адчувацца ў Эўропе. Гэта адзіны іншы гулец, які мае дастаткова сілаў і досьвед, каб весьці рэй у сьвеце. Але калі Эўропа заявіць, што пойдзе адрозным ад Амэрыкі шляхам – мякчэйшым, далікатнейшым (назавіце як заўгодна), ці дадасьць гэта стабільнасьці ў сьвеце? Мэты ЗША і Эўропы ў большасьці пытаньняў прыкладна аднолькавыя: мір, адсутнасьць тэрарызму, вольны гандаль, пашырэньне свабоды, цывілізаваныя правілы паводзінаў. Калі Эўропа пракладае асобны курс толькі дзеля таго, каб падкрэсьліць сваю адрознасьць ад ЗША, гэта пагражае расколам у вырашэньні праблемаў сусьветнага маштабу. Арганізацыя гандлю, распаўсюд ядзернай зброі, Блізкі Ўсход – якое пытаньне ні вазьмі, Эўропа надта разьяднаная, каб вырашыць яго без ЗША. Яна можа толькі дабіцца, каб не ўдаліся пляны Амэрыкі. У выніку сьвет будзе плыць куды вецер павее, і над ім будзе ўсячасна вісець небясьпека, што неразьвязаныя праблемы аднойчы выбухнуць сапраўднай катастрофай. Замест двайнога выйгрышу атрымаецца двайны пройгрыш – для Эўропы, для Злучаных Штатаў, для ўсяго сьвету.

[да зьместу артыкула]

Пераклала з ангельскае мовы V. K.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 4 (38) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/07
[image]

ідэалогія • гісторыя • палітыка • крытыка • **эсэістыка** • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Некалькі словаў пра аўтара гэтага ліста і той час, калі ён быў напісаны. Пётр Сяўрук, сын Якава, нарадзіўся ў 1905 годзе ў Скідзелі ў небагатай сялянскай сям’і. У 1915 годзе ўся яго сям’я разам з сотнямі тысяч іншых праваслаўных беларусаў выехала на ўсход. Сеўрукі апынуліся ў Ліпецку. Хлопец прачытаў там сотні, калі не тысячы, кніг, пачаў друкавацца ў мясцовых газетах. У 1921 годзе вярнуўся ў родны Скідзель, які стаў часткай Польшчы. Тут Пятра чакала цяжкая сялянская праца, поўная адсутнасць надзеі рэалізаваць свае здольнасці і пастаянныя візіты п’яных польскіх паліцэйскіх. Пётр шмат пісаў – вершы, апавяданні, філасофскія творы, вёў дзённік (цяпер яго спадчына захоўваецца ў сваякоў). У 1926 годзе далучыўся да нацыянальнага руху. Узначальваў Гарадзенскую акруговую арганізацыю Таварыства беларускай школы (летам 1927 года ў Гарадзенскім павеце былі 53 гурткі ТБШ). У 1925–1928 гадах шмат разоў арыштоўваўся і некалькі месяцаў правёў у гарадзенскай турме. Вясной 1929 года, бачачы, што левы беларускі рух канчаткова падпарадкаваўся дыктаванаму з усходу курсу, П. Сяўрук звярнуўся да лідэраў беларускага пасольскага клуба «Змаганне» (з лідэрам якога Ігнатам Дварчаніным перапісваўся) з лістом, у якім выказаў сваё бачанне тагачаснай сітуацыі. Ліст Пятра Сеўрука не быў надрукаваны, а сам яго аўтар пайшоў з гэтага свету напрыканцы 1929 года. Гэта, аднак, не прыніжае гістарычнага значэння звароту да беларускіх правадыроў. Ліст, па сутнасці, падвёў мяжу пад эпохай масавага беларускага нацыянальна-вызваленчага руху (Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады) у Заходняй Беларусі. Пётр Сяўрук дыягнаставаў адсутнасць у яго выразна акрэсленых мэтаў, цвёрдых палітычных ідэяў, выкарыстанне

нацыянальнай тэматыкі толькі з дэмагагічнымі мэтамі, бясконцыя запазычанні ўсходніх ды заходніх ідэалогій – вось прычыны паражэння беларускага адраджэння.

У верасні 1939 года скідзельская моладзь з вінтоўкамі ў руках выганяла з мястэчка польскія войскі. Цяпер яе праўнукі п'юць гарэлку, жуюць птушынае дзярмо (танны наркатычны сродак, якім гандлююць у Горадні прадаўцы з Сярэдняй Азіі), забіваюцца на машынах і матацыклах і праводзяць час у кампутарных клубах.

Іронія гісторыі палягае яшчэ і ў тым, што цяпер «нашы» палякі, аб'яднаныя ў Саюз палякаў Беларусі, знаходзяцца акурат у той самай сітуацыі, што беларусы Другой Рэчы Паспалітай семдзесят гадоў таму. Іх правакуюць і расколваюць яўныя ворагі і ўяўныя дабрадзеі. Не дзіва, што Польская мацеж школьная і Таварыства беларускай мовы месцяцца цяпер у Горадні на адной лесвічнай пляцоўцы.

А. Павач

Пётар Сяўрук
Да «правадыроў»
беларускага народу

Я пішу гэтыя некалькі слоў горкай праўды аб беларускай запраўднасьці не затым, што я сумняваюся ў Вашай ідэйнасьці, не затым, што лічу Вас самазванымі, а не запраўднымі правадырамі беларускага народу, а іменна затым, што народ верыць Вам, бо толькі з гэтага, а не з чаго іншага вынікае тое вялікае зло, якое Вы несьвядома сееце паміж нашага народу. Бо найбольш шкодзяць народу тыя, якіх народ лічыць сваімі ідэаламі, якім ён сьлепа верыць, іменна дзеля таго, што ён лічыць іх ідэаламі, і іменна дзеля таго, што ён сьлепа ім верыць, бо гэтым паніжаецца сьвядомасьць масаў да звычайнага фанатызму. Гэткі закон запраўднасьці, дзеля гэтага сьвядомыя правадыры народаў перш-наперш стараюцца ўнікнуць гэтае акалічнасьці, як агню.

І ня што іншае, як толькі гэтае, найбольш шкодзіць прабуджэньню сьвядомасьці беларускага народу. Ніякі ўціск уладаў і ніякія «здраднікі» беларускага руху ня шкодзяць гэтулькі, колькі шкодзяць тыя, якія дзякуючы сваёй шчырасьці, дзякуючы сваёй ідэйнасьці вядуць да канца сваю згубную справу, бо ня тое зло, на якое можна паказаць пальцам, але толькі тое – чаго ніхто ня бачыць і не разумее, ня той шкодзіць народу, які сам разумее, што ягоная справа ілжывая, але толькі той, хто гэта робіць з запалам ідэйнасьці і шчырасьці.

Як бачым, адное ідэйнасьці і шчырасьці вельмі мала дзеля таго, каб быць правадыром народу. Праўдзівым правадыром народу можа быць толькі той, хто ў сваім сэрцы адчувае біцьцё сэрца цэлага народу, хто ўмее стрымліваць страсьці і гвалтоўнасьці несьвядомых масаў, хто нясе адказнасьць за ўсе, нават несьвядомыя чыны народу; але хто гэтага ня ведае і «служыць» народнаму руху тымі ідэямі, якія ён запазычыў у дактрынэраў-палітыкаў, карыстаючыся страсьцямі масаў дзеля сваіх палітычных мэтаў, – дык ці ж можа той быць правадыром народу, ці ж можа ён быць ягоным прарокам?

Адно, што зрабілі «правадыры» нашага народу, і што Вы цяпер робіце ў далейшым цягу – гэта нейкая недарэчная фікцыя сялянска-работніцкай еднасьці, адчуваная па шаблёну розных сацыялізмаў і марксізмаў з рознымі бессэнсоўнымі клічамі як «сялянска-работніцкі ўрад», сялянска-работніцкая еднасьць і г.д. Мы чулі розныя ўсхваленьні гэтай ідэалёгіі, толькі ніхто не сказаў нам, дзе яна выросла? З чаго яна створана? Яна выросла з сацыялізму, створанага работніцкім рухам заходняе Эўропы, і створана з матар'ялаў, сфабрыкованых машынамі партыйнае палітыкі; і гэты вось вытвар прынесены на грунт народу бадай выключна сялянскага, зусім не знаёмага ні з сацыялізмамі, ні з палітыкамі, і нават мала знаёмага з самім сабою і прадзначаны дзеля таго, каб вясьці яго да лепшае будучыні. Але ж, ці ж не выглядае гэта на пародыю?

І якія з гэтага вынікі?

Вы пэўныя, што гэтая пародыя прабудзіла сьвядомасьць нашага народу, бо Вы бачылі рух, які яна ўзьняла, Вы бачылі, што масы паверылі правадырам і пайшлі за імі, але ці адчувалі пры гэтым

правадыры, чым б'ецца сэрца народу, ці разумелі яны тое, што пхае народ, галоўным чынам, несьвядомую моладзь, на гэты шлях? Я пэўны, што «правадыры» гэтага не разумелі і не разумеюць, ня бачылі і ня бачаць, бо ім ходзіць зусім не аб тое; ім ходзіць аб тое, каб народ ім верыў і яны думаюць, што калі народ будзе верны, дык яны яго жыўцом завядуць у сацыялістычны рай!

Але я пакажу Вам другі бок мэдаля.

Вы крычыце несьвядомаму народу аб уціску капіталу, аб бяспраўі, якое чыніцца над працоўным народам, і г. д., і г. д. І што ж найбольш зразумеў народ з гэтае Вашае агітацыі, галоўным чынам, як сказана, несьвядомая моладзь? А вось што: несьвядомая маса гэтае моладзі зразумела, што буржуазны ўціск прымушае яе цягнуць сялянскае ярмо, тады калі яна, гэтая моладзь, магла б аддаць свае сілы болей пачэснай і вялікай народнай справе. Толькі буржуазны ўціск прымушае іх цягнуць сялянскае ярмо, але сялянска-работніцкі ўрад дасьць ім нешта лепшае. І вось гэтыя «геніі» лічаць, што гэты ўрад – гэта будзе іхні ўрад; гэта яны будуць правіць усім, будуць камісарамі, чэкістамі, нават звычайнымі катамі, але ня будуць толькі цягнуць ужо сялянскага ярма. На сьцяне ў Гарадзенскім арышце я прачытаў адбітак гэтае маніі. Нейкі геній-палітык, які не патрапіў злажыць фразы зь некалькіх слоў, нацарапаў нешта бязглуздае, бязграматнае, сэнс чаго такі: калі вы б'яце нас, дык мы Вам у сто раз зробім тое самае. Гэта ёсьць тое, што Вы прадстаўляеце сабе як рэвалюцыйны настрой беларускае вёскі, і што ў сутнасьці зьяўляецца маніяй улады: нешта недарэчнае, нешта бязглуздае, нешта дзікае, нешта хваравітае, нешта гумарыстычнае, каб не было гэта жудасна сумна.

Не ігнарыруйце гэтых і падобных фактаў, бо шмат аб чым падобным Вам вядома, але Вы ня лічыцеся з гэтым, лічачыся адно з сваімі палітычнымі праграмамі і плянамі. Вам здаецца, што гэта – ня важна, што гэта можна абмінуць і замаўчаць, дзеля гэтага Вы ўсьцяж сьвядома трубіце гэткім маньякам аб іхняй надзвычайнай сьвядомасьці. Напэўна, што для Вашых палітычных плянаў гэтую манію, створаную Вамі, Вы спакойна

можаце ігнараваць, але не забывайцеся, што Вашыя палітычныя пляны – гэта адно, а жыццё – гэта другое, і жыццё не ігнарыруе гэтай маніі так, як ігнарыруеце Вы.

Колькі разоў ужо жыццёвая запраўднасць бясспрэчна даводзіла аб памылках правадыроў беларускага руху, але ніколі ніхто ня меў адвагі сказаць аб гэтым. І – ва ўсім вінаваты нехта іншы. І цяпер асабліва пераконваюча, асабліва сільна гаворыць аб гэтым жыццёвая запраўднасць, але ізноў у далейшым часу мы чуем лаянкі і абвінавачваньні некага іншага, а ніколі ня чуем ад Вас праўды аб тэй жыццёвай запраўднасьці, якую ўжо разумеюць больш сьвядомыя, нават адчуваюць менш сьвядомыя – і не разумеюць адно маньякі, якія сьлепа вераць Вам і на якіх Вы толькі і можаце апірацца.

Дык ведайце, што на Вас ляжыць адказнасьць за народную справу; ведайце, што, сеючы свае рэвалюцыйныя настроі, ці папросту манію ўлады, Вы памагаеце тым, хто панявольвае наш народ, сееце семя нянавісьці, ведзяце да пагрозы вайны і разрухаў у нашым краю.

Я ведаю, што Вы – «правадыры» беларускага народу – не пачуеце гэтых некалькі слоў горкай праўды і пакінеце без увагі, але ёсьць такія, якія думаюць так, і я лічу сваім абавязкам сказаць Вам гэта, бо маўчаць немагчыма. Няхай гэтыя некалькі слоў пройдуць дарэмна, няхай яны будуць нечутны, але тое што жыццё скажа, ня можа прайсьці дарэмна, таго Вы ня можаце ня чуць.

Скідаль, 2 сакавіка 1929 г.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 4 (38) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/07
[image]

АЛЯКСЕЙ ЗНАТКЕВІЧ

Аляксей Знаткевіч

---

* * *

(Мы засталіся з дэбілам сам-насам)

Мы засталіся з дэбілам сам-насам
Яго бацькі сышлі на работу ці яшчэ куды
Здаецца, ён быў за мяне малодшы

Лета пасьля Чарнобылю – цёплае і сьветлае
З чужога гораду хацелася да сяброў
Ды глядзець у сваім доме
Футбольны чэмпіянат сьвету ў Мэксыцы
У дванаццаць гадоў няшмат думаеш пра радыяцыю

На канапе баксэрскія пальчаткі
Я нацягнуў правую, яму даў левую

Хвілін пяць мы гойсалі па пакоі
Ён мяне дастаць ня мог, а я патрапляў яму па твары
Адчуваючы сумесь асалоды й агіды
Потым стаміўся

Увечары старэйшы брат дэбіла падазрона спытаўся:
«Чаго ён глядзіць на цябе, нібы баіцца?»
Пэўна толькі тады мне стала сорамна

Адказаў, што ня ведаю

* * *

(Драбінкі травы й тытуню на стале)

Драбінкі травы й тытуню
Нехта рассыпаў на стале
У начным бары самотна
Як 32 сьнежня

* * *

(Кветка на вільготны крыж)

Часта я праходзіў паўз крыж на зямлі
Цёмны мэтал на сьветлым бруку
Часам там ляжалі кветкі

На гэтым месцы хлопец спаліў сябе
Калі чужынскія танкі запаўзьлі ў горад

Ня ведаю, быў ён герой ці вар’ят
Я так не зрабіў бы
Таму пакладу кветку
На халодны вільготны крыж
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 4 (38) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/07
[image]

[image] [image] [image]

АНДРУСЬ ХРАПАВІЦКІ (нар. у 1979 у Глыбокім) – паэт. Скончыў факультэт замежных моваў Полацкага дзяржаўнага ўнівэрсытэту. Друкуецца ў «Нашай Ніве» і «ARCHE».

Andruś Chrapavicki Eŭropa

Adnojčy ty adčuješ,
Što brakuje repertuaru
Ŭ vulicach, zatanułych u štodzionnaści,
U słovach, napiatych na skazy,
Azdoblenych u vyrazy tvaraŭ,
Što maskujuć
Abyjakavaść.

Mahčyma, ty nie čytaŭ Derridu,
Karatkieviča, Nietzsche,
Brzezińskaha, Junga, Alszańskaha…
Ujaŭleńnie pra filazofiju,
Palitalohiju, kulturu
I eŭrapiejskaść
Maješ tolki z padručnikaŭ
I prahramaŭ TV.

I ty kažaš, što
Tvaje słovy majuć hrunt?

Mahčyma, ty nie błukaŭ pa zavułkach i praspektach
Londanu, Paryžu, Berlinu,
Varšavy ci Prahi,

A movy nia viedaješ navat svajoj?

I ty kažaš, što
Viedaješ Eŭropu jak svaje piać palcaŭ?

Natoŭp składajecca ź ludziej,
Ruchaŭ, sutyknieńniaŭ,
Vybačeńniaŭ, roznych movaŭ,
Ujaŭleńniaŭ, kulturaŭ,
Kalejdaskapičnaj mazaiki
Losaŭ.

Časam ścienaŭ,
Nutranych i źniešnich,
Ujaŭnych i mityčnych,
Ale ŭ jakija vierać
I budujuć stahodździami
Na rujinach Babilonu
Tyja, chto bajicca jednaści,
Tyja, chto šukaje vorahaŭ u susiedziach.

Łastaŭka-vandroŭnica
Łunaje nad kupałami i špilami
Zamkaŭ i pałacaŭ,
Cerkvaŭ i kaściołaŭ
Hłybokaha j Vilni, Varšavy j Stakholmu.

Dla jaje Eŭropa - prosta słova
Na niezrazumiełaj
Čałaviečaj movie,
Realnaść,
U jakuju, kab pavieryć,
Treba ścieny
Razburyć najpierš u sabie
J raspravić kryły.

POKLIČ PRAVINCYI
U Sopacie žyć lepš,
Čym u Varšavie.

Tut žyvie elita,
Kinazorki, biznesoŭcy.
Tut mora pobač,
Akvapark, dyskateki,
Načnyja kluby,
Šmat turystaŭ,
Šmat zabavak…
Pierajaždžaj, Jarku!

U Santa-Barbary
Žyć lepš, čym
U Novym Jorku!
"Vialiki jabłyk"
Ŭžo daŭna zhniŭ
I patanuŭ u niazručnaści
Isnavańnia
Dla prostaha abyvaciela.
Tamaka navat niazručna
Zapraŭlacca.
Tłum uvieś čas
I biehatnia.
A tutaka spakojna
I prestyžna.
Pierajaždžaj, Tommy!

U Karlsruhe ciopła
I piva fajna hatujuć,
Francyja blizka,
Niadrenny rynak
Dla pradukcyji tvajoj firmy.
Pavier, na Berlinie
Śviet nie syšoŭsia klinam.
Tam złačynnaść
I brudna,
Tam stralajuć
U Kreuzbergu -
Adhukajecca
La Bundestagu.
Pierajaždžaj, Ralf!

Dieppe - port,
Heta značyć mora vidać
Budzie ź viły tvajoj,
A da Tumannaha Albijonu
Rukoj padać,
Dzie žyvie tvaja ciotka,
Jakuju varta było b
Užo daŭna naviedać.
Tvoj čortaŭ Paryž
Taksama nia tak daloka,
Ale ja b na tvaim miescy
Jechaŭ by preč.
U ciabie suchoty,
Treba źmiena klimatu i abstanoŭki.
Dieppe moža stać
Tvaim vyratavańniem!
Tak što pierajaždžaj, Jose!

Hłybokaje - horad
U centry Eŭropy,
Čysty i śvietły,
Z aziorami naŭkoła
I lasami. Biznes tut
Niemały. Kažuć, hrošy
Možna rabić… Nišy jość
Dla ciabie taksama.
Što tabie hety Miensk?
Hety tłumny, niazručny,
Ahidny, bločny,
Chruščoŭkaska-stalinska-
Ampiryčny
Maksimaliscki mehapolis
Ciahnie ŭsio ź Biełarusi,
Vysmoktvaje, by Maskva z Sajuzu,
Zasmoktvaje
By pyłasmok,
A potym vytrasaje
Razam sa śmiećciem,
Navat kali ty pryros da jaho karaniami…
Ty chočaš być hetym śmiećciem?

Hłybokaje čakaje na ciabie,
By zachodnija preryji na tvoj płuh,
by ty - kaŭboj Johnny,
Na tvoj vierš,
by ty - paet Whitman,
Na tvoj pryjezd,
by California pierad załatoj lichamankaj.
Tut tvoj los, tvoj horad!
Hladzi, kab nie było pozna.
Pierajaždžaj, Alesiu!

TANCY SA STRAČANYMI ANIOŁAMI
Ściskaju i raściskaju dałoń.
Hladžu pierad saboj. Idu. Dychaju.
Čuju – serca jašče bjecca,
A ***JANO*** – like a prayer wheel
u vieršy Amaty, jakaja deklamuje
Sionńia ŭ «Cotton Club»*,*
Dakazvajučy, što Los Angeles
Nia tolki horad aniołaŭ,
Ale jašče i paetaŭ.

Serca bjecca, i heta daje nadzieju,
Što zaŭtra jašče paśpieju
Schadzić na «Ta bouche»*,*
Vypić absentu z mastakami
Z Northridge,
Paśpieju dačytać «Paradise Lost» *Miltona,*
Bo «Straconego Raju»*,*
utulnaj restaracyji ŭ Krakowie,
Zanadta mała,
Kab toj raj sapraŭdy stracić…
Patrebien, jak minimum Lost Angeles*,*
Jak my prazvali hety horad
Z Hollywoodam i
Multykulturalnym hiedanizmam,
Katory tut paŭsiul.
Jon prabivajecca praz cement i feon,
Praz LCD-display-*i*
I LSD-viarozy.

Taksoŭka jedzie pa Rosecrans Ave,
Pavarot na S Euclid St,
Potym uniz až da La Palma Avenue…
Ściskaju, raściskaju dałoń,
Hajdajusia ŭ takt vyboinaŭ,
Niaroŭnaściaŭ majho žyćciovaha šlachu,
Fakusuju voču na vieršach Amaty,
Što, napeŭna, siońnia budzie ŭ «Da Poetry Lounge».
Znoŭ čytać pra serca,
Jakoje, jak malebnaje koła, nie spyniajecca,
Jak kaviarnia,
Što pracuje 23 hadziny,
A tuju adnu hadzinu techničnaha pierapynku,
Ciažka zaŭvažyć,
Bo kaviarnia cieraz darohu
Ŭ toj čas jakraz adčyniena,
I, navat kali ciabie zrujnujuć,
Likvidujuć i zabuducca,
Budzie chtości inšy prapanoŭvać
Hamburgery, «Polish Sausages»
Ci, naprykład, vieršy…

IMHNIEŃNI ŁODZKAJ VIASNY

Łodź. O Boža jak my ŭsie blizka
da stanu zabyćcia… histeryčny śmiech
miažuje z niaŭpeŭnienaściu ci varta
vychodzić z hetaha pubu až da zakryćcia
«Szafa» «Łodź Kaliska»… što jašče?
dzie tut jašče prapanujuć wściekłych psoŭ?
dzie tut jašče takija karciny na ścienach
i taki art u prybiralniach?

Marazmatyčna šmat šmat šmat šmat
natchnieńnia zvaliłasia źnianacku
ŭ formie cehły i chutka sfarmavała mur
berlinski mur miž nami
dźviuma asobami dźviuma krainami

što nas radnić
dyk heta ŭśmieška…
i ty i ja lubim śmiajacca
i ty i ja čužyja tut u hetym
industryjalna-śpitym mieście
ty bolš ja mieńš
paradaksalna
žadajem nie sychodzić
zastacca tut
chacia b u formie nakidu
na apakaliptyčnych karcinach
tvaich ścien

my – polusy
moj vierš – moj mur
miž nami
bo ty zanadta prazajična
vyhladaješ
ź pivam
chacia i pravakuješ
šmat šmat šmat šmat šmat
natchnieńnia
natchnieńnia vypić
hety kufal
da dna
natchnieńnia
być zvyčajnym macho
standartny seks
jak arkuš A4

i ciahniki
by sekundanty
nas raźviaduć u roznyja baki
spačatku da e-mailaŭ i ICQ
a potym
da farmalnych
vinšavańniaŭ paru raz na rok.

O(RIEN) + (CCIDEN)TAL

Adčynić akanicy i prakryčać «Dobraha ranku» a 6-j ranicy -
Napeŭna, heta jahony modus operandi*,*
Ale nichto nia žalicca, usim treba ŭstavać:
Ad staroj Japonii, kali imperatar vyniščaŭ samurajaŭ,
A chentaj i manha nia mieli kanatacyji z anime,
Da sučasnaj - z Tokijo, dzie žyć nie zručniej,
Čym u bondzie razam z Dyjahenam,
Ale usio, jak musić być, up-to-date, modern, extra…
Telefon, telefon, pakaży mnie, jak prajści
Da kulturnaha centru.

Siedziačy rankam z Krystaferam Edharam
U karčmie na vulicy biaz nazvy
U horadzie, što nahadvaje murašnik,
Siabie ujaŭlaješ takim za murašom,
Katory mysić biehčy, zmahacca za žyćcio …
Adno što ty ŭ kaściumie, z halštukam
Čakaješ na zamoŭleny cannelloni*,*
Pješ pamarančavy sočak i razmaŭlaješ pra paeziju,
Pra viečnaje … jak tyja malunki u piačorach:
Nubijcy ź viaroŭkami, sielanin naviazvaje žyviołu,
Palavańnie z sabakami ŭ pustelni,
Nubijcy staviać pastki na ptušak,
Vyjavy Mektury, voka Horusa,
Schilenyja holavy pierad mahiłaj Neferu, etc.

Niby reptylija, paŭzie viasna,
Praz šybiny mknie ŭ pakoj… Napeŭna,
Siońnia ja nie pabaču starečaha tubylca,
Katory prakryčyć «Dobraha ranku»…
Ci heta jon pamior, ci heta ja…
Ci, mabyć, hety horad, by nubijcy na malunkach,
Syšoŭ, źlacieŭ, rasplyŭsia, źnik
Razam z mezaninami i portykami,
Skulpturnymi halerejami i vystavami zbroji
I jašče šmat čym, što tak ramantyčna,
Što zavarožvaje, jak ekzystencyjalizm Kabo Abe
Abo mahičnyja miadźviedziaptuški pad Uschodniaj Zorkaj.

MIENSK

Mahčyma, heta maja pryvatnaja viaršynia,
Vyšej ja nie padymusia nikoli
Hraje na flejcie dziaučyna.
Kala stoli.

Ahidna vyhladaje miaža Raju,
Bo kalučym drotam abniesiena,
Kab strymlivać nielehałaŭ. Darajila b
Abmiežavać Raj viesieła.

Miensk – heta zamak Drakuły,
Što nad biezdańniu razlohsia,
Abo hołas Arakuła,
Ci vakalista «Stoksaŭ».

Žyviom u blokach, palim na placoŭkach,
Haŭbcach, płacim kvartpłatu,
Charčujemsia ŭ staloŭkach …
Trachajemsia ŭ internatach …

Miensk - heta ty i ja, u he-
ametryčnaj prahresiji
Pamnožanyja, vulicami razbaŭlenyja,
Napoŭnienyja stresami.

Miensk – heta pieśni zabaronienych klubaŭ,
Muzyka stometroŭki,
Letnija pavievy dupaŭ,
Zimovyja vatoŭki.

Miensk – heta časami pratesty
Śviadomych advažnych studentaŭ,
Heta dumki abitury pra testy,
Kartež prezydenta.

Časami Miensk - heta vieršy,

Ale bolš proza.
Drazdoŭski establishment –
Dla vieršau prosta zvyšdoza.

Ale my lubim Miensk, lubim. Praŭda.
Žyviom, źmianiajemsia, stalejem,
Nabyvajem tut kvatery i aŭty,
Dadajom štoś u hety mayhem.

Roznastylovy, raznaplanavy
Miensk chruščovak, kaviarniaŭ i myjniaŭ…
Adnojčy ty stanieš pamarančavym,
Svabodnym, revalucyjnym!

Ja vieru, bo inakš by navat
Minaŭ ciabie staranoju,
Pisaŭ by ody Varšavie
Ci byŭ by ŭ viečnym zapoji.

A tak ja tvoj, choć nikoli
Nia mieŭ tvajoj navat prapiski,
Ale jana ŭ Miensku roli
Nia jhraje, darma što ŭ Minsku.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 4 (38) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/07
[image]

Аляксандар Грыцанаў Разброд і хістаньні афіцыйнай навукі

АЛЯКСАНДАР ГРЫЦАНАЎ філёзаф. У сфэру яго зацікаўленьняў уваходзіць філязофія постмадэрну, філязофія псыхааналізу, філязофія марксізму (у галіне гісторыі філязофіі); псыхалягічная школа ў сацыялёгіі, сацыялёгія міжнацыянальных зносінаў, філязофская кампаратывістыка. Рыхтуе «Словарь современной философии. Постмодернизм», які мае ...

Выданьні, якія разглядаюцца ў артыкуле (пры цытаваньні ў тэксьце ўказваецца парадкавы нумар выданьня ў дадзеным пераліку і адпаведная старонка):

1. Головко А. А. *Теоретические основы демократии (конституционно-правовой аспект)*. – Мн.: ИООО «Право и экономика», 2004. – 164 с. (Наклад 100 экз.)

2. Котляров И. В., Земляков Л. Е. *Республика Беларусь: конфессиональном измерении.* Мн.: Изд-во МИУ, 2004. – 231 с. (Наклад 500 экз.)

3. Майхрович А. с. *Идеология: сущность, назначение, возможности.* 2-е изд. – Мн.: ИООО «Право и экономика», 2003. – 48 с. (Наклад 500 экз.)

4. *На пути к правовому государству: совершенствование правовой сферы.* – Мн.: ИООО «Право и экономика», 2004. – 407 с. (Наклад 250 экз.)

Дзейны прэзыдэнт краіны А. Лукашэнка неаднаразова ставіў

перад прыдворнай навукай задачу – давесьці цывілізацыйнасьць нашай самабытнай грамадзкай сыстэмы. Шэраг мыслярскіх твораў сувязі з гэтым папрацавалі над стварэньнем твораў канцы 2005-праблемах «прававой дзяржавы», «дэмакратыі», «ролі сучасную эпоху». Кнігі гэтыя надзвычайна розьняцца як прафэсійным узроўнем, гэтак і ідэйным напаўненьнем.

Так, напрыклад, у адной зь іх зусім справядліва і недвухсэнсоўна падкрэсьліваецца, што «магчымыя спробы знайсьці свой, цалкам апрычоны шлях, які прынцыпова адрозьніваецца ад таго, што ўжо выпрацавала чалавецтва, маюць усе падставы так і застацца чыста разумовымі пабудовамі» [3; 35]. Нейкую цэльную мадэль грамадзка-палітычнага ўладкаваньня беларусам давядзецца выбіраць. І – пры гэтым – з «джэнтэльмэнскага набору» Эўропы. Канфуцыянска-ісламскія схемы, такія блізкія да мэнталітэту асобных правінцыйных правадыроў, наўрад ці здабудуць тут прызнаньне.

Дэманстраваць пэўную фронду цяперашняму рэжыму нашмат лягчэй, чым у 1950–1980-х гг. Няма цэнтралізаванай цэнзуры, няма магутнага апарату прафэсійных рэдактараў дзяржаўных выдавецтваў, няма кампэтэнтнасьці ў чыноўнікаў, якія наглядаюць за сацыяльна-гуманітарнай навукай. Мэта падобных работаў можа быць любая. Акрамя адной. Тэксты гэтыя ні ў якой меры не спрыяюць умацаваньню ці хаця б «стабілізацыі» цяперашняй дзяржаўнай мадэлі.

Цяперашні рэжым, пастаянна апэлюючы да ўласнае ўнікальнасьці, усё яшчэ не ўсьвядоміў сябе як спэцыфічны «лад»: ня той калібр «архітэктараў», ня тая падрыхтоўка ў «канструктараў». Непаўторная ідэалёгія «чучхэ» ў Беларусі ня зьявіцца – насуперак добрым пажаданьням і нават простым указаньням, якія часам даносяцца з уладных вяршыняў.

Задачы, якія бачаць перад сабою ідэйныя праектавальнікі айчыннага «сацыяльна-эканамічнага цуду», цалкам рэспэктабэльныя: «Ідэі і каштоўнасьці прававой дзяржаўнасьці сталі адным з галоўных арыенціраў у зьдзяйсьненьні буйнамаштабных пераўтварэньняў у Рэспубліцы Беларусі» [4; 4]. Фармат і патас гуманітарных праграмаў, жыцьцёва

неабходных для стварэньня маладой нацыянальнай дзяржавы, заяўленыя зусім азначана. Да чаго ж *не павінна быць падобная*, з гледзішча гэтых адмыслоўцаў, сувэрэнная Беларусь?

Базавыя падмуркі цалкам рэспэктабэльных грамадзянскіх супольнасьцяў і прававых дзяржаваў, якія ўваходзяць у XXI стагодзьдзе, характарызуюцца так:

Схільнасьць абслугоўваць інтарэсы эканамічнай і палітычнай эліты, замацаваньне панаваньня такіх «каштоўнасьцяў», як індывідуалізм, эгаістычны разьлік, посьпех, выгада, арыентацыя на каштоўнасьці сярэдняга роўню, панаваньне канцэпцыі фармальнае роўнасьці, пры якім свабода дужага выключае свабоду слабога, а выгада і посьпех заўсёды на баку дужага, канструкцыя «заканадавец заўсёды мае рацыю» [4; 31].

Што ж прапануецца ў якасьці ўнівэрсальнай панацэі ад напасьцяў, характэрных для грамадзтваў зь пераходнай эканомікай? З спасылкай на шэраг вядомых расейскіх адмыслоўцаў робіцца выснова пра найбольш правільную сёньня дзяржаўна-прававую моду:

Як вынік у якасьці вырашальнай умовы пераходу да сучаснай рынкавай гаспадаркі называецца мэтанакіраваная дзяржаўная дзейнасьць, якая часткова носіць у пераходны пэрыяд імпэратыўна-ўладны характар, і ўлучэньне дзяржавы ўва ўсю сыстэму інстытутаў грамадзтва, то бок рэкамэндуецца шлях пераходу да рынкавых адносінаў, які абраны і рэалізуецца Рэспублікай Беларусьсю [4; 51].

Як жа ў межах такой грамадзкай сыстэмы павінна выглядаць духоўная сфэра жыцьця? Адказ просты:

Сфэра выхаваньня, навучаньня, грамадзянскасьці, дзе ў сацыяльнай дзейнасьці дзяржавы пануюць прынцыпы справядлівасьці, тэндэнцыі да фактычнай роўнасьці, ня можа і не павінна быць падуладная рынкавым мэтадам, законам куплі-

продажу [4; 67].

Тым самым адхіляецца клясычная заходняя практыка адукацыйных тэхналёгіяў, згодна зь якой толькі здольныя вытрымаць канкурэнцыю на рынку асьветніцкіх паслуг навучальныя ўстановы маюць права на існаваньне. Але для гэтай адмовы знаходзіцца значная адгаворка:

Перанясеньне, запазычаньне (рэцэпцыя) заходнеэўрапейскіх палітычных ідэяў і прававых формаў як альтэрнатыва разьвіцьця беларускага грамадзтва і дзяржавы магчымыя толькі пры наяўнасьці двух складнікаў: а) гэтыя ідэі і формы апрабаваныя міжнароднай супольнасьцю і апраўдалі сябе; б) гэтыя прававыя ідэі, інстытуты, мэханізмы хоць неяк павінны быць гістарычна ўласьцівыя нашаму народу і дадатна ўспрымацца грамадзкай правасьвядомасьцю [4; 115–116].

Цікавыя самі звароты: «апраўдалі сябе» і «апрабаваныя». У нядаўнім мінулым адзін вельмі вядомы малады эўрапейскі палітык прапаноўваў разьмежаваць эфэктыўныя сацыяльныя практыкі гітлераўскага рэжыму і яго нечалавечую існасьць. «Апраўданьне» – катэгорыя вельмі мэтафізычная, залежная ад герархіі каштоўнасьцяў таго соцыюму, які «апрабоўвае» тое ці іншае новаўвядзеньне. Калі ж народ – з тых ці іншых прычынаў – ня ў стане ўсьвядомлена аддаць перавагу пэўнай пэрспэктыве, ці правільна зьвяртацца да яго поглядаў?

Адзін з адмыслоўцаў, найбольш чуйны да тэмаў нацыянальнай самасьвядомасьці, Альфрэд Майхровіч, які ня так даўно пайшоў з жыцьця, шмат разважаў аб мэнтальных характарыстыках беларуса, што складаліся на працягу некалькіх стагодзьдзяў. Ён сьцьвярджаў, што нам уласьцівыя «падатлівасьць да ўзьдзеяньня наяўнай палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сытуацыі, асаблівая ўспрымальнасьць да ціску навакольных абставінаў, якія суправаджаюцца адпаведнымі ўтапічнымі надзеямі і пабудовамі, замяшанымі на абстрактных ідэях усеагульнай справядлівасьці» [цыт. паводле: 4; 114], а таксама «падатлівасьць… на любыя ўзьдзеяньні

ўладных структураў» [цыт. паводле: 4; 115].

Зразумелае жаданьне шмат якіх прыдворных мудрацоў не «вынаходзіць ровару». Яны імкнуцца сумясьціць у сьпешна прапанаваных рэцэптах «адмываньня дабяла чорнага сабакі» звыклую ім марксісцка-ленінскую дэмагогію і непазьбежны ў XXI ст. «дэмакратычны» духоўны фасон. У выніку на сьвет зьяўляюцца такія духоўныя монстры, якіх нельга прысьніць нават у кашмарным філязофскім сьне. Калі б не былі апублікаванай явай тэкстаў.

У развагах пра «тэарэтычныя падмуркі дэмакратыі» [1] Анатоль Галоўка фармулюе цалкам разумную, на першы погляд, думку: «Ня можа быць паняцьця дэмакратыі беларускай, нямецкай, амэрыканскай, французскай і да т. п., як і ня могуць быць нацыянальнымі навукамі фізыка і матэматыка. Дэмакратыя – паняцьце пазанацыянальнае» [1; 25]. Дапаўняецца гэтая неаспрэчная максыма наступнай заўвагаю: «Вялікі філёзаф і фантаст Джордж Оруэл зрабіў у свой час правільную выснову: «Немагчыма пабудаваць цывілізацыю на страху, нянавісьці і жорсткасьці. Яна не ўтрывае... Перакананы, што толькі росквіт дэмакратыі ўратуе сьвет ад гібелі» [1; 31].

Оруэл, бліскучы мысьляр сярэдзіны XX ст., творца самага знакамітага ў сьвеце антыкамуністычнага раману-антыўтопіі «1984», пэўна, перавярнуўся б у труне, калі б пазнаёміўся зь лёгікай разважаньняў доктара юрыдычных навук Галоўкі, які пачынае свае тэарэтычныя пасажы з цытаваньня ягоных тэкстаў.

Оруэл лічыў XX ст. эпохаю, калі «роўнасьць сярод людзей стала тэхнічна магчымай». Пры гэтым, паводле перакананьня Оруэла, акурат у гэтым стагодзьдзі

практыкі, ад якіх даўно адмовіліся, дзе-нідзе ўжо колькі стагодзьдзяў назад, – турэмнае зьняволеньне без суду, выкарыстаньне ваеннапалонных як рабоў, публічныя пакараньні сьмерцю, катаваньні дзеля выцягваньня прызнаньняў, выкарыстаньне цэлых групаў насельніцтва ў якасьці закладнікаў і іх дэпартацыі – сталі зноў ня толькі звычайнымі, але

дапушчальнымі і нават апраўдваюцца людзьмі, якія лічаць сябе культурнымі і прагрэсіўнымі.

Практыка камуністычных і (у меншых маштабах) фашыстоўскіх рэжымаў выяўлена ў дадзеным выпадку цалкам пазнавальна.

Оруэл у якасьці рабочай назвы кнігі «1984» узяў словазлучэньне «Апошні чалавек у Эўропе». Людзей, якія хаця б неяк асацыююць сапраўдную дэмакратыю з практычнымі наступствамі-ўвасабленьнямі ідэалёгіі марксізму-ленінізму, нельга аднесьці да катэгорыі «апошніх прадстаўнікоў роду чалавечага» ў Эўропе.

Пры гэтым у адным з сваіх артыкулаў, напісаных у 1944 г., Оруэл прааналізаваў тое, што ён называў «вельмі небясьпечнай памылкай, надта пашыранай цяпер у краінах, дзе ўсталяваўся таталітарызм». Паводле Оруэла,

памылкова думаць, што пры дыктатарскім рэжыме можна быць свабодным унутры сябе. *Уявіць сабе чалавека аўтаномным індывідам – найбольшая памылка. Тайная свабода, якую быццам бы можна захаваць пры дэспатычным праўленьні, – гэта дурніна, таму што асабістыя думкі ніколі не бываюць цалкам уласнымі. Філёзафы, пісьменьнікі, мастакі, нават навукоўцы маюць патрэбу ў заахвочваньні і публіцы, ім трэба пастаянная стымуляцыя з боку іншых людзей. Забярэце свабоду слова, і творчыя здольнасьці зьнікнуць.*

Паводле А. Галоўкі,

марксізм абгрунтоўвае сацыялістычную дэмакратыю наяўнасьцю грамадзкай уласнасьці на сродкі вытворчасьці і рэальнай прыналежнасьцю ўлады народу. Пры такой форме палітычнага ўладкаваньня ўлада ажыцьцяўляецца народам і для народу... Разьвіцьцё сацыялістычнай дэмакратыі вядзе да паглынаньня дзяржавы грамадзтвам... Чалавек падымаецца да ўзроўню асобы, здабываючы магчымасьць кіраваць самім сабой. Зь ліквідацыяй прыватнай уласнасьці, эксплюатацыі і прыгнёту

зьяўляецца адзінства грамадзкіх і асабістых інтарэсаў [1; 13].

І – далей:

Дэмакратыя нярэдка правяраецца групавым эгаізмам апазыцыі. У адрозьненьне ад дыктатуры, якая абапіраецца на моц правадыра і зброі, дэмакратыя мусіць угрунтоўвацца на сваёй індывідуальнай і грамадзкай моцы аднадумцаў, асобаў, аб'яднаных адзіным грамадзкім інтарэсам [1; 31].

Такім чынам, няхай жывуць «аднадумства», «паліцыя думак» і «міністэрства праўды»!

Аўтар абвяшчае: «Сацыялізм, заснаваны на рэальнай дэмакратыі, больш прагрэсіўная і справядлівая фармацыя разьвіцьця грамадзтва ў параўнаньні з рабаўладальніцкім, фэадальным і капіталістычным ладам» [1; 38]. Натуральна, з гэтым цяжка спрачацца. Не зусім ясна толькі, пра які менавіта «капіталізм» або «сацыялізм» ідзе размова. Пра «капіталізм» эпохі першых эканамічных крызісаў перавытворчасьці і дзіцячай працы? Або пра «капіталізм» самай свабоднай у сьвеце Галяндыі? Пра сацыялізм у людаедзкім праекце Маркса–Энгельса, якія жахнулі ўвесь сьвет прапановаю пагалоўных «працоўных арміяў», ідэямі зьнішчэньня інстытуту сям'і і ператварэньня грамадзтва ў «адзіную фабрыку»? Або пра «сацыялізм з чалавечым абліччам», пабудаваны Сталіным?

Аўтар перакананы, што

нельга адкінуць, выкінуць за борт і пахаваць навуковыя працы аб дэмакратыі К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна і іхных аднадумцаў гэтаксама, як і сацыялізм. Гэта была і ёсьць эпоха ў жыцьці грамадзтва... Гэтыя ідэі абвергнуць нельга. Яны былі ў значнай ступені рэалізаваныя ў СССР. Але пры рэалізацыі ідэяў сацыялістычнай дэмакратыі ў неадукаваным, эканамічна адсталым, «рэвалюцыйна настроеным» грамадзтве рабіліся грубыя памылкі, якія ўзмацняліся пад уплывам сфармаванага культу асобы [1; 38].

Далей жа пачынаюцца такія дзівосы, што застаецца працытаваць расейскага клясыка: «Памры, Дзянісе, лепей не напішаш!» – і даць слова самому А. Галоўку:

1. Такую рэвалюцыю можна было б лепей і прасьцей зьдзейсьніць у высокакультурным, дэмакратычным і эканамічна моцным буржуазным грамадзтве, дзе панавалі тыя ж антаганістычныя, незамірэнчыя супярэчнасьці паміж клясамі.

2. Праводзіць сацыялістычную рэвалюцыю трэба было паэтапна, абапіраючыся на розныя станы грамадзтва, а ня толькі на яго бедныя станы. Гэта паменшыла б бязьлітаснасьць барацьбы за ўладу і садзейнічала б захаваньню эканамічных каштоўнасьцяў.

3. Нельга было бязьлітасна распраўляцца з эканамічна моцнымі станамі грамадзтва (прамыслоўцамі, памешчыкамі, гандлярамі, банкірамі, уласьнікамі буйных транспартных сродкаў і г. д.). Да іх трэба было знайсьці падыходы, пераканаць іх у неабходнасьці дэмакратычных, гуманных пераўтварэньняў у грамадзтве.

4. Сур'ёзнай памылкай было правядзеньне масавай нацыяналізацыі аб'ектаў буйной уласнасьці, то бок прымусовае і бязвыплатнае яе адчужэньне на карысьць дзяржавы...

5. Трэба было знайсьці ключ да красы грамадзтва – інтэлігенцыі, яе слынных аўтарытэтаў і сьвяцілаў, абараніць і захаваць яе, не дапусьціць яе масавага выезду за мяжу...

6. Пасьля перамогі рэвалюцыі новая дзяржава павінна была абапірацца на таленавітых, разумных людзей (кшталту Луначарскага А. В.), уцягнуць іх у стварэньне новага грамадзтва, а не адхіляць ад кіраваньня, перадаўшы яго неадукаванаму натоўпу.

7. Новая савецкая дзяржава павінна была інакш весьці сваю замежную палітыку: упэўнена, годна, сьціпла, паважліва да іншых дзяржаваў, не пужаць іх пастаянна ўсясьветнай

сацыялістычнай рэвалюцыяй і рэзка не супрацьпастаўляць сацыялістычную ідэалёгію буржуазнай... Усё гэта пазбавіла б савецкую дзяржаву ад ізаляцыі зь іншымі дзяржавамі. А рэальна яна супрацьстаяла ўсім дзяржавам сьвету.

8. Шмат якія глябальныя пытаньні вырашаліся без папярэдняга правядзеньня экспэрымэнтаў (напрыклад, правядзеньне калектывізацыі), што прыводзіла да памылак, гібелі людзей, хваравіта адбівалася на іхнай веры ў лепшае жыцьцё.

9. Сілу трэба было ўжываць толькі ў выключных выпадках, калі вычэрпваліся ўсе меры пераконваньня і растлумачэньня.

10. Ня трэба было дапускаць такога становішча, пры якім бы камуністычная партыя падмяняла дзяржаўны апарат і тым самым падрывала яго аўтарытэт перад народам...

11. Такім чынам, сацыялізм можна было пабудаваць зь меншымі ахвярамі, а можа й без ахвяраў, як гэта было зроблена ў Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы, Народнай Рэспубліцы Баўгарыі і ў іншых дзяржавах, якія падтрымліваў Саюз ССР

[1; 38 – 40].

Прыношу глыбокія прабачэньні за доўгую цытату і камэнтую па пунктах.

1. У «высокакультурным, дэмакратычным» грамадзтве, аказваецца, могуць быць «антаганістычныя, незамірэнчыя супярэчнасьці». Добрая дэмакратыя!

2. «Ня бедныя» (то бок забясьпечаныя і больш адукаваныя) станы грамадзтва зусім не былі зычліва настроеныя да ленінскага закліку «рабуй нарабаванае!».

3. А як жа быць з працэнтнымі нормамі зьнішчэньня прадстаўнікоў заможных клясаў паводле мадэлі, выкладзенай Леніным у вядомым пісьме бальшавіцкаму наркаму Курскаму (Ільліч дэталёва пералічыў больш за 20 грамадзкіх катэгорыяў, якія падлягалі неадкладнай ліквідацыі пасьля ўсталяваньня

савецкае ўлады ў тым ці іншым рэгіёне)? Услаўленьне «герояў грамадзянскай вайны», то бок «геніяў братазабойства», усё яшчэ квітнее ў шмат якіх школах Беларусі.

4. Якраз так і зрабіў Гітлер у Нямеччыне: ён прапанаваў буйным прамыслоўцам працаваць на ўмовах, устаноўленых рэжымам.

5. Практычна ўся расейская інтэлігенцыя добра ўяўляла сабе, да чаго прывядуць бальшавісцкія праекты. Вучоны І. П. Паўлаў 21 сьнежня 1934 г., выдатна разумеючы, што ён робіць, і зусім не выключаючы магчымасьці арышту і расстрэлу, адправіў у Раду народных камісараў СССР адчайны ліст, які ўтрымліваў шэраг дакладных, пранізьлівых характарыстык:

Вы дарэмна верыце ўва ўсясьветную рэвалюцыю... Вы сеецe па культурным сьвеце не рэвалюцыю, а зь вялізным посьпехам фашызм. Да вашай рэвалюцыі фашызму не было...

Я ўсё болей бачу падабенства нашага жыцьця з жыцьцём старажытных азіяцкіх дэспатыяў. А ў нас гэта завецца рэспублікай.

6. «Перадача кіраваньня неадукаванаму натоўпу» – гэта быў выратавальны для бальшавіцкай улады палітычны кульбіт. Зьдзяйсьняць цалкам бесчалавечны сацыяльны экспэрымэнт зь мільёнамі ахвяраў можна было адно ад імя такога натоўпу, хаваючыся пад «уладай працоўных і сялянаў».

Аўтар трохі ніжэй піша: «У. І. Ленін патрабаваў пагалоўнага ўдзелу насельніцтва ў рабоце дзяржаўнага апарату. Уцягненьне масаў у кіраваньне ўсімі жыцьцёвымі працэсамі ў дэмакратычным, гуманным грамадзтве зьяўляецца патрэбаю, заканамернасьцю яго разьвіцьця» [1; 66]. Патрабаваць «пагалоўнага ўдзелу ў рабоце дзяржаўнага апарату» ад «неадукаванага натоўпу» (іншай якасьці натоўпу ў часы Леніна не магло быць у прынцыпе) – гэта было што? Дзіўная юрыдычная пасьлядоўнасьць!

7. Іншую палітыку – не экспансіянісцкую і міралюбную – Савецкі Саюз ня здольны быў весьці. Ён ствараўся менавіта ў такіх мэтах: СССР быў адзінай дзяржавай сьвету, у назьве якой адсутнічала геаграфічная прывязка» да канкрэтнай мясцовасьці. Добраахвотнае ўваходжаньне ў яго склад Уругвайскай ССР не зьмяніла б нічога ў яго найменьні – як далучэньне Літвы, Латвіі і Эстоніі. Па-за ўмовамі ваеннай гістэрыі і праграмы «сусьветнай рэвалюцыі» дыктат і рэжым пэрманэнтных рэпрэсіяў было б нашмат цяжэй зьдзяйсьняць.

8. Будучыя непазьбежныя вынікі калектывізацыі (як і ўсяго сацыялістычнага экспэрымэнту ў цэлым) не былі ні для кога ў Эўропе сакрэтам. Успомнім хоць бы словы германскага канцлера Бісмарка: «Для пабудовы сацыялізму трэба знайсьці краіну, якой не шкада».

9. Бальшавізм пачаўся з татальнай экспрапрыяцыі маёмасьці цэлай краіны. Працягвалася яна аж да ўцёкаў КПСС за мяжу з накрадзенымі ў народу капіталамі.

10. Чым жа быў «дзяржаўны апарат» у СССР, як ня часткаю партыйнай намэнклятуры? Дзіўнае для вучонага-юрыста ўяўленьне пра структуру «баявых атрадаў» кампартыі.

11. Пабудова сацыялізму ў ГДР «без ахвяраў» – мякка кажучы, недакладнасьць. Як жа хваляваньні рабочых у 1953-м, раздушаныя савецкімі танкамі? Як жа ахвяры, якія спрабавалі зьбегчы з «сацыялістычнага раю» цераз бэрлінскі мур?

Трагедыя ў тым, што *такое* можна тут публікаваць. Камэдыя ў тым, што наклад – усяго (ажно?) 100 экзэмпляраў.

Дзівосы высокай юрыдычнай навукі ў яе «канстытуцыйна-прававым аспэкце» на гэтым не канчаюцца. Аўтар працягвае кнігу выкладаньнем «асноўных прынцыпаў дэмакратыі».

Ну, а гэта наагул – найвышэйшы пілятаж. Чытачы, учытайцеся:

9. Дысцыпліна.

…Дысцыпліна зьяўляецца больш шырокім паняткам, чым законнасьць. Яна грунтуецца ня толькі на праве, але й на традыцыях, звычаях, нормах маралі, этыцы (у марскім суднаходзтве, у тэатральных спэктаклях, у сямейным жыцьці, у спорце, у шлюбных звычаях, у навучаньні і ў іншых грамадзкіх сфэрах, а ў Вялікабрытаніі – у дзейнасьці парлямэнту і яго органаў)

[1; 52–53].

Можа, нехта штосьці і зразумее. Але яўна не сярэдні розум.

13. недапушчальнасьць узурпацыі ўлады якім-небудзь дзяржаўным органам, партыяй, групай або асобай.

14. тэрміновасьць заняцьця пасадаў дзяржаўнымі службоўцамі ў структурах дзяржаўных уладаў

[1; 59 – 60].

20. Забесьпячэньне палажэньня аб падзеле дзяржаўных уладаў, іх узаемных стрымліваньнях і процівагах.

І – Божа мой! – ніжэй мы знаходзім у фрагмэнце «Суб'ектыўныя гарантыі дэмакратыі» пералік яе «палітычных гарантыяў»:

Важнай гарантыяй іх (радаў дэпутатаў усіх зьвёнаў. – **А. г.**) *сапраўднага народаўладзьдзя зьяўляецца абмежаваньне тэрміну знаходжаньня ўва ўладзе абраных асобаў (ня больш за два тэрміны) і ўзмацненьня над імі кантролю масаў* [1; 108].

Заслона… Кніга была падпісана ў друк 11.08.2004 г. То бок, да лёсавызначальнага рэфэрэндуму аб працягненьні тэрміну паўнамоцтваў дзейнага прэзыдэнта на трэці тэрмін. Аляксандар Рыгоравіч заўсёды вылучаўся непрадказальнасьцю захадаў… Нават для вучоных-юрыстаў…

На гэтым адкрыцьці ў сфэры тлумачэньня прыроды сапраўднай

дэмакратыі цалкам ня скончыліся. Яшчэ тэзіс:

Чалавек з моманту нараджэньня мае мноства дадатных якасьцяў, якія ён страчвае з укараненьнем адмоўных ідэяў глябалізацыі… Якім будзе разьвіцьцё Інтэрнэту, цяжка сабе нават уявіць. Калі ён ствараўся, дык не кантраляваўся, таму што меркавалася адсутнасьць у ім улады. Навука павінна зрабіць усё для таго, каб Інтэрнэт працаваў на карысьць людзей [1; 156 – 157].

Як зьвязана «адсутнасьць кантролю пры стварэньні» зь меркаваньнем пра «адсутнасьць улады»? Або кардынальнае, глябальнае адрозьненьне *сеткавых* (сапраўды дэмакратычных) мэханізмаў вытворчасьці і распаўсюджаньня інфармацыі ад звыклых *пірамідальных* (падпарадкаваных дыктату Цэнтру) яшчэ засвоена ня ўсімі карыстальнікамі Інтэрнэту ў Беларусі?

Добра, што нармальныя тэксты па ўказаных праблемах зусім ня рэдкасьць сярод публікацыяў афіцыйных аўтараў. А. Майхровіч канстатуе:

Распад сацыялістычнай сыстэмы стаў адначасова сьведчаньнем беспэрспэктыўнасьці ідэалягічнай дактрыны, якая зьнітоўвала ранейшы ўклад існаваньня шматлікіх народаў. Час крызісу з асаблівай відавочнасьцю выявіў менавіта яе слабыя бакі. Усясьветна-мэсійныя праекты і спробы іх зьдзяйсьненьня, якія рабіліся на працягу дзесяцігодзьдзяў, запатрабавалі ад краіны найвялікшага напружаньня сілаў і велічэзных эканамічных сродкаў, аднак так і засталіся незрэалізаванымі, паказаўшы свой утапізм.

Жорсткае падпарадкаваньне чалавека вышэйшым дзяржаўна-палітычным мэтам перашкаджала разьвіцьцю разнастайных формаў сацыяльнай актыўнасьці грамадзтва. Нецярпімасьць і барацьба з усім, што супярэчыць паноўнай ідэалёгіі, дзяржаўнаму патрыятызму, культу правадыра і калектывісцкай супольнасьці, вяла да кансэрвацыі, да бюракратычнай уніфікацыі ўсяго, што выходзіць за межы штучна прынятай

усеагульнай сярэдняй нормы. У выніку безумоўнасьць падпарадкаваньня ўладзе і моцы, уніфікацыя мысьленьня і паводзінаў, занядбаньне права, свабоды асобы, маралі аказваліся тыповымі характарыстыкамі старой сыстэмы, якая імкнулася ўсталяваць поўную перавагу дзяржавы над разнастайнымі праявамі грамадзкага жыцьця. У гэтых умовах супольнае адзінства (як неабходная перадумова існаваньня любога сацыяльнага ўтварэньня) магло забясьпечвацца адно вонкавымі адносна грамадзтва сродкамі, носьбітам і правадніком якіх была партыйна-дзяржаўная сыстэма, што ўзвышалася над грамадзтвам і кіравала ім як з дапамогай моцы, так і духоўна, ідэалягічна

[3; 14].

Несупадзеньне з казкамі пра «сьветлае мінулае» «сацыялістычнай дэмакратыі» – відавочнае.

У марксісцкай традыцыі дзяржава выступала інстытутам задушэньня шырокіх масаў у клясава-антаганістычным грамадзтве, формаю вымушанага ўсталяваньня інтарэсаў эксплюататарскіх станаў. Таксама і сацыялістычная дзяржаўнасьць абгрунтоўваецца ў марксізьме-ленінізьме першапачаткова акурат як дыктатура пралетарыяту, то бок ізноў жа ў сваёй гвалтоўна-прымусовай функцыі [3; 39].

Як лічыць Майхровіч, «найважнейшым крытэрам адрозьненьня розных ідэалягічных мадэляў дзяржаўнасьці ёсьць характар стасункаў дзяржавы і астатняй, «вялікай», грамадзянскай супольнасьці. Гэткая мадэль можа грунтавацца на абсалютызацыі ідэі дзяржаўнасьці і асаблівага прызначэньня ўладных структураў… У ідэалягічным абгрунтаваньні неабходнасьці свайго існаваньня такія формы дзяржаўнасьці зьвяртаюцца да розных мадыфікацыяў прынцыпу супольных дабротаў, улучаючы ідэю дасягненьня «грамадзтва справядлівасьці»» [3; 41]. Ідэі «справядлівасьці», «роўнасьці», «сумленнасьці», «найжарстчэйшага кантролю» і да т. п. добра знаёмыя беларусам на працягу ўжо больш як 10 гадоў.

Улады ангажуюць служак Бога – прыхільнікаў трагічнага «зьвязу крыжа й молата». А менавіта: «Адметнай асаблівасьцю сучаснага этапу разьвіцьця дзяржаўна-канфэсійных стасункаў становіцца актуалізацыя сацыяльнага служэньня канфэсійных арганізацыяў» [2; 155].

І далей: прэамбула закону «Аб унясеньні зьменаў і дапаўненьняў у Закон Рэспублікі Беларусі «Аб свабодзе веравызнаньняў і рэлігійных арганізацыях»», падпісанага прэзыдэнтам Лукашэнкам 31 кастрычніка 2002 г.,

мае важнае палітычнае, канстытуцыйна-прававое, гістарычнае й ідэалягічнае гучаньне. Прызнаецца вызначальная роля праваслаўнай царквы ў гістарычным станаўленьні і разьвіцьці духоўных, культурных і дзяржаўных традыцыяў народу. Гэта зьвязана з тым, што праваслаўе зьяўляецца рэлігіяй асноўнай культуратворчай нацыі і заўсёды ўдзельнічала ў ўва ўмацаваньні беларускага грамадзтва. У сучаснай Беларусі праваслаўе пачынае набываць асаблівае значэньне культурнага цэнтру і сымбалю нацыянальнай ідэнтычнасьці [2; 167].

Што ж, выбар відавочны – беларускае праваслаўе зыходзіць з банальна знаёмага і цалкам канфармісцкага «Любая ўлада ад Бога»...

Эпоха масавых накладаў беларускай ідэалягічнай літаратуры, на шчасьце, пайшла ў мінулае разам з БССР. Кнігі, якія раней прэтэндавалі б на месцы ў шматлікіх фондах рэспубліканскіх бібліятэк, цяпер выдаюцца парай сотняў экзэмпляраў. Больш ці менш вузкае кола асабістых знаёмых аўтараў, а таксама чыноўнікі, якія курыруюць навуку, але зусім не чытаюць спэцыяльнай літаратуры, – вось патэнцыйны і адначасова самы рэальны адрас прызначэньня падобных твораў. Пра які-кольвечы масавы ахоп зацікаўленых асобаў размова ў прынцыпе ісьці ня можа. Ня тыя часы, дый, скажам шчыра, ня тая якасьць.

Але, заўважым, літаратура (нават у рамках зборнікаў, аўтарства якіх належыць аднаму творчаму калектыву)

ідэалягічна неаднастайная. Кагосьці, мабыць, вучыў А. Майхровіч. Кагосьці, відаць, працягвае вучыць А. Галоўка.

Гэта, у прыватнасьці, сьведчыць, што адраджэньне ідэйнага таталітарызму сталінска-брэжнеўскага ўзору ўва ўмовах сучаснай Беларусі неажыцьцяўляльнае (незалежна ад жаданьня яе цяперашніх гаспадароў). Ня тыя кадры, ня той узровень уладнага прэсінгу, ня тая ступень духоўнай залежнасьці вучоных. На падставе тэкстаў, агледжаных у гэтым артыкуле, можна стаць нацыянальным дэмакратам ці фашыстам, бяздумным выканаўцам прэзыдэнцкай волі ці адважным вулічным апазыцыянэрам. Хаос і бязглузьдзіца, уласьцівыя ў апошнія дзесяцігодзьдзі XX ст. афіцыйнай ідэалёгіі савецкай камуністычнай імпэрыі, толькі ўзмацніліся ўва ўмовах «сацыяльна арыентаванай рынкавай эканомікі».

Будучыня пакажа, у якога з вышэйпазначаных тэкстаў будзе больш паважанае месца на «стужцы культуры». Інакш – бяз думак пра гэта – любому аўтару ня варта і тварыць. Бо «культурная творчасьць» – гэта «прыгода». І галоўнае (як заканчваецца адзін з фрагмэнтаў дзёньніка героя раману Оруэла Ўінстана Сьміта): «Свабода – гэта свабода гаварыць, што два плюс два роўна чатыром. Калі гэта дапускаецца, з гэтага вынікае ўсё астатняе».

Калі людзі падбаюць пра свабоду, праўда сама падбае аб сабе.

Пераклад з расейскай
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 4 (38) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/14
[image]

[image] [image] [image]

Юры Ліхтаровіч Росквіт і сьмерць польскага камунізму

ЮРЫ ЛІХТАРОВІЧ (нар. у 1978 годзе ў г. Маладзечне) – выпускнік факультэту палітычных і адміністрацыйных навук Эўрапейскага Гуманітарнага ўнівэрсытэту, дактарант Школы прыкладных гуманітарных навук пры Інстытуце філязофіі і сацыялёгіі Польскай акадэміі навук.

Апошняя публікацыя ў «ARCHE» – аналіз «Навукоўцы ў люстэрку

Grabowska Mirosława. *Podział postkomunistyczny. Społeczne podstawy polityki w Polsce po roku 1989.* – Warszawa: Wydawnictwo Naukowe Scholar, 2004 – 403 s.

Нашы высокія ідэалы, якія мы так цэнім, на самай справе паўстаюць як супрацьвага ці адмаўленьне іншых ідэалаў, якія для кагосьці гэтаксама каштоўныя, як нашы для нас. Ці то задаволены жыцьцём прыхільнік славянскіх каштоўнасьцяў і моцнай улады, ці то барацьбіт за беларускую дэмакратыю расплюшчваюць вочы на вонкавы сьвет толькі пад уплывам якіхсьці неадназначных і вялікіх падзеяў: вайны ў Іраку, рэвалюцыі ўва Ўкраіне ці Кіргізіі. Адзін пачынае радавацца стабільнасьці яго «малога ўтульнага» дому, другі чакае з надзеяй, калі падобная хваля дакоціцца нарэшце да Беларусі. Абодва гэтыя погляды – неадпаведныя ў сёньняшняй посткамуністычный рэчаіснасьці. Дзякуючы ім нельга ўбачыць і зразумець зьмены ў грамадзтве і ў дзяржаве, якія па вызначэньні ня ёсьць чымсьці статычным. А здольнасьць да распазнаваньня зьменаў і адэкватнага прыстасаваньня да іх – важны элемэнт сучаснай глябальнай палітыкі, які ўплывае на пасьпяховасьць і моц дзяржаваў і народаў.

Акурат пра гэта гаворыцца ў кнізе, выдадзенай у 2004 г. Мірaславай Грабоўскай[1] і прысвечанай аналізу палітыкі на працягу апошніх 15 гадоў, а таксама ўзаемазалежнасьцям паміж камуністычным мінулым, сучаснасьцю і будучыняй. Палітычныя падзеі ў ёй разглядаюцца праз прызму перакананьняў, што пануюць у грамадстве.

Пасьля 1989 г. у Польшчы і іншых краінах Сярэдняй Эўропы слова палітыка стала шматзначным. Для кагосьці гэтае слова азначала новыя мысьленчыя гарызонты і новыя магчымасьці для дзейнасьці: унутры краіны стала магчыма і прэстыжна займацца палітыкай для вялікай колькасьці людзей, а ня толькі для вузкага і выбранага кола. Людзі зразумелі, што іх голас вырашае, у якім кірунку будзе разьвівацца дзяржава і які будзе пэрсанальны склад ураду ці парлямэнту. Хтосьці, наадварот, успрыняў палітызацыю грамадзкага жыцьця як небясьпечную зьяву, зьвязаную з карупцыяй і інтрыгамі.

М. Грабоўская падае агульную канцэпцыю, каб вытлумачыць на польскім прыкладзе, чым ёсьць палітыка і як яна ўплывае на жыцьцё грамадзтва. Для гэтага з пэрспэктывы сацыялёгіі і сацыяльнай псыхалёгіі аналізуюцца грамадзкія ідэнтычнасьці, з дапамогай сацыялёгіі і паліталёгіі робіцца аналіз выбарчых паводзінаў, асаблівасьцяў электаратаў і сацыяльных інстытуцыяў (палітычных партыяў і ролі касьцёлу). Першы ўзровень аналізу – тэарэтычны: абмяркоўваецца канцэпцыя «падзелаў», распрацаваная амэрыканскімі дасьледчыкамі с. Ліпсэтам і с. Раканам (камунізм выклікаў падзел у грамадзтве на дзьве групы: посткамуністаў і антыкамуністаў). Другі ўзровень – аналіз сацыяльных ідэнтычнасьцяў, выбарчых прэфэрэнцыяў, партыйнай сыстэмы і партыйных структураў – сьведчыць пра наяўнасьць гэтага падзелу і цяпер.

У аснову канцэпцыі Ліпсэта-Ракана пакладзена ідэя гістарычных і сацыяльных мэханізмаў фармаваньня палітычных партыяў і асаблівасьцяў іх функцыянаваньня ў Заходняй Эўропе. Згодна зь ёй, палітычныя партыі зьявіліся як адлюстраваньне падзелаў у грамадзтве пад уплывам важных гістарычных працэсаў, якія вызначалі эўрапейскую палітыку з

Да «Палёгіі» (3/2005).

[1] Міраслава Грабоўская (Mirosława Grabowska), доктар сацыялёгіі, выкладчыца Інстытуту Сацыялёгіі

XVI ст. Структура грамадзкіх падзелаў і, як вынік, відаў палітычных партыяў былі вызначаны Рэфармацыяй, нацыянальна-дэмакратычнымі рэвалюцыямі і прамысловай рэвалюцыяй.

Рэфармацыя спрычынілася да канчатковага аддзялення царквы ад дзяржавы і да большай рэлігійнай разнастайнасьці Эўропы, а таксама да зьяўленьня канфлікту інтарэсаў і каштоўнасьцяў паміж гарадзкой буржуазіяй і зямельнай арыстакратыяй, і, адпаведна, да першага падзелу, дзякуючы якому ўзьніклі першыя палітычныя партыі: кансэрватыўныя, лібэральныя і каталіцкія.

У працэсе нацыянальна-дэмакратычных рэвалюцыяў у Эўропе (кан. XVIII – XIX ст.) умацаваўся другі падзел па лініі цэнтар/пэрыфэрыя, адбылося пашырэньне палітычных правоў і фармаваньне панятку «грамадзянства». Зьяўленьне нацыянальных дзяржаваў патрабавала цэнтралізаванай і стандартызаванай нацыянальнай культуры, якая б забясьпечвала мабілізацыю насельніцтва на ўзроўні ўсёй краіны супраць асобных правінцыйных ці пэрыфэрыйных групаў, адрозных паводле этнічнай, моўнай ці рэлігійнай прыкметы, а таксама супраць прывілеяў і дамінуючай ролі царквы. Гэты працэс не прыводзіў аўтаматычна да зьяўленьня новых палітычных партыяў – умацоўваліся партыі існуючыя, адбывалася іх дыфэрэнцыяцыя ў залежнасьці ад спэцыфікі краіны і партыйнага кіраўніцтва.

Калі два папярэднія працэсы паспрыялі росту разнароднасьці Заходняй Эўропы, то прамысловая рэвалюцыя ўмацавала аднастайнасьць Эўропы, ствараючы падзел паміж уласьнікамі, працадаўцамі і наёмнымі працаўнікамі. Рост наёмнай працоўнай сілы і ейная высокая канцэнтрацыя сталіся ўмовамі зьяўленьня прафсаюзаў і масавых рабочых партыяў.

Паміж посткамуністычнымі і заходнеэўрапейскімі грамадзтвамі існуе вялікая розьніца. У краінах Сярэдняй Эўропы няма такой моцнай залежнасьці паміж асаблівасьцямі грамадзкага разьвіцьця і характарам палітычных партыяў. Апошнія тут ствараліся «зьверху», як прадукт імпарту пэўных ідэяў і канцэпцыяў, а не ў працэсе зьменаў і эвалюцыі грамадзтва.

Варшаўскага ўнівэрсытэту, заснавальніца Інстытуту дасьледаваньняў асновы дэмакратыі (Instytut Badań nad Podstawami Demokracji) Варшаўскага ўнівэрсытэту, супрацоўніца Інстытуту палітычных навук Польскай Акадэміі навук.

Камуністычны рэжым зьнішчаў тканку арганізацыяў-пасярэдніцаў паміж уладай і грамадзтвам (тое, што сёньня называюць грамадзянскай супольнасьцю), а таксама зьмяняў індывідуальныя ідэнтычнасьці і формы паводзінаў. Навязваньне грамадзтву ідэі «парадку і стабільнасьці» ў якасьці галоўнай каштоўнасьці, немагчымасьць сказаць «не» (за гэта перасьледавалі), маніпуляваньне маральлю спрычынілася да пасіўнасьці і да таго, што г. Арэнт назвала «разбурэньнем грамадзтва і разбурэньнем асобы».

Уплыў камуністычнай сыстэмы на грамадзтва быў настолькі моцны і доўгатэрміновы, што сфармаваны ў ім падзел на камуністаў/посткамуністаў і антыкамуністаў пражыў яе заняпад. З аднаго боку, сыстэма была вельмі пасьпяховай у прыцягваньні новых прыхільнікаў. Першай прапановай камуністаў было працаўладкаваньне для шырокіх масаў, бо эканоміка была нацыяналізавана, а растучы дзяржаўны і партыйны апарат паглынаў новыя і новыя кадры. Ужо ў 1947 г. у апараце польскай службы бясьпекі працавала каля 100 тыс. чалавек, вялікімі тэмпамі расла колькасьць членаў партыі: восень 1946 г. – 400 тыс., восень 1947 г. – 800 тыс., сьнежань 1948 г. – больш за 1 млн 400 тыс. чалавек. Напрыканцы 1980-х гг. ПАРП налічвала каля 2 млн сяброў. Праграма рэформаў і абяцаная пабудова грамадзтва ўсеагульнай справядлівасьці атрымалі падтрымку тых, хто хацеў стабільнасьці і спакою пасьля вайны.

З другога боку, камуністычная сыстэма была пабудавана ў Сярэдняй Эўропе сілком, на штыхах Чырвонай Арміі і пры падтрымцы спэцслужбаў. Да 1947 г. у Польшчы яшчэ адбываліся ўзброеныя сутычкі паміж падпольшчыкамі і камуністамі. Колькасьць ахвяраў ацэньваецца ў 2 тыс. забітых і каля 95 тыс. зьняволеных. Апазыцыя, прадстаўленая Польскай сялянскай партыяй (ПСЛ), перасьледавалася, вынікі рэфэрэндуму і выбараў фальсыфікаваліся. Так, падчас рэфэрэндуму 30 чэрвеня 1946 г. 73,1 % насельніцтва галасавалі за прапановы ПСЛ ці супраць прапановаў камуністаў, толькі 26,9 % падтрымалі прапановы апошніх, але афіцыйна былі пададзены адваротныя лічбы. Падобная сытуацыя паўтарылася падчас выбараў у студзені 1947 г. Згодна з ПСЛ, партыя

атрымала 69 % галасоў, а афіцыйна ёй адпісалі 10,3 %, а 80,3 % – камуністычнаму Дэмакратычнаму блёку.

На працягу свайго існаваньня польскі камунізм, змагаючыся з ворагамі, выпіхваючы людзей з сыстэмы, нішчачы легальныя магчымасьці выказаць незадавальненьне ці нязгоду ў яе рамках, выклікаў незадаволенасьць і антыкамуністычныя настроі. Увесь гэты час у Польшчы існавала апазыцыя, што ўзмацняла падзел у грамадзтве. Сацыялягічныя дасьледаваньні паказвалі, што «разрыў» існуе паміж першасным і найважнейшым узроўнем ідэнтыфікацыі індывіда – сям'ёй – і другім узроўнем ідэнтыфікацыі – нацыяй, нацыянальнай супольнасьцю. Прамежкавыя інстытуты (у тым ліку партыя), якія існавалі ў камуністычнай Польшчы, успрымаліся як чужыя, варожыя, як «яны», з чым людзі не ідэнтыфікуюцца, нават калі самі працуюць у іх. Такое падвойнае існаваньне было магчыма дзякуючы сыстэме знаёмстваў, «кланаў» і дамоўленасьцяў. Па-другое, у прыватным жыцьці людзі арыентаваліся на адныя каштоўнасьці, а ў публічным жыцьці – на іншыя. Грамадзтва ў адказ на спробы цэнтральных уладаў кантраляваць публічную сфэру з дапамогай прымусу, афіцыйнай мовы і ідэалёгіі толькі фармальна прымала «ідэалягічную рэчаіснасьць» і ўцякала ў прыватную сфэру, дзе дамінавалі нацыянальныя каштоўнасьці і міты (напрыклад, вызвольных паўстаньняў) пры апірышчы на традыцыю каталіцкасьці, якая была зьнітавана з народнай культурай.

Разам з тым, сацыялягічныя апытаньні паказвалі яскравае адрозьненьне паміж каштоўнасьцямі і поглядамі сяброў ПАРП і тымі, хто не належаў да партыі або ўваходзіў у «Салідарнасьць». Сябры партыі лепш ацэньвалі ўласнае матэрыяльнае становішча, верылі ў здольнасьць уладаў хутка вырашыць крызісы, лічылі ПНР дэмакратычнай краінай, меркавалі, што ўлада мае права абмяжоўваць грамадзкія свабоды ў імя «вышэйшай мэты», а Касьцёл ня мае права мяшацца ў палітыку.

У рэгіёнах, дзе канцэнтрацыя сяброў партыі была вышэйшая, чымся па краіне, выявілася большая падтрымка «народнага» (камуністычнага) сьпісу падчас выбараў 1989 г., У. Цімашэвіча

на прэзыдэнцкіх выбарах 1990 г., сацыял-дэмакратаў (былых камуністаў) у 1991 і 1993 гг. Адваротная сытуацыя назіралася ў рэгіёнах, дзе была вышэйшая канцэнтрацыя ксяндзоў.

Сёньня посткамуністычную/антыкамуністычную ідэнтычнасьць выбіраюць каля 1/3 дарослага насельніцтва і 1/4 моладзі Польшчы (тоеснасьць «дэмакрат» выбірае 24 % і 38 %, «апанэнт камунізму» – 34 % і 24 %, а «чалавек ПНР» – 29 % і 15 %). Адзіным найбольш дакладным крытэрам, паводле якога можна вызначыць, хто выбірае тую ці іншую тоеснасьць, зьяўляецца ўзрост.

Выбар ідэнтычнасьці пост- ці антікамуніста праяўляецца ў палітычных поглядах, выбарчых сымпатыях і партыйнай прыналежнасьці. Так, посткамуніст лічыць, што з канцом камунізму Польшча больш страціла, чым набыла. Ён выступае супраць забароны займаць кіраўнічыя пасады для былых высокіх партыйных чыноўнікаў. На выбарах 1989–1995 гг. ён радзей галасаваў за «Салідарнасьць» і ейных кандыдатаў, на прэзыдэнцкіх выбарах 2000 г. галасаваў за А. Квасьнеўскага, а на парлямэнцкіх выбарах 2001 г. – за кааліцыю СЛД–УП (Саюз лявіцы дэмакратычнай і Унія Працы). Малады посткамуніст мякчэй ацэньвае камунізм, лічыць, што «для такіх людзей, як я, ня важна, ці ўрад дэмакратычны, ці не», і галасуе за СЛД–УП.

Антыкамуніст раней рэгулярна слухаў радыё «Вольная Эўропа» і ўваходзіў у «Салідарнасьць» у 1981 г. Ён лічыць, што Польшча шмат здабыла з заняпаду камунізму, выступае за забарону займаць кіраўнічыя пасады для былых высокіх партыйных чыноўнікаў, лічыць, што дэмакратыя мае перавагу над усімі іншымі формамі кіраваньня. Ён хінецца да правых партыяў. На выбарах 1989 г. ён галасаваў за «Салідарнасьць» ці яе хаўрусьнікаў, у 1995 г. не зьбіраўся галасаваць – за Валэнсу ці іншых кандыдатаў. Падобна выглядае малады антыкамуніст. Ён нэгатыўна ацэньвае камунізм, лічыць, што дэмакратыя мае перавагу над усімі іншымі формамі кіраваньня, у 2001 г. галасаваў за правыя партыі.

Такая ўвага да польскіх выбараў 1989 г. невыпадковая. Яны мелі вельмі важнае значэньне, бо паказалі грамадзкі падзел і вызначылі хаду пазьнейшых выбараў: з аднаго боку –

посткамуністы, з другога – партыі з радаводам ад «Салідарнасьці». Падчас наступных выбараў заўважаецца стабільны электаральны падзел. Тыя, хто галасаваў за левыя партыі на першых выбарах, збольшага галасуе за «левых» і на наступных. Падобная сытуацыя назіраецца і сярод «правага» электарату. Да 2003 г. «левы бок» быў у лепшай сытуацыі – дзякуючы доўгатрываласьці і моцы галоўнай партыі СЛД. Што да правага спэктру, то тут заўважаецца высокая зьменлівасьць, якая тлумачыцца нестабільнасьцю партыйных кааліцыяў і частымі распадамі правых партыяў.

Слабасьць правых палітычных партыяў тлумачыцца асаблівасьцямі іхнага ўзьнікненьня. Гэта збольшага невялікія партыі бяз моцных сувязяў з грамадзтвам, створаныя «зьверху» якойсьці групай, аб'яднанай супольнай ідэяй ці каштоўнасьцямі, без рэсурсаў і досьведу партыйнага будаўніцтва. У выніку яны характарызуюцца слабой дысцыплінай, недахопам кадраў і схільнасьцю да падзелаў. Посткамуністычныя партыі, асабліва СЛД, якая стала пераемніцай былой кіраўнічай партыі, здолела захаваць большую колькасьць структураў на месцах, засталася масавай (каля 80 тыс. чальцоў у 1998 г.), мае неабходны партыйны досьвед і рэсурсы.

Аднак, нягледзячы на няўстойлівасьць правых партыяў, польская палітычная сцэна мае яскравы і стабільны падзел на правы і левы бакі. З 1989 г. не назіралася спробаў стварыць кааліцыю з прадстаўнікамі супрацьлеглага боку, таксама быў вельмі малы працэнт пераходаў палітыкаў з аднаго лягеру ў іншы. Да таго ж застаецца вельмі стабільны электарат абодвух бакоў. Левыя партыі (перадусім СЛД) прадстаўляюць гарадзкіх і лепш адукаваных выбарцаў. У асноўным, гэта левая інтэлігенцыя, чыноўнікі, былыя партыйцы. Правыя партыі таксама прадстаўляюць гарадзкіх і лепш адукаваных выбарцаў, праўда, гэта, хутчэй, бізнэсоўцы, клеркі, мэнэджары (так званыя «спэцыялісты») і былыя антыкамуністы. Вясковы і менш адукаваны электарат прадстаўляюць радыкальныя папулісцкія партыі, такія, як «Самаабарона», больш рэлігійную і нацыяналістычную частку – «Ліга Польскіх сем'яў» (ЛПС).

З 2002 г. у польскім грамадстве адбываецца аслабленьне падзелу на посткамуністаў і антыкамуністаў, якое робіцца менш прывязаным да свайго мінулага. Людзей пачынаюць цікавіць праблемы эканамічнага росту і эфэктыўнасьці дзяржаўных інстытутаў, забесьпячэньня сацыяльных стандартаў. Пры гэтым сфармаваны і закасьцянелы падзел палітычнай сцэны як неадпаведны чаканьням выбарцаў выклікае недавер грамадзянаў да палітыкі і палітыкаў увогуле.

Хіба працы Грабоўскай у тым, што прапанаваная канцэпцыя падзелаў не праверaная на матэрыялах іншых посткамуністычных краінаў, а яе аўтарка лічыць, што былыя рэспублікі СССР наагул пад яе не падпадаюць. Паводле яе лёгікі, у адрозьненьне ад краінаў Цэнтральнай Эўропы, якія «будавалі камунізм» толькі 45 гадоў, былыя рэспублікі СССР пры камунізьме жылі даўжэй і таму тут посткамуністычны падзел мае быць мацнейшы. Сучасныя дасьледаваньні гэтага не паказваюць.

Галоўная ж выснова з кнігі для беларускіх палітолягаў – неабходна больш увагі зьвяртаць на «мясцовыя» ці «народныя» ляндшафты, то бок на працэсы, што ідуць у грамадстве, а не займацца выключна ідэалёгіяй – зборам абстрактных, шмат у чым дактрынальных ідэалаў.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 4 (38) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/14
[image]